Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”

**М.В. Півавар**

# ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ Ў 1961–1991 ГГ.

***Манаграфія***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2016*

УДК 94(476)“1961/1991”:913(476):908(476)
ББК 63.3(4Беи-4Вит)+26.891(4Беи-4Вит)
П32

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 3 ад 19.02.2016 г.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імя П.М. Машэрава. Пратакол № 9 ад 26.09.2016 г.

Аўтар: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук **М.В. Півавар**

Р э ц э н з е н т ы :
доктар гістарычных навук, прафесар *А.У. Русецкі*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.М. Дулаў*

**Півавар, М.В.**

**П32** Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг. : манаграфія / М.В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016. – 216 с.

ISBN 978-985-517-549-1.

У навуковым выданні знайшлі адлюстраванне асноўныя этапы развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг. Прааналізаваны здабыткі і дасягненні, праблемы і недахопы савецкага перыяду ў дзяржаўным, грамадскім і школьным накірунках. Асобная глава прысвечана дзейнасці выдатных краязнаўцаў краіны. Можа быць цікавым для гісторыкаў, краязнаўцаў, студэнтаў.

**УДК 94(476)“1961/1991”:913(476):908(476)**
**ББК 63.3(4Беи-4Вит)+26.891(4Беи-4Вит)**

**ISBN 978-985-517-549-1**

© Півавар М.В., 2016
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** ……………………………………………………………... 4

**ГЛАВА 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ** ………………………………… 8

**ГЛАВА 2. РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАЎНАГА НАКІРУНКУ ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ Ў 1961–1991 ГГ.** ………………………………………… 37

2.1. Навуковыя даследаванні інстытутаў АН БССР і краязнаўчая дзейнасць вышэйшых навучальных устаноў ……………………………………………... 37

2.2. Краязнаўчая дзейнасць музеяў, архіваў, бібліятэк …… 49

**ГЛАВА 3. РАЗВІЦЦЁ ГРАМАДСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА Ў 1960–1980-Я ГГ.** ………………………………… 63

3.1. Дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры …………………... 63

3.2. Праца краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры і Беларускага краязнаўчага таварыства …… 77

3.3. Краязнаўчая дзейнасць гісторыка-культурных грамадскіх таварыстваў і аб'яднанняў у другой палове 1980-х – 1991 г. ………………………………………… 84

**ГЛАВА 4. РАЗВІЦЦЁ ШКОЛЬНАГА КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ Ў 1961–1991 ГГ.** ………………………….. 95

4.1. Сутнасць школьнага краязнаўства і яго турысцка-краязнаўчы накірунак ……………………………….. 95

4.2. Краязнаўчая праца школьных музеяў …………………. 107

4.3. Пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці ……… 114

**ГЛАВА 5. ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЦАЎ У 1961–1991 ГГ.** … 121

5.1. Каго лічыць краязнаўцам? Тыпалогія даследчыкаў (краязнаўцаў) ………………………………………… 121

5.2. Краязнаўчая дзейнасць навукоўцаў …………………… 122

5.3. Дзейнасць краязнаўцаў-аматараў. Асаблівасці дзейнасці краязнаўцаў-аматараў у 1961–1991 гг. ……………….. 138

5.4. Праца лепшых краязнаўцаў-педагогаў ……………... 155

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ……………………………………………… 164

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС** ………………………….…… 174

**РЭЗЮМЭ** ……………………………………..………… 213

Репозиторий ВГУ

# УВОДЗІНЫ

Краязнаўства – феномен культурнага жыцця чалавецтва, які ўзнік на стыку навуковай і грамадскай дзейнасці. Краязнаўства – гэта і навукова-пазнавальная, і культурна-асветніцкая, і нацыянальна-патрыятычная дзейнасць. На працягу вывучэння тэмы намі вылучаны некалькі дэфініцый гэтай складанай і структурнай з'явы. **Краязнаўства** – гэта:

***метад пазнання*** (які абапіраецца, як правіла, на міждысцыплінарныя сувязі);

***міжгаліновая дысцыпліна***, якая вывучае жыццё і сучасны стан супольнасцяў і тэрыторый;

***навукова-папулярызатарская і асветніцкая дзейнасць*** пэўнай тэматыкі (аб мінулым, сучасным якога-небудзь краю і яго помнікаў);

***форма грамадскай дзейнасці,*** накіраваная на ўсебаковае вывучэнне насельніцтвам гістарычных, палітычных, сацыяльна-эканамічных, геаграфічных, культурных, прыродных і шэрага іншых фактараў пэўнай тэрыторыі (сяла, горада, раёна, вобласці і г.д.).

Аб'ектамі краязнаўства з'яўляецца край ці асобная тэрыторыя. Прадмет вывучэння – прырода, насельніцтва, гаспадарка, гісторыя, культура, мастацтва.

Вылучаюцца асобныя галіны краязнаўства: гістарычнае, геаграфічнае, эканамічнае, прыродазнаўчае, літаратурнае, дэмаграфічнае, тапанімічнае і іншыя.

Як асобная галіна вылучаецца гістарычнае краязнаўства, якое вывучае гісторыю і культуру пэўнай мясцовасці. У структуры гістарычнага краязнаўства можна вылучыць:

уласна гістарычнае, царкоўнае, мемарыяльнае (ахова помнікаў гісторыі і культуры), тапанімічнае, бібліятэчнае (стварэнне бібліяграфіі), архіўнае, музейнае, вывучэнне этнаграфіі і фальклору, некропалезнаўства і іншыя кірункі.

У жыцці любой дзяржавы краязнаўства адыгрывае важную ролю. Яно спрыяе развіццю грамадскай ініцыятывы, фарміруе патрыятызм, актыўную грамадзянскую пазіцыю, выступае як сродак навуковага пазнання гісторыі краю, інструмент развіцця культуры, захавання нацыянальнай спадчыны. Лакальныя даследаванні, якія праводзяцца дзяржаўнымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі ці краязнаўцамі-аматарамі, выяўляюць асаблівасці гістарычнага развіцця рэгіёнаў краіны, ствараюць базу для напісання абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. Вывучэнне роднага краю абавязкова спрыяе ўзнікненню любові да яго. А любоў і павага да малой радзімы з'яўляюцца фундаментам патрыятызму, нацыянальнай і гістарычнай свядомасці – сацыяльна-значных каштоўнасцей, якія назвычай востра запатрабаваны нашай краінай ва ўмовах суверэнітэту.

Репозиторий ВГУ

У нашым даследаванні аналізуецца першая і чацвёртая дэфініцыя такой шматграннай з’явы, як краязнаўства. Мы прытрымліваемся думкі аб тым, што сучаснае краязнаўства мае тры асноўныя формы арганізацыі: дзяржаўнае, грамадскае і школьнае. Дзяржаўнае (навуковае) краязнаўства ўключае ў сябе працу спецыялізаваных навуковых устаноў (Інстытут гісторыі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Інстытут беларускай мовы і літаратуры, Інстытут геалогіі і геафізікі Зямлі), вышэйшых навучальных устаноў, рэгіянальных дзяржаўных і ведамасных музеяў, архіваў, бібліятэк. Пэўную ролю ў краязнаўчых даследаваннях мае дзейнасць тэрытарыяльных органаў і ўстаноў абласной, раённай і гарадской адміністрацыі, супрацоўнікаў мясцовых органаў улады (аддзелаў і ўпраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, па спорту і турызму раённых, гарадскіх і абласных выканаўчых камітэтаў). У працэсе выканання сваіх прафесійных абавязкаў яны выяўляюць, збіраюць і апрацоўваюць разнастайныя матэрыялы, фактычныя і статыстычныя даныя краязнаўчага характару. Адміністрацыйныя органы (аддзелы ідэалогіі, культуры, па справах моладзі, спорце і турызме) з’яўляюцца праваднікамі ў ажыццяўленні рэгіянальных даследаванняў і правядзенні ў жыццё іх вынікаў. Асобую ролю ў распаўсюджванні і папулярызацыі краязнаўчых ведаў адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі.

Грамадскі напрамак краязнаўства развіваўся на добраахвотных пачатках праз дзейнасць грамадскіх арганізацый (Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК), Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Таварыства беларускай школы, таварыства “Веды”, Беларускага краязнаўчага таварыства, шэрага мясцовых ініцыятыў: фонда А. Сапунова, краязнаўчага таварыства імя А. Гэдэмана (Браслаў), клуба аматараў даўніны “Узгор’е” (Віцебск), “Вытокі” (Полацк), “Повязь” (Орша) і іншых аматараў-краязнаўцаў. Школьны напрамак краязнаўства з’яўляецца якасным прыкладам сінтэзу грамадскага і дзяржаўнага накірункаў і развіваецца праз сістэму турысцка-краязнаўчай дзейнасці, арганізацыю краязнаўчых даследаванняў у музеях навучальных устаноў і пошукавай дзейнасці.

На працягу XX стагоддзя развіццё гістарычнага краязнаўства перажывала розныя стадыі – ад усплёску актыўнасці на пачатку стагоддзя і сапраўднага росквіту ў БССР ў 1920-я гады да заняпаду і крызісу ў 1930–1940-я гады. Новы ўздым у развіцці гістарычнага краязнаўства назіраецца з другой паловы 1980-х гадоў і звязаны з палітыкай “перабудовы”, атрыманнем суверэнітэту нашай краінай.

Трэба сказаць, што калі перыяд XIX – і асабліва пачатку XX ст. знайшоў адлюстраванне ў працах навукоўцаў, то перыяд 1960–1980-х гадоў, у якім сфарміраваліся перадумовы актыўнага развіцця краязнаўства ў канцы XX і пачатку XXI стагоддзя, засталіся па-за ўвагай даследчыкаў.

Рэпазіторый ВДУ

У той жа час, менавіта ў гэты перыяд краязнаўства Беларусі стала важным інструментам вырашэння праблем, якія стаялі перад грамадствам краіны: стварэння сістэмы грамадскай аховы помнікаў гісторыі і культуры, выхавання патрыятызму і савецкага інтэрнацыяналізму, фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі. У сувязі з гэтым неабходна разгледзець асноўныя дасягненні і набыткі краязнаўства гэтага перыяду.

У навуковай літаратуры закраналіся толькі асобныя аспекты краязнаўчай дзейнасці – ахова помнікаў, стварэнне краязнаўчых музеяў, некаторыя праблемы школьнага краязнаўства. Работы, у якіх бы комплексна вывучаліся дзяржаўны, грамадскі і школьны накірункі гістарычнага краязнаўства, аналізавалася сістэма краязнаўчай працы, адсутнічаюць. Асаблівую цікавасць маюць набыткі дзяржаўнага накірунку, бо дзяржаве ў савецкія часы належала галоўная роля ў вызначэнні асноўных прыярытэтаў развіцця краязнаўства, іх рэалізацыю праз сістэму арганізацый і ўстаноў. Мэтазгодна вызначыць месца і ролю школьнага краязнаўства ў патрыятычным выхаванні ў 1960–1980-я гг., калі яно актыўна спрыяла выхаванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадскіх поглядаў моладзі. Варты ўвагі вопыт працы грамадскіх краязнаўчых арганізацый. Цікава прааналізаваць узаемаадносіны дзяржаўнага і грамадскага накірункаў.

Храналагічныя межы даследавання абумоўліваюцца тым, што менавіта ў пачатку 1960-х гг. сталі адчувальны вынікі палітыкі “адлігі”. У перыядычным і навуковым друку СССР пачынаецца дыскусія адносна месца і ролі гістарычнага краязнаўства ў жыцці савецкага грамадства. У 1961 г. прымаюцца навучальныя праграмы сярэдняй школы па гісторыі, заснаваныя на краязнаўчым прынцыпе. 1960–1980-я гады – гэта час правядзення комплексных даследаванняў рэгіёнаў Беларусі, развіцця сістэмы дзяржаўных краязнаўчых музеяў, арганізацыі і ўдасканалення школьнай краязнаўчай працы, стварэння і дзейнасці Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК) – асноўнай грамадскай арганізацыі, якая займалася краязнаўствам на працягу гэтага перыяду. 1991 г. з’яўляецца фінальнай датай даследавання, таму што з распадам СССР і абвяшчэннем суверэнітэту Беларусі пачаўся новы этап развіцця гістарычнага краязнаўства.

Улічваючы тую ролю, якую адыгрывае гістарычнае краязнаўства на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, уяўляецца неабходным і актуальным правядзенне комплекснага даследавання, прысвечанага яго развіццю ў 60–80-я гады XX стагоддзя. Абагульненыя матэрыялы дазволяць убачыць, якія здабыткі і пралікі меліся ў дзяржаўнай палітыцы, якія дасягненні можна выкарыстоўваць на сучасным этапе.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта даследавання: прааналізаваць развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ў перыяд з 1961 па 1991 г.

Репозиторий ВГУ

У адпаведнасці з мэтай былі пастаўлены наступныя з*адачы* даследавання:

– вылучыць асноўныя кампаненты дзяржаўнага накірунку гістарычнага краязнаўства БССР, вызначыць прыярытэтныя напрамкі іх дзейнасці, акрэсліць асноўныя этапы развіцця;
– даследаваць дзейнасць і вызначыць ролю грамадскіх арганізацый у развіцці гістарычнага краязнаўства Беларусі;
– вызначыць накірункі і формы дзейнасці школьнага краязнаўства ў 60–80-я гады XX ст., прааналізаваць ролю і месца школьнага краязнаўства ў патрыятычным выхаванні;
– прааналізаваць узаемаадносіны дзяржаўнага, грамадскага і школьнага накірункаў гістарычнага краязнаўства;
– вылучыць асноўныя дасягненні, праблемы і асаблівасці гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг.

У аснове гэтай манаграфіі – дысертацыйная работа, абароненая ў 2006–2007 гг. За дзесяць год, якія прайшлі з моманту абароны, адбыліся пэўныя змены. Уведзены ў зварот новыя крыніцы, якія дазваляюць больш глыбока ацаніць развіццё краязнаўства ў другой палове XX ст. З'явіліся новыя працы па гісторыі краязнаўства. Намі праведзены дадатковыя даследаванні па тэме, назапашаны новы матэрыял, адкрыліся малавядомыя факты, адбылося пэўнае пераасэнсаванне вынікаў папярэдняй працы.

Таму дадзеная манаграфія пэўным чынам адрозніваецца ад абароненай дысертацыі і мае некалькі іншую рэдакцыю. У яе склад уключана яшчэ адна глава, дапрацаваны бібліяграфічны раздзел, дапоўнены спіс літаратуры, адкарэктаваны вынікі, уключаны думкі і разважанні адносна таго, што такое краязнаўства, ці ёсць дзяржаўнае краязнаўства, ці краязнаўства – гэта грамадская з'ява.

Важнае значэнне мелі істотныя і карысныя заўвагі, выказаныя пры абароне афіцыйнымі апанентамі, а таксама рэцэнзентамі, якія атрымалі аўтарэфераты ў Беларусі і бліжэйшым замежжы: Э.М. Загарульскага, С.У. Амелька, М.Ф. Бандзелікава, І.У. Цітовіча, Я.А. Грэбеня, А.М. Дулава, Д.В. Юрчака. Значна паўплывала на структуру і высновы работы рэцэнзія ВАКа 2006 года.

Дзякуй усім, хто прычыніўся да выхаду гэтага даследавання ў свет.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 1

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

Развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гады знайшло пэўнае адлюстраванне ў айчыннай гістарыяграфіі. Аднак трэба канстатаваць, што гісторыя краязнаўства Беларусі гэтага часу не стала тэмай асобных даследаванняў і пакуль практычна не вывучана. Асобныя аспекты праблемы разглядаліся ў працах навукоўцаў, прысвечаных сумежным пытанням. Комплекс прац, якія маюць тое ці іншае дачыненне да гэтай тэмы, мэтазгодна падзяліць на тры групы.

Да **першай групы** мы адносім працы навукоўцаў, прысвечаныя *развіццю гістарычнага краязнаўства ў СССР і саюзных рэспубліках у 1960–1980-я гг.* Такія работы вартыя ўвагі па той прычыне, што БССР у дадзены перыяд з’яўлялася часткай СССР, а гістарычнае краязнаўства Беларусі развівалася ў кантэксце агульнасаюзных працэсаў. Падобныя даследаванні даюць магчымасць вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці гістарычнага краязнаўства, што мелі месца ў вывучаемы перыяд у Савецкім Саюзе ў цэлым і саюзных рэспубліках, у прыватнасці, і разам з гэтым экстрапаліраваць атрыманыя вынікі на БССР з мэтай правядзення параўнальнага аналізу.

**Другую групу** прац складаюць даследаванні, якія непасрэдна закранаюць пытанні *развіцця гістарычнага краязнаўства ў БССР у 1960–1980-я гг.* і патрабуюць больш падрабязнага аналізу.

**Трэцяя група** ўключае ў сябе працы, якія выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы тэарэтычных палажэнняў, важныя для разумення тэарэтычных асноў краязнаўства, маюць істотнае значэнне для распрацоўкі метадалогіі даследаванняў, удакладнення дэфініцыі гістарычнага краязнаўства, разумення яго філасофіі, гістарычнага кантэксту падзей, асноўных тэндэнцый і праблем развіцця.

Пачнём з разгляду прац савецкіх даследчыкаў. *Гісторыі* развіцця *гістарычнага краязнаўства* СССР у 1960–1980-х гг. прысвяцілі свае працы П.І. Кабанаў, А.В. Ушакоў[1], Н.П. Кавальскі[2], Ю.Е. Лексін[3], Д.С. Ліхачоў[4],

[1] Кабанов, П.И. О советском историческом краеведении / П.И. Кабанов, А.В.Ушаков // История СССР. – 1963. – № 3. – С. 3–17; Кабанов, К.А. Краеведение как отрасль гуманитарного знания [Электронны рэсурс] / К.А. Кабанов // Кемеров. гос. ун-т. – 2003. – Рэжым доступу: http://belovo.kemsu.ru/conferens/doklad_gum/kabanov1.html. – Дата доступу: 15.08.2005.

[2] Ковальский, Н.П. Историческое краеведение и специальные исторические дисциплины / Н.П. Ковальский // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики / Ин-т ист. АН УССР; сост. Р.Т. Тронько. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 31–34.

[3] Лексин, Ю. Первый перелом: (беседа с С.О. Шмидтом, В.Ф. Козловым, С.Б. Филимоновым) / Ю. Лексин // Знание – сила. – 1988. – № 11. – С. 66–75.

[4] Лихачев, Д.С. Памятники культуры – всенародное достояние / Д.С. Лихачев // История СССР. – 1961. – № 3. – С. 3–13.



Репозиторий ВГУ

Б.В. Лунін[5] і А.М. Разгон[6], А.В. Санцэвіч[7], І.С. Юньеў[8]. Навуковец Д.С. Ліхачоў, напрыклад, у сваіх працах выдатна паказаў і абгрунтаваў надзвычай важную ролю краязнаўства ў вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры, адзначыў іх вялікую карысць для выхаваўчага працэсу.

У працах С.Д. Бабішына[9], А.М. Разгона, А.В. Мамантава[10], В.Н. Мікалаева, Н.Н. Шчэрбы аналізуюцца пытанні месца, ролі і значэння гістарычнага краязнаўства ў працэсе навучання і выхавання, разглядаюцца яго актуальныя праблемы і асноўныя накірункі развіцця ў СССР. Аўтары вызначаюць асноўныя праблемы таго часу, якія стрымлівалі развіццё краязнаўства: адсутнасць у краіне адзінай краязнаўчай арганізацыі, спецыялізаванага перыядычнага выдання па краязнаўству, недастатковая ўвага партыйных і савецкіх органаў да краязнаўства як грамадскага руху і іншыя.

Акадэмік С.Л. Ціхвінскі ў рабоце “Состояние и задачи дальнейшего развития исторического краеведения в СССР”[11] разглядае стан гістарычнага краязнаўства ў СССР у сярэдзіне 1980-х гг. Аўтар канстатуе рост цікавасці да краязнаўства і ўзмацненне грамадскай актыўнасці ў вывучэнні мясцовай гісторыі. У той жа час даследчык прызнае наяўнасць праблем у развіцці гістарычнага краязнаўства СССР: адсутнасць адзінага каардынацыйнага цэнтра, перыядычнага выдання, раз’яднанасць намаганняў розных ведамстваў: архіваў, краязнаўчых музеяў, ВНУ ў справе стварэння краязнаўчай арганізацыі і іншыя.

Пэўныя звесткі па дадзенай праблеме можна знайсці ў *дапаможніках* па гістарычнаму краязнаўству: “Историческое краеведение: учебное пособие для исторических факультетов педагогических институтов”[12], “Краеведение и музейное дело в СССР”[13], “Историческое краеведение: пособие для студентов педвузов”[14] і іншых[15].

---

[5] Лунин, Б.В. Из опыта историко-краеведческой работы в Средней Азии и Казахстане (20–30 гг.) / Б.В. Лунин // История СССР. – 1968. – № 5. – С. 190–195.

[6] Разгон, А.М. Пути советского краеведения / А.М. Разгон // История СССР. – 1967. – № 4. – С. 190–201.

[7] Санцевич, А.В. Историческое краеведение как составная часть изучения отечественной истории / А.В. Санцевич // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 19–25.

[8] Юньев, И.С. Возродить массовое краеведческое движение / И.С. Юньев // Коммунист. – 1960. – № 3. – С. 157–159; Юньев, И.С. Беседы о краеведении / И.С. Юньев. – М.: Знание, 1966. – 110 с.

[9] Бабишин, С.Д. Из опыта краеведческой работы в школах (по материалам Хмельницкой области УССР) / С.Д. Бабишин // История СССР. –1962. – № 2. – С. 237–238; Бабишин, С.Д. Краеведение как средство связи школы с жизнью / С.Д. Бабишин. – М.: Просвещение, 1963. – 16 с.

[10] Мамонтов, А.В. Нерешенные проблемы краеведения / А.В. Мамонтов, В. Николаев, Н. Щерба // Библиотекарь. – 1972. – № 6. – С. 16–19; Мамонтов, А.В. Краеведческая библиография: учебник для библиотечных факультетов институтов культуры и педвузов / А.В. Мамонтов, Н.Н. Щерба. – Минск: Книжная палата, 1989. – 215 с.

[11] Тихвинский, С.Л. Состояние и задачи дальнейшего развития исторического краеведения в СССР / С.Л. Тихвинский // Вопросы истории. – 1988. – № 1. – С. 24–31.

[12] Ашурков, В.Н. Историческое краеведение: учеб. пособие для исторических факультетов педагогических институтов / В.Н. Ашурков, Б.В. Кацюба, Г.Н. Матюшин; под ред. Г.Н. Матюшина. – М.: Просвещение, 1980. – 192 с.

[13] Бахта, В.Н. Краеведение и музейное дело в СССР / В.Н. Бахта. – М.: Просвещение, 1977. – 123 с.

[14] Историческое краеведение (осн. изучения ист. родн. края): пособие для студентов педвузов / под ред. проф. Н.П. Милонова. – М.: Просвещение, 1969. – 319 с.

Репозиторий ВГУ

Шырокае асвятленне ў дысертацыйных даследаваннях і манаграфічных працах атрымала *школьнае краязнаўства*. Аналізу яго стану і перспектыў развіцця прысвечаны дысертацыйныя даследаванні Д.В. Кацюбы[16], О.Б. Мазбаева[17], Л.В. Смірнова[18], І.Р. Цімошына[19]; манаграфія І.І. Бескаравайнага[20], Е.Е. Грычыхінай[21], Д.В. Кацюбы[22], В.І. Лебедзева[23], А.Л. Літвіна[24], Н.П. Мілонава[25]. Найбольш грунтоўнай працай, прысвечанай разгляду тэарэтычных і практычных аспектаў школьнага краязнаўства, з'яўляецца манаграфія П.В. Іванова "Основы школьного краеведения"[26]. У ёй даследчык вызначае асноўныя шляхі і формы школьнага краязнаўства: 1. Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчай рабоце. 2. Краязнаўства ў пазакласнай рабоце. 3. Краязнаўства ў працы піянерскіх арганізацый. 4. Краязнаўства ў працы экскурсійна-турыстычных станцый. 5. Краязнаўства, якое ажыццяўляецца настаўнікамі ў навуковых і вучэбных мэтах. 6. Метадычная праца настаўнікаў, краязнаўчых музеяў па пытаннях школьнага краязнаўства; 7. Краязнаўства ў падрыхтоўцы настаўнікаў. 8. Краязнаўства ў працы навукова-педагагічных устаноў і грамадска-педагагічных арганізацый[27]. З вывадамі Іванова можна пагадзіцца, але трэба адзначыць, што рэаліі школьнага краязнаўства Беларусі былі некалькі іншымі. Пытанні, звязаныя з развіццём і станам *турысцка-краязнаўчай дзейнасці* ў школе, вывучалі В.М. Кулікоў[28],

---

[15] Краеведение: пособие для учителя / под ред. А.В. Доринского. – М.: Просвещение, 1987. – 156 с.; Краеведение и туризм: сб. ст. / под ред. А.В. Даринского. – Л.: Ленизадат, 1972. – 145 с.; Лярский, П.А. Пособие по краеведению / П.А. Лярский. – Минск: Высш. шк., 1966. – 239 с.; Матюшин, Г.Н. Историческое краеведение: учеб. пособие для исторических факультетов педагогических институтов по спец. № 2108 "История" / Г.Н. Матюшин. – М.: Просвещение, 1987. – 207 с.

[16] Кацюба, Д.В. Теория и практика исторического краеведения в школе и в вузе: автореф. дис. … д-ра пед. наук: 13.00.01 / Д.В. Кацюба; Челябин. гос. ун-т. – Челябинск, 1993. – 43 с.

[17] Мазбаев, О.Б. Подготовка будущих учителей к руководству туристко-краеведческой деятельностью со школьниками: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01; 13.00.02 / О.Б. Мазбаев; Казах. ин-т проблем. образования им. И. Алтынсарина. – Алматы, 1993. – 24 с.

[18] Смирнова, Л.В. Педагогическое краеведение как средство подготовки студентов к воспитательной работе в школе: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Л.В. Смирнова; Моск. гос. открытый пед. ин-т. – М., 1992. – 20 с.

[19] Тимошин, И.Р. Советское краеведение – важнейшее средства воспитания трудящихся на революционных традициях: дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / И.Р. Тимошин; Моск. гос. ун-т. – М., 1966. – 16 с.

[20] Бескоровайный, И.И. Школьное краеведение как средство повышения качества знаний / И.И. Бескоровайный. – М.: Просвещение, 1963. – 53 с.

[21] Гричихина, Е.Е. Опыт проведения производственно-исторических экскурсии / Е.Е. Гричихина – М.: Просвещение, 1959. – 23 с.

[22] Коцюба, Д.В. Краеведение в воспитании учащихся / Д.В. Коцюба. – М.: Просвещение, 1965. – 79 с.

[23] Лебедев, В.И. К вопросу о развитии учебного краеведения (на примере Пензенского края) / В.И. Лебедев // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики / Ін-т гіст. АН УССР; склад. Р.Т. Тронько. – Киев: Наукова думка, 1991. – С. 169–173.

[24] Литвин, А.Л. Краеведение в школе / А.Л. Литвин, Е.И. Устюжанин, Г.И. Хамитов. – Казань: Татар. книжн. изд-во, 1967. – 150 с.

[25] Милонов, Н.П. Изучение истории области в средней школе / Н.П. Милонов. – М.: Просвещение, 1960. – 83 с.

[26] Иванов, П.В. Основы школьного краеведения / П.В. Иванов. – Петрозаводск: Изд-во ПГУ, 1986. – 106 с.

[27] Тамсама. – С. 172–173.

[28] Куликов, В.М. Школьный туризм. Концепция с критическими оценками современного состояния (28 тезисов) [Электронны рэсурс] / В.М. Куликов // Вестн. детско-юношеского туризма в России. – 1997. – № 3(23) – 2002. – Рэжым доступу. – Дата доступу: 15.08.2005.

Репозиторий ВГУ

А.Г. Озераў[29], І.С. і В.І. Сяргеевы[30], Т.Б. Табарданава[31].

Краязнаўчая дзейнасць *школьных музеяў* стала прадметам даследавання А.Т. Топчага[32], Т.Н. Сурагі[33], Г.Ю. Элькіна і З.А. Агрызкі[34]. А.С. Жукоўскі разглядаў дзейнасць школьных музеяў баявой і рэвалюцыйнай славы[35]. Варта таксама адзначыць калектыўныя даследаванні і зборнікі артыкулаў, прысвечаныя вызначанай праблеме: "Исторические и краеведческие музеи СССР"[36] і "Новое в развитии исторического краеведения и регионального музееведения"[37]. Важныя звесткі пра развіццё школьных грамадскіх музеяў у СССР можна ўзяць з матэрыялаў канферэнцыі "Краеведение и музеи", якая адбылася ў 1991 г.[38].

Асобныя аспекты краязнаўства Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Эстоніі і іншых рэгіёнаў СССР вывучаліся дысертантамі С.Ш. Ахметавай[39], Б.В. Бельскім[40], Ю.З. Данілюк[41], В.С. Пракапчук[42]. В. Ярв у сваёй кнізе "Очерки по истории краеведения в Эстонии" прааналізаваў развіццё

---

[29] Озеров, А.Г. Система организации туристско-краеведческой деятельности учащихся России / А.Г. Озеров // Детско-юношеский туризм и краеведение в воспитании гражданственности и патриотизма, оздоровлении подрастающего поколения России: материалы науч.-практ. конф. – М.: ЦДЮТур РФ, 1998. – С. 3–33; Озеров, А.Г. Страницы истории туристско-краеведческой деятельности // "Отечество". Альманах. – 2001. – Вып. № 7. Издательство ЦДЮТиК МО РФ [Электронны рэсурс]. – М., 2004. – Рэжым доступу: http://kraevedenie.chat.ru/articls/ozr_hist.html. – Дата доступу: 11.06.2005.

[30] Сергеева, И.С. Краеведческая работа в школе / И.С. Сергеева, В.И. Сергеев. – М.: Акад. пед. наук СССР, 1974. – 134 с.

[31] Табарданова, Т.Б. Историческое краеведение в школе: метод. рекомендации Упр. образования Администации Ульян. обл. Ульян. ин-т повышения квалификации и переподготовки работников образования / Т.Б. Табарданова. – Ульяновск: Ульян. ин-т повышения квалификации и переподготовки работников образования, 2003. – 54 с.

[32] Топчий, А.Т. Историческое краеведение, туризм и музейное дело [Электронны рэсурс] / А.Т. Топчий. – 2002. – Рэжым доступу: http://hist.dcn-asu.ru/borod3/14-19.html. – Дата доступу: 12.03. 2005.

[33] Сураго, Т.Н. Экспозиция школьного музея во внекласной работе / Т.Н. Сураго // Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ ім. Я. Купалы; абл. аддзял. Беларус. добраахвотнага тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ. – С. 68–69.

[34] Элькин, Г.Ю. Школьные музеи: пособие для учителей / Г.Ю. Элькин, З.А. Огрызко. – М.: Просвещение, 1972. – 123 с.

[35] Жуковский, А.С. Школьный музей боевой и революционной славы / А.С. Жуковский. – Минск: Нар. асвета, 1973. – 136 с.

[36] Исторические и краеведческие музеи СССР: каталог / Центр. муз. рев. СССР; сост. Л.Н. Годунова. – М.: Наука и техника, 1988. – 540 с.

[37] Новое в развитии исторического краеведения и регионального музееведения: материалы межрегион. конф., Новокузнецк, 14–15 нояб. 2002 г. / НКГУ; редкол.: С.О. Шмидт (гл. ред.) [и др.]. – Новокузнецк: Кузнецкая крепость, 2003. – 156 с.

[38] Краеведение и музеи / сост.: Н.А. Гроссман, Л.И. Капуста. – Петрозаводск: Типография им. П.Ф. Анохина, 1992. – 198 с.

[39] Ахметова, С.Ш. Развитие исторического краеведения в Советском Казахстане: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / С.Ш. Ахметова; Алма-Атинский гос. ун-т. – Алма-Ата, 1981. – 16 с.; Ахметова, С.Ш. Историческое краеведение в Казахстане / С.Ш. Ахметова. – Алма-Ата: Казахстан, 1982. – 167 с.

[40] Бельский, Б.В. Историческое краеведение в школах Хакасии / Б.В. Бельский. – М.: Просвещение, 1973. – 16 с.

[41] Данилюк, Ю.З. Развитие общественных форм исторического краеведения на Украине (конец 50-х – 80-е годы) [Электронны рэсурс] / Ю.З. Данилюк. – Харьков, 1991. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/razvitie-obschestvennyh-form-istoricheskogo-kraevedeniya-na-ukraine-konets-50-h-80-e-gody.

[42] Прокопчук, В.С. Розвиток краэзнавства на Поділлі [Электронны рэсурс] / В.С. Прокопчук. – Київ, 1994. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/razvitie-kraevedeniya-na-podolie.



Рэпазіторый ВДУ

грамадскага накірунку гістарычнага краязнаўства Эстонскай ССР[43]. К.Й. Рачкаўскас у даследаванні “Краеведческое движение в Советской Литве (1961–1980)”[44] робіць вывад пра вядучую ролю Рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў развіцці краязнаўства ў Літоўскай ССР у акрэслены перыяд.

Вывучэнне гістарычнага краязнаўства СССР стала тэмай даследаванняў шэрагу расійскіх аўтараў у постсавецкі час. Перш за ўсё трэба вызначыць доктарскую дысертацыю Т.Д. Румінай “Эволюция краеведения в России в кон. XIX – XX веках”[45]. Каштоўнасць даследавання ў тым, што навукоўца зрабіла важныя вывады аб “маятнікападобным” развіцці краязнаўства, яго значнай ролі ў развіцці грамадскіх аб’яднанняў, залежнасці развіцця краязнаўства ад ідэалагічнай заангажаванасці кіруючых колаў і інш. Цікавыя высновы пра развіццё краязнаўства ў мегаполісе можна адшукаць у артыкуле даследчыцы, які прысвечаны маскоўскаму краязнаўству ў XIX–XX ст.[46].

Т.О. Размустава[47] ў працы “Гістарычныя мадэлі краязнаўства ў Расіі” прапануе абгрунтаваную перыядызацыю савецкага краязнаўства і сваё ўяўленне аб адпаведных асобным перыядам мадэлях гістарычнага краязнаўства ў СССР. Яна вызначае чатыры этапы развіцця гістарычнага краязнаўства ў Расіі і характарызуе мадэль развіцця гістарычнага краязнаўства ў 1960–1980-я гг. як музейную[48].

Расійскі даследчык В.А. Бердзінскіх у сваім артыкуле “Основные этапы развития краеведения в XX веке” характарызуе развіццё гістарычнага краязнаўства ў 1960–1980-я гады ў СССР, у тым ліку і Беларусі і адзначае ідэйную сувязь росквіту краязнаўства ў гэты перыяд з поглядамі “шасцідзясятнікаў”. Аўтар справядліва адзначае характэрны для таго часу інтарэс моладзі да ваенна-рэвалюцыйнай тэматыкі, важную ролю Усесаюзнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры[49]. Мы

Репозиторий ВГУ

[43] Ярв, В.-Р.Л. Очерки по истории краеведения в Эстонии / В.-Р.Л. Ярв. – Таллин: Книжная палата, 1971. – 123 с.

[44] Рачкаускас, К.Й. Краеведческое движение в Советской Литве (1961–1980): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / К.Й. Рачкаускас; ВГУ им. В. Капсукаса. – Вильнюс, 1986. – 20 с.

[45] Рюмина, Т.Д. Эволюция краеведения в России в кон. XIX–XX веках: на материалах Москвы: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.09 / Т.Д. Рюмина; Ист-арх. ин-т. – М., 1999. – 48 с.

[46] Рюмина, Т.Д. Московское краеведение в конце XIX–XX вв. как общественное явление / Т.Д. Рюмина // Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы всерос. науч.-практ. конф., Москва, 10–11 дек. 1998 г. / РГГУ; Ист-арх. ин-т; отв. ред. С.О. Шмидт. – М.: АНО ИЦ “Москвоведение”, 1999. – С. 232–237.

[47] Размустова, Т.О. Исторические модели краеведения в России / Т.О. Размустова // Современное состояние и перспективы развития краеведения в регионах России: материалы всерос. науч.-практ. конф. – М.: ЦДЮТур РФ, 1999. – С. 94–101.

[48] Размустова, Т.О. Социокультурный подход в преподавании краеведения в XX веке / Т.О. Размустова // Краеведение и преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях / сост.: В.Ф. Козлов, С.О. Шмидт. – М.: АНО ИЦ “Москвоведение”, 2002. – С. 54–59.

[49] Бердинских, В.А. Основные этапы развития краеведения в XX веке [Электронны рэсурс] / В.А. Бердинских // Рос. гос. гуманит. ун-т. – 2003. – Рэжым доступу: http://iai.rgu.ru/berd.htm. – Дата доступу: 15.08.2005.

згодныя з вывадамі навукоўца аб прычынах запаволенага (у параўнанні з 1920-мі гадамі) развіцця краязнаўства ў СССР, а менавіта – абмежаванне доступу даследчыкаў у дзяржаўныя архівы, немагчымасць друкаваць вынікі сваіх краязнаўчых даследаванняў, разрыў у ланцугу пакаленняў правінцыяльнай інтэлігенцыі і іншыя.

Цікавыя вывады пра ролю грамадскіх краязнаўчых музеяў у 2-й палове XX стагоддзя ў культуры правінцыі робіць даследчыца В.Г. Рыжэнка[50]. Выклікае цікавасць арыгінальная праца расійскай даследчыцы Г.А. Навумавай[51], у якой асвятляецца роля ленінскіх музеяў як гісторыка-краязнаўчых цэнтраў ў 60–80-я гады XX стагоддзя. Асобна трэба адзначыць працы В.Е. Туманава[52], у якіх даследуецца развіццё школьнага краязнаўства СССР і Расіі ў 2-й палове XX стагоддзя, разглядаюцца асноўныя аспекты, праблемы, дасягненні, дынаміка росту школьных музеяў СССР. Назавём і метадычны дапаможнік, прысвечаны арганізацыі школьнага краязнаўчага музею[53].

Звесткі па развіцці гістарычнага краязнаўства ў 60–80-я гады XX стагоддзя ў СССР можна адшукаць у даследаваннях С.І. Добранькага[54], В.П. Корзуна[55], Ю. Лексіна[56], А.В. Рэмізава[57]. Асобна адзначым аналітычныя артыкулы старшыні Расійскага саюза краязнаўцаў

Репозиторий ВГУ

[50] Рыженко, В.Г. Общественные музеи советской эпохи в культуре российской провинции [Электронны рэсурс] / В.Г. Рыженко. – Омск, 2003. – Рэжым доступу: http://www.ic.omskreg.ru/~cultsib/mus/rigenko.htm. – Дата доступу: 11.05.2005; Рыженко, В.Г. Методологическое и методическое наследие “Золотого десятилетия” и современность): материалы науч.-практ. конф., посвященной 75-летию Первого Восточно-Сибирского краеведческого съезда, Иркутск, 1925 [Электронны рэсурс]. – 2003. – Рэжым доступу: http://ifhs.irk.ru/rigenko1.html. – Дата доступу: 11.05.2005.

[51] Наумова, Г.А. Ленинские музеи как историко-краеведческие центры на рубеже веков / Г.А. Наумова // Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы всерос. науч.-практ. конф., Москва, 10–11 дек. 1998 г. / РГГУ; Ист.-археолог. ин-т; отв. ред. С.О. Шмидт. – М.: Книжная палата, 1999. – С. 265–268.

[52] Туманов, В.Е. Вехи краеведения / В.Е. Туманов // Источниковедение и краеведение в культуре России: сб. к 50-летию служения С.О. Шмидта ист.-арх. ин-ту; редкол.: В.Ф. Козлов (отв. ред.) [и др.]. – М.: РГГУ, 2000. – С. 348–350; Туманов, В.Е. Наследие в системе образования / В.Е. Туманов // Школьное краеведение: практический опыт, идеи. – М.: Книжная палата, 1995. – С. 67–69; Туманов, В.Е. Документальные памятники школьных музеев РСФСР. Организация выявления, учета и использования (1956–1985): автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / В.Е. Туманов; Ист-архив. ин-т. – М., 1994. – 18 с.; Туманов, В.Е. Школьное краеведение и исторические источники / В.Е. Туманов // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 174–177.

[53] Туманов, В.Е. Школьный музей: метод. пособие / В.Е. Туманов. – М.: ЦДЮТиК, 2003. – 154 с.

[54] Добренький, С.И. Рефлексия исторического краеведения и региональной истории в российской историографии конца XX – начала XXI века [Электронны рэсурс] / С.И. Добренький // Маск. гіст.-арх. ін-т. – 2004. – Рэжым доступу: http://iai.rgu.ru/dobr.htm. – Дата доступу: 15.08.2005.

[55] Корзун, В.П. Регионоведческие направления в деятельности исторических кафедр провинциальных университетов России / В.П. Корзун, В.Н. Рыженко // Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. / РГГУ; Ист.-арх. ин-т; сост.: С.О. Шмидт (гл. ред.) [и др.]. – С. 35–37.

[56] Лексин, Ю. Первый перелом: (беседа с С.О. Шмидтом, В.Ф. Козловым, С.Б. Филимоновым) / Ю. Лексин // Знание – сила. – 1988. – № 11. – С. 66–75.

[57] Ремизов, А.В. Омское краеведение 1930–1960-х годов: очерк истории / А.В. Ремизов. – Омск: Изд-во ОмГУ, 1998. – 89 с.

У.Ф. Казлова[58], прысвечаныя гісторыі і сучаснаму стану краязнаўства Расійскай Федэрацыі і сумежных краін.

Важнейшым укладам у распрацоўку гісторыі краязнаўства сталі выдадзеныя ў 1989–2004 гадах працы прызнанага аўтарытэта ў галіне гістарычнага краязнаўства, акадэміка Педагагічнай акадэміі Расіі С.О. Шмідта[59]. Даследчык стаў аўтарам першага вучэбнага дапаможніка ў постсавецкі перыяд па гістарычным краязнаўстве “Краеведение и документальные памятники”[60], дзе давалася і характарыстыка яго развіцця ў 60–80-я гг. XX ст. У абагульняльна-праграмных артыкулах навукоўцы разглядаецца гісторыя краязнаўства як грамадскага руху, даецца характарыстыка паняццяў “краязнаўства”, “гістарычнае краязнаўства”, адзначана іх комплекснасць, навуковасць, гістарызм. Вызначаецца таксама план дзейнасці па стварэнню гісторыі краязнаўства, які карысна ўжываць і ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы: падрыхтоўка акадэмічных даследаванняў гісторыі краязнаўства, работы па гісторыі краязнаўства асобных рэгіёнаў, краязнаўчых таварыстваў, музеяў і інш.

Станаўленне і развіццё пошукавага руху ў РСФСР у 1950–1990-я гады разглядае і ў сваіх артыкулах і манаграфіі С.І. Садоўнікаў[61]. Выключную цікавасць уяўляюць сабой дысертацыі расійскіх даследчыкаў, абароненыя ў апошнія дзесяцігоддзі і прысвечаныя розным аспектам і феноменам краязнаўства. Так, В.А. Катлярова ў сваім даследаванні вывучае ролю краязнаўства ў грамадскім жыцці правінцыяльнага цэнтра[62].

---

[58] Козлов, В.Ф. О роли современной краеведческой периодики в развитии краеведческого движения в регионах / В.Ф. Козлов // Провинциальная культура и краеведение: материалы IV Всерос. науч. конф., Пенза, 25–28 июня 2000 г. – Пенза: Обл. типография, 2001. – С. 106–110; Козлов, В.Ф. Региональная история России и сопредельных государств / В.Ф. Козлов // Преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях: сб. / сост. В.Ф. Козлов, С.О. Шмидт. – М.: АНО ИЦ “Москвоведение”, 2002. – С. 123–136.

[59] Шмидт, С.О. “Золотое десятилетие” советского краеведения / С.О. Шмидт // Отечество. Краеведческий альманах. – М.: Высш. шк., 1990. – Вып. 1. – С. 56–66; Шмидт, С.О. Вступительное слово [Электронны рэсурс] / С.О. Шмидт // Современное состояние и перспективы развития краеведения: материалы всерос. науч.-практ. конф. – 2004. – Рэжым доступу: http://kraevedenie.chat.ru/articls/ozr_hist.html. – Дата доступу: 10.10.2005; Шмидт, С.О. Краеведение и региональная история в современной России [Электронны рэсурс] / С.О. Шмидт // Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара; Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. – СПб.: Нотабене, 2000. – С. 14–15; Шмидт, С.О. К участникам регионал. науч.-практ. конф. “«Золотое десятилетие» иркутского краеведения: 1920-е годы” [Электронны рэсурс] / С.О. Шмидт. – 2003. – Рэжым доступу: http://ifhs.irk.ru/shmidt.html. – Дата доступу: 10.10.2005; Шмидт, С.О. История, современное состояние и перспективы развития краеведения / С.О. Шмидт // Краеведение в России: История. Современное состояние. Перспективы развития: материалы всерос. семинара краеведов “Любовь к малой родине – источник любви к Отчизне”, Зарайск, 30 янв. 2004 г. / Рос. гос. гуманит. ин-т. – М., 2004. – С. 11–30.

[60] Шмидт, С.О. Краеведение и документальные памятники: учеб. пособие / С.О. Шмидт. – Тверь: Книжное изд-во, 1992. – 86 с.

[61] Садовников, С.И. Становление и развитие поискового движения в России (1950–1990-е гг.) / С.И. Садовников // Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы Всерос. науч.-практ. конф., Москва, 10–11 дек. 1998 г. / РАПН; отв. ред. С.О. Шмидт. – М., 1999. – С. 82–88; Садовников, С.И. Поиск, ставший судьбой / С.И. Садовников; С.О. Шмидт (отв. ред.). – М.: Центр. Типография МО РФ, 2003. – 253 с.

[62] Котлярова, О.А. Елецкое краеведение в общественной жизни провинциального города в XIX–XX вв. [Электронны рэсурс] / О.А. Котлярова. – Елец, 2009. – Рэжым доступу:

Репозиторий ВГУ

А.З. Хакімава[63] і Ю.Ю. Каргін[64] разглядаюць ролю краязнаўства ў вывучэнні, ахове, папулярызацыі і выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны розных рэгіёнаў краіны. Ю.А. Меліхава[65] і І.П. Цуканаў[66] аналізуюць гісторыю пошукавага руху ў Расіі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. У дысертацыі Н.А. Сядзельнікава разглядае краязнаўства Расіі як сацыякультурны феномен[67]. Цікавая вывады аб культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў робіць даследчыца Д.Я. Озерава, аналізуючы дзейнасць у гэтых установах Расіі і Германіі ў 1971–2001 гг.[68].

Вялікую каштоўнасць для разумення тэарэтычных пытанняў гістарычнага краязнаўства, праблем, перспектываў, дынамікі яго развіцця ўяўляюць матэрыялы міжнародных канферэнцый па гістарычным краязнаўстве. У ходзе даследавання былі вывучаны матэрыялы міжнародных канферэнцый, семінараў, сімпозіумаў, зборнікі артыкулаў, прысвечаныя развіццю гістарычнага краязнаўства ў 1960–1980-я гады і на сучасным этапе[69]. Асаблівую цікавасць выклікаюць матэрыялы

---

http://cheloveknauka.com/dissearch?q=%D0%BA%D1%80%D0%B0%D0%B5%D0%B2%D0%B5%D0%B4%D0%B5%D0%BD%D0%B8%D0%B5.

[63] Хакимова, А.З. Роль краеведческой работы в изучении и популяризации историко-культурного наследия Татарстана в 1920–2000-е гг. [Электронны рэсурс] / А.З. Хакимова. – Казань, 2011. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/rol-kraevedcheskoy-raboty-v-izuchenii-i-populyarizatsii-istoriko-kulturnogo-naslediya-tatarstana-v-1920-2000-e-gg.

[64] Каргин, Ю.Ю. Деятельность государственных учреждений по охране, изучению, использованию археологического наследия на новостройках Нижнего Поволжья с 1945 по 1991 г. [Электронны рэсурс] / Ю.Ю. Каргин. – Саратов, 2009. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/deyatelnost-gosudarstvennyh-uchrezhdeniy-po-ohrane-izucheniyu-ispolzovaniyu-arheologicheskogo-naslediya-na-novostroykah-n.

[65] Мелихова, Ю.А. История молодежного поисково-краеведческого движения в России в 40-е – начале 90-х годов XX века [Электронны рэсурс] / Ю.А. Мелихова. – Курск, 2011. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/istoriya-molodezhnogo-poiskovo-kraevedcheskogo-dvizheniya-v-rossii-v-40-e-nachale-90-h-godov-xx-veka.

[66] Цуканов, И.П. История поискового движения в России в конце XX – начале XXI века [Электронны рэсурс] / И.П. Цуканов. – Курск, 2007. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/istoriya-poiskovogo-dvizheniya-v-rossii-v-kontse-xx-nachale-xxi-veka.

[67] Седельникова, Н.А. Областное краеведение как социокультурный феномен [Электронны рэсурс] / Н.А. Седельникова. – Омск, 2010. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/dissearch?q=%D0%BA%D1%80%D0%B0%D0%B5%D0%B2%D0%B5%D0%B4%D0%B5%D0%BD%D0%B8%D0%B5.

[68] Озерова, Д.Е. Культурно-образовательная деятельность исторических музеев в России и Германии, 1971–2001 гг. [Электронны рэсурс] / Д.Е. Озерова. – Ярославль, 2003. – Рэжым доступу: http://cheloveknauka.com/kulturno-obrazovatelnaya-deyatelnost-istoricheskih-muzeev-v-rossii-i-germanii-1971-2001-gg.

[69] Всеукраїнська конференція “Історичне краєзнавство у відродженні духовності, культури, багатовікових національних ...”, Луцьк, 28–30 верес. [Электронны рэсурс] // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn. – Дата доступу: 15.08.2005; Историческое краеведение в школе и вузе: материалы первой Всерос. науч. конф., Кемерово, 14–15 дек. 1994 г. / редкол., председ. Д.В. Кацуба [и др.]. – Кемерово: Обл. типография, 1994. – 243 с.; Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики / Ин-т ист. АН УССР; сост. Р.Т. Тронько. – Киев: Наук. думка, 1991. – 275 с.; Історичне краезнавство в Украіньскій РСР / Ін-т гіст. АН УССР; склад. Р.Т. Тронько. – Київ: Наук. думка, 1989. – 237 с.; Источниковедение и краеведение в культуре России: сб. к 50-летию служения С.О. Шмидта ист.-арх. ин-ту; редкол.: В.Ф. Козлов (отв. ред.) [и др.]. – М.: РГГУ, 2000. – 519 с.; Краеведение в духовно-нравственном развитии личности: тезисы докладов Рос. науч.-метод. конф., Рязань, 25 марта 1999. / РАПН; РГУ. – Рязань: Обл. типография, 1999. – 180 с.; Краеведение в России: История. Современное состояние. Перспективы развития: материалы всерос. семинара краеведов “Любовь к малой родине – источник любви к Отчизне”, Зарайск, 30 янв. 2004 г. / отв. ред. С.О. Шмидт



Репозиторий ВГУ

канферэнцыі “Краеведение в России”[70], якая прайшла ў Парыжы, што сведчыць пра вялікую цікавасць да гістарычнага краязнаўства Расіі і СССР[71]. На працягу 2006–2016 гг. у Гісторыка-архіўным інстытуце Расійскага гуманітарнага ўніверсітэта праводзяцца Усерасійскія краязнаўчыя канферэнцыі. Па выніках кожнай з канферэнцый выдадзены зборнік артыкулаў[72]. Шэраг з іх змяшчаюць цікавую інфармацыю, якая мае пэўнае дачыненне да тэмы нашага даследавання.

Прафесар Прынстанскага ўніверсітэта С. Коткін у артыкуле “О краеведении и его методологии”, разглядаючы метадалогію гістарычнага краязнаўства, аналізуе яго на прыкладах Германіі, Расіі і Савецкага Саюза[73]. Даследуючы краязнаўства СССР, Коткін робіць важны вывад, з якім, на нашу думку, можна пагадзіцца: “Пасля рэпрэсій 1930-х гадоў краязнаўства цалкам ніколі не знікала і пасля вайны пачало жыць новым жыццём. Пры Хрушчове на яго паўплывала развянчанне культу асобы, пры Брэжневе – культурны нацыяналізм, звязаны з некаторымі «тоўстымі» маскоўскімі часопісамі правага напрамку. Пасля 1991 года краязнаўства, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, перажывае небывалы росквіт”[74].

Пры падрыхтоўцы дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваліся працы **украінскіх навукоўцаў.** Развіццё гістарычнага краязнаўства гэтай краіны ў другой палове ХХ ст. мела шмат агульнага з беларускім:

---

[и др.]. – М.: АНО ИЦ “Москвоведение”, 2004. – 304 с.; Краеведение и музеи / сост.: Н.А. Гроссман, Л.И. Капуста. – Петрозаводск: Типография им. П.Ф. Анохина. 1992. – 198 с.; Краеведение и туризм: сб. ст. / под ред. А.В. Даринского. – Л.: Лениздат, 1972. – 145 с.; Краеведение и уроки истории: сб. ст. – Л.: Лениздат, 1967. – 106 с.; Краеведение и школа: тезисы и доклады и областной конференции по школьному краеведению, Курган, 25 марта 1974 г. / Педагогическое общество РСФСР; ред.-сост. М.Д. Янко. – Курган, 1973. – 59 с.; Краеведение – основа духовного и нравственного возрождения общества: материалы международной науч.-практ. конф., Гомель, 10–11 дек. 1997 г. / Гомел. обл. б-ка; отв. за выпуск В.П. Дуброва. – Гомель: Типография “Сож”, 1997. – 104 с.; Краеведческая работа в начальных классах: сб. ст. / сост. И.В. Соколова. – М.: Просвещение, 1977. – 224 с.; Краеведческая работа в школе: тезисы и доклады по проблемам краеведения и охраны окружающей среды в работе школы и педвузов, Москва, окт. 1974 г. – Ч. 1 / редкол. И.Д. Зверев (отв. ред.) [и др.] – 134 с.; Ч. 2. / редкол.: И.С. Матрусов (отв. ред.) [и др.] – 107 с. – М.: Высш. шк., 1974.; Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. / редкол. С.О. Шмидт (гл. ред.). [и др.] – СПб.: Нотабене, 2000. – 230 с.; Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы всерос. науч.-практ. конф., Москва, 10–11 дек. 1998 г. / Рос. гос. гуманит. ун-т; редкол.: С.О. Шмидт (отв. ред.). – М.: АНО ИЦ Москвоведение, 1999. – 316 с.

[70] Краеведение в России: истоки, проблемы, возрождение: междунар. науч. конф., Сорбонна, 2000 [Электронны рэсурс]. – 2001. – Рэжым доступу: http:/www.memo.ru/about/bull/b24/32.html. – Дата доступу: 15.08.2005.

[71] Фролов, А.И. Российское краеведение в Париже. Сорбонна, 3–5 мая 2000 г. / А.И. Фролов // Вестн. архивиста. – 2000. – № 5–6 (59–60). – С. 267–269.

[72] Первые Всероссийские краеведческие чтения. Итоги и перспективы развития краеведения и Москвоведения (Москва, 15–17 апр. 2007 г.). – М.: ИЦ “Москвоведения”, ОАО “Московские учебники”, 2009. – 543 с.; Третьи всероссийские краеведческие чтения (Москва–Коломна, 22–23 июня 2009 г.). / отв. ред. В.Ф. Козлов. – М.: АНО ИЦ «Москвоведение»; ОАО «Московские учебники», 2009. – 543 с.; Пятые всероссийские краеведческие чтения (Москва–Владимир, 27–28 мая 2011 г.) / отв. ред. В.Ф. Козлов, сост. А.Г. Смирнова. – М.: Изд. центр «Краеведение», 2012. – 534 с.

[73] Коткин, С. О краеведении и его методологии / С. Коткин // Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. / РГГУ; Ист.-арх. ин-т; сост.: С.О. Шмидт (гл. ред.) [и др.]. – СПб.: Нотабене, 2000. – С. 16–22.

[74] Тамсама. – С. 21.



Репозиторий ВГУ

агульныя падзеі сацыяльна-палітычнага жыцця, нацыянальнае адраджэнне, развіццё гістарычнага краязнаўства і інш. Таму цікавасць выклікаюць даследаванні О.Г. Бажан[75], Ю.З. Данілюк[76], Л.І. Еўсялеўскага[77], Д.П. Краўца[78], В.Ф. Паўлухінай[79], О.В. Саўчука[80], П.Т. Тронько[81], Л.Д. Фёдарава[82], І.І. Ярмошыка[83].

**<u>Другую групу</u>** даследаванняў, прысвечаных вывучэнню развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі, складаюць працы беларускіх навукоўцаў. У айчыннай гістарыяграфіі вылучаюцца два этапы: *першы* (з пачатку 1960 і да сярэдзіны 1980-х гадоў) і *другі* (сярэдзіна 80-х гадоў XX ст. – пачатак XXI ст.).

З пачатку 1960-х і да сярэдзіны 1980-х гадоў гістарычны накірунак грамадскага краязнаўства Беларусі, амаль не вывучаўся айчыннымі даследчыкамі. Развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1970-я гады ў асноўных рысах было асветлена ў вучэбным дапаможніку “Историческое краеведение Белоруссии”[84]. Аўтары прапанавалі сваё разуменне краязнаўства і яго мэтаў у грамадскім жыцці. У асобным раздзеле прааналізаваны асноўныя напрамкі развіцця гістарычнага краязнаўства. Аднак, даследчыкі хоць і акрэслілі галоўныя пытанні краязнаўчай працы ў Беларусі, асноўную ўвагу надалі вучэбнаму матэрыялу.

Шырокую вядомасць у 1960–1980-я гады атрымала праца прафесара Я.Н. Мараша “Студенческий научно-исследовательский кружок”. На аснове вопыту дзейнасці такога гуртка ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце вучоны пераканаўча даказвае, што гісторыка-краязнаўчы

---

[75] Бажан, О.Г. Культурні ініціативи українських дисидентів по збереженню національної культурної спадщини в 60–80-х рр. [Электронны рэсурс] / О.Г. Бажан // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/07.html. – Дата доступу: 21.09.2005.

[76] Данилюк, Ю.З. Общественные формы охраны памятников истории Украины на современном этапе / Ю.З. Данилюк // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики / Ин-т ист. АН УССР; сост. Р.Т. Тронько. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 242–246.

[77] Евселевский, Л.И. Некоторые итоги и задачи изучения истории промышленных предприятий Украины / Л.И. Евселевский // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики / Ин-т ист. АН УССР; сост. Р.Т. Тронько. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 218–220.

[78] Кравець, Д.П. Розвиток історичного краєзнавства у Бахмутському Краї [Электронны рэсурс] / Д.П. Кравець, С.Й. Татаринов // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/12.html. – Дата доступу: 15.08.2005.

[79] Павлухіна, В.Ф. Основні етапи розвитку історичного краєзнавства на Донеччині [Электронны рэсурс] / В.Ф. Павлухіна // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/24.html. – Дата доступу: 11.06. 2005.

[80] Савчук, О.В. Поєднання наукових і громадських форм дослідження рідного краю у процесі краєзнавчої роботи в Україні (друга половина 50–80 рр.) [Электронны рэсурс] / О.В. Савчук // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/32.html. – Дата доступу: 11.05.2005.

[81] Тронько, П.Т. Развитие исторического краеведения на Украине / П.Т. Тронько // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 8–15.

[82] Федорова, Л.Д. Енциклопедія краєзнавства України: постановка проблеми [Электронны рэсурс] / Л.Д. Федорова. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/40.html. – Дата доступу: 09.10.2005.

[83] Ярмошик, І.І. Волинь в історико-краєзнавчих дослідженнях XIX–XX століть: авторэф. дис. ... канд. іст. наук: 07.00.06 / І. Ярмошик; Житомирський інженерно-технологічний ін-т. – Житомир, 1998. – 28 с.

[84] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.

Репозиторий ВГУ

гурток ВНУ з’яўляецца “базай для ўзнікнення багатых даследчыцкіх калектыўных інтарэсаў па вывучэнню мясцовай гісторыі”[85]. Навуковец адзначае, што для паспяховага правядзення лакальных даследаванняў трэба таксама сумесныя намаганні ВНУ і грамадскіх аб’яднанняў (у першую чаргу, таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры). Метадычныя парады для пачынаючых навукоўцаў змяшчае іншая праца гродзенскага даследчыка “Методические рекомендации учителю-стажеру по сбору краеведческого материала”[86].

Пачынаючы з другой паловы 80-х гадоў XX ст. краязнаўчая тэматыка пачынае прыцягваць увагу значнай колькасці даследчыкаў. Працы *другога* перыяду адрозніваюцца ад работ папярэдніх гадоў адсутнасцю старых ідэалагічных клішэ, больш аб’ектыўным поглядам на прадмет даследавання. У той жа час у дачыненні да развіцця гістарычнага краязнаўства работы носяць ці апісальны, ці лакальны характар і не даюць комплекснага бачання праблемы.

Інфармацыя аб развіцці грамадскага краязнаўства Беларусі ў пасляваенны час утрымліваюцца ў энцыклапедычных выданнях, прысвечаных гісторыі Беларусі: “Энцыклапедыя гісторыі Беларусі”[87], “Этнаграфія Беларусі”[88], “Беларускі фальклор”[89]. У іх змяшчаюцца кароткія звесткі пра асаблівасці развіцця краязнаўства ў гэты перыяд, акрэслены задачы краязнаўчых арганізацый на новым этапе развіцця краязнаўчага руху краіны (з другой паловы 80-х гг. XX ст.), прыводзіцца невялікі спіс краязнаўцаў-аматараў, якія вывучалі гісторыю і культуру пэўных рэгіёнаў Беларусі ў 60–90-я гады XX ст.

У працах беларускіх вучоных гэтага перыяду, у якіх можна адшукаць пэўныя звесткі па вывучаемай праблеме, перш за ўсё, адзначым работы Э.М. Загарульскага[90], А.В. Прадзеінай[91], А. Смаляніча[92], дзе аўтары звяртаюцца да *гісторыі краязнаўства Беларусі*.

З аўтарскіх даследаванняў гэтага часу выдзелім працы Г.А. Каханоўскага, навукоўца, намаганнямі якога было створана Беларускае краязнаўчае таварыства (1989). У шэрагу артыкулаў

[85] Мараш, Я.Н. Студенческий научно-исследовательский кружок / Я.Н. Мараш. – Минск: Наука и техника, 1976. – С. 117.
[86] Мараш, Я.Н. Методические рекомендации учителю-стажеру по сбору краеведческого материала (досоветский период) / Я.Н. Мараш. – Гродно: ГОУТ, 1988. – 23 с.
[87] Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260.
[88] Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.
[89] Півавар, М.В. Краязнаўства / М.В. Півавар // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 719–721.
[90] Загарульскі, Э. Краязнаўства ўчора і сёння / Э. Загарульскі // Спадчына. – 1989. – № 2. – С. 11–13.
[91] Прадзеіна, А. Абуджаць гістарычную рамантыку / А. Прадзеіна // Беларус. мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 30–32.
[92] Смаляніч, А. Гістарычнае краязнаўства: праблемы і перспектывы / А. Смаляніч // Беларус. мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 61.

Репозиторий ВГУ

даследчыка можна знайсці цікавыя звесткі па развіццю гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 1960–1980-я гады, асноўныя набыткі і дасягненні, праблемы якія заміналі арганізацыйнаму афармленню грамадскага краязнаўчага руху ў краіне[93].

Сувязь гістарычнага краязнаўства і *архіўнай справы* аналізуецца ў працы М.Ф. Шумейкі "Роль исторического краеведения в Беларуси в подготовке архивистов республики"[94], К.П. Батраковай[95], А. Карлюкевіча[96].

Пэўная ўвага ў беларускай гістарыяграфіі ўдзялялася праблемам *краязнаўчай дзейнасці музеяў Беларусі*. Напрыклад, А.М. Калбаска ў некаторых сваіх артыкулах[97] і дысертацыі[98] разглядае развіццё музейнай справы ў 1970–1980-я гады, робіць важныя вывады аб вялікай ролі не толькі дзяржаўных, але і грамадскіх краязнаўчых музеяў у лакальных даследаваннях Беларусі.

А.А. Гужалоўскі ў манаграфіі "Музеі Беларусі (1941–1991 гг.")[99] разглядае лёс беларускіх музейных калекцый у гады вайны, узнаўленне музейнай сеткі ў пасляваенны час, развіццё музейнай справы да распаду СССР у 1991 г. Аналізуецца стан дзяржаўных музеяў, а асобны раздзел прысвечаны і развіццю грамадскіх і школьных музеяў. Можна пагадзіцца з меркаваннем даследчыка аб тым, што агульнае пашырэнне музейнай дзейнасці ў 1960–1980-я гады было вынікам узрастання грамадскай актыўнасці і цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны. Грамадскія музеі ў вывучаемы час былі своеасаблівымі клубамі, якія аб'ядноўвалі людзей па інтарэсах і давалі магчымасць праявіць і рэалізаваць свае здольнасці.

Праца В. Курылёнак непасрэдна прысвечана станаўленню асветніцкай работы музеяў Беларусі[100]. Але праблема разглядаецца ў

[93] Каханоўскі, Г.А. Вандраванні / Г.А. Каханоўскі // Маладосць. – 1984. – № 10. – С. 43; Каханоўскі, Г.А. Краязнаўства – клопат многіх / Г.А. Каханоўскі // ЛіМ. – 1988. – 22 крас. – С. 13; Каханоўскі, Г.А. Ніва нашага патрыятызму / Г.А. Каханоўскі // ЛіМ. – 1990. – 19 кастр. – С. 4, 5, 7; Каханоўскі, Г.А. Збіраць, ахоўваць, вывучаць / Г.А. Каханоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1983. – № 4. – С. 35–37.

[94] Шумейко, М.Ф. Роль исторического краеведения в Беларуси в подготовке архивистов республики / М.Ф. Шумейко // Преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях: сб. / сост.: В.Ф. Козлов, С.О. Шмидт. – М.: АНО ИЦ "Москвоведение", 2002. – С. 118–124.

[95] Батракова, К.П. Основные направления краеведческой работы в ЦГИА БССР в г. Гродно / К.П. Батракова // Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ ім. Я. Купалы; абл. аддзяленне Беларус. добраахвотнага тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ. – С. 54–56.

[96] Карлюкевіч, А. Знойдзенае і … згубленае? / А. Карлюкевіч // "Весн. архівіста". Беларускі археаграфічны штогоднік / рэдкал.: Р.П. Платонаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелНДІДАС, 2000. – Вып. 1 – С. 92–97; Карлюкевіч, А. Краязнаўства / А. Карлюкевіч // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 2.

[97] Калбаска, А.М. Агляд развіцця музейнай справы ў Беларусі (1971–1985) / Калбаска, А.М. // Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць. Музейныя сшыткі: навук.-метад. зб. – Мінск: БелІПК, 1998. – С. 52–57.

[98] Колбаско, А.Н. Деятельность музеев Белорусской ССР по воспитанию трудящихся на патриотических и трудовых традициях белорусского народа. 1917–1985 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук / А.Н. Колбаско; МГПИ им. М. Горького. – Минск, 1990. – 20 с.

[99] Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2004. – 218 с.

[100] Курылёнак, В. Станаўленне асветніцкай работы музеяў на Беларусі / В. Курылёнак // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2003. – № 3. – С. 56–59.

Репозиторий ВГУ

шырокіх храналагічных рамках і гэтага перыяду прысвечаны толькі невялікі матэрыял.

Уяўленне аб краязнаўчай працы Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея дае артыкул В.М. Царук "Хроніка музея за 80 гадоў"[101]. Мэтазгодна, на нашу думку, адзначыць зборнік матэрыялаў канферэнцыі "Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства" (1990), які змяшчае цікавыя звесткі аб стане, задачах, перспектывах даследаванняў дзяржаўных, грамадскіх краязнаўчых музеяў[102]. Пэўныя звесткі аб правядзенні рэгіянальных даследаванняў можна ўзяць з выдання "Музей старажытнабеларускай культуры"[103]. У выданні "Музеі Беларусі"[104] змешчана інфармацыя аб музеях сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікамі аддзела краязнаўства і беларусазнаўства Віцебскага абласнога аб'яднання пазашкольнай працы падрыхтаваны і выдадзены даведнік "Музеі школ і ПТВ Віцебскай вобласці"[105].

Ролі краязнаўства ў *ахове помнікаў гісторыі і культуры* прысвечаны работы Л.М. Несцярчука, С. Самуэль[106], Г.А. Саўчанкі[107]. Л.М. Несцярчук у манаграфіі "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, заканадаўчая база, сучасны стан і перспектывы" прааналізаваў развіццё гістарычнага краязнаўства ў XIX–XX стагоддзях у кантэксце вывучэння аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі[108]. Даследчык прыводзіць дэфініцыю дзейнасці па ахове помнікаў гісторыі і культуры, якая вельмі трапна паказвае арганічную сувязь з краязнаўствам. Л.М. Несцярчук адзначыў важную ролю навукова-метадычнага бюлетэня "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" ў развіцці гістарычнага краязнаўства.

У сваім даследаванні аўтар прыйшоў да высновы, што ў канцы 1980-х гадоў узнікла новая хваля адраджэння беларускага краязнаўства. Важную ролю ў ім адыграла стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства. Аднак пагадзіцца з некаторымі вывадамі Л.М. Несцярчука можна толькі ўмоўна. Так, аўтар лічыць, што "адроджаны краязнаўчы рух

---

101 Царук, В.М. Хроніка музея за 80 гадоў (1920–2000) / В.М. Царук, Л.В., Фёдарава // Краязнаўчыя запіскі / уклад. В.М. Царук. – Гродна: ГАУПП "Гродз. друкарня", 2003. – Вып. 6: Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей – С. 83–182.

102 Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ імя Я. Купалы; абл. аддзяленне Беларус. добраахвотнага. тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ. – 100 с.

103 Музей старажытнабеларускай культуры / НАН Беларусі; Ін-т мастацтвазн., этнаграфии і фальклору імя К. Крапівы; рэд. В.О. Шматаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 236 с.

104 Музеі Беларусі = Museum Belarus: Інфармацыя аб музеях сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь / склад. А.Б. Сташкевіч [і інш.]. – Минск: Беларусь, 2001. – 272 с.

105 Музеі школ і ПТВ Віцебскай вобласці: даведнік / склад. А.В. Куржалаў. – Віцебск: Друкарня імя Камінтэрна, 1995. – 95 с.

106 Самуэль, С. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / С. Самуэль // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 429.

107 Саўчанка, Г.А. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры / Г.А. Саўчанка // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 81.

108 Несцярчук, Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 286 с.



Репозиторий ВГУ

Беларусі трымаўся амаль ці не поўнасцю на самаадданасці і энтузіязме Г.А. Каханоўскага і пасля заўчаснай смерці вучонага быў прыпынены”[109]. З адыходам з жыцця Г.А. Каханоўскага, роля якога ў Беларускім краязнаўчым таварыстве была сапраўды вялікай, дзейнасць арганізацыі працягвалася, а прычын, якія замарудзілі яе працу, было значна больш. Акрамя гэтага, падзеі 1990-х гадоў і пачатку XXI стагоддзя не даюць падставы лічыць, што “краязнаўчы рух быў прыпынены”.

Аб удзеле ў падрыхтоўцы спецыялістамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР “Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” змяшчаецца цікавая інфармацыя ў артыкуле І. Гатоўчыц[110].

Некаторыя аспекты развіцця *пошукавага руху* ў СССР і Беларусі і яго сувязь з краязнаўствам раскрылі ў сваіх артыкулах С. Бяспанскі[111], С.С. Кацэвіч[112], В.Э. Шомадзі[113]. Аўтары даюць высокую адзнаку пошукаваму руху, адзначаюць пры гэтым пэўныя складанасці яго развіцця з прычыны неадназначнага стаўлення да яго з боку дзяржавы. Цікавы фактычны матэрыял пра развіццё пошукавага руху Беларусі ў канцы XX ст. можна пачэрпнуць з кнігі Л.Н. Бруевай “Пока не похоронен последний солдат”[114], А. Трапезнікавай “Мы ищем на земле ровесников следы…”[115], А. Бурдо “Не предай забвению!”[116].

Выдатным краязнаўчым помнікам нашай краіны з’яўляюцца *гісторыка-дакументальныя хронікі “Памяць” гарадоў і раёнаў Беларусі*. У іх маюцца раздзелы, прысвечаныя гісторыі вывучэнню роднага краю, утрымліваецца інфармацыя пра краязнаўцаў, іх асноўныя працы. Важным помнікам свайго часу, у якім даецца кароткая характарыстыка рэгіянальнага краязнаўства, а таксама крыніцай, якая дае магчымасць зразумець кантэкст эпохі, стан гістарычнай навукі і краязнаўства на мяжы стагоддзяў, з’яўляюцца “Рэкамендацыі па напісанню кніг «Памяць»”[117].

[109] Несцярчук, Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – С. 186.
[110] Гатоўчыц, І. Спакоранасць перад талентам / І. Гатоўчыц // Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв’ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. – Мінск: Маст. літ., 2005. – С. 69–77.
[111] Бяспанскі, С. Да гісторыі пошукавага руху на Магілёўшчыне / С. Бяспанскі // Магілёўская даўніна / рэдкал.: А. Агееў [і інш.]. – Магілёў: УПКП “Магілёўская ўзбуйненая друкарня”, 2001. – С. 133–139; Бяспанскі, С. Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Беларусі (восень 1943 г. – вясна 1944 г.) / С. Бяспанскі // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 1. – С. 24–28.
[112] Коцевич, С.С. Красные следопыты / С.С. Коцевич. – Минск: Беларусь, 1976. – 65 с.
[113] Шомоди, В.Э. Из истории поискового движения / В.Э. Шомоди // Детский туризм и краеведение Беларуси / авт.-сост.: С.С. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 85–90.
[114] Бруева, Л. Пока не похоронен последний солдат (из истории поискового движения в Витебской области): справоч. издание / Л. Бруева. – Орша: Оршан. типография, 2009. – 496 с.
[115] Трапезникова, Е. Мы ищем на земле ровесников следы… / Е. Трапезникова. – Полоцк: Издатель А.И. Судник, 2008. – 171 с.
[116] Бурдо, А. Не предай забвению! Малоизвестные страницы войны (из опыта поисковой работы) / А. Бурдо. – Витебск: Диджитал-экспресс, 2008. – 90 с.
[117] Дадатковыя рэкамендацыі па збору матэрыялаў і напісанню гісторыка-дакументальных кніг “Памяць”. – Мінск: МП “Белтэст”, 1992. – 69 с.



Рэпазіторый ВДУ

Працэс стварэння ў Беларусі такіх хронік прааналізавалі ў сваіх артыкулах У.В. Лемяшонак[118], М.У. Пішчулёнак[119], В.У. Скалабан[120].

Інфармацыю аб *рэгіянальных асаблівасцях* развіцця гістарычнага *краязнаўства* Беларусі з сярэдзіны 1980 – да пачатку 1990-х гадоў можна знайсці ў працах М.В. Гаравога[121], А. Екадумава[122], М.А. Ткачова[123], В. Жылко[124], В. Задаля[125], А.І. Марзалюка[126], Э. Смулковай[127], І.Г. Шпырковай[128] і іншых выданнях[129]. Гэтыя даследаванні багатыя факталагічным матэрыялам, адлюстроўваюць асноўныя тэндэнцыі, якія мелі месца ў Беларусі з канца 1980-х гадоў да атрымання незалежнасці.

О.Л. Дзенісюк у працы "Неформальные объединения, общественно-политические движения, партии в СССР: предпосылки, становление, развитие" ў асобным раздзеле аналізуе фарміраванне новых самадзейных нефармальных аб'яднанняў "Майстроўня", "Талака", "Тутэйшыя" і іншых у сярэдзіне – канцы 1980-х гадоў[130].

З комплексу прац айчынных даследчыкаў можна вылучыць некаторыя з іх, што ўтрымліваюць звесткі аб жыцці і дзейнасці

---

[118] Лемяшонак, У.В. Архіўная дакументалістыка ў выданні хроніка-дакументальнай кнігі «Памяць»: магчымасці і стан [Электронны рэсурс] / У.В. Лемяшонак. – 2003. – Рэжым доступу: http://vestnik.rsuh.ru/51/hr51.htm. – Дата доступу: 15.07.2005; Лемешонок, В.И. Отражение судьбы советских военнопленных в историко-документальной хронике "Память" / В.И. Лемешонок // Трагедия войны: фронт и плен: сб. материалов науч. конф. – Минск, 1995. – С. 110.

[119] Пішчулёнак, М.У. Архіўная дакументалістыка ў выданні хроніка-дакументальнай кнігі "Памяць": магчымасці і стан [Электронны рэсурс] / М.У. Пішчулёнак. – 2003. – Рэжым доступу: http://vestnik.rsuh.ru/51/hr51.html. – Дата доступу: 11.05.2005.

[120] Скалабан, В. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць": эвалюцыя краязнаўчага выдання / В. Скалабан // Студії з архівної справи та документознавства / Дзержкомархів України; УНДІАСД; рэдкол.: І.Б. Матяш (гол. ред.) [та ін.]. – К., 2003. – Т. 10. – С. 187–189.

[121] Гаравы, М. Ад пошукавай работы да краязнаўчага цэнтра / М. Гаравы // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 1. – С. 69–75.

[122] Екадумаў, А. Культурныя рэаліі беларуска-расійскай інтэграцыі. / А. Екадумаў // Беларуска-расійская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы. – Мінск: УП "Выдавецтва «Энцыклапедыкс»", 2002. – С. 173–221.

[123] Ткачоў, М. Паходня: кн. публіцыстыкі / М. Ткачоў; рэд.-склад. С.П. Самуэль. – Мінск: БелЭн, 1994. – 288 с.

[124] Жылко, В. Краязнаўства ў Лунінецкім раёне / В. Жылко // Загароддзе-2: Палессе – скрыжаванне культур і часу: матэрыялы навук.-краязн. канф., Пінск, 25–27 верас. 1999 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўскі [і інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2000. – С. 185–188.

[125] Задаль, В. Традыцыі і сёння гродзенскага краязнаўства / В. Задаль // Краязн. газ. – 2005. – № 11, сак. – С. 5.

[126] Марзалюк, А. Краязнаўства ў Краснаполлі / А. Марзалюк // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 9. – С. 70–74; Марзалюк, А. Незабыўныя дні / А. Марзалюк // Краязн. газ. – 2004. – № 12(29), сак. – С. 4.

[127] Смулкова, Э. Заключнае слова / Э. Смулкова // Загароддзе-2: Палессе – скрыжаванне культур і часу: матэрыялы навук.-краязн. канф., Пінск, 25–27 верас. 1999 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўскі [і інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2000. – С. 189–190.

[128] Шпыркова, И.Г. Общественные музеи Слонимщины / И.Г. Шпыркова // Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ імя Я. Купалы; абл. аддзяленне. Беларус. добраахвотнага тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ, 1990. – С. 67–68.

[129] Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсы людзей: матэрыялы навук.-практ. краязн. канф., Ваўкавыск, 22 сн. 1995 г. / ГрДУ імя Я. Купалы; склад. І.П. Крэнь (гал. рэд.). – Ваўкавыск: Гродз. друк. 1997. – 246 с.; З гісторыі вякоў і пакаленняў Іўеўскага краю: зб. матэрыялаў / рэд. І.П. Крэнь [і інш.]. Гродна: Гродз. абл. друкарня, 1999. – 123 с.

[130] Денисюк, О.Л. Неформальные объединения, общественно-политические движения, партии в СССР: предпосылки, становление, развитие (1985–1991) / О.Л. Денисюк. – Минск: БГУ, 2003. – 296 с.

Рэпазіторый ВДУ

*краязнаўцаў-аматараў*, якія працавалі ў другой палове XX ст. Прыгадаем работы Л. Кулажанкі[131], М. Маліноўскага[132], А.М. Пяткевіча[133], В.У. Скалабана[134], А. Пугач[135]. Сюды ж далучым матэрыялы канферэнцый прысвечаных гэтай тэме[136].

У апошні час значна ўзрасла колькасць артыкулаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці найлепшых краязнаўцаў краіны: А. Белакозу[137], І.П. Драўніцкаму[138], Э.С. Корзуну[139], М.С. Лапеху[140], А.М. Мартынаву[141], А.С. Палубінскаму[142], М.Ф. Петрыкевічу[143], Р.В. Родчанку[144], І.І. Стаброўскаму, У.А. Урбановічу[145], І.І. Філіповічу[146], А. Цыхуну[147] і іншым. Краязнаўцам Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. прысвечаны біябібліяграфічны слоўнік М.В. Півавара[148], магілёўскім краязнаўцам – даведнік “Даследчыкі роднага краю”, распрацаваны ў Магілёўскай абласной універсальнай бібліятэцы[149].

---

[131] Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязн. даведнік: дапаможнік для настаўнікаў: у 3 кн. / Л. Кулажанка. – Мінск: БелЭн, 2000. – Кн. 1: Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці. – 286 с.

[132] Маліноўскі, М. Аляксей Пяткевіч. Людзі культуры з Гродзеншчыны / М. Маліноўскі // Кантакты і дыялогі. – 2001. – № 2–3. – С. 40–41.

[133] Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік / А. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 356 с.

[134] Скалабан, В. Ствараецца даведнік “Беларускія краязнаўцы” / В. Скалабан // Кантакты і дыялогі. – 2001. – № 1. – С. 28–30; Скалабан, В. 65-годдзе з дня нараджэння Генадзя Каханоўскага / В. Скалабан // Кантакты і дыялогі. – 2001. – № 1. – С. 30; Скалабан, В. Сучасныя беларускія краязнаўцы / В. Скалабан // Краязн. газ. – 2005. – № 11, сак. – С. 2; – № 12, сак. – С. 2.

[135] Пугач, А. Старэйшына краязнаўчага цэху Магілёўшчыны / А. Пугач // Краязн. газ. – 2006. – № 4, студз. – С. 6.

[136] Славутыя людзі Воранаўшчыны: матэрыялы навук.-практ. канф., Гродна / рэд. І.П. Крэнь [і інш.]. – Гродна: Гродз. абл. друкарня, 1994. – 67 с.

[137] Жыццё і прыгоды Алеся Белакоза [Электронны рэсурс] // АДВЕЧНАЕ. – Рэжым доступу: http://belarus.kulichki.net/index.php?option=com_content&task=view&id=902&Itemid=71&limit=1&limitstart=5.

[138] Высоцкі, А. Іван Драўніцкі: “Родная мова як паветра, як зямля, як маці” [Электронны рэсурс] / А. Высоцкі // Рэгіянал. газ. – Рэжым доступу: http://www.rh.by/by/238/10/7246/. – Дата доступу: 12.09.2015.

[139] Лабуніна, В. Стваральнік музея і яго прадаўжальнік / В. Лабуніна // Краязн. газ. – 2012. – № 8, люты. – С. 3; Жалкоўскі, А. Імя краязнаўцы – яго музею [Электронны рэсурс] / А. Жалкоўскі // Биржа информации. – Рэжым доступу: http://www.gazeta.grodno.by/249/n1.html. – Дата доступу: 23.10.2015.

[140] Корбут, С. Сладкие пейзажи с горьким кофе [Электронны рэсурс] / С. Корбут // Беларусь сегодня.– Рэжым доступу: http://www.sb.by/kultura/article/sladkie-peyzazhi-s-gorkim-kofe.html. – Дата доступу: 21.05.2015.

[141] Рысь, А. Захавальнік гісторыі [Электронны рэсурс] / А. Рысь // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: http://ikobrin.ru/martinov-104.php. – Дата доступу: 30.07.2015.

[142] Культурные традиции Свислоччины [Электронны рэсурс] // Свислочский район. – Рэжым доступу: http://uctopuk.info/regions/svisloch/history/?id=753. – Дата доступу: 09.11.2015.

[143] Петрыкевіч, М. Народжаны вечнасць тварыць: краязнаўчыя артыкулы, успаміны, пісьмы / М. Петрыкевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 200 с.

[144] Гучок, Я. Ах, Родчанка! // Я. Гучок // Краязн. газ. – 2012. – № 35. – С. 3

[145] Чыгрын, С. Педагог, нацыяналіст, дэлегат [Электронны рэсурс] / С. Чыгрын // Новы час. – Рэжым доступу: http://novychas.info/asoba/pjedahoh_nacyjanalist_deliehat/. – Дата доступу: 05.04. 2015.

[146] Пугач, А. Старэйшына краязнаўчага цэху Магілёўшчыны / А. Пугач // Краязн. газ. – 2006. – № 4, студз. – С. 6; Калініна, Т. Іеранім Філіповіч – даследчык Магілёўшчыны [Электронны рэсурс] / Т. Калініна // Магілёўскія ведамасці. – Рэжым доступу: http://www.mogved.by/kultura/5018. – Дата доступу: 05.04.2015.

[147] Пяткевіч, А. Цыхун Апанас Пятровіч / А. Пяткевіч // Людзі культуры з Гродзеншчыны. – Гродна, 2000. – С. 316–317.

[148] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М. Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – 372 с.

[149] Даследчыкі роднага краю (краязнаўцы і гісторыкі-ураджэнцы Магілёўшчыны: біяграфічна-бібліяграфічны паказальнік). – Магілёў: Абл. б-ка, 1995. – 67 с.; Иванова, С.Г. Оршанские краеведы



Репозиторий ВГУ

У той жа час трэба канстатаваць, што роля краязнаўца-аматара на сённяшні дзень не стала прадметам даследавання. Вывучэнне гэтай тэмы мае пэўныя асаблівасці. Па-першае, адзначым амаль поўную адсутнасць архіўных крыніц, таму ў даследаваннях можна абапірацца толькі на бягучыя архівы арганізацый, установ, прыватныя зборы, інтэрв'ю краязнаўцаў, успаміны сучаснікаў з розных рэгіёнаў краіны. На жаль, так і не быў створаны даведнік "Краязнаўцы Беларусі", выданне якога планавалася краязнаўчай камісіяй БФК і Навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны. Па-другое, дакументальныя комплексы з прыватных архіваў часта немагчыма ўвесці ў навуковы зварот з прычыны адыходу з жыцця саміх краязнаўцаў і страты напрацаваных імі матэрыялаў.

У ходзе работы вывучаліся працы беларускіх даследчыкаў, прысвечаныя *школьнаму краязнаўству*. Выклікаюць цікавасць работы М.П. Герасіменкі[150], А.П. Госцева[151], Е.Н. Мяшэчка[152]; М.С. Рыўкіна[153], М.А. Рыца[154], В.У. Фядуты[155], Д.М. Чорнага[156], якія даюць характарыстыку асноўным працэсам і тэндэнцыям развіцця школьнага краязнаўства ў 1960–1980-я гады. На самай справе, адзначаныя працы ў сваёй большасці прысвечаны педагагічным аспектам выкарыстання краязнаўства ў выхаваўчым працэсе.

Адной з найбольш значных сучасных прац па гісторыі школьнага краязнаўства Беларусі з'яўляецца зборнік "Детский туризм и краеведение в Беларуси"[157]. Аўтары артыкулаў прааналізавалі развіццё школьнага краязнаўства, падмацавалі свае вывады багатым факталагічным і ілюстратыўным матэрыялам, які тычыцца развіцця турысцка-краязнаўчага накірунку школьнага краязнаўства Беларусі з 1920-х гадоў да гэтага часу.

---

(биографический справочник) / С.Г. Иванова. – Орша, 2002. – 32 с.; Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М. Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – 372 с.

[150] Герасіменка, М.П. Экспедыцыя "Наш край" у дзеянні / М.П. Герасіменка // Детский туризм и краеведение в Беларуси / авт.-сост. С.М. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 75–84.

[151] Госцеў, А.П. Карані і вытокі, або магчымасці школьнага краязнаўства / А.П. Госцеў // Мінулае Гродзеншчыны: навук.-метад. дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Гродна: ГАІПКПКРСА, 1998. – Вып. 5 – С. 3–31; Госцеў, А. Адзіная выхаваўчая прастора і краязнаўства / А. Госцеў // Гісторыя: праблемы выкладання. – № 3. – 2000. – С. 47–62.

[152] Мешечко, Е.Н. Развитие краеведения в Беларуси и современность / Е.Н. Мешечко // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: материалы респуб. научн.-практ. конф., Брест, 16–17 окт. 2003 г. / БрГУ им. А.С. Пушкина; гл. ред. С.Г. Рачевский. – Брест: Изд-во БрГУ им. А.С. Пушкина, 2003. – С. 9–15.

[153] Рыўкін, М.С. Эстэтычнае выхаванне вучняў у краязнаўчай рабоце па гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Вучпедвыд БССР, 1963. – 72 с.; Рыўкін, М.С. Скарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Нар. асвета, 1965. – 154 с.

[154] Риц, М.А. Краеведение – живая школа воспитания. Из опыта работы СШ 2 г. Верхнедвинска / М.А. Риц. – Минск: Нар. асвета, 1966. – 32 с.

[155] Фядута, В.У. Месца і роля школьнага гістарычнага краязнаўства ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў [Электронны рэсурс] / В.У. Фядута // Гродненский государственный университет им. Я. Купалы. – 2004. – Рэжым доступу: http://www.grsu.unibel.by /~littc/html/confer/publ/97/etnas97/ch11.html. – Дата доступу: 09.10.2005.

[156] Чорны, Д.М. Краязнаўчая работа ў школе. З вопыту Клецкай СШ № 2 / Д.М. Чорны. – Мінск: Нар. асвета, 1976. – 62 с.

[157] Детский туризм и краеведение в Беларуси / авт.-сост. С.М. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – 104 с.

Репозиторий ВГУ

Дзейнасць школьных музеяў стала тэмай даследавання А. Галіча. У артыкуле “Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны” аўтарам даецца характарыстыка і дынаміка развіцця школьных і грамадскіх музеяў на працягу другой паловы ХХ стагоддзя[158].

Асобна адзначым работу нямецкага даследчыка Р. Лінднэра “Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст.”[159]. Даследчык вызначае фактары развіцця краязнаўчых даследаванняў у 1960-я гады: пэўныя змены ў гістарычнай навуцы (пашырэнне крыніцазнаўчай базы, павялічэнне аб’ёму і пашырэнне тэматыкі даследаванняў, павялічэнне колькасці навукоўцаў-гісторыкаў (за 10 год (1960–1970-я гг.) больш чым у два разы)[160].

Цікавыя звесткі пра развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі можна адшукаць у падручніках, дапаможніках па бібліятэчным краязнаўстве, у матэрыялах канферэнцый і зборніках артыкулаў, прысвечаных яму[161]. Нягледзячы на спецыфіку ў такіх выданнях назіраюцца розныя падыходы да вызначэння дэфініцыі краязнаўства, асаблівасцяў яго развіцця ў розныя перыяды і г.д. З мэтай вывучэння шэрага матэрыялаў былі прааналізаваны канферэнцыі, якія праходзілі ў Беларусі ў канцы 1980-х – 1990-я гады і былі прысвечаны сувязі гістарычнага краязнаўства і адукацыі[162], развіццю музеяў[163], зберажэнню гісторыка-культурнай спадчыны[164], рэгіянальным даследаванням[165].

---

[158] Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 55–66.

[159] Лінднэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Р. Лінднэр. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 540 с.

[160] Тамсама. – С. 376.

[161] Белорусская краеведческая библиография: анализ библиотечных пособий областных библиотек // Отраслевые библиографии БССР / Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина; ред. В.А. Фокеев. – Минск: Высш. шк., 1972. – С. 191; Краеведение – основа духовного и нравственного возрождения общества: материалы междунар. науч.-практ. конф., Гомель, 10–11 дек. 1997 г. / Гомел. обл. б-ка; отв. за выпуск В.П. Дуброва. – Гомель: Типография “Сож”, 1997. – 104 с.; Предеина, А.В. Краеведческая библиографическая деятельность областных универсальных научных библиотек Беларуси / А.В. Предеина. – Минск: ИК, 2002. – 16 с.

[162] Развитие исторического краеведения в вузах БССР в свете перестройки высшего образования: сб. науч. ст. / Грод. гос. ун-т. им. Я. Купалы; І.П. Крень (отв. ред.). – Гродно: Изд-во ГрГУ, 1989. – 123 с.; Гістарычнае краязнаўства – дзейсны фактар інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу ў школе і ВНУ: тэзісы навук.-метад. канф., Гродна, 27–28 кастр. 1994 / ГрДУ імя Я. Купалы; кафедра гіст. Беларусі; склад. І.П. Крэнь (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГОУТ, 1994. – 112 с.

[163] Краязнаўчыя запіскі: зб. артыкулаў памяці Ю.Я. Ядкоўскага / уклад. В.М. Царук. – Гродна: Гродз. абл. клінічная бальніца, 1990. – 48 с.

[164] Каштоўнасці мінуўшчыны: праблемы зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Мінска: матэрыялы канф., Мінск, 12 лістап. 1998 г. / пад рэд. С.М. Марцэлева. – Мінск: Лекцыя, 1998. – 181 с.

[165] Загароддзе-1: матэрыялы навук.-краязн. канф., Пінск, 19 верас. 1997 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўскі [і інш.]. – Мінск: БелПК, 199. – 99 с.; Загароддзе-2: Палессе – скрыжаванне культур і часу: матэрыялы навук.-краязн. канф, Пінск, 25–27 верас. 1999 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўскі [і інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2000. – 207 с.; Загароддзе-3: Палессе ў XXI стагоддзі: матэрыялы навук.-краязн. канф., Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчук, В.А. Лабачэўскі [і інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 317 с.; Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: матэрыялы рэгіян. гіст.-краязн. канф., прысвечанай 759-годдзю Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І.І. Стаброўскага / пад рэд. І.П. Крэня [і інш.]. – Слонім: Слонім. друкарня, 2002. – 392 с.; История Витебской областной партийной организации:

Репозиторий ВГУ

У апошні час выдадзены некалькі дапаможнікаў па гістарычным краязнаўстве ці гісторыі краязнаўства Беларусі. Выкладчыкамі БДПУ імя М. Танка падрыхтаваны дапаможнік “Гістарычнае краязнаўства Беларусі”[166]. Але ён мае больш практычную і метадычную накіраванасць і выдадзены вельмі невялікім накладам (90 экзэмпляраў). У дапаможніку В.І. Саітавай “Гісторыя краязнаўства Беларусі”[167] ў V раздзеле разглядаецца гісторыя краязнаўства ў 1946–1980-я гг., але ён складаецца з 17 старонак і сур’ёзна тэму гісторыі краязнаўства краіны не разглядае[168]. Тое ж можна сказаць пра дапаможнік В.П. Шамава, у якім раздзел “Возрождение краеведческой деятельности в послевоенное время” займае 6 старонак[169].

**Трэцяя група** даследаванняў уключае працы савецкіх, айчынных і замежных навукоўцаў, якія не звязаны непасрэдна з развіццём гістарычнага краязнаўства Беларусі ў перыяд з 1960-х да 1991 года, але важны ў тэарэтычным асэнсаванні феномену краязнаўства. Спачатку прыгадаем работы выдатнага навукоўцы, першага гісторыка краязнаўства Беларусі М.І. Касяровіча[170], якія не страцілі сваёй актуальнасці і да гэтага часу. Аналіз манаграфіі “Краязнаўства” дазваляе вызначыць асобныя аспекты станаўлення і развіцця беларускага краязнаўства як часткі савецкага краязнаўчага руху 1920–1930-х гг., садзейнічае ўдакладненню разумення дэфініцыі *савецкага* краязнаўства, яго структуры, форм развіцця, асэнсаванню шэрага праблем. М.І. Касяровіч першы звярнуўся да досведу замежных краін і прааналізаваў развіццё краязнаўства ў краінах Прыбалтыкі, Фінляндыі.

На працягу падрыхтоўкі даследавання былі прааналізаваны дысертацыйныя работы, прысвечаныя некаторым аспектам краязнаўства. Ролі краязнаўства ў ідэйна-маральным выхаванні школьнікаў – Н.К. Катовіч[171], значэнне краязнаўства ў фарміраванні патрыятызму будучых настаўнікаў – М.П. Міхальчук[172], сістэме школьнага краязнаўства – І.М. Пракаповіч[173], развіццю гістарычнага краязнаўства Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. –

---

традиции и преемственность: тезисы докладов науч.-теорет. конф., Витебск, 16 окт. 1987 г. / Гос. архив Витебской обл. – Витебск: Типография им. Коминтерна, 1988. – 65 с.

[166] Гістарычнае краязнаўства Беларусі: дапаможнік / І.І. Багдановіч [і інш.]; пад рэд. А.А. Карзюка. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 219 с.

[167] Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэб. дапаможнік / В.І. Саітава. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.

[168] Тамсама. – С. 153–170.

[169] Шамов, В.П. Краеведение Беларуси: пособие / В.П. Шамов. – Минск: РИПО, 2014. – С. 222–227.

[170] Касяровіч, М. З гісторыі краязнаўства (беларускага) / М. Касяровіч // Наш край. – 1928. – № 2. – С. 13–19; Касяровіч, М. Краязнаўства / М. Касяровіч. – Мінск: Белдзяржвыдат. – 1929. – 159 с.

[171] Катович, Н.К. Идейно-нравственное воспитание школьников-подростков в краеведческой деятельности: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Н.К. Катович; МГПИ им. М. Горкага. – Минск: МГПИ, 1988. – 16 с.

[172] Міхальчук, М.П. Фарміраванне патрыятызму будучых настаўнікаў сродкамі краязнаўства (на матэрыялах ВНУ Беларусі): аўтарэф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.06 / М.П. Міхальчук; БДПУ. – Мінск, 1997. – 16 с.

[173] Пракаповіч, І. Сістэма школьнага краязнаўства: метад. дапаможнік / І. Пракаповіч. – Мінск: ГДА “Пантограф”, 2004. – 98 с.



Репозиторий ВГУ

І.У. Цітовіч[174], развіццю беларускага савецкага краязнаўства ў 1920–1930-я гады – А.У. Дзянісава[175].

*Дэфініцыя* краязнаўства, асноўныя напрамкі, перыядызацыя гістарычнага краязнаўства СССР удакладняліся на старонках энцыклапедычных выданняў[176].

Важную ролю ў асэнсаванні феномена беларускага краязнаўства адыграла манаграфія Г.А. Каханоўскага "Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст." падрыхтаваная на багатым дакументальным матэрыяле. На жаль, даследаванне ахоплівае толькі XVI–XIX стагоддзі, аднак аўтар паказаў пераемнасць, паслядоўнасць і няспыннасць працэсу развіцця гістарычнага краязнаўства на працягу даследуемага перыяду[177]. Л.В. Аляксееў у сваім даследаванні "Археалогія і краязнаўства Беларусі XVI ст. – 30-я гг. XX ст."[178] дае сваё разуменне гэтай грамадскай і навуковай з'яве, робіць вельмі грунтоўнае апісанне гісторыі яго развіцця, але даводзіць яго толькі да 1930-х гадоў.

Асобна адзначым публікацыі прафесара А.І. Мальдзіса, у якіх ён дае сваё разуменне краязнаўства, прыводзіць меркаванні аб яго развіцці шэрага гісторыкаў, грамадскіх дзеячаў Беларусі XVIII–XIX ст.[179], аналізуе замежны вопыт, асабліва Польшчы, дзе краязнаўства лічыцца навуковай дысцыплінай і існуе навукова-даследчы інстытут рэгіёназнаўства і краязнаўства.

Важныя вывады аб месцы гістарычнага краязнаўства ў грамадска-палітычным і культурным жыцці краіны робяцца ў артыкулах А.В. Дулава "Краеведение как сфера деятельности общества"[180], В.А. Углова "Мир краеведения (онтологический аспект)"[181]. У артыкулах І.В. Савіцкага

---

[174] Цітовіч, І.У. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І.У. Цітовіч; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2005. – 16 с.

[175] Дзянісаў, А.У. Краязнаўчы рух у БССР у 20–30-я гг. XX ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.У. Дзянісаў; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2008. – 16 с.

[176] Краеведение // Большая Советская энциклопедия. – М.: Сов. энцикл., 1973. – Т. 13. – С. 453; Краеведение // Педагогический словарь: в 2 т. / гл. ред. И.А. Каиров [и др.]. – М: Изд-во Академии пед. наук, 1960. – Т. 1. А–Н. – С. 324; Краеведение // Педагогическая энциклопедия: в 4 т. / редкол.: И.А. Каиров (гл. ред.) [и др.]. – М.: Сов. энцикл., 1965. – Т. 2. Ж–М. – С. 412; Российская педагогическая энциклопедия: в 2 т. / редкол. В.В. Давыдов (гл. ред.) [и др.]. – М.: Большая рос. энцикл., 1993. – Т. 1. – 608 с.; Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260; Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

[177] Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

[178] Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI века – 30-е годы XX века / Л.В. Алексеев. – Минск: Беларус. навука, 1996. – 206 с.

[179] Мальдзіс, А. Астравеччына, край дарагі… / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 207 с.; Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 256 с.; Мальдзіс, А. Краязнаўства / А. Мальдзіс // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 4; Мальдзіс, А. Гістарычныя сядзібы Беларусі: як іх аднавіць і ажывіць / А. Мальдзіс // Краязн. газ. – 2003. – № 11, верас. – С. 4–5.

[180] Дулов, А.В. Краеведение как сфера деятельности общества [Электронны рэсурс] / А.В. Дулов // Иркут. гос. ун-т. – 2003. – Рэжым доступу: http://ifhs.irk.ru/dulov.htm. – Дата доступу: 15.08.2005.

[181] Углов, В.А. Мир краеведения (онтологический аспект) / В.А. Углов // Краеведение и туризм: проблемы, поиски, перспективы: материалы регион. науч.-практ. конф., Орел, 26–29 апр. 2000 г. – Орел: Книжное изд-во, 2000. – С. 170–172.

Репозиторий ВГУ

“Микроистория и краеведение: сравнительный анализ”[182], Н.В. Серады “Регионалистика и краеведение в контексте развития современной исторической науки”[183] разглядаюцца пытанні дэфініцыі, межаў, узаемасувязі і ўзаемаўплыву мікрагісторыі, рэгіёналістыкі і краязнаўства.

Аўтар доктарскай дысертацыі “Историческое краеведение в России и документальные памятники”[184], расійскі даследчык С.Б. Філімонаў паказаў важную ролю гістарычнага краязнаўства ў зборы, захаванні і выкарыстанні дакументальных крыніц, што спрыяла развіццю мясцовых дзяржаўных краязнаўчых музееў, архіваў, ВНУ і ў цэлым садзейнічала развіццю савецкай гістарычнай навукі. Краязнаўчы рух у Паволжы з 1917 па 1930-я гады стаў тэмай доктарскай дысертацыі Е.А. Флеймана[185].

А.А. Астапец-Свешнікава ў дысертацыі на суісканне вучонай ступені доктара педагагічных навук прааналізавала сістэму турысцка-краязнаўчай дзейнасці[186]. Аўтар адзначае некаторыя праблемы ў развіцці краязнаўства: залішнее адміністраванне руху, вузкасць крыніцазнаўчай базы, тэндэнцыю да скарачэння публікацый крыніц, асабліва якія мелі дачыненне да дарэвалюцыйнай гісторыі. Работа карысна для разумення фарміравання сістэмы краязнаўчай працы ў школе, але ў большай ступені закранае менавіта педагагічныя аспекты праблемы.

З 1960-х гадоў краязнаўства ў Польскай Народнай Рэспубліцы мела статус навуковай галіны. З гэтай прычыны яно развівалася тут вельмі актыўна і стала прадметам вывучэння шэрагу навукоўцаў. Розныя аспекты краязнаўства даследавалі Г. Бенчук (Bienczyk)[187], А. Чарноўскі (Czarnowski)[188], К. Дэнэк (Denek)[189], З. Кручэк (Kruczek)[190], Ч. Лачур (Lachur)[191], В. Ліпняцкі (Lipniacki)[192], Я. Мазур (Mazur)[193], Ф. Мідура

Репозиторий ВГУ

---

[182] Савицкий, И.В. Микроистория и краеведение: сравнительный анализ [Электронны рэсурс] / И.В. Савицкий. – М.: РГГУ, 2003. – Рэжым доступу: http://vestnik.rsuh.ru/73/hr73.htm. – Дата доступу: 11.05.2005.
[183] Середа, Н.В. Регионалистика и краеведение в контексте развития современной исторической науки / Н.В. Середа // Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. – СПб.: Нотабене, 2000. – С. 78–81.
[184] Филимонов, С.Б. Историческое краеведение в России и документальные памятники: (1917–1929): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.09 / С.Б. Филимонов; Рос. гос. гуманит. ун-т, ист.-арх. ин-т. – М., 1992. – 21 с.
[185] Флейман, Е.А. Краеведческое движение в Поволжье 1917–1930 гг.: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.09 / Е.А. Флейман; Яросл. гос. ун-т. – Ярославль, 1997. – 43 с.
[186] Остапец-Свешников, А.А. Система туристско-краеведческой деятельности общеобразовательной школы: автореф. дис. … д-ра пед. наук (13.00.01, 13.00.02) / А.А. Остапец-Свешников; МГПИ. – М.: МГПИ, 1989. – 32 с.
[187] Bienczyk, G. Krajoznawstwo i jego związki z turystyką / G. Bienczyk. – Warszawa: Wyïsza Szkoła Ekonomiczna, 2003. – 208 s.
[188] Czarnowski, A. Krajoznawstwo. Poradnik Metodyczny, ZG PTTK / A. Czarnowski. – Warszawa, 1979. – S. 23–24.
[189] Denek, K. Krajoznawstwo i turystyka w wychowaniu dzieci i miodzieïy szkolnej / K. Denek. – Warszawa: Kraj, 1989. – 262 s.; Denek, K. W kręgu edukacji, krajoznawstwa i turystyki w szkole / K. Denek. – Poznań: Eruditus, 2000. – 323 s.
[190] Kruczek, Z. Metodyka krajoznawstwa / Z. Kruczek. – Krakyw: Druk. Narodowa, 1983. – 242 s.
[191] Lachur, Cz. Krajoznawstwo i geografia turystyczna Polski: informator bibliograficzny / Cz. Lachur. – Opole: Wydaw. UO, 2000. – 115 s.
[192] Lipniacki, W. Elementy teorii krajoznawstwa / W. Lipniacki. – T. 1, Krajoznawstwo jako dziaialność poznawcza – Szczecin: Polskie Tow. Turystyczno-Krajoznawcze: Zarząd Wojewydzki, 1985. – 300 s.;

(Midura)[194], А. Ратка (Ratka)[195]. Пры падрыхтоўцы даследавання былі выкарыстаны зборнікі канферэнцый, прысвечаныя актуальным пытанням краязнаўства ў Польшчы і іншых краінах[196].

Каб даследаваць найбольш складаныя аспекты развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі, аўтар звярнуўся да аналізу **дакументальных крыніц** – як апублікаваных, так і архіўных матэрыялаў.

У манаграфіі выкарыстоўваюцца афіцыйныя дакументы ЦК КПСС, ЦК КПБ, Савета Міністраў СССР, Савета Міністраў БССР[197], галіновых міністэрстваў[198], ЦК ЛКСМБ[199], якія вызначалі стратэгію і асноўныя накірункі развіцця краязнаўства ў БССР. Сярод іх законы[200], нарматыўныя акты[201] і пастановы[202], зборнікі дакументаў[203]. Аналізаваліся і статуты грамадскіх арганізацый краязнаўчай накіраванасці – Беларускага фонда культуры[204], Беларускага краязнаўчага таварыства[205], БДТАПГіК[206].

У ходзе даследавання выкарыстоўваліся дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь: ф. 492 (Цэнтральны савет БДТАПГ і К), ф. 1030 (праўленне рэспубліканскага таварыства "Веды" БССР),

---

Lipniacki, W. Elementy teorii krajoznawstwa / W. Lipniacki. – T. 2, Metodyka dziaialności poznawczej. – Szczecin: Polskie Tow. Turystyczno-Krajoznawcze: Zarząd Wojewydzki, 1986. – 342 s.

[193] Mazur, E. Leksykon turystyki i krajoznawstwa / E. Mazur. – Szczecin: Wydaw. Naukowe Uniwersytetu Szczecicskiego, 2000. – 86 s.

[194] Midura, F. Ochrona krajobrazu przyrodniczego i kulturowego domeną krajoznawstwa. Ziemia'99 / F. Midura. – Opole, 1990.

[195] Ratka, A. Turystyka i krajoznawstwo w Rudzie Ślęskiej w latach 1924–1993: od kyi PTT i PTK do Oddziaiu PTTK / A. Ratka. – Ruda Ślęska: Oddziai Miejski Polskiego Tow. Turystyczno-Krajoznawczego: Tow. Przyjaciyi Rudy Polskiej, 1994. – 85 s.

[196] Book of British villages / A guide to 700 of the most interesting and attractive villages in Britain / – London, 1980; Krajoznawstwo i turystyka w szkole: praca zbiorowa. – Warszawa: Wydaw. Szkolne i Pedagogiczne, 1990. – 352 s.; Krajoznawstwo jako czynnik edukacji spoiecznej: materiaiy do dyskusji przed Kongresem Krajoznawczym: I Lubuskie Spotkanie Krajoznawcyw, 7–8 kwieciec 1979 r. – Lublin, 1979. – 234 s.; Nauka a krajoznawstwo: materiaiy z sesji naukowej 23–25 września 1988 r. / red. Ryszard Harajda, Pola Kuleczka. – Zielona Gyra: WSP, 1989. – 79 s.; Polskie Towarzystwo Krajoznawcze na Kielecczyџnie 1908–1950: zarys dziejyw / Adam Massalski & Andrzej Rembalski. – Kielce: PZGraf. RSW "P-K-R", 1983. – 132 s.

[197] Збор пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1991–1994 (Да верасня 1991 г. – Збор пастаноў Урада Беларускай ССР).

[198] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР (1965–1990); Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства народнай асветы (1991–2000); Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі і навукі (2001–2004).

[199] Документы ЦК ВЛКСМ. 1971. – М.: Молодая гвардия, 1973. – 304 с.; Документы ЦК ВЛКСМ. 1974. – М.: Молодая гвардия, 1975. – 250 с.; Документы ЦК ВЛКСМ, 1981. – М.: Молодая гвардия, 1982. – 217 с.; Документы ЦК ВЛКСМ, 1982. – М.: Молодая гвардия, 1983. – 206 с.; Документы ЦК ВЛКСМ, 1983. – М.: Молодая гвардия, 1984. – 224 с.

[200] Закон Беларускай ССР "Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры. Прыняты на X сесіі ВС БССР 9-га склікання 14.07.1978 г.". – Мінск: Беларусь, 1978. – 64 с.

[201] Сборник официальных документов по детско-юношескому туризму, краеведению, организации отдыха детей и молодежи / сост. Ю.С. Константинов. – М.: ЦДЮТур МО РФ, 1999. – 231 с.

[202] Советское законодательство о памятниках истории и культуры: сб. документов и материалов. – Минск: Полымя, 1972. – 430 с.

[203] Охрана памятников истории и культуры: сб. документов. – М.: Сов. Россия, 1973. – 191 с.

[204] Статут савецкага фонду культуры. – Минск, 1989. – 23 с.

[205] Статут Беларускага краязнаўчага таварыства. – Мінск, 1991. – 27 с.

[206] Устав Белорусского добровольного общества охраны памятников истории и культуры. – Минск: Беларусь, 1972. – 24 с.



Репозиторий ВГУ

неапрацаваны фонд (краязнаўчая камісія Беларускага краязнаўчага таварыства); Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці: ф. 289 (Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці), ф. 487 (Віцебскае абласное аддзяленне БДТАПГіК), ф. 2797 (Віцебскі абласны аддзел народнай адукацыі), ф. 119 (сакратарыят Віцебскага абласнога камітэта ЛКСМБ), ф. 520 – п. (архіў Віцебскага абласнога камітэта КПБ); Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці: ф. 224 (Гродзенскае абласное аддзяленне БДТАПГ і К), ф. 245 (Гісторыка-краязнаўчы гурток ГрДУ імя Я. Купалы); Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці: ф. 124 (Магілёўскі абласны аддзел народнай адукацыі), ф. 1244 (краязнаўцы Магілёўшчыны: воп. 2, 3, 19), ф. 2930 (Магілёўскае абласное аддзяленне БДТАПГіК); Віцебскага абласнога краязнаўчага музея: ф. 1075, ф. 1248 (навуковы архіў ВАКМ).

У дадзеных архіўных фондах утрымліваецца важны матэрыял, які дазваляе:

а) высветліць пытанне аб арганізацыі і краязнаўчым змесце дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх, гісторыка-культурных грамадскіх таварыстваў, краязнаўчай працы ў школе;

б) прааналізаваць грамадскую сістэму аховы помнікаў, якая была ўтворана намаганнямі дзяржавы на аснове працы грамадскіх арганізацый і сістэму школьнага краязнаўства;

в) параўнаць і супаставіць дырэктывы і цыркуляры ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Цэнтральнага савета БДТАПГіК і абласных і раённых саветаў, прапаноў з месцаў. Устаноўлена, што дакументы раённых арганізацый носяць арганізацыйна-распараджальны характар, якія па сутнасці дубліруюць адпаведныя распараджэнні ЦК і Цэнтральнага савета. У той жа час пярвічныя арганізацыі праяўлялі большую зацікаўленасць да працы на мясцовым матэрыяле, часам выходзілі за прапанаваныя ідэалагічныя межы;

г) выкарыстоўваць багаты факталагічны матэрыял аб развіцці дзяржаўнага, грамадскага і школьнага накірункаў гістарычнага краязнаўства ў рэгіёнах Беларусі, рабіць вывады наконт асаблівасцей развіцця гістарычнага краязнаўства ў розных рэгіёнах нашай краіны;

д) зрабіць выснову аб тэматыцы даследаванняў, колькасным складзе краязнаўцаў-аматараў у рэгіёнах, фарміраванні інфармацыйнай базы мясцовых даследаванняў (на аснове прыватных фондаў краязнаўцаў).

Матэрыялы вызначаных фондаў з’яўляюцца грунтоўнай крыніцай па вывучэнні развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг., але павінны выкарыстоўвацца ў комплексе з іншымі крыніцамі, у тым ліку і вуснымі, а таксама пры ўмове крытычных адносін даследчыка да матэрыялу.

Пры правядзенні даследавання былі выкарыстаны матэрыялы бягучых архіваў упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага абласнога цэнтра пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, грамадскіх аб’яднанняў Віцебскай, Гродзенскай, Гомельскай абласцей.

Репозиторий ВГУ

Для аналізу развіцця асноўных накірункаў гістарычнага краязнаўства ў школе ў 1960-я – пачатку 1990-х гадоў выкарыстоўваліся матэрыялы выданняў па методыцы краязнаўчай работы[207]. З мэтай вывучэння дзейнасці краязнаўчай камісіі БФК у канцы 1980 – пачатку 1990-х гадоў вывучаліся матэрыялы, змешчаныя ў зборніку "Спадчына"[208]. Аналіз "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі"[209] дазволіў вылучыць навукоўцаў і краязнаўцаў-аматараў, якія займаліся пытаннямі аховы помнікаў гісторыі і культуры ў рэгіёнах краіны.

На працягу працы над дысертацыяй з мэтай атрымання інфармацыі пра рэгіянальныя даследаванні, якія праводзіліся навуковымі ўстановамі краіны, намі былі прааналізаваны навуковыя выданні, прысвечаныя гарадам і рэгіёнам БССР. Сярод комплексу прац адзначым манаграфіі і публікацыі па археалогіі гарадоў і тэрыторый Л.В. Аляксеева[210], Ф.Д. Гурэвіч[211], Л.У. Дучыц[212], Э.М. Загарульскага[213], Я. Г. Звяругі[214], П.Ф. Лысенкі[215], В.М. Ляўко[216], С. Тарасава[217], Г.В. Штыхава[218] і інш., рэгіянальныя

[207] Канцэптуальныя асновы IV этапа Усебеларускай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі навучэнцаў "Наш край" // Краязнаўчая газета. – 2004. – № 4(10), студз. – С. 1–2; Краеведение и уроки истории: сб. ст. – Л.: Лениздат, 1967. – 106 с.; Методика историко-краеведческой работы в школе / под ред. Н.С. Борисова, – М.: Просвещение, 1982. – 123 с.; Методические материалы в помощь организатору туристско-краеведческой работы; сост. Н.Н. Шкут / Витеб. пед. ин-т им. С.М. Кирова. – Витебск: Витеб. обл. типография, 1966. – 23 с.; Методические рекомендации по выявлению, описанию и сбору народного творчества при создании школьного краеведческого музея / Витеб. обл. краевид. музей. – Витебск: Витеб. обл. типография, 1982. – 32 с.; Методические рекомендации учителю-стажеру по сбору краеведческого материала (досоветский период) / сост. Я.Н. Мараш. – Гродно: ГОУТ, 1988. – 23 с.

[208] Долгосрочная программа деятельности БФК "Спадчына". – Минск: Типография БГУ, 1988. – 32 с.; Спадчына. Прапановы для распрацоўкі рэспубліканскай праграмы даследавання, захавання і прапаганды культурнай спадчыны беларускага народа // ЛіМ. – 1990. – 15 чэрв. – С.14–15.

[209] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі [Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская вобл.] / АН БССР; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1984–1989.

[210] Алексеев, Л.В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.

[211] Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок / Ф.Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 123 с.

[212] Дучыц, Л.У. Край блакітных азёр / Л.У. Дучыц. – Мінск: Полымя, 1988. – 39 с.

[213] Загорульский, Э.М. Древний Минск / Э.М. Загорульский. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 119 с.; Загорульский, Э.М. Возникновение Минска / Э.М. Загорульский. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 358 с.

[214] Зверуго, Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1989. – 207 с.; Зверуго, Я.Г. Древний Волковыск / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1975. – 145 с.

[215] Лысенко, П.Ф. Города Туровской земли / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1974. – 199 с.; Лысенко, П.Ф. Берестье / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 399 с.

[216] Левко, О.Н. Витебские изразцы XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1981. – 46 с.; Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.; Левко, О.Н. Экскурсия по древнему Витебску / О.Н. Левко. – Минск: Полымя, 1984. – 32 с.; Левко, О.Н. Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1989. – 88 с.

[217] Тарасаў, С.В. Полацк. IX–XVII стст.: гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.

[218] Штыхов, Г.В. Археология Полоцкой земли за 50 лет / Г.В. Штыхов // Древности Белоруссии: докл. к конф. по археал. Белоруссии, Минск, март 1969 г. / сост. В.Д. Будько [и др.]. – Минск, 1969. – 475 с.; Штыхов, Г.В. Древний Полоцк. IX–XIII вв. / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 135 с.; Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.; Штыхаў, Г.В. Ажываюць сівыя стагоддзі / Г.В. Штыхаў. – Мінск: Нар. асвета, 1982. – 175 с.



Репозиторий ВГУ

энцыклапедычныя даведнікі[219], гістарычныя і гісторыка-эканамічныя нарысы, прысвечаныя Вілейцы[220], Іўю[221], Мінску[222], Міру[223], Нясвіжу[224], Полацку[225], Слуцку[226], Клічаўшчыне[227], Налібоччыне[228] і іншым гарадам і рэгіёнам Беларусі. З апошніх асобна вылучым работы, напісаныя навукоўцамі Г.А. Каханоўскім[229], У.М. Кісялёвым[230], А.В. Мальдзісам[231], М.М. Улашчыкам[232] пра свой родны край. Якасныя даследаванні прысвечаны помнікам гісторыі і культуры Віцебска[233], Міншчыны[234], Мінска[235], Магілёўшчыны[236], Нясвіжа[237], Слонімшчыны[238]. Асобна аналізаваліся некаторыя навукова-папулярныя выданні і пуцяводнікі, прысвечаныя Магілёву[239], Мінску[240], Міншчыне[241], Нясвіжу[242], славутым землякам[243].

---

[219] Брест: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – 408 с.; Витебск: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с. Гомель: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 527 с.; Гродно: энцикл. справ. / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1989. – 483 с.

[220] Булгак, В.А. Вилейка / В.А. Булгак, В.И. Кебец, М.Н. Клемантович. – Минск: Беларусь, 1984. – 80 с.

[221] Васілючак, М.В. Іўе: гісторыка-эканамічны нарыс / М.В. Васілючак, І.П. Крэнь, Я.Н. Мар. – Мінск: Беларусь, 1991. – 127 с.

[222] Шыбека, З.В. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека. – Мінск: Полымя, 1990. – 341 с.

[223] Хілімонаў, В.А. Мірскія былі: гістарычны нарыс / В.А. Хілімонаў. – Мінск: Полымя, 1990. – 50 с.

[224] Шишигина, К.Я. Музы Несвижа / К.Я. Шишигина. – Минск: Полымя, 1986. – 139 с.; К.Я. Шышыгіна. Паданні Нясвіжа / К.Я. Шышыгіна. – Мінск: Полымя, 1990. – 40 с.

[225] Полоцк: исторический очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.

[226] Грицкевич, А.П. Слуцк: историко-экономический очерк / А.П. Грицкевич. – 2-е изд. – Минск: Беларусь. 1970. – 112 с.; Грицкевич, А.П. Древний город на Случи / А.П. Грицкевич. – Минск: Полымя, 1985. – 158 с.

[227] Валаханович, А.И. Кличевщина: историко-экономический очерк / А.И. Валаханович, И.И. Савченко. – Минск: Полымя, 1989. – 62 с.

[228] Прокопчик, Л.Т. В краю Налибокской пущи / Л.Т. Прокопчик. – Минск: Полымя, 1979. – 159 с.

[229] Каханоўскі, Г.А. Маладзечна: гісторыка-эканамічны нарыс / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Полымя, 1988. – 120 с.

[230] Киселев, В.Н. На истоках неманских / В.Н. Киселев. – Мінск: Полымя, 1985. – 112 с.

[231] Мальдзіс, А. Астравеччына, край дарагі… / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 207 с.

[232] Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 608 с.

[233] Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска: з гісторыі планіроўкі і забудовы горада / Т.І. Чарняўская. – Мінск: Навука і тэхніка. – 102 с.; Якімовіч, Ю.А. Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX – пачатку XX ст. / Ю.А. Якімовіч. – Мінск: Полымя, 1990. – 46 с.

[234] Габрусь, Т.В. Помнікі манументальнага дойлідства Міншчыны: гісторыка-мастацтвазнаўчы нарыс / Т.В. Габрусь. – Мінск: Полымя, 1991. – 4 с.; Грамович, В.В., Памятники колхозного строительства в Белоруссии / В.В. Грамович, М.П. Костюк. – Минск: Беларусь, 1976. – 31 с.; Чарняўскі, М.М. Археалагічныя помнікі Міншчыны / М.М. Чарняўскі. – Мінск: Полымя, 1988. – 24 с.

[235] Памятники Минска: справочник-путеводитель / авт.-сост. В.П. Шамов. – Минск, 1990. – 205 с.; Памятники Минска: справочник-путеводитель / авт.-сост. В.П. Шамов. – Минск: Полымя, 1991. – 208 с.

[236] Гордеев, П.Б. Могилевщина: Памятники бессмертной славы / П.Б. Гордеев. – Минск: Полымя, 1986. – 143 с.

[237] Чантурыя, У.А. Архітэктурныя помнікі Нясвіжа / У.А. Чантурыя, Ю.І. Казакоў. – Мінск: Полымя, 1989. – 47 с.

[238] Караткевіч, В.Б. Помнікі Слоніма / В.Б. Караткевіч, А.М. Кулагін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 103 с.

[239] Городецкий, М.Н. Могилев и окрестности: справочник-путеводитель / М.Н. Городецкий, Е.А. Крисковец. – Минск: Полымя, 1982. – 112 с.

[240] Грахоўскі, С.І. Мінск. Спадарожнік турыста / С.І. Грахоўскі. – Мінск: Беларусь, 1975. – 224 с.; Минск и окрестности: справочник-путеводитель / сост.: В.В. Шарпило, М.И. Потемкин, И.М. Пучинский [и др.]. – Минск: Полымя, 1979. – 139 с.; Мы расскажем о Минске / сост.: С. Граховский, В. Карпов, Р. Соболенко. – Минск: Беларусь, 1966. – 212 с.

[241] Андрощенко, Н.К. Дорогами подвигов: путеводитель по местам революционной, боевой, трудовой славы на Минщине / Н.К. Андрощенко. – Минск: Беларусь, 1970. – 168 с.

Репозиторий ВГУ

З мэтай ацэнкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк краіны пры даследаванні праводзіўся аналіз выданняў краязнаўчых аддзелаў абласных бібліятэк: складзеных бібліяграфічных паказальнікаў[244], рэкамендацыйных спісаў[245], метадычных распрацовак, даведак.

У асобную групу крыніц па гістарычным краязнаўстве Беларусі мы аднеслі перыядычны друк. Ён утрымлівае ацэнкі вынікаў і праблем развіцця гістарычнага краязнаўства, асабістыя меркаванні, выступленні, артыкулы, інтэрв'ю беларускіх гісторыкаў[246], краязнаўцаў[247], дзеячаў культуры[248] і інш.

Асобны комплекс крыніц уяўляюць сабой працы саміх краязнаўцаў. Нягледзячы на тое, што ў савецкія часы досыць цяжка было надрукаваць кнігі краязнаўчага характару, некаторыя з іх усё ж такі выдаваліся, напрыклад, А. Мальдзіса, У. Кісялёва, Э.А. Карніловіча, Н.І. Дарафеенка і іншых. Шмат такіх кніг, створаных у 1960 – 1980-я гг., былі выдадзены ўжо ў

---

[242] Трэпет, Л.В. Там, дзе гучалі паланэзы / Л.В. Трэпет. – Мінск: Полымя, 1990. – 34 с.

[243] Иоффе, Э.Г. Советские военноначальники на белорусской земле: путеводитель по местам жизни и деятельности / Э.Г. Иоффе. – Минск: Полымя, 1988. – 239 с.

[244] Аркадий Михайлович Подлипский. Библиография основных публикаций 1968–2005 гг. / сост.: А.М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск: ГУ "Витебская областная библиотека им. В.И. Ленина", 2006. – 78 с.; Библиографический указатель литературы по истории Гродно /сост. Е.М. Таюрская, Г.М. Регилева. – Гродно: ГОУТ, 1978. – 38 с.; Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне: бібліяграфічны паказальнік / уклад. Л.Т. Бяззубік, Н.С. Кітовіч. – Віцебск: ВАБ, 1977. – 40 с.; Гісторыя камсамола Гродзеншчыны: рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік / склад. Л.У. Здрадоўская. – Гродна: ГАНБ, 1990. – 22 с.; Гісторыя фабрык і заводаў Віцебскай вобласці / склад. Н.С. Кітовіч. – Віцебск: Віцеб. абл. б-ка, 1962. – 6 с.; Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага 1830–2000 гг.: бібліяграфічны паказальнік / уклад. Л.І. Трумасава. – Гродна: ГАНБ імя Я.Ф. Карскага, 2004. – 30 с.; Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.): бібліяграфічны паказальнік / склад.: Л.Т. Бяззубік, Н.С. Кітовіч. – Віцебск: ВАБ, 1975. – 67 с.; Принеманский край. Города и райцентры: библиографический указатель литературы по истории Гродно / сост. Е.М. Таюрская. – Гродно: ЦСУ г. Гродно, 1980. – 108 с.

[245] Витебску – 1000: Рекомендательные материалы в помощь библиотекам области / сост. Н.С. Китович. – Витебск: ВОБ, 1973. – 19 с.; Героі Савецкага Саюза – Віцябчанкі / склад. Т.В. Ганчарова. – Віцебск: ВАБ, 1975. – 12 с.; Змагары за ўладу Саветаў на Віцебшчыне: бібліяграфічны паказальнік / склад. Т.В. Ганчарова. – Віцебск: Віцеб. абл. б-ка, 1967. – 11 с.; Организация, методика и содержание краеведческой работы. Аннотированный указатель новой литературы. Гос. публ. б-ка им. М.Е. Салтыкова-Щедрина. – Л.: Книжная палата, 1973. – Вып. 6–7. – 123 с.; Тэкстыльная прамысловасць Гродзеншчыны: рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік / склад. Л.У. Здрадоўская. – Гродна: ГАНБ, 1991. – 12 с.; Ф.К. Багушэвіч (1840–1900) да 150-годдзя з дня нараджэння: бібліяграфічны рэкамендацыйны спіс літаратуры ў дапамогу краязнаўцам / склад.: А.П. Госцеў, Г.М. Рыгілевіч. – Гродна: ГАНБ, 1990. – 23 с.

[246] Корзюк, А. Проведение уроков-экскурсий в музеях при изучении истории Беларуси в средней школе / А. Корзюк // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2003. – № 4. – С. 43; Кулажанка, Л. Краязнаўства / Л. Кулажанка // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 3; Мыцік, Ю. Успаміны пра Мікалая Улашчыка / Ю. Мыцік // Кантакты і дыялогі. – 2001. – № 12. – С. 13–19; Сосна, У. Рэгіянальныя навуковыя канферэнцыі – справа агульнанацыянальная / У. Сосна // Беларус. гіст. час. – 1999. – № 2. – С. 85.

[247] Барыс, С. Краязнаўства ў школе. Якім яму быць? / С. Барыс // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 4. – С. 76–77; Валодзька, Г. Краязнаўцы Паазер'я – яднайцеся // Віцеб. рабочы. – 1991. – 4 крас. – С. 4; Воршыч, А. Макракніга пра мікрагісторыю / А. Воршыч // Наша ніва. – 2004. – 20 жн. – С. 9; Да чытача // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 1; Жукоўскі, В. "Оршазнаўства" спрыяе і маральнаму выхаванню / В. Жукоўскі // Краязн. газ. – 2003. – № 5, чэрв. – С. 4; Карлюкевіч, А. Краязнаўства / А. Карлюкевіч // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 2; У даніну Каханоўскаму // Краязн. газ. – 2003. – № 4. – С. 5.

[248] Далідовіч, Г. Якім быць нашым дзецям? / Г. Далідовіч // Краязн. газ. – 2003. – № 5, чэрв. – С. 4; Манаеў, В. Каб сэрца не балела / В. Манаеў, Л. Тарасенка // Чырвоная змена. – 1988. – 20 верас. – С. 5.



Репозиторий ВГУ

1990-я і 2000-я гады. Прыгадаем працы В.Я Ляшук[249], М. Петрыкевіча[250], А.М. Пяткевіча[251], М. Рыўкіна[252], В. Супруна[253] і іншых краязнаўцаў.

Падкрэслім, што пры напісанні даследавання былі выкарыстаны прыватныя архівы краязнаўцаў Беларусі (М. Рыўкіна, А. Падліпскага, Д.М. Абрамовіча, В. Гуза, Я. Мараша, І.І. Філіповіча) і надрукаваныя і размешчаныя ў Інтэрнэце аб іх дзейнасці матэрыялы (М. Улашчыка[254], А. Белакоза[255], В. Супруна[256]).

Асобна адзначым нашы работы: як тыя, што былі напісаны з мэтай асвятлення матэрыялаў дысертацыі да абароны, так і тыя, што былі апублікаваны пазней, але прысвечаны вывучаемаму перыяду. Роля дзяржаўных, ведамасных, школьных музеяў Віцебска ў дадзены перыяд разглядаецца ў нашай манаграфіі “Музеі Віцебска на пачатку XXI ст”[257]. Краязнаўцам Віцебшчыны другой паловы XX ст. прысвечаны біябліяграфічны даведнік “Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзяў”[258]. У прадмове вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўства, яго набыткі, праблемы. Дэфініцыя краязнаўства ўдакладнена ў артыкуле, змешчаным у энцыклапедыі “Беларускі фальклор”[259]. У 36 асобных артыкулах асвятляюцца розныя аспекты развіцця краязнаўства Беларусі ў другой палове XX ст. У асобнай серыі асвятляюцца жыццёвыя лёсы і дасягненні выдатных краязнаўцаў Віцебшчыны: М.Х. Плавінскага[260], В.А. Ермалёнка[261], А.М. Дарафеева[262],

---

[249] Ляшук, В.Я. Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я. Ляшук, Г.М. Снітко. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2008. – 319 с.

[250] Петрыкевіч, М. Народжаны вечнасць тварыць: краязнаўчыя артыкулы, успаміны, пісьмы / М. Петрыкевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 200 с.

[251] Пяткевіч, А.М. Літаратурная Гродзеншчына / А.М. Пяткевіч. – Мінск: Выдав. цэнтр “Бацькаўшчына”, 1996. – 96 с.

[252]Рывкин, М.С. Краеведческие очерки и статьи: сост., предисл., и примеч. А.М. Подлипский / М.С. Рывкин. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2011. – 159 с.

[253] Супрун, В.Р. Дзеі над Шчарай: З гісторыі зямлі Слонімскай / В.Р. Супрун. – Слонім: ГАУПП “Слонімская друкарня”, 2000. – 168 с

[254] Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 608 с.

[255] Жыццё і прыгоды Алеся Белакоза [Электронны рэсурс] // АДВЕЧНАЕ – Рэжым доступу // http://belarus.kulichki.net/index.php?option=com_content&task=view&id=902&Itemid=71&limit=1&limitstart=5. – Дата доступу: 23.07.2015.

[256] Супрун, В. Штрыхі з успамінаў [Электронны рэсурс] / В. Супрун // Слонімблог. – Рэжым доступу: http://slonimblog.net/?p=7092. – Дата доступу: 23.03.2015.

[257] Півавар, М.В. Музеі Віцебска на пачатку XXI ст.: манаграфія / М.В. Півавар. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – 180 с.

[258] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М.В. Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – 372 с.

[259] Півавар, М.В. Краязнаўства / М.В. Півавар // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 719–721.

[260] Півавар, М.В. Краязнаўца з Віцебска, або Не забывайма пра сваіх рупліўцаў / М.В. Півавар // Настаўніцкія інавацыі. – № 2/3. Метадычны бюлетэнь для настаўнікаў. – Гдыня, 2005. – С. 34–38.

[261] Півавар, М.В. Педагог, краязнаўца, грамадзянін Вітольд Ермалёнак / М.В. Півавар // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 30–31 сак. 2010 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2010. – С. 232–238.

[262] Півавар, М.В. Эколаг, краязнаўца, патрыёт – Анатоль Максімавіч Дарафееў / М.В. Півавар // Экологическая культура и охрана окружающей среды: I Дорофеевские чтения: материалы междунар.

Репозиторий ВГУ

Д.Р. Газіна[263], полацкіх[264], лепельскіх[265], шаркаўшчынскіх[266] краязнаўцаў, даследчыкаў беларуска-латышскага памежжа[267]. Асобныя артыкулы прысвечаны стану гістарычнага краязнаўства[268], краязнаўству ў ВНУ Беларусі[269], развіццю музеяў Віцебшчыны[270], дзейнасці грамадскіх краязнаўчых арганізацый[271], электронным краязнаўчым рэсурсам[272] і іншым пытанням краязнаўства.

Кола літаратуры, што так ці інакш закранае праблематыку гістарычнага краязнаўства, дастаткова шырокае. Пры гэтым некаторыя праблемы засталіся недастаткова даследаванымі. Па-за ўвагай даследчыкаў засталіся дзяржаўная

---

науч.-практ. конф., Витебск, 21–22 нояб. 2013 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (отв. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – С. 8–12.

263 Півавар, М.В. Выдатны знаўца Віцебскага краю / М.В. Півавар // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XVIII(65) Региональной науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 13–14 марта 2013 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: А.П. Солодков (гл. ред) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – Т. 1. – С. 442–444.

264 Півавар, М.В. Краязнаўцы Полаччыны другой паловы XX ст. / М.В. Півавар // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, 20–21 лістап. 2008 г. / пад агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 236–243.

265 Півавар, М.В. Краязнаўцы Лепельшчыны XVI – першай паловы XX ст. / М.В. Півавар // III Лепельскія чытанні: матэрыялы навук.-практ. канф., г. Лепель, 10 кастр. 2008 / редкол.: А. Стельмах, У. Баранов. – Віцебск: Бюро оперативной полиграфии, 2008. – С. 104–121.

266 Півавар, М.В. Краязнаўцы Шаркоўшчыны другой паловы XX – пач. XXI стст. / М.В. Півавар // Мой родны кут! Як ты мне мілы… Германавіцкія чытанні: матэрыялы краязн. чытанняў. – Глыбокае–Паставы, 2011. – С. 83–91.

267 Пивовар, Н.В. Краеведы-исследователи белорусско-латышского пограничья второй половины XX – нач. XXI ст. / Н.В. Пивовар // Vēsture: avoti un cilvēki. Proceedings of the 19th International Scientific Reading of the Faculty of Humanities. History XIII. – Daugaupils: Daugaupils universitātes akadēmiskais apgāds "Salute", 2010. – S. 157–163.

268 Пивовар, Н.В. Историческое краеведение Беларуси в 1961–1991 гг. / Н.В. Пивовар // Первые Всероссийские краеведческие чтения. Итоги и перспективы развития краеведения и Москвоведения, Москва, 15–17 апр. 2007 г. – М.: ИЦ "Москвоведения", ОАО "Московские учебники", 2009. – С. 366–371.

269 Пивовар, Н.В. Историческое краеведение в вузах Беларуси во второй половине XX – начале XXI века / Н.В. Пивовар // Краєзнавство. – 2011. – № 3. – С. 80–85.

270 Пивовар, Н.В. Музеи Витебска как центры развития краеведения в XVIII – нач. XXI в. / Н.В. Пивовар // Седьмые всероссийские краеведческие чтения, Москва–Омск, 13–17 мая 2013 г. / отв. ред. В.Ф. Козлов, сост. А.Г. Смирнова. – М: Изд. центр «Краеведение», 2013. – С. 185–193; Півавар, М.В. Музеі Віцебска на мяжы стагоддзяў: праблемы і дасягненні / М.В. Півавар // Acta Albaruthenica. – Warszawa. – Tom 13. – S. 305–316; Півавар, М.В. Ведамасныя музеі (музеі прадпрыемстваў і ўстаноў) у другой палове XX – пачатку XXI ст. / М.В. Півавар // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск: Нац. б-ка Беларусі, 2013. – С. 112–115.

271 Півавар, М.В. Гісторыка-культурныя грамадскія аб'яднанні Віцебшчыны канца XX ст. / М.В. Півавар // "Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.): матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 23–24 кастр. 2008 г. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І.І. Коўкель (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 402–406; Пивовар, Н.В. Общественные краеведческие объединения Витебщины конца XX – начала XXI в. / Н.В. Пивовар // Третьи всероссийские краеведческие чтения, Москва – Коломна, 22–23 июня 2009 г. / отв. ред. В.Ф. Козлов. – М.: АНО ИЦ «Москвоведение»; ОАО «Московские учебники», 2009. – С. 20–24; Півавар, М.В. Помніказберагаючая дзейнасць гісторыка-культурнага клуба "Узгор'е" ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гадоў / М.В. Півавар // Сучасны стан беларускага краязнаўства і валанцёрскі рух: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., Мінск, 16 красав. 2012 г. / уклад.: А. Анісім, А. Трусаў. – Мінск, 2012. – С. 145–150.

272 Півавар, М.В. Краязнаўства ў Інтэрнэце / М.В. Півавар // Актуальные проблемы источниковедения: материалы междунар. науч.-практ. конф. к 135-летию со дня рождения В.И. Пичеты, Минск–Витебск, 9–11 окт. 2013 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: А.Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – С. 101–103.

Репозиторий ВГУ

палітыка ў галіне гістарычнага краязнаўства краіны ў 60–80-я гг. XX ст., суадносіны і ўзаемадзеянне розных накірункаў гэтай галіны ведаў, рэгіянальныя асаблівасці краязнаўства Беларусі. На жаль, не праводзіўся параўнальны аналіз краязнаўства БССР з краязнаўчым рухам у суседніх савецкіх рэспубліках. Больш дэталёвага вывучэння патрабуе пошукавы рух як асобная галіна школьнага краязнаўства і яго важная роля ў выхаванні патрыятызму сярод моладзі краіны. Трэба прызнаць, што гісторыя развіцця дзяржаўнага, грамадскага і школьнага накірункаў гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1980-я гады як *прадмет даследавання* не стала тэмай асобных навуковых выданняў і пакуль вывучана слаба.

Улічваючы той факт, што шэраг праблем развіцця гістарычнага краязнаўства ў 1961–1991 гг. засталіся недастаткова даследаванымі і прымаючы пад увагу тую ролю, якую адыгрывае гістарычнае краязнаўства на сучасным этапе развіцця грамадства Беларусі і суседніх краін, прадстаўляецца патрэбным напісанне і выданне комплекснага, усебаковага даследавання, прысвечанага яго развіццю ў 1960–1980-я гады. На нашу думку, выданне такой працы з'яўляецца важным крокам у разуменні пазітыўнага вопыту мінулага і выкарыстанні яго на карысць краіны на сучасным этапе.

**Метадалогія і метады даследавання.** Тэарэтычнай і метадалагічнай базай даследавання з'яўляюцца прынцыпы *гістарызму, аб'ектыўнасці* і *сістэмнасці*. У даследаванні выкарыстаны *гісторыка-генетычны* і *параўнальна-гістарычны* метады. У працэсе даследавання аўтар абапіраўся на такія агульнанавуковыя метады, як лагічны, дэдуктыўны, індуктыўны, аналітыка-сінтэтычны, якія дазволілі сістэматызаваць вялікі эмпірычны матэрыял, выявіць галоўнае ў разглядаемых працэсах, усебакова раскрыць тэму ў сукупнасці ўзаемасувязей. У адпаведнасці з пастаўленымі мэтай і задачамі пры даследаванні сістэмы дзяржаўнага і школьнага краязнаўства ў Беларусі быў выкарыстаны *сістэмна-структурны* падыход. Для пацверджання гістарычнай дакладнасці атрыманых вынікаў выкарыстаны метады *аналогіі* і *супрацьпастаўлення*.

Выкарыстанне гісторыка-генетычнага метаду дало магчымасць прасачыць генезіс БДТАПГіК, грамадскіх культурна-асветніцкіх арганізацый і аб'яднанняў у грамадскім жыцці ў перыяд палітыкі "перабудовы", змены дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да грамадскага краязнаўства.

З дапамогай параўнальнага-гістарычнага метаду аўтар ацаніў асаблівасці развіцця гістарычнага краязнаўства ў саюзных рэспубліках і ў БССР, характар дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да гістарычнага краязнаўства ў перыяд з 1961 па 1985 г. і з другой паловы 1980-х па 1991 г.

Рэпазіторый ВДУ

# ГЛАВА 2

# РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАЎНАГА НАКІРУНКУ ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ Ў 1961–1991 ГГ.

## 2.1. Навуковыя даследаванні інстытутаў АН БССР і краязнаўчая дзейнасць вышэйшых навучальных установ

Актыўнае развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі назіраецца з пачатку 1960-х гадоў. Важнымі фактарамі сталі пэўныя змены ў гістарычнай навуцы: пашырэнне тэматыкі даследаванняў (пошукавая дзейнасць, рэабілітацыя нявінна асуджаных у 1930–1950-я гг. грамадзян, некаторыя аспекты гісторыі Вялікай Айчыннай вайны) і крыніцазнаўчай базы, павялічыўся аб'ём даследаванняў. Колькасць навукоўцаў-гісторыкаў за 10 год (1960–1970 гг.) узрасла больш чым у два разы[273]. У пасляваенныя гады аб'ектыўным працэсам стала дыферэнцыяцыя розных накірункаў краязнаўчых даследаванняў. Больш дакладна вызначыўся гістарычны накірунак, сфарміраваліся асноўныя формы краязнаўства: навуковае, школьнае, грамадскае[274].

У перыядычным друку СССР пачынаецца дыскусія адносна месца і ролі гістарычнага краязнаўства ў жыцці савецкага грамадства. На старонках часопісаў "Коммунист", "История СССР"[275] узнімаюцца пытанні пра аднаўленне дзейнасці Цэнтральнага бюро краязнаўства, стварэння саюзнага перыядычнага друкаванага органа па прыкладу бюлетэня "Наш край", які выдаваўся ў 1920-я гг., разгортвання масавай грамадскай краязнаўчай дзейнасці.

У 1960-я гады вызначаецца тэндэнцыя актывізацыі цікавасці грамадства да пытанняў аховы помнікаў гісторыі і культуры. Яна стала праяўленнем агульнасусветнай традыцыі. Напрыклад, аднаўляецца архітэктурны ансамбль Будапешта, пачынаецца аднаўленне гістарычнага цэнтра Варшавы, Прагі, гарадоў Германіі. Грамадства прыцягвае ўвагу ўрадаў і само актыўна ўключаецца ў дзейнасць па захаванню культурнай

---

[273] Ліндвэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Р. Ліндэр. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – С. 376.

[274] Тронько, П.Т. Развитие исторического краеведения на Украине / Р.Т. Тронько // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 8–15.

[275] Бабишин, С.Д. Краеведение как средство связи школы с жизнью / С.Д. Бабишин. – М.: Просвещение, 1963. – 16 с.; Кабанов, П.И. О советском историческом краеведении / П.И. Кабанов, А.В. Ушаков // История СССР. – 1963. – № 3. – С. 3–17; Лихачев, Д.С. Памятники культуры – всенародное достояние / Д.С. Лихачев // История СССР. – 1961. – № 3. – С. 3–13; Лунин, Б.В. Из опыта историко-краеведческой работы в Средней Азии и Казахстане (20–30 гг.) / Б.В. Лунин // История СССР. – 1968. – № 5. – С. 190–195; Разгон, А.М. Пути советского краеведения / А.М. Разгон // История СССР. – 1967. – № 4. – С. 190–201.



Репозиторий ВГУ

спадчыны. У Беларусі гэтая тэндэнцыя вызначылася ў актывізацыі дзейнасці па ахове помнікаў гісторыі і культуры: стварэнні “Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”, арганізацыі рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, шырокай дзейнасці па ўпарадкаванні месцаў пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны і ўзвядзення помнікаў у гонар загінуўшых салдат.

Значная праца краязнаўчай накіраванасці праводзілася структурнымі падраздзяленнямі АН БССР: Інстытутам гісторыі, Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Ва ўсіх рэгіёнах краіны ішлі археалагічныя раскопкі, якія самі па сабе з’яўляліся і краязнаўчымі даследаваннямі. У краіне склалася практыка, калі археолагі замацоўваліся за пэўнымі рэгіёнамі і помнікамі, праводзілі іх сістэматычную распрацоўку, што мела важнае значэнне для вывучэння мінулага рэгіёнаў Беларусі.

Даследаваннямі Брэстчыны, напрыклад, у 1960–1980-я гг. займаліся У.Ф. Ісаенка, П.Ф. Лысенка; Віцебшчыны – Т.С. Бубенька, Л.У. Дучыц, В.М. Ляўко, С.В. Тарасаў, В.В. Шадыра, Г.В. Штыхаў; Гомельшчыны – В.В. Багамольнікаў, У.Д. Будзько, В.С. Вяргей, А.А. Макушнікаў, С.Я. Рассадзін; Гродзеншчыны – Я.Г. Звяруга, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, А.А. Трусаў, М.М. Чарняўскі; Магілёўшчыны – В.Ф. Капыцін, А.Г. Калечыц, У.П. Ксяндзоў, Л.Д. Побаль; Міншчыны – Э.М. Загарульскі, Ю.А. Заяц, А.Р. Мітрафанаў, В.Р. Тарасенка і інш. У выніку даследаванняў, якія мелі на мэце вывучэнне мінулага Беларусі, былі створаны навуковыя працы па гісторыі асобных гарадоў і рэгіёнаў. У якасці прыклада прывядзем даследаванні Л.В. Аляксеева[276], Ф.Д. Гурэвіч[277], Л.У. Дучыц[278], Э.М. Загарульскага[279], Я.Г. Звяругі[280], П.Ф. Лысенка[281], В.М. Ляўко[282], С. Тарасава[283], Г.В. Штыхава[284].

[276] Алексеев, Л.В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.

[277] Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок / Ф.Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 123 с.

[278] Дучыц, Л.У. Край блакітных азёр / Л.У. Дучыц. – Мінск: Полымя, 1988. – 39 с.

[279] Загорульский, Э.М. Древний Минск / Э.М. Загорульский. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 119 с.; Загорульский, Э.М. Возникновение Минска / Э.М. Загорульский. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 358 с.

[280] Зверуго, Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1989. – 207 с.; Зверуго, Я.Г. Древний Волковыск / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1975. – 145 с.

[281] Лысенко, П.Ф. Города Туровской земли / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1974. – 199 с.; Лысенко, П.Ф. Берестье / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 399 с.

[282] Левко, О.Н. Витебские изразцы XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1981. – 46 с.; Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.; Левко, О.Н. Экскурсия по древнему Витебску / О.Н. Левко. – Минск: Полымя, 1984. – 32 с.; Левко, О.Н. Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1989. – 88 с.

[283] Тарасаў, С.В. Полацк. IX–XVII стст.: гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.

[284] Штыхов, Г.В. Археология Полоцкой земли за 50 лет / Г.В. Штыхов // Древности Белоруссии: докл. к конф. по археал. Белоруссии, Минск, март 1969 / сост.: В.Д. Будько [и др.]. – Минск, 1969. – 475 с.; Штыхов, Г.В. Древний Полоцк. IX–XIII вв. / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 135 с.; Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.; Штыхаў, Г.В. Ажываюць сівыя стагоддзі / Г.В. Штыхаў. – Мінск: Нар. асвета, 1982. – 175 с.

Рэпазіторый ВГУ

На Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) АН БССР была ўскладзена задача стварэння збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. У адпаведнасці з пастановай АН СССР і Міністэрства культуры СССР “Аб падрыхтоўцы «Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР»” (1967) у структуры інстытута быў створаны сектар “Збору помнікаў гісторыі і культуры”[285]. Да працы былі далучаны вядучыя навуковыя кадры рэспублікі і з іншых навуковых устаноў: Інстытута гісторыі АН БССР, НДІ “Белспецрэстаўрацыя”, дзяржаўных музеяў, ВНУ. Загадчыкам аддзела спачатку быў У.І. Няфёд, потым С.В. Марцэлеў[286]. Супрацоўнікі сектара праводзілі пастаянныя навуковыя экспедыцыі ў рэгіёны краіны. Напрыклад, у 1970, 1973 гг. – у Гродзенскую вобласць, 1971 – у Віцебскую[287]. Штогод сектар ладзіў да трох комплексных экспедыцый[288].

Сумесна з аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР, выдавецтвам “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя”, з абласнымі, раённымі аддзяленнямі БДТАПГіК(на якія таксама былі ўскладзены абавязкі па збору матэрыялаў да выдання) і абласнымі краязнаўчымі музеямі былі створаны спісы, апісанні, праведзены фіксацыя і абмеры помнікаў гісторыі і культуры. Сумеснай працай навукоўцаў і пярвічных арганізацый БДТАПГ і К, выкладчыкаў навучальных устаноў, краязнаўцаў-аматараў былі складзены гістарычныя даведкі на ўсе віды помнікаў, заведзены гістарычныя фармуляры з апісаннем падзей, якім прысвечаны помнік, складзены спісы загінуўшых, апавяданні пра падзеі вайны ў пэўнай мясцовасці, вялася перапіска са сваякамі і аднапалчанамі. Зразумела, што кіруючая і арганізуючая роля належала прафесіяналам – спецыялістам дзяржаўных устаноў. Навуковая рэдакцыя, напісанне канцэптуальных гістарычных тэкстаў ускладалася на прафесійных гісторыкаў, архітэктараў.

Кожнай вобласці і г. Мінску прысвячаліся асобныя тамы. Праца над імі заняла больш 20 гадоў. У 1988 г. была выдадзена апошняя кніга 7-томнага выдання “Збору”, якое змяшчала больш за 14 тысяч артыкулаў пра нерухомую гісторыка-культурную спадчыну Беларусі. Праца над зводам помнікаў рэспублікі была высока ацэнена ўрадам краіны. У 1990 г. калектыву была прысуджана Дзяржаўная прэмія[289]. Шкада, што ў сучасным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей іх значна менш.

Репозиторий ВГУ

[285] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 31. – Арк. 32–33. Постановления и распоряжения президиума ЦС БДООПиК за 1970 г.

[286] Гатоўчыц, І. Спакоранасць перад талентам / І. Гатоўчыц // Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв’ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. – Мінск: Маст. літ., 2005. – С. 69–77.

[287] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 40. – Арк. 44. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972.

[288] Музей старажытнабеларускай культуры / НАН Беларусі; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; рэд. В.О. Шматаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 5.

[289] Самуэль, С. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / С. Самуэль // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 429.

У 2009 г. было 4,5 тысячы[290]. Калі браць Віцебскую вобласць, то на 1985 г. у спісе было 2739 помнікаў, а ў 2008 г. пад аховай знаходзіліся толькі 873 аб’екты[291]. На 2014 год у спісе знаходзяцца 5527 аб’ектаў спадчыны, з іх матэрыяльных нерухомых – 5373, матэрыяльных рухомых – 78, нематэрыяльных праяў творчасці чалавека – 76. Матэрыяльныя аб’екты спадчыны прадстаўлены 2336 помнікамі археалогіі, 1759 помнікамі архітэктуры, 1192 помнікамі гісторыі, 60 помнікамі мастацтва, 11 помнікамі горадабудаўніцтва, 4 запаведнымі мясцінамі[292].

Адметнай падзеяй краязнаўчай накіраванасці стала падрыхтоўка і выданне гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”. Яшчэ ў 1966 г. была прынята пастанова ЦК КПБ “Аб далейшай рабоце па ўвекавечанню гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны”. У адпаведнасці з пастановай была распрацавана маштабная праграма збудавання помнікаў, манументаў, мемарыяльных комплексаў, стварэння музеяў народнай славы, арганізацыі навуковай і пошукавай дзейнасці, масавай прапаганды гераізму савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі сярод насельніцтва[293].

Адной з форм працы стала збіранне і апрацоўка матэрыялаў для стварэння “Летапісу народнай славы” кожнага раёна Беларусі. Для аўтараў, рэдактараў і складальнікаў былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, якія змяшчалі прыкладныя прапановы па вядзенні “Летапісу”, тэматыцы і рэдактарскай апрацоўцы матэрыялаў, прыкладныя патрабаванні пры асвятленні інфармацыйных і біяграфічных артыкулаў, структуры ўкладання матэрыялаў. Першынство ў падрыхтоўцы такога роду выданняў трымала Віцебская вобласць. У 1980 г. у часопісе “Маладосць” быў надрукаваны “Летапіс народнай славы Шумілінскага раёна”. З цягам часу ўзнікла ідэя не абмяжоўвацца тэматыкай Вялікай Айчыннай, а пашырыць межы выдання на іншыя перыяды. Вынікам працы стала з’яўленне гісторыка-дакументальных хронік “Памяць”. Кіраўніцтва падрыхтоўкай і выданнем кніг “Памяць” ажыццяўлялася раённымі і гарадскімі камісіямі на чале з сакратарамі райкамаў і гаркамаў КПБ. Апрацоўкай матэрыялаў кніг і падрыхтоўкай іх да друку займаліся аддзелы культуры гар- і райвыканкамаў, аддзелы прапаганды і агітацыі партыйных камітэтаў, выкладчыкі ВНУ, навукоўцы з Інстытута гісторыі, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Репозиторий ВГУ

---

[290] Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад.: В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.
[291] Тамсама. – С. 118–218.
[292] Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей уключае больш за 5,5 тысяч аб’ектаў [Электронны рэсурс] // БЕЛТА. – Рэжым доступу: http://blr.belta.by/all_news/culture/Sps-gstoryka-kulturnyx-kashtonastsej-Belarus-kljuchae-bolsh-za-55-tys-abekta_i_73533.html. – Дата доступу: 21.05.2015.
[293] Скалабан, В. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”: эвалюцыя краязнаўчага выдання / В. Скалабан // Студії з архівної справи та документознавства / Дзержкомархів України; УНДІАСД; рэдкол.: І.Б. Матяш (гол. ред) [та ін.]. – К., 2003. – Т. 10. – С. 187.

Трэба адзначыць, што вялізную працу па падрыхтоўцы і выданні гісторыка-культурных хронік разам з дзяржаўнымі ўстановамі і навуковымі арганізацыямі адыгралі грамадскія арганізацыі і краязнаўцы-аматары. Імі была зроблена вялікая праца па выяўленні архіўных матэрыялаў, асоб, складанні спісаў загінуўшых землякоў у часы Вялікай Айчыннай вайны, сабрана інфармацыя пра вядомых землякоў, напісана значная колькасць артыкулаў.

У 1985 г. у выдавецтве "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" выйшла гісторыка-дакументальная хроніка Шумілінскага раёна, якая паклала пачатак гэтаму адметнаму выданню[294]. У 1989 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнага камітэта па выданні гісторыка-дакументальных хронік раёнаў нашай краіны. Былі распрацаваны новыя, з улікам атрыманага досведу, рэкамендацыі па зборы матэрыялаў і напісанні гісторыка-дакументальных кніг "Памяць". Савет Міністраў БССР 27 мая 1991 г. прыняў пастанову № 203 "Аб выданні ў рэспубліцы кніг «Памяць»". У адпаведнасці з ім Дзяржкамітэт быў пераўтвораны ў арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гісторыка-дакументальных хронік "Памяць" Міністэрства інфармацыі БССР (кіраўнік А. Петрашкевіч). Да 2005 года выдавецтвамі Беларусі былі выдадзены ўсе з запланаваных 146 тамоў гэтай серыі[295].

Пэўнаму разгортванню краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах рэспублікі спрыяла праца Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР па арганізацыі гісторыка-этнаграфічнага музея БССР, неабходнасць стварэння якога была абгрунтавана ў запісцы, накіраванай кіраўніцтвам інстытута ў ЦК КПБ[296] (такія музеі ўжо існавалі ў суседніх рэспубліках).

На наш погляд, асаблівай адзнакі ў развіцці краязнаўчых даследаванняў у Беларусі заслугоўвае дзейнасць дзяржаўных органаў па даследаванні гістарычных цэнтраў гарадоў і перспектыў іх забудовы. Пачатая ў 1960–1970-я гады праца па ахове і аднаўленню гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі патрабавала сур'ёзнага вывучэння спецыялістамі шырокага спектра навук, але ў іх аснове ляжалі краязнаўчыя даследаванні і дапамога мясцовых аматараў даўніны. Падрыхтоўка дакументаў, даведак, будаўнічай праектна-каштарыснай дакументацыі, ацэнка значнасці пабудоў патрабавала дастаткова грунтоўнага вывучэння як гісторыі рэгіянальнага цэнтра (горада, пасёлка і г.д.), так і сацыяльнага заказу, абставін пабудовы помніка і яго сучаснай перспектывы[297].

---

[294] Скалабан, В. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць": эвалюцыя краязнаўчага выдання / В. Скалабан // Студії з архівної справи та документознавства / Держкомархів України; УНДІАСД; рэдкол.: І.Б. Матяш (гол. ред.) [та ін.]. – К., 2003. – Т. 10. – С. 188.

[295] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / Ин-т истории НАН РБ; сост.: А.А. Коваленя (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БЕЛТА, 2005. – С. 513.

[296] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 94. – Арк. 12–14. Даведкі, інфармацыі ў ЦК КПБ, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Савет міністраў БССР аб стварэнні ў рэспубліцы музея народнай архітэктуры, стане, уліку і ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, асноўных формах працы Бюро прапаганды ведаў пра помнікі гісторыі і культуры (1975–1976 гг.).

[297] ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 253. – Арк. 123. Исторические справки на города Чаусы, Чериков, Шклов, Хотимск (1983).



Рэпазіторый ВДУ

У ліпені 1971 года Дзяржбуд БССР і Міністэрства культуры па прапанове БДТАПГіК зацвердзілі спіс гарадоў (21 горад), якія мелі архітэктурныя ансамблі і комплексы, прадстаўлялі архітэктурную і гістарычную каштоўнасць і патрабавалі асаблівых адносін пры рэканструкцыі і забудове[298].

У 1976–1977 гг. даследаваліся 16 гарадоў і населеных пунктаў: Пружаны, Бешанковічы, Браслаў, Глыбокае, Друя, Паставы, Дзятлава, Жыровічы, Шчучын, Любча, Шчорсы, Гайцюнішкі, Валожын, Быхаў, Мсціслаў, Шклоў[299]. Кіраўніцтва і падрыхтоўка дакументацыі былі ўскладзены на старшыню секцыі архітэктурных помнікаў Цэнтральнага савета таварыства В.А. Чантурыя.

Па заказу БДТАПГіК кафедрай гісторыі і тэорыі архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута на працягу 1976–1981 гг. у абласцях рэспублікі былі даследаваны яшчэ 40 гарадоў на прадмет выяўлення і ацэнкі той гісторыка-архітэктурнай і горадабудаўнічай спадчыны, якая ў іх захавалася[300]. Даследаванні паказалі, што спіс трэба пашыраць. Матэрыялы з адпаведнымі рэкамендацыямі секцыя архітэктуры таварыства даслала ў абласныя выканкамы[301].

Сваімі дзеяннямі дзяржаўныя органы садзейнічалі захаванню старой забудовы і планіроўкі, правядзенню рэстаўрацыі, рэканструкцыі і праектавання гістарычных цэнтраў, распрацоўцы ахоўных зон і зон рэгулявання забудовы помнікаў культуры[302]. Хаця, трэба прызнаць, былі і адмоўныя вынікі практычна ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах краіны.

Аналіз дысертацыйных даследаванняў сведчыць пра тое, што краязнаўчая тэматыка не знайшла шырокага выкарыстання ў вывучаемы перыяд. Так, у 1960–1964 гг., былі абаронены 4 работы і 1971–1974 гг. – 3 дысертацыі па рэгіянальнай тэматыцы. Адзначым, што калі на пачатку 1960-х гг. пераважала сацыяльна-эканамічная тэматыка вывучэння эпохі феадалізму, то на пачатку 1970-х г. тэмы былі звязаны толькі з вывучэннем Вялікай Айчыннай вайны. Да 1991 г. у Беларусі былі абаронены яшчэ толькі дзве работы, якія насілі рэгіянальны характар – у 1982 і 1985 гг. Такі вывад намі зроблен на падставе аналізу бібліяграфічнага паказальніка падрыхтаванага У.М. Міхнюком[303].

---

[298] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 51. – Арк. 4. Пратаколы пасяджанняў Прэзідыума Цэнтральнага і абласных саветаў БДТАПГіК і дакументы да іх (8.02.–27.11. 1972 г.).

[299] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 130. – Арк. 3. Постановления пленумов, заседаний президиума Республиканского Совета БДООПиК.

[300] ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 310. – Арк. 26. Перспективны план сооружения, реконструкции и реставрации памятников истории и культуры Могилевской области на 1986–1990 гг.

[301] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 101. – Арк. 15. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1981 г.

[302] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 130. – Арк. 1–2. Постановления пленумов, заседаний президиума Республиканского Совета БДООПиК.

[303] Міхнюк, У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь (1991–2003 гг.): бібліяграф. паказчык / У.М. Міхнюк. – Мінск: НАРБ, 2006. – 68 с.



Репозиторий ВГУ

Значную ролю ў краязнаўчым вывучэнні Беларусі адыграла выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя". Менавіта яму належыць першынство ў выданні найбольш значных прац, якія насілі краязнаўчы характар: "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" (па абласцях), гісторыка-дакументальных хронік раёнаў Беларусі "Памяць", энцыклапедычных даведнікаў, прысвечаных абласным цэнтрам Беларусі. Пачатковыя этапы працы над будучымі выданнямі (пошук ідэй, выпрацоўкі канцэпцыі, метадычных падыходаў, крытэрыяў будучага выдання, распрацоўкі тэматычнага і генеральнага слоўніка, вызначэнні аўтараў) рабіўся калектывам выдавецтва. На этапах напісання шэрага артыкулаў, іх рэцэнзавання, пошуку ілюстрацыйнага матэрыялу навукоўцы часта звярталіся да мясцовых краязнаўцаў. Створаная сістэма працы дазваляла атрымліваць у выніку якасныя выданні. Асобна адзначым менавіта серыю энцыклапедычных даведнікаў, прысвечаных абласным цэнтрам: рэгіянальныя энцыклапедычныя даведнікі: "Брэст"[304], "Віцебск"[305], "Гомель"[306], "Гродна"[307] і іншыя. Даведнікі складаліся з агульнага тэматычнага нарыса і больш за тысячу артыкулаў пра гістарычныя падзеі, дзяржаўныя і грамадскія ўстановы, вуліцы, архітэктурныя помнікі, славутых людзей горада. Дадавалася храналагічная табліца з гісторыі горада, спіс літаратуры. На жаль, так і не пабачылі свет "Беларуская краязнаўчая энцыклапедыя" і даведнік "Краязнаўцы Беларусі".

Асобнымі навукоўцамі ствараліся комплексныя працы і манаграфіі, якія насілі рэгіянальны характар: напрыклад, аб Мінску[308], Полацку[309]. Значная колькасць была прысвечана помнікам гісторыі і культуры асобных гарадоў і абласцей БССР. Сярод комплексу прац адзначым манаграфіі і публікацыі па археалогіі гарадоў і тэрыторый Л.В. Аляксеева, Ф.Д. Гурэвіч, Л.У. Дучыц, Э.М. Загарульскага, Я.Г. Звяругі, П.Ф. Лысенка, В.М. Ляўко, С. Тарасава, Г.В. Штыхава і іншых даследчыкаў, якіх мы згадвалі вышэй. З друку выйшлі гістарычныя і гісторыка-эканамічныя нарысы, прысвечаныя Вілейцы[310], Іўю[311], Мінску[312], Міру[313], Нясвіжу[314], Полацку[315],

---

[304] Брест: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – 408 с.
[305] Витебск: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с.
[306] Гомель: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 527 с.
[307] Гродно: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1989. – 483 с.
[308] Мы расскажем о Минске / сост.: С. Граховский, В. Карпов, Р. Соболенко. – Минск: Беларусь, 1966. – 212 с.; Чыркі, М.А. Максім Багдановіч у Мінску / М.А. Чыркі. – Мінск: Полымя, 1986. – 31 с.
[309] Полоцк: исторический очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.
[310] Булгак, В.А. Вилейка / В.А. Булгак, В.И. Кебец, М.Н. Клемантович. – Минск: Беларусь, 1984. – 80 с.
[311] Васілючак, М.В. Іўе: гістарычна-эканамічны нарыс / М.В. Васілючак І.П. Крэнь, Я.Н. Мар. – Мінск: Беларусь, 1991. – 127 с.
[312] Шыбека, З.В. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека. – Мінск: Полымя, 1990. – 341 с.
[313] Хілімонаў, В.А. Мірскія былі: гістарычны нарыс / В.А. Хілімонаў. – Мінск: Полымя, 1990. – 50 с.
[314] Шишигина, К.Я. Музы Несвижа / К.Я. Шишигина. – Минск: Полымя, 1986. – 139 с.; Шышыгіна, К.Я. Паданні Нясвіжа / К.Я. Шышыгіна. – Мінск: Полымя, 1990. – 40 с.
[315] Полоцк: исторический очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.

Репозиторий ВГУ

Слуцку[316], Клічаўшчыне[317], Налібоччыне[318] і іншым рэгіёнам Беларусі. Менавіта вучоныя сталі аўтарамі гісторыка-эканамічных нарысаў пра гарады і раёны Беларусі. Шэрагам вядомых гісторыкаў былі напісаны і выдадзены кнігі, у якіх на высокім навуковым узроўні аналізавалася гісторыя, культура мясцовасці, дзе нарадзіўся і вырас даследчык. У якасці прыклада можна спаслацца на працы Г.А. Каханоўскага[319], У.М. Кісялёва[320], А.В. Мальдзіса[321]. Адной з найлепшых краязнаўчых работ можна лічыць кнігу М.М. Улашчыка "Была такая вёска"[322], выдадзеную ў 1988 г.

Навукоўцы бралі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы турысцкіх даведнікаў, пуцяводнікаў і іншых выданняў, прысвечаных славутасцям розных гарадоў і мясцовасцей краіны: Віцебска[323], Магілёва[324], Магілёўшчыны[325], Мінска[326], Міншчыны[327], Нясвіжа[328], Слонімшчыны[329], славутым землякам[330].

*Вышэйшыя навучальныя ўстановы.* Вялікая праца па вывучэнні гісторыі і культуры роднага краю праводзілася гістарычнымі факультэтамі ВНУ рэспублікі. Менавіта тут меўся кваліфікаваны выкладчыцкі састаў,

---

[316] Грицкевич, А.П. Слуцк: историко-экономический очерк / А.П. Грицкевич. – 2-е изд. – Минск: Беларусь. 1970. – 112 с.; Грицкевич, А.П. Древний город на Случи / А.П. Грицкевич. – Минск: Полымя, 1985. – 158 с.

[317] Валаханович, А.И. Кличевщина: историко-экономический очерк / А.И. Валаханович, И.И. Савченко. – Минск: Полымя, 1989. – 62 с.

[318] Прокопчик, Л.Т. В краю Налибокской пущи / Л.Т. Прокопчик. – Минск: Полымя, 1979. – 159 с.

[319] Каханоўскі, Г.А. Маладзечна: гісторыка-эканамічны нарыс / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Полымя, 1988. – 120 с.

[320] Киселев, В.Н. На истоках неманских / В.Н. Киселев. – Мінск: Полымя, 1985. – 112 с.

[321] Мальдзіс, А. Астравеччына, край дарагі… / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 207 с.

[322] Улашчык, М. Была такая вёска: гісторыка-этнаграфічны нарыс / М. Улашчык. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 74 с.

[323] Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска: з гісторыі планіроўкі і забудовы горада / Т.І. Чарняўская. – Мінск: Навука і тэхніка. – 102 с.; Якімовіч, Ю.А. Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX – пачатку XX ст. / Ю.А. Якімовіч. – Мінск: Полымя, 1990. – 46 с.

[324] Городецкий, М.Н. Могилев и окрестности: справочник-путеводитель / М.Н. Городецкий, Е.А. Крисковец. – Минск: Полымя, 1982. – 112 с.

[325] Гордеев, П.Б. Могилевщина: Памятники бессмертной славы / П.Б. Гордеев. – Минск: Полымя, 1986. – 143 с.;

[326] Памятники Минска: справочник-путеводитель / авт.-сост. В.П. Шамов. – Минск, 1990. – 205 с.; Памятники Минска: справочник-путеводитель / авт.-сост. В.П. Шамов. – Минск: Полымя, 1991. – 208 с.; Грахоўскі, С.І. Мінск. Спадарожнік турыста / С.І. Грахоўскі. – Мінск: Беларусь, 1975. – 224 с.; Минск и окрестности: справочник-путеводитель / сост.: В.В. Шарпило, М.И. Потемкин, И.М. Пучинский [и др.]. – Минск: Полымя, 1979. – 139 с.; Мы расскажем о Минске / сост.: С. Граховский, В. Карпов, Р. Соболенко. – Минск: Беларусь, 1966. – 212 с.

[327] Габрусь, Т.В. Помнікі манументальнага дойлідства Міншчыны: гісторыка-мастацтвазнаўчы нарыс / Т.В. Габрусь. – Мінск: Полымя, 1991. – 4 с.; Грамович, В.В. Памятники колхозного строительства в Белоруссии / В.В. Грамович, М.П. Костюк. – Минск: Беларусь, 1976. – 31 с.; Чарняўскі, М.М. Археалагічныя помнікі Міншчыны / М.М. Чарняўскі. – Мінск: Полымя, 1988. – 24 с.; Андрощенко, Н.К. Дорогами подвигов: Путеводитель по местам революционной, боевой, трудовой славы на Минщине / Н.К. Андрощенко. – Минск: Беларусь, 1970. – 168 с.

[328] Чантурыя, У.А. Архітэктурныя помнікі Нясвіжа / У.А. Чантурыя, У.І. Казакоў. – Мінск: Полымя, 1989. – 47 с.; Трэпет, Л.В. Там, дзе гучалі паланэзы / Л.В. Трэпет. – Мінск: Полымя, 1990. – 34 с.

[329] Караткевіч, В.Б. Помнікі Слоніма / В.Б. Караткевіч, А.М. Кулагін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 103 с.

[330] Иоффе, Э.Г. Советские военноначальники на белорусской земле: путеводитель по местам жизни и деятельности / Э.Г. Иоффе. – Минск: Полымя, 1988. – 239 с.

Репозиторий ВГУ

навуковыя кадры, студэнты, якія займаліся гістарычнымі даследаваннямі, выкарыстоўваючы, у першую чаргу, мясцовы (г.зн. краязнаўчы) матэрыял.

На ўсіх гістарычных факультэтах з 1971 г. выкладаўся прадмет "Гістарычнае краязнаўства". У 1980 г. быў выдадзены дапаможнік "Историческое краеведение Белоруссии" пад рэдакцыяй кандыдата гістарычных навук Э.М. Загарульскага. У падручніку пададзены сціслы нарыс гісторыі гістарычнага краязнаўства Беларусі, апісана методыка вывучэння краю, аховы і прапаганды гістарычных каштоўнасцей. Кніга напісана на вялікім гістарычным матэрыяле, абагульняе вопыт краязнаўчай работы ў рэспубліцы. Значнае месца адведзена аналізу форм і метадаў краязнаўчай працы. У вучэбныя планы ВНУ рэспублікі была ўключана музейная, археалагічная, краязнаўчая практыкі, у ходзе якіх студэнты вывучалі гісторыю, геаграфію, помнікі гісторыі і культуры асобных рэгіёнаў Беларусі і сумежных рэспублік СССР.

У Гродзенскім педінстытуце (з 1977 г. – універсітэце) пры кафедры гісторыі БССР на працягу дзясяткаў гадоў працаваў студэнцкі гісторыка-краязнаўчы гурток. Яго кіраўніком з'яўляўся доктар гістарычных навук, прафесар Я.Н. Мараш[331]. Мэтай дзейнасці гуртка з'яўлялася паглыбленне ведаў па гісторыі роднага краю; вывучэнне матэрыялаў архіваў на Гродзеншчыне, набыццё навыкаў працы з гістарычнымі дакументамі і адпаведнай літаратурай[332]. На мясцовым матэрыяле гуртkoўцы займаліся вывучэннем дзейнасці КПБ і КПЗБ у краі; даследавалі гісторыю заводаў і фабрык, калгасаў і саўгасаў, культурных устаноў Гродзеншчыны; праводзілі абагульненне перадавога вопыту работы школьных гісторыка-краязнаўчых гурткоў і музеяў; рабілі апісанне і вывучэнне выяўленых помнікаў гісторыі і культуры краю і выкарыстоўвалі гэтыя матэрыялы ў рабоце па прапагандзе ведаў пра гісторыка-культурную спадчыну[333]. Актыўнымі членамі секцыі быў напісаны шэраг прац, сярод якіх "Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны і іх выкарыстанне пры выкладанні ў школе", "Гісторыя вёскі Дзеравянчыцы Слонімскага раёна", "З гісторыі барацьбы камсамола Берастаўіцкага раёна (1929–1932)", "Рэвалюцыйныя і працоўныя традыцыі працоўных Лідскай абутковай фабрыкі" і шэраг іншых[334].

Гуртkoўцамі рыхтаваліся і праводзіліся тэматычныя экскурсіі: "Рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Гродна", "Іх імёнамі названы вуліцы Гродна", "Партызанскі рух на Гродзеншчыне",

[331] ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. – 119. Личное дело профессора ГрГУ им. Я. Купалы Я.Н. Мараша (1947–1990).
[332] ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 56. Проект устава историко-краеведческого кружка и список бывших членов.
[333] ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 51. Протоколы заседаний историко-краеведческого кружка 1971–1975 гг.
[334] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 61. – Арк. 73–74. Отчеты, справки, информации о работе областного совета общества за 1974 г.; ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 101. – Арк. 20. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1981 г.



Репозиторий ВГУ

“Вызваленне Гродзеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”[335]. Некаторыя студэнты працавалі ў гарадскім экскурсійным бюро, экскурсійным бюро “Спутник” пры абласным камітэце ЛКСМБ[336]. Штогод чыталіся лекцыі на факультэце будучага настаўніка, у школе юнага гісторыка, школах Гродна і іншых гарадах Гродзенскай вобласці. Напрыклад, у 1976/1977 навучальным годзе было прачытана 40 лекцый[337].

На працягу 25 гадоў існавання гісторыка-краязнаўчага гуртка ў яго дзейнасці брала ўдзел больш за 250 чалавек. Было напісана 200 навуковых прац. 78% з іх было адзначана дыпломамі I і II катэгорый на рэспубліканскіх канферэнцыях[338]. Многія гурткоўцы сталі вучонымі, выкладчыкамі ВНУ: І.І. Коўкель, І.П. Крэнь, С.В. Марозава, У.М. Міхнюк, В.М. Чарапіца і інш. Кіраўнік гуртка Я.Н. Мараш абагульніў досвед працы ў спецыяльных выданнях, якія не страцілі сваёй актуальнасці і ў цяперашняй рабоце са студэнцкай моладдзю: “Студэнцкі навукова-даследчы гурток”[339], а таксама метадычных парадах настаўнікам[340].

Значную ролю ў краязнаўчым даследаванні Гомельшчыны адыгрываў гістарычны факультэт Гомельскага ўніверсітэта (1969). Варта прыгадаць тэмы курсавых і дыпломных работ, якія абараняліся на факультэце: “Першыя рэвалюцыянеры Гомельшчыны, якія сустракаліся з Леніным”, “Пра вайсковыя часці, вызваляўшыя гарады і раёны Гомельшчыны”, “Партыйнае падполле і партызанскія стаянкі на тэрыторыі раёнаў Гомельшчыны”, “Пра першых геолагаў, якія знайшлі беларускую нафту”, “Аб працоўных подзвігах майстроў высокага ўраджаю”[341]. У 1980 г. па ініцыятыве гісторыкаў ва ўніверсітэце быў створаны археолага-этнаграфічны музей. Студэнты гістарычных факультэтаў летам праходзілі краязнаўчую выязную практыку[342]. Некаторая частка навучэнцаў ВНУ брала ўдзел у працы будатрадаў, у час якой узводзіліся помнікі, загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны, добраўпарадкоўваліся ваенныя пахаванні, ствараліся альбомы, прысвечаныя гістарычным падзеям у мясцовасці правядзення будоўлі[343].

---

335 ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 61. – Арк. 73–74. Отчеты, справки, информации о работе областного совета общества за 1974 г.

336 ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 101. – Арк. 20. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1981 г.

337 ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 53. – Арк. 13. Документы о работе историко-краеведческого кружка (планы, отчеты, статьи) 1975–1981 гг.

338 ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 98. – Арк. 2. План работы секции исторического краеведения на 1983 г.

339 Мараш, Я.Н. Студенческий научно-исследовательский кружок / Я.Н. Мараш. – Минск: Наука и техника, 1976. – 128 с.

340 Методические рекомендации учителю-стажеру по сбору краеведческого материала (досоветский период) / сост. Я.Н. Мараш. – Гродно: ГОУТ, 1988. – 23 с.

341 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 24. Справаздачы Цэнтральнага і абласных саветаў БДТАПГіК аб працы за 1969 г.

342 Гнеўка, М.Р. Студэнтскія маршруты / М.Р. Гнеўка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 3. – С. 39.

343 НАРБ. – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Краязнаўчая праграма для студэнцкіх атрадаў.

Репозиторий ВГУ

Выкладчыкі ВНУ бралі ўдзел у падрыхтоўцы выданняў, прысвечаных гісторыі і культуры рэгіёнаў. Напрыклад, выкладчыкам Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава М.С. Рыўкіным былі падрыхтаваны працы па методыцы выкарыстання краязнаўчага матэрыялу ў школьным навучанні і выхаванні[344], а дацэнтам гэтага ж інстытута Н.І. Дарафеенка – кнігі "Віцебскае падполле"[345], "Юныя героі Віцебшчыны"[346].

Праведзены аналіз дзейнасці некаторых ВНУ Беларусі дазваляе зрабіць вывад пра тое, што праца гістарычных факультэтаў істотна актывізавала краязнаўчыя даследаванні ў рэгіёне (Гродна, Гомель, Магілёў, Мінск). У той жа час трэба канстатаваць, што ў абласных цэнтрах, дзе адсутнічалі гістарычныя факультэты (Брэст, Віцебск) краязнаўчае вывучэнне рэгіёнаў адбывалася больш павольна[347].

У другой палове 1980-х гг. ВНУ, разам з музеямі, архівамі, аддзеламі культуры аблвыканкамаў, выступалі ініцыятарамі правядзення навуковых канферэнцый на краязнаўчую тэматыку. Напрыклад, у Гродне ў 1988 г. адбылася канферэнцыя "Развіццё гістарычнага краязнаўства ў ВНУ". У ёй прынялі ўдзел 13 дактароў, 58 кандыдатаў навук, супрацоўнікі інстытута гісторыі АН БССР, археолагі, архівісты, музейныя работнікі, студэнты, аматары – усяго 330 чалавек. Была прынятая пастанова стварыць рэспубліканскі каардынацыйны і абласныя саветы па гістарычным краязнаўстве, правесці рэспубліканскі краязнаўчы з'езд. Па матэрыялах канферэнцыі быў выдадзены зборнік артыкулаў[348].

Падобныя канферэнцыі прайшлі ў іншых гарадах краіны: "Стан і задачы далейшага развіцця краязнаўства ў Брэсцкай вобласці" (Брэст, 1988), Першая Гомельская абласная навуковая канферэнцыя па гістарычным краязнаўстве (Гомель, 1989), Абласная навукова-практычная канферэнцыя па гістарычнаму краязнаўству (Віцебск, 16–17 студзеня 1990).

У апошняй, напрыклад, прынялі ўдзел выдатныя беларускія, расійскія і латышскія навукоўцы: Я.К. Анішчанка, Ш.І. Бекцінееў, А.П. Грыцкевіч, А.Г. Каханоўскі, У.П. Ксянзоў, Л.У. Лучын, В.М. Ляўко, В.Л. Насевіч, В.С. Мянжынскі, Л.Д. Побаль, Г.М. Семянчук, А.А. Трусаў, С.М. Ходзін, А.К. Цітоў, І.У. Чаквін, М.М. Чарняўскі, В.І. Шадыра, Г.В. Штыхаў (Мінск), Я.Н. Мараш, Э.С. Ярмусік (Гродна), В.А. Булкін,

---

[344] Рыўкін, М.С. Эстэтычнае выхаванне вучняў у краязнаўчай рабоце па гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Вучпедвыд БССР, 1963. – 72 с.; Рыўкін, М.С. Скарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Нар. асвета, 1965. – 154 с.

[345] Пахомов, Н.И. Витебское подполье / Н.И. Пахомов, Н.И. Дорофеенко, Н.В. Дорофеенко. – 2-е изд. – Минск: Беларусь, 1974. – 223 с.

[346] Дорофеенко, Н.И. Юные герои Витебщины / Н.И. Дорофеенко [и др.]. – Минск: Нар. асвета, 1980. – 127 с.

[347] Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В. Півавар // Беларус. гіст. часоп. – 2005. – № 3. – С. 46–52.

[348] Развитие исторического краеведения в вузах БССР в свете перестройки высшего образования: сб. науч. ст. / Грод. гос. ун-т им. Я. Купалы; І.П. Крень (отв. ред.). – Гродно: Изд-во ГрГУ, 1989. – 123 с.

Репозиторий ВГУ

В.А. Рачкоўскі, В.М. Смірноў (Ленінград), М.В. Вераб'ёў (Калінін), Я.Я. Граўдоніс, М.А. Кравінска, В. Цырсіс, Ю.У. Уртанс (Рыга), Я.А. Шмідт (Смаленск) і іншыя даследчыкі. Свае паведамленні прачыталі і мясцовыя краязнаўцы: В. Ермалёнак, І. Пракаповіч, В. Шышанаў, Л. Хмяльніцкая, В. Арлоў, К. Кажан, У. Драбашэўскі, Б. Гордзін, Л. Бруева, М. Шкадаў і іншыя[349].

*Узаемасувязь навуковага і грамадскага накірункаў*. На працягу 1960–1980-х гг. назіраецца цесная ўзаемасувязь паміж навуковым і грамадскім накірункамі краязнаўства Беларусі. Навуковыя супрацоўнікі акадэмічных устаноў бралі актыўны ўдзел у працы грамадскіх таварыстваў, дзейнасць якіх мела краязнаўчую накіраванасць. Яны ўваходзілі ў склад прэзідыумаў арганізацый, з'яўляліся "генератарамі" ідэй, кваліфікаванымі арганізатарамі і прафесійнымі выканаўцамі. Па сутнасці большасць супрацоўнікаў Інстытута гісторыі, ІМЭФ АН БССР уваходзілі ў склад рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў, Беларускага фонду культуры, таварыства "Веды", Беларускага краязнаўчага таварыства – найбольш важных грамадскіх краязнаўчых арганізацый БССР. Напрыклад, у склад краязнаўчай камісіі Беларускага аддзялення Савецкага фонду культуры, утворанай у 1987 г., уваходзілі вядомыя гісторыкі і краязнаўцы: Г.А. Каханоўскі, А.А. Трусаў, Э.М. Загарульскі, Г.В. Кісялёў, А.М. Люты, Э.А. Ляўкоў, В.Н. Рабцэвіч, К.І. Тарасаў, А.К. Цітоў, В.А. Чамярыцкі, Г.В. Штыхаў, Э.В. Ялугін[350].

У 1990 г. пры Міністэрстве культуры была створана камісія па распрацоўцы доўгатэрміновай комплекснай праграмы "Спадчына". У яе падрыхтоўцы прынялі ўдзел даследчыкі, якія ўваходзілі ў краязнаўчую камісію БФК. Прапановы па яе дапрацоўцы былі надрукаваны ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" за 15 красавіка 1990 г.

Сярод найбольш актыўных дзеячаў грамадскіх таварыстваў былі вядомыя навукоўцы краіны, якія, працуючы ва ўстановах, вырашалі важныя задачы навуковага краязнаўства. Напрыклад, у склад рэспубліканскага праўлення БДТАПГіК уваходзіў доктар гістарычных навук Э.М. Загарульскі. Дзякуючы супрацоўніцтву таварыства і кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін БДУ імя У.І. Леніна, у праграму ВНУ краіны быў уключаны курс гістарычнага краязнаўства. Быў напісаны вучэбны дапаможнік, які не толькі даваў апісанне markdown розных роду помнікаў гісторыі і культуры, але і ўтрымліваў метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі працы з такімі помнікамі, методыцы стварэння музеяў, афармленні калекцый. Можна лічыць, што гэтае выданне задала своеасаблівы алгарытм працы для настаўнікаў, краязнаўцаў-аматараў Беларусі і стала іх "настольнай" кнігай.

[349] Праграма абласной навукова-практычнай канферэнцыі па гістарычнаму краязнаўству, Віцебск, 16–17 студ. 1990 // Бягучы архіў Л. Хмяльніцкай.

[350] НАРБ. – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Спіс вядучых краязнаўцаў Беларусі і саюзных рэспублік.

Рэпазіторый ВДУ

На II з’ездзе БДТАПГіК у 1971 г. доктар гістарычных навук Л.Д. Побаль прапанаваў, у мэтах пашырэння прапаганды ведаў аб помніках гісторыі і культуры, унесці змены ў вучэбныя планы школ і ВНУ Беларусі. Прапанова была падтрымана навукоўцамі Інстытутаў гісторыі і мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, якія распрацавалі тэматыку курсавых і дыпломных работ краязнаўчай накіраванасці. Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі былі зацверджаны новыя вучэбныя планы ВНУ[351].

У канцы 1980-х гг. ва ўсіх абласных цэнтрах па ініцыятыве дзяржаўных органаў, ВНУ, краязнаўчых музеяў і грамадскіх арганізацый прайшлі краязнаўчыя канферэнцыі. У іх часта разам з вядомымі навукоўцамі і выкладчыкамі бралі ўдзел краязнаўцы-аматары. Такія канферэнцыі былі звязаны з вывучэннем краю і былі добрай школай для шараговых краязнаўцаў.

## 2.2. Краязнаўчая дзейнасць музеяў, архіваў, бібліятэк

Роля музеяў як цэнтраў краязнаўчых даследаванняў была зафіксавана ў шэрагу пастаноў КПСС/КПБ і дзяржаўных органаў – “Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай працы” (1938) “Аб паляпшэнні работы музеяў і разгортванні краязнаўства ў Беларусі” (ЦК КП(б)Б, 1947), “Пра павышэнне ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных” (ЦК КПСС, 1964) і іншых. Яны вызначалі статус краязнаўчых музеяў і як навукова-метадычных цэнтраў, пад кіраўніцтвам якіх ажыццяўлялася праца грамадскіх арганізацый па вывучэнні роднага краю[352].

На працягу 1960–1980-х гг. назіралася агульнае пашырэнне музейнай сеткі, паляпшэнне якасці экспазіцый, што сведчыла аб узрастанні грамадскай актыўнасці насельніцтва і яго цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, на 1960 г. у сістэме Міністэрства культуры БССР было 42 музеі, а на пачатку 1991 г. – 141. Гэта значыць, што на працягу 30 гадоў у краіне было адчынена амаль 100 музеяў. Найбольш шматлікая (каля 80%) група дзяржаўных музеяў БССР мела краязнаўчы профіль[353]. Адны з музеяў ствараліся Міністэрствам культуры БССР, іншыя арганізоўваліся па ініцыятыве краязнаўцаў-аматараў і толькі потым набывалі дзяржаўны статус.

Вялікую вядомасць атрымалі раённыя гісторыка-краязнаўчыя музеі, створаныя ў гарадах: Пухавічы (1964), Дзятлаве (1966), Клічаве (1966), Бягомлі (1968), Карэлічах (1970), Паставах (1974), Лунінцы (1978), Клецку

---

[351] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 51. – Арк. 24–38. – Пратаколы пасяджанняў Прэзідыума Цэнтральнага і абласных саветаў БДТАПГіК і дакументы да іх (8.02.–27.11.1972 г.).
[352] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – С. 28.
[353] Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2004. – С. 160.



Репозиторий ВГУ

(1979), Уздзе (1981), Браславе (1982), Смаргоні (1984), Шуміліна (1984), Чашніках (1987), Нясвіжы (1989) і іншых населеных пунктах БССР.

Вылучым асноўныя накірункі і формы краязнаўчай працы дзяржаўных музеяў на прыкладзе Віцебскага абласнога краязнаўчага і гісторыка-археалагічнага музея г. Гродна.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці рэгіянальных гісторыка-краязнаўчых музеяў у вывучэнні і распаўсюджванні ведаў аб пэўным рэгіёне з'яўляліся збіральніцка-экспазіцыйны, навукова-метадычны і культурна-асветніцкі.

У межах *збіральніцка-экспазіцыйнага накірунку* ў першую чаргу галоўную ролю адыгрываў збор фондаў, папаўненне і экспанаванне сабраных матэрыялаў па гісторыі краю. Разам з імі важнае месца займалі *афармленне і пераафармленне тэматычных экспазіцый*. Зразумела, што ў працы любога музея сумесна са збіраннем матэрыялаў важнае значэнне мела стацыянарнае і выяздное *экскурсійнае абслугоўванне*.

Адзначым, што галоўнай задачай у экспазіцыйнай працы музея лічылася стварэнне экспазіцыі, прысвечанай гісторыі савецкага перыяду 1917–1945 гг. У адпаведнасці з гэтым арганізоўвалася і збіральніцкая праца музеяў. Напрыклад, у 1970 г. у асноўны фонд ВАКМ паступілі 972 экспанаты, з іх 633 адносіліся да перыяду 1917–1945 гг. і 322 да перыяду сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва[354]. У 1974 г. з 719 паступіўшых у асноўны фонд прадметаў да савецкага перыяду адносіліся 475[355]. У 1977 г. з 1632 экспанатаў – 1575. У сувязі са святкаваннем юбілею Кастрычніцкай рэвалюцыі асаблівая ўвага надавалася збору матэрыялаў пра матросаў "Аўроры" – віцяблян, удзельнікаў устанаўлення савецкай улады[356]. Актывізацыя збіральніцкай працы звычайна адбывалася ў сувязі са святкаваннем юбілеяў партыі і дзяржавы, гадавінаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, юбілеяў У.І. Леніна, перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, утварэння СССР/БССР, ВЛКСМ/ЛКСМБ і інш. Значным сродкам атрымання матэрыялаў з'яўляліся *комплексныя экспедыцыі* ў раёны вобласці.

Адной з важных форм экспазіцыйнай працы было правядзенне *тэматычных выстаў*. Як прыклад, тэматыка краязнаўчых выстаў, якія экспаніраваліся ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі на працягу 1960–1980-х гг. і некаторых населеных пунктах Гродзенскай вобласці: "З гісторыі піянерыі і камсамола Гродзеншчыны", "Гродзеншчына за гады савецкай улады", "Прыкладное мастацтва Гродзеншчыны", "Гродзеншчына сёння", "Гродзеншчына ад з'езда да з'езда", "Гродзеншчына ў Х пяцігодцы", "Гродна 850 гадоў", "Край мой родны, Прынямонне", "Гродзеншчына: людзі, справы, падзеі", "Мінулае і будучае Замкавай гары", "Гродна на паштоўках",

[354] Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Навуковы архіў. – Фонд 1248. – Спр. 10. – Арк. 70. Справаздача Віцебскага абласнога краязнаўчага музея за 1970 г.
[355] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 14. – Арк. 67. Справаздача ВАКМ за 1974 г.
[356] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 2. – Арк. 13. Справаздача ВАКМ за 1977 г.

Рэпазіторый ВГУ

“Традыцыі народнай творчасці Гродзеншчыны”, “Археалагічныя даследаванні г. Гродна 1980-х гадоў”, “Гродзеншчына на шляхах перабудовы”, “Праекты рэстаўрацыі Старога замка”[357].

Аналіз справаздач Віцебскага абласнога краязнаўчага музея дазваляе вылучыць падобную тэматыку выстаў і на Віцебшчыне: “Гістарычнае мінулае Віцебска”, “Вайна 1812 г. на Віцебшчыне”, “Гістарычныя помнікі Віцебшчыны”, “Помнікі гісторыі і культуры Бешанковіцкага, Лёзненскага раёна”, “Кастрычнік у Віцебску”, “Аб выніках культурнай рэвалюцыі на Віцебшчыне 1917–1941 гг.”, “Віцябляне – удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны”, “Працоўныя Віцебска і Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, “Віцябляне – Героі Савецкага Саюза”, “Вызваленне Віцебшчыны” “Партызанскі рух на Віцебшчыне”, “Камсамол на Віцебшчыне ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны”, “Іх імёнамі названы вуліцы нашага горада” і шэраг іншых[358]. Перасоўныя выставы экспанаваліся ў тэатры імя Якуба Коласа, абласной бібліятэцы, у раённых палацах культуры, доме Палітасветы, на абласных турзлётах і ў некаторых іншых месцах.

*Навукова-метадычная* праца аддзелаў краязнаўчых музеяў заключалася ў распрацоўцы навуковых тэм і напісанні гістарычных і навуковых даведак. У ВАКМ на працягу вывучаемага перыяду былі падрыхтаваны навуковыя даведкі па гісторыі прадпрыемстваў і ўстаноў Віцебшчыны, прысвечаныя дзеячам партыі, камсамола, розным пытанням гісторыі і культуры рэгіёна. Сярод іншых адзначым: “Віцебская губерня ў пачатку ХХ ст.”, “Віцебшчына за 50 гадоў савецкай улады”, “Гісторыя г. Дрыса”, “Гісторыя г. Гарадок”, “Культура г. Віцебска Х–ХІІІ ст.”, “Гісторыя віцебскага трамвая”, “З гісторыі Віцебскага аблвыканкама”, “Друк у акупаваным Віцебску 1941–1944 гг.”. На працягу 1960–1980-х гг. супрацоўнікамі музея распрацоўваліся тэмы “Камбеды на Віцебшчыне”, “Рэўкамы на Віцебшчыне”, “Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Віцебшчыне”. Вывучаліся таксама тэмы “Стан царкоўна-прыходскіх школ у Віцебскай губерні”, “Царква на Віцебшчыне”[359].

Важнай формай прэзентацыі краязнаўчых матэрыялаў і азнаямлення навуковых кадраў і шырокіх слаёў грамадскасці з вынікамі працы музеяў сталі арганізацыя і ўдзел у семінарах і ***канферэнцыях*.** Штогод кожны абласны краязнаўчы музей ладзіў канферэнцыю для супрацоўнікаў музеяў вобласці. Пастаянна, сумесна з абласнымі дзіцячымі турысцка-экскурсійнымі станцыямі праводзілася не менш за 4 семінары для настаўнікаў школ вобласці, адказных за турысцка-краязнаўчую працу. Супрацоўнікі музеяў вучылі настаўнікаў правільнай арганізацыі працы

---

[357] Царук, В.М. Хроніка музея за 80 гадоў (1920–2000) / В.М. Царук, Л.В. Фёдарава // Краязнаўчыя запіскі. – Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей / уклад. В.М. Царук. – Гродна: ГАУПП “Гродз. друкарня”, 2003. – Вып. 6. – С. 83–182.

[358] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 1–5. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за перыяд 1976–1980 гг.

[359] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 1–15. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за перыяд 1961–1975 гг.



Репозиторий ВГУ

школьнага краязнаўчага музея. Спашлемся на тэматыку прадстаўленых на семінарах лекцый: "Стварэнне і афармленне мемарыяльнага музея", "Навукова-даследчая праца і стварэнне школьнага музея", "Стварэнне экспазіцыі па перыяду развітога сацыялізму ў СССР"[360].

З канца 1980-х гадоў праца па арганізацыі і правядзенні канферэнцый значна актывізавалася. Толькі ў Гродне пры непасрэдным удзеле дзяржаўных музеяў былі праведзены канферэнцыі: "Гісторыка-медыцынскія помнікі і ахова здароўя Гродзеншчыны" (29 верасня 1990), "Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства" (8–9 кастрычніка 1990), "Да 100-годдзя нараджэння Ю. Ядкоўскага" (26 снежня 1990), "Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны: пошук, вывучэнне, ахова" (26 лістапада 1991).

Краязнаўчыя музеі аказвалі метадычную дапамогу школьным, ведамасным, грамадскім музеям. Рэцэнзавалі тэматыка-экспазіцыйныя планы дзяржаўных раённых музеяў. На базе музеяў праводзілася музейная практыка студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ краіны.

Асаблівую значнасць атрымаў *асветніцкі накірунак* дзейнасці краязнаўчых музеяў. Разам з правядзеннем экскурсій, супрацоўнікі музеяў практыкавалі чытанне *лекцый* на краязнаўчую тэматыку ў сценах музея і ўстановах горада. Напрыклад, у ВАКМ на працягу 1960–1980-х гадоў чыталіся лекцыі: "Віцебск старажытны", "Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Віцебшчыне", "Героі Савецкага Саюза – удзельнікі вызвалення Віцебшчыны", "Віцебшчына ў перыяд акупацыі", "Віцебск у мінулым, цяперашнім і будучым", "Віцебск сёння", "Віцебшчына ад з'езда да з'езда". Падобная форма працы знайшла распаўсюджанне і ў Гродне. Тут праводзіліся *краязнаўчыя лекторыі*. У розны час яны арганізоўваліся ў Палацы культуры тэкстыльшчыкаў, інтэрнаце бавоўнапрадзільнай фабрыкі, пагранатрадзе (1971), калгасах "Прагрэс" і "Авангард" Гродзенскага раёна (1973, 1985, 1986), саўгасах "Індура" (1982, 1985), "Шлях да камунізму" (1986–1988), ПТВ № 141, Гібуліцкай 8-гадовай школе.

*Выдавецкая дзейнасць* з'яўлялася адной з важнейшых форм краязнаўчай працы музеяў. Праз публікацыю матэрыялаў у рэспубліканскім і мясцовым друку, выданне даведнікаў, маршрутаў турысцкіх паходаў школьнікаў і моладзі ажыццяўлялася папулярызацыя гісторыі і культуры краю сярод шырокіх мас насельніцтва, фарміраванне грамадскай думкі адносна помнікаў даўніны, аховы спадчыны роднага краю. Гродзенскі музей падрыхтаваў некалькі цікавых выданняў, прысвечаных гісторыі і культуры горада. Супрацоўнікі музеяў бралі ўдзел у падрыхтоўцы артыкулаў для энцыклапедычных даведнікаў абласных цэнтраў "Брэст", "Віцебск", "Гомель", "Гродна", "Магілёў", "Мінск". З канца 1980-х гг. абласныя краязнаўчыя музеі сталі актыўна выдаваць зборнікі матэрыялаў канферэнцый, бюлетэні, альманахі, іншыя

[360] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 1. – Арк. 14. Справаздача ВАКМ за 1976 г.



Рэпазіторый ВДУ

перыядычныя і неперыядычныя выданні. Напрыклад, з 1990 г. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей пачаў выдаваць “Краязнаўчыя запіскі”[361]. Да цяперашняга часу выдадзены 6 зборнікаў. Штогод на старонках мясцовых перыядычных выданняў кожны музей публікаваў каля дзясятка артыкулаў на краязнаўчую тэматыку.

У асветніцкіх мэтах музеямі выкарыстоўваліся і іншыя *сродкі масавай інфармацыі*. Напрыклад, у 1973 г. на Віцебскім абласным тэлебачанні прайшло 5 тэлеперадач “Матэрыялы музея расказваюць”. У 1974 г. – серыя перадач, прысвечаных 1000-годдзю Віцебска, Л.М. Даватару, В.М. Азіну. У кінатэатры “Спартак” праходзіў кіналекторый, арганізаваны віцебскім музеем, на якім дэманстраваліся фільмы: “Рэвалюцыйныя святы ў Віцебску”, “Бітва за Віцебск”, “Горад майго лёсу”[362]. У Гродне ў 1982 г. выходзіў у эфір цыкл перадач “Спадчына”. Штогод супрацоўнікі музеяў рыхтавалі не менш 4 радыёперадач, прысвечаных мясцовай гісторыі. У 1973 г. віцебскія музейныя супрацоўнікі Н.Л. Лагойка, Л.Т. Катлярова выступалі з перадачамі “Барацьба віцяблян за нацыянальную незалежнасць”, “Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны і першай пасляваеннай пяцігодкі” і іншымі[363].

З мэтай прывіцця любові да роднага краю і выхавання патрыятызму насельніцтва музейнымі ўстановамі праводзіліся і *масавыя мерапрыемствы*: уручэнне пашпартоў, камсамольскіх білетаў, сустрэчы моладзі са славутымі землякамі, прыняцце прысягі салдатамі, работнікамі міліцыі.

Змест працы дзяржаўных музеяў, што існавалі ў іншых гарадах Беларусі, прыкладна адпавядаў апісанай дзейнасці музея ў гарадах Віцебску і Гродне[364].

Важныя змены ў дзейнасці музеяў адбываюцца з другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў. Разам з палітыкай перабудовы, адраджэннем цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны, актывізацыяй грамадскага жыцця ў краіне пачаўся пошук новых форм і метадаў працы музеяў краіны, выпрацоўка новай культурнай палітыкі. Узнікаюць альтэрнатыўныя падыходы да асвятлення мінулага, больш разнастайнымі становяцца формы падачы матэрыялаў, тэматыка экспазіцый.

У Віцебску, напрыклад, былі распрацаваны “Прапановы па развіццю музеяў у гарадах і раёнах Віцебскай вобласці на перыяд да 2000 г.”, прынятыя Віцебскім аблвыканкамам. У адпаведнасці з імі планавалася адкрыць 18 музеяў у горадзе і 2 у Віцебскім раёне. Калі на 1985 г. у горадзе было 2 дзяржаўныя музеі, то да 1997 г. іх павінна было быць 20! (табліца 1).

---

[361] Краязнаўчыя запіскі: зб. артыкулаў памяці Ю.Я. Ядкоўскага / уклад. В.М. Царук. – Гродна: Гродз. абл. клінічная бальніца, 1990. – 48 с.
[362] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 13. – Арк. 86. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за 1973 г.
[363] ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 13. – Арк. 96. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за 1973 г.
[364] Царук, В.М. Хроніка музея за 80 гадоў (1920–2000) / В.М. Царук, Л.В. Фёдарава // Краязн. запіскі / уклад. В.М. Царук. – Гродна: ГАУПП “Гродз. друк.”, 2003. – Вып. 6: Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей. – С. 83–182.



Репозиторий ВГУ

План быў змешчаны ў газеце “Віцебскі рабочы” за 7 красавіка і выклікаў грамадскую дыскусію адносна месца размяшчэння, колькасці, зместу будучых музеў. Так, напрыклад, С. Навумчык[365] прапаноўваў для размяшчэння музея літаратуры будынак на вул. Талстога. З.М. Паўлаў лічыў, што для Віцебска, які ганарыцца адным з найлепшых мединстытутаў у СССР, варта стварыць музей гісторыі медыцыны[366]. А. Мемус меркаваў, што размяшчэнне музея архітэктуры і горадабудаўніцтва ў адноўленым будынку Дабравешчанскай царквы XII ст. абясцэніць ідэю і прапаноўваў размясціць яго ў будынку на вул. Калініна, 20. Прычым, аздобіць дэкор кафляй. Цікавай выглядае прапанова аўтара артыкула аб стварэнні “Квартала майстроў” на вул. Грыбаедава, а таксама “Музея старажытных рамёстваў” у адным з будынкаў ансамбля даходных дамоў на рагу вуліц Чэхава і Суворава[367].

Ужо ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. былі заснаваны новыя філіялы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея – Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна “Здраўнёва”, літаратурны музей, мастацкі музей і музей прыватных калекцый. На сёняшні дзень у горадзе існуе 7 музеяў з запланаваных у 1988 годзе.

Табліца 1

**Музейнае будаўніцтва ў Віцебскай вобласці (1988–2000 гг.)**

| № п/п | Назва музея | Месца стварэння, адрас | Запланаваны час стварэння |
|---|---|---|---|
| 1. | Абласны мастацкі музей | г. Віцебск, пл. Свабоды, будынак абкама КПБ | 1991 |
| 2. | Выставачная зала выяўленчага мастацтва (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Леніна, у рэстаўраванай Пакроўскай царкве і манастырскіх будынках | 1991–1993 |
| 3. | Абласны літаратурны (з аддзяленнем гумару і сатыры) | г. Віцебск, вул. Талстога, 3 | 1991–1994 |
| 4. | Музей гісторыі горадабудаўніцтва (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, у адноўленым будынку Дабравешчанскай царквы | 1993–1995 |
| 5. | Экспазіцыя “Антыфашысцкі рух на Віцебшчыне ў комплексе з мемарыялам “Камера фашысцкай турмы СД” | г. Віцебск, вул. Крылова, 7 | 1991–1993 |

[365] Навумчык, С. Не адкладываць на будучыню / С. Навумчык // Віцеб. рабочы. – 1988. – 10 жн. – С. 3.
[366] Паўлаў, М. Не губляю надзеі / М. Паўлаў // Віцеб. рабочы. – 1988. – 10 жн. – С. 3.
[367] Мемус, А. Каб форма адпавядала месту / А. Мемус // Віцеб. рабочы. – 1988. – 10 жн. – С. 3.



Рэпазіторый ВГУ

*Заканчэнне табл. 1*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6. | Абласны музей этнаграфіі і прыкладнога мастацтва | пас. Лужасна, будынак адрэстаўраванай царквы | 1991–1992 |
| 7. | Мемарыяльна-ландшафтны музей І.Я. Рэпіна (філіял ВАКМ) | в. Здраўнёва Віцебскага раёна | 1989–1990 |
| 8. | Музей тэатральнага мастацтва (з аддзелам лялек народаў СССР) | г. Віцебск, вул. Я. Купалы, 19 | 1990–1991 |
| 9. | Музей “Віцебская кафля” (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Даватара, 20 | 1993–1996 |
| 10. | Музей “Кераміка і шкло” (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Даватара, 18 | 1992–1995 |
| 11. | Экспазіцыя “Старадаўняя зброя” (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Фрунзэ, у адноўленай Нарожнай вежы | 1990–1991 |
| 12. | Музей “Жалезных спраў майстры” (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Рэвалюцыйная, 3 | 1993–1996 |
| 13. | Экспазіцыя “Віцебская модніца” (філіял ВАКМ) | г. Віцебск, вул. Суворава, 4 | 1995–1997 |
| 14. | Аддзел нумізматыкі ВАКМ | г. Віцебск, вул. Суворава, 2 (падвалы) | 1993 |
| 15. | Музей заснавальнікаў Віцебскай мастацкай школы | г. Віцебск, вул. Праўды, 5а | 1993–1995 |
| 16. | Дом народных рамёстваў | г. Віцебск, вул. Кастрычніцкая, 3 | 1995 |
| 17. | Музей гісторыі Віцебскага трамвая | г. Віцебск, вул. Фрунзэ, 13 | |
| 18. | Зала-экспазіцыя “У.І. Ленін у выяўленчым мастацтве” | | 1994–1995 |
| 19. | Народны музей У.І. Леніна | г. Віцебск, вул. Леніна, 71 | |
| 20. | Археалагічны “Верхні замак” | г. Віцебск, вул. Пушкіна | 1984 |

Репозиторий ВГУ

Такім чынам, на працягу пасляваеннага перыяду ў Беларусі была створана сістэма музеяў як навукова-асветных устаноў па зборы, вывучэнні, захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і яе рэгіёнаў. Аднак больш грунтоўнаму станаўленню музеяў як цэнтраў краязнаўчай працы перашкаджалі пэўныя аб’ектыўныя (інтэнсіўныя працэсы урбанізацыі) і суб’ектыўныя (недастатковае фінансаванне, недахоп падрыхтаваных навуковых кадраў) прычыны.

Краязнаўчы кампанент у дзейнасці *архіваў* заключаецца ў навуковай, выдавецкай, інфармацыйнай і папулярызатарскай працы. Яна праводзілася ў мясцовым друку, на радыё і тэлебачанні; праз арганізацыю канферэнцый краязнаўчай накіраванасці; падрыхтоўку выданняў, прысвечаных розным аспектам гісторыі і культуры рэгіёна.

У фондах дзяржаўных абласных і занальных архіваў захоўваюцца каштоўныя і цікавыя дакументы, у тым ліку і краязнаўчага характару: службовыя матэрыялы, рукапісы навуковых і літаратурных твораў, мемуары, біяграфіі і аўтабіяграфіі, эпісталярная спадчына дзеячаў краю, комплексы старых мясцовых перыядычных выданняў. На працягу 1960–1980-х гг. супрацоўнікі архіваў займаліся папаўненнем, улікам і апрацоўкай такіх дакументаў, стваралі даведачны апарат і рыхтавалі да друку, выконвалі разнастайныя запыты грамадзян і арганізацый. На аснове архіўных матэрыялаў праводзіліся краязнаўчыя даследаванні.

У вывучаемы перыяд асноўнай формай выкарыстання дакументаў архіваў з’яўлялася публікацыя артыкулаў, падрыхтоўка перадач па гісторыі краю для сродкаў масавай інфармацыі. Напісанне артыкулаў для мясцовага друку ўваходзіла ў службовыя абавязкі навуковага супрацоўніка. Так, напрыклад, дырэктар Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ) К.М. Коласаў з 1958 па 1977 г. стаў аўтарам больш за 75 артыкулаў[368]. Супрацоўнік партархіва Віцебскай вобласці Т.Н. Касцянюк на працягу 1970–1990-х гг. падрыхтавала больш за 60 артыкулаў для рэспубліканскіх і мясцовых перыядычных выданняў[369].

З удзелам супрацоўнікаў ДАВВ з 1960-х да сярэдзіны 1970-х гг. былі падрыхтаваны і праведзены 20 радыё- і 30 тэлеперадач, у якіх асвятляліся розныя аспекты гісторыі Віцебшчыны: “Этапы рэвалюцыі”, “Герой шабельных паходаў” (пра Г.А. Шубіна), “Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі пры вызваленні Віцебска”, “На рубяжы XX стагоддзя” (з гісторыі Віцебска), “Першыя крокі” (да 40-годдзя Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа) і інш.

Аналіз працы архіваў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей дазваляе зрабіць выснову, што асветніцкая, публікатарская дзейнасць архіваў у 60–70-я гг. XX ст. мела, галоўным чынам,

---

[368] ДАВВ. – Фонд 289. – Воп. 1-к. – Спр. 90. Личное дело К.М. Колосова.

[369] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М. Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – С. 124.



Репозиторий ВГУ

“хвалепадобны” характар і ў асноўным прымяркоўвалася да святкавання юбілейных дат у гісторыі камуністычнай партыі, ЛКСМБ, Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі народнай гаспадаркі і асобных прадпрыемстваў.

Пэўныя змены назіраюцца з сярэдзіны 1980-х гг. З актывізацыяй грамадскага жыцця ў краіне, зняццем пэўных ідэалагічных абмежаванняў, пашырэннем тэматыкі даследаванняў набыло актуальнасць правядзенне краязнаўчых канферэнцый.

У Віцебску, напрыклад, у 1987 г. была праведзена навукова-практычная канферэнцыя “Некоторые вопросы истории Витебской областной партийной организации”[370]. У ёй прынялі ўдзел супрацоўнікі архіваў, выкладчыкі мясцовых ВНУ: М.М. Барэнфельд, Я.Л Гельберг, С.Ф. Дахія, В.М. Лайко, Ф.Д. Конін, А.Л. Родзік, В.С. Савіцкая, Н.А. Ярмоленка. Па матэрыялах выступленняў быў выдадзены зборнік тэзісаў[371]. Да канферэнцыі была падрыхтавана выстава, арганізаваны перадачы на радыё і тэлебачанні. Супрацоўнікамі партархіва Т.Н. Касцянюк і Віцебскага абласнога краязнаўчага музею В.І. Акуневіч быў падрыхтаваны і выдадзены камплект плакатаў “Призванные Октябрем”[372]. Камплект складаўся з 28 уланшэтаў фарматам 60х80 см² і уключаў інфармацыю пра найбольш актыўных удзельнікаў устанаўлення савецкай улады ў г. Віцебску і Віцебскай губерні: Л.К. Бемэ, А.І. Берасценя, С.Н. Крылова, В.К. Путну, І.А. Мяніцкага, В.Я. Чуніна і інш.

У 1988 г. да 50-годдзя ўтварэння архіва Віцебскага абкама КПБ былі падрыхтаваны даклад пра яго дзейнасць і створаны альбом фотаздымкаў работнікаў. Супрацоўнікамі партархіва рыхтавалася да выдання цікавая кніга краязнаўчай накіраванасці, прысвечаная героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Віцебскай вобласці[373]. Яе падрыхтоўкай актыўна займаліся Г.М. Акенцьеў і В.Г. Глушко. Кніга двойчы праходзіла рэцэнзаванне ў Інстытуце гісторыі партыі, аднак не выйшла па аб’ектыўных прычынах: распад СССР, пагаршэнне эканамічнай сітуацыі. Не пабачыла свет і другое выданне, падрыхтаванае супрацоўнікамі партархіва ў 1989 г. да юбілею ЛКСМБ. Кніга нарысаў па гісторыі Віцебскай абласной камсамольскай арганізацыі “Заветам Ленина верны” аб’ёмам 6 аўтарскіх аркушаў была добра структурыравана, уключала ўводзіны, 7 глаў, заключэнне, утрымлівала ілюстрацыі[374]. Рукапіс быў падрыхтаваны ў двух варыянтах:

[370] ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 304–307. Дела относящиеся к конфенренции “Некоторые вопросы истории Витебской областной организации”.

[371] Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему: “История Витебской областной партийной организации: традиции и преемственность”. г. Витебск, 16 окт. 1987 г. / Гос. архив Витеб. обл. – Витебск: Типография им. Коминтерна, 1988. – 65 с.

[372] Костенюк, Т.Н. Призванные Октябрем / Т.Н. Костенюк, О.И. Акуневич. – Витебск: Типография им. Коминтерна, 1987. – 28 л.

[373] ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 285–298. Тэкст кнігі “Героі Савецкага Саюза ўраджэнцы Віцебшчыны”.

[374] ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 356. Тэкст кнігі “Заветам Ленина верны (страницы истории комсомола Витебщины)”.



Репозиторий ВГУ

адзін з навукова-даведачным апаратам, другі спасылак не ўтрымліваў і меў больш папулярна-публіцыстычны характар. Другі варыянт матэрыялаў быў памножаны на ратататары і выдадзены ў форме брашур (з рознакаляровымі вокладкамі) для камсамольскага актыву вобласці і лектарскіх груп.

*Бібліятэкі.* У структуру дзяржаўнага краязнаўства ўваходзіць таксама дзейнасць мясцовых універсальных навуковых, публічных і некаторых спецыяльных бібліятэк, цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. Яны фарміруюць фонды літаратуры пра свой край і мясцовых выданняў, ствараюць адпаведны даведачна-бібліяграфічны апарат, праводзяць бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне спажыўцоў краязнаўчай інфармацыі, складаюць і публікуюць краязнаўчыя бібліяграфічныя і методыка-бібліяграфічныя выданні, займаюцца планавымі краязнаўчымі даследаваннямі.

З 1965 г. у даведачна-бібліяграфічным аддзеле Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага пачаў працаваць бібліёграф-краязнаўца, які вёў краязнаўчую бібліяграфію, укладаў выданні краязнаўчага характару[375]. Сектар беларускай і краязнаўчай літаратуры ў бібліятэцы быў утвораны ў 1981 г.[376]. У 1991 г. ён быў рэарганізаваны ў краязнаўчы сектар. На працягу 1970–1980-х гг. супрацоўнікамі бібліятэкі быў створаны шэраг бібліяграфічных паказальнікаў па гісторыі і культуры Гродзеншчыны, сярод якіх вызначым: “Библиографический указатель литературы по истории Гродно”[377], “Памятники истории и культуры Гродненщины”[378], “Прынёманскі край”[379], “Тэкстыльная прамысловасць Гродзеншчыны”[380], “Ф. Багушэвіч”[381], “Гісторыя камсамола Гродзеншчыны”[382] і інш.

У 1967 г. у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна быў створаны аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры. Пазней ён быў рэарганізаваны ў аддзел краязнаўства і бібліяграфіі. Адной з задач аддзела з’ўлялася складанне рэкамендацыйных спісаў літаратуры па гісторыі рэгіёна пра розныя бакі жыцця краю. Напрыклад, на працягу 1960–1980-х гг. супрацоўнікамі аддзела Віцебскай абласной бібліятэкі была праведзена значная праца па складанні

375 Белорусская краеведческая библиография: анализ библиотечных пособий областных библиотек // Отраслевые библиографии БССР / гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина; ред. В.А. Фокеев. – Минск: Высш. шк., 1972. – С. 191.

376 Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага 1830–2000 гг.: бібліягр. паказальнік / уклад. Л.І. Трумасава. – Гродна: ГАНБ імя Я.Ф. Карскага, 2004. – 30 с.

377 Библиографический указатель литературы по истории Гродно / сост.: Е.М. Таюрская, Г.М. Регилева. – Гродно: ГОУТ, 1978. – 38 с.

378 Памятники истории и культуры Гродненщины: библиогр. указатель литературы / сост. Г.М. Таюрская. – Гродно: ГАНБ, 1984. – 41 с.

379 Принеманский край. Города и райцентры: библиогр. указатель литературы по истории Гродно / сост. Е.М. Таюрская. – Гродно: ЦСУ г. Гродно, 1980. – 108 с.

380 Тэкстыльная прамысловасць Гродзеншчыны: рэкаменд. бібліягр. паказальнік / склад. Л.У. Здрадоўская. – Гродна: ГАНБ, 1991. – 12 с.

381 Ф.К. Багушэвіч (1840–1900) да 150-годдзя з дня нараджэння: бібліяграф. рэкамендацыйны спіс літаратуры ў дапамогам краязнаўцам / склад. А.П. Госцеў, Г.М. Рыгілевіч. – Гродна: ГАНБ, 1990. – 23 с.

382 Гісторыя камсамола Гродзеншчыны: рэкаменд. бібліягр. паказальнік / склад. Л.У. Здрадоўская. – Гродна: ГАНБ, 1990. – 22 с.



Репозиторий ВГУ

бібліяграфіі Віцебшчыны. За гэты перыяд было надрукавана 22 выданні: бібліяграфічныя паказальнікі, рэкамендацыйныя спісы літаратуры, лекцыі, метадычныя парады ў дапамогу чытачам і бібліятэкам, напрыклад, "Віцебску – 1000 гадоў"[383], "Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне"[384], "Героі Савецкага Саюза – Віцябчанкі"[385], "Гісторыя фабрык і заводаў Віцебскай вобласці"[386], "Змагары за ўладу Саветаў на Віцебшчыне"[387], "Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны"[388]. Штогод выдаваўся "Каляндар знамянальных і памятных дат".

Вынікі краязнаўчых даследаванняў як навуковага, так грамадскага і школьнага накірункаў знаходзілі адлюстраванне ў сродках масавай інфармацыі. Штатныя супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання вялі распрацоўку краязнаўчай тэматыкі, дапамагалі мясцовым краязнаўцам у падрыхтоўцы іх матэрыялаў да друку, а часам і самі з'яўляліся краязнаўцамі. Напрыклад, журналіст А.М. Падліпскім, які працаваў у віцебскіх выданнях "Строитель", "Народнае слова" ў 1960–1980-я гг. падрыхтаваў больш за 800 артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Прыдзвіння[389]. Аднак СМІ хутчэй з'яўляліся "трыбунай", з якой асвятляліся вынікі краязнаўчай дзейнасці.

Кіруючая роля ў вызначэнні асноўных прыярытэтаў развіцця гістарычнага краязнаўства на працягу 1960–1980-х гг. належала КПСС. Дамінаванне партыі ў грамадскім жыцці вызначала яе дамінаванне і ў сферы культуры і ідэалогіі. У адпаведнасці з тым, што галоўнай мэтай свайго існавання партыя ставіла пабудову камуністычнага грамадства, уся палітыка КПСС была накіравана на яе выкананне. Адной з важных задач, вырашэнне якой прадугледжвалася сродкамі краязнаўства, з'яўлялася выхаванне ў моладзі сацыялістычнага патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

У СССР камуністычная партыя (панаванне якой у краіне было замацавана 6-м артыкулам Канстытуцыі СССР 1977 г.) вызначала асноўныя прыярытэты ў краязнаўчай дзейнасці, мела значныя фінансавыя магчымасці, сістэму арганізацый і ўстаноў для правядзення выпрацаванай палітыкі. Пастановы ЦК КПСС/КПБ з'яўляліся асноўнымі дакументамі, у якіх вызначаліся асноўныя напрамкі і змест дзейнасці ў сферы дзяржаўнага краязнаўства. У якасці прыклада спашлемся на пастановы толькі некалькіх гадоў: "Пра павышэнне ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных" (ЦК КПСС, 1964), "Аб

---

383 Витебску – 1000: рекоменд. материалы в помощь библиотекам области / сост. Н.С. Китович. – Витебск: ВОБ, 1973. – 19 с.

384 Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне: бібліягр. паказальнік. / уклад. Л.Т. Бяззубік, Н.С. Кітовіч. – Віцебск: ВАБ, 1977. – 40 с.

385 Героі Савецкага Саюза – Віцябчанкі / склад. Т.В. Ганчарова. – Віцебск: ВАБ, 1975. – 12 с.

386 Гісторыя фабрык і заводаў Віцебскай вобласці / склад. Н.С. Кітовіч. – Віцебск: Віцеб. абл. б-ка, 1962. – 6 с.

387 Змагары за ўладу Саветаў на Віцебшчыне: бібліягр. паказальнік / склад. Т.В. Ганчарова – Віцебск: Віцеб. абл. б.-ка, 1967. – 11 с.

388 Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.): бібліягр. паказальнік / склад.: Л.Т. Бяззубік, Н.С. Кітовіч. – Віцебск: ВАБ, 1975. – 67 с.

389 Аркадий Михайлович Подлипский. Библиография основных публикаций 1968–2005 гг. / сост.: А.М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск: ГУ "Витебская областная библиотека им. В.И. Ленина", 2006. – 78 с.

Репозиторий ВГУ

далейшай рабоце па ўвекавечанню гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны” (ЦК КПБ, 1966), “Аб падрыхтоўцы «Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР»” (ЦК КПСС, 1967), “Аб мерах па далейшым развіцці турызму і экскурсій” (ЦК КПСС, 1970) і інш. Пастановы ЦК трансфармаваліся дзяржаўнымі органамі адпаведна рабочых дакументаў ЦК КПБ і Савета міністраў БССР.

Партыйныя і дзяржаўныя органы кантралявалі выкананне прынятых рашэнняў праз вывучэнне дзейнасці міністэрстваў і ведамстваў (культуры, народнай асветы, абароны, дзяржаўных камітэтаў па справах выдавецтваў, паліграфіі, кніжнага гандлю, дзяржаўных музеяў, інстытутаў гісторыі, мастацтвазнаўства і інш.), абласных, гарадскіх і раённых партыйных камітэтаў, абласных, гарадскіх, раённых выканкамаў, уносілі адпаведныя карэктывы ў іх работу.

Ідэалагічнае кіраўніцтва датычылася таксама і грамадскіх арганізацый. Напрыклад, стварэнне таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК) – грамадскай арганізацыі, якая выконвала ролю каардынацыйнага цэнтра ў такой сферы краязнаўства, як ахова помнікаў – адбылося ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19.07.1965 года № 306 “Аб стварэнні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры”[390]. У адпаведнасці з ёй арганізацыя справы была ўскладзена на абласныя, гарадскія і раённыя камітэты партыі, абласныя, раённыя і гарадскія Саветы дэпутатаў працоўных. Старшынямі мясцовых аддзяленняў таварыства ў шэрагу раёнаў з’яўляліся намеснікі старшынь гар- і райвыканкамаў, або загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі гаркамаў і райкамаў партыі[391]. Напрыклад, у 1969 г. з 26 старшыняў гарадскіх і раённых аддзяленняў Віцебскага абласнога таварыства 22 займалі пасаду намесніка старшыні гар- і райвыканкама. Усе яны з’яўляліся членамі КПСС. У 1978 годзе ў той жа Віцебскай вобласці з 27 адказных сакратароў раённых і гарадскіх аддзяленняў таварыства на пасады былі абраны 12 работнікаў партыйных камітэтаў і 15 работнікаў выканкамаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў[392]. Кандыдатуры на пасады старшыні і намесніка старшыні абласнога таварыства вызначаліся ўпраўленнямі культуры аблвыканкамаў і зацвярджаліся ў абкаме КПБ[393]. У склад прэзідыумаў гарадскіх і раённых аддзяленняў таварыства ўваходзілі работнікі аддзелаў прапаганды і агітацыі гарадскіх і раённых камітэтаў партыі і камсамола, супрацоўнікі

---

[390] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 119. – Воп. 34. – Спр. 13. – Арк. 15. Справки по работе первичных, районных, городских областной комсамольских организаций 1965 г.

[391] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 81. – Арк. 14. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1974 г.

[392] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 132. – Арк. 163. Отчеты, справки, информации о работе областного и районных советов общества за 1983 г.

[393] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 6. Протоколы заседаний президиума областного отделения БДООПИиК за 1966 г.

Рэпазіторый ВДУ

гарадскіх і раённых аддзелаў культуры і народнай адукацыі, якія дапамагалі і накіроўвалі работу мясцовых аддзяленняў[394].

Той факт, што на чале абласных і раённых аддзяленняў стаялі асобы, якія займалі адказныя пасады партыйнай і дзяржаўнай структуры пазітыўна адбіваўся на дзейнасці БДТАПГіК. Асобам, надзеленым уладай, было значна прасцей вырашыць пэўныя пытанні, звязаныя з дзейнасцю грамадскай арганізацыі, чым шараговаму члену. Адзначым, аднак, што ў пэўных выпадках партыйнае кіраванне вяло да залішняй заарганізаванасці і прыводзіла да фармалізацыі грамадскіх пачынанняў і ініцыятыў. Ідэалагічнымі прычынамі тлумачыцца абмежаванне тэматыкі гістарычных даследаванняў і акцэнтаванне ўвагі на вывучэнні гісторыі савецкага перыяду, пытанняў класавай барацьбы і інш., жорсткі кантроль за дзейнасцю грамадскіх арганізацый, цэнзура і складаная сістэма магчымасці публікацыі аўтарскіх матэрыялаў. Негатыўна ўплывалі на развіццё мясцовых даследаванняў прынцыпы "сацыялістычнага інтэрнацыяналізму" (сцірання нацыянальных і моўных межаў) і "ваяўнічага атэізму" (барацьба з рэлігіяй і руйнаванне помнікаў культавага дойлідства).

Прааналізаваўшы развіццё дзяржаўнага накірунку гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гады, можна зрабіць наступныя вывады.

Партыйнымі і дзяржаўнымі органамі ажыццяўлялася практычнае і ідэалагічнае кіраўніцтва краязнаўчай дзейнасцю: выяўляліся патрэбы, фарміраваліся прапановы, стымулявалася, кантралявалася выкананне пастаноў праз дзейнасць міністэрстваў і ведамстваў (культуры, народнай асветы, абароны, дзяржаўныя камітэты па справах выдавецтваў, паліграфіі, кніжнага гандлю, дзяржаўныя музеі, Інстытут гісторыі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і інш.). На месцах краязнаўчая дзейнасць ажыццяўлялася рэгіянальнымі музеямі, архівамі, бібліятэкамі пад патранажам партыйных органаў.

Развіццё дзяржаўнага накірунку гістарычнага краязнаўства накіроўвалася як праз непасрэднае ідэалагічнае кіраўніцтва дзейнасцю дзяржаўных ўстаноў, так і праз шырокае прыцягненне да ўдзелу у грамадскіх арганізацыях супрацоўнікаў партыйных, савецкіх органаў, работнікаў навуковых і акадэмічных інстытутаў.

На працягу 1960–1980-х гадоў найбольшы ўклад у вывучэнне рэгіёнаў Беларусі быў унесены навуковымі ўстановамі (Інстытутам гісторыі, інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору), дзяржаўнымі і ведамаснымі музеямі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, архівамі, некаторымі іншымі дзяржаўнымі ўстановамі.

Цэнтральнае месца ў структуры дзяржаўнага краязнаўства на працягу 1960–1980-х гг. займалі Інстытут гісторыі і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, якія з'яўляліся навукова-метадычнымі цэнтрамі па

[394] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 128. – Арк. 12. Списки исторических памятников, расположенных на территории области (1976).

вывучэнні рэгіёнаў рэспублікі, аказвалі кваліфікаваную навуковую дапамогу па пэўных пытаннях гісторыі і культуры як дзяржаўным органам, так і грамадскім арганізацыям. Дзяржаўнымі навуковымі ўстановамі краіны была праведзена значная праца па краязнаўчым вывучэнні Беларусі. Арганізавана падрыхтоўка і выданне “Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”. Распрацавана канцэпцыя і здзейснена выданне серыі гісторыка-культурных хронік “Памяць”, энцыклапедычных даведнікаў, прысвечаных абласным цэнтрам Беларусі. Важнае значэнне ў краязнаўчым вывучэнні Беларусі адыграла выдавецтва “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя”.

Значная роля ў развіцці гістарычнага краязнаўства належала вышэйшым навучальным установам. Тут выкладаліся курсы па гістарычным краязнаўстве, студэнты штогод праходзілі краязнаўчую, археалагічную, музейную, архіўную практыкі, што садзейнічала больш глыбокаму вывучэнню рэгіёнаў краіны. Тэматыка курсавых і дыпломных работ уключала ў сябе тэмы, звязаныя з гісторыяй і культурай розных мясцовасцей Беларусі. Краязнаўчыя даследаванні, якія праводзіліся студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, пазітыўна адбіваліся на якасці падрыхтоўкі будучых настаўнікаў, спецыялістаў, адказных работнікаў.

Мясцовыя краязнаўчыя музеі сталі арганізуючымі і каардынуючымі цэнтрамі краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах краіны, забяспечылі збор, захаванне і выкарыстанне інфармацыі па гісторыі і культуры краю ў мэтах выхавання насельніцтва. У адзначаны час значна павялічылася колькасць дзяржаўных гісторыка-краязнаўчых музеяў і якасць іх экспазіцый.

Крыніцазнаўчую базу для правядзення даследаванняў забяспечвалі архівы БССР, якія на аснове выяўленых дакументаў праводзілі важную асветніцкую дзейнасць праз мясцовы і рэспубліканскі друк.

У бібліятэках Беларусі ў вывучаемы перыяд былі створаны краязнаўчыя аддзелы, якія займаліся бібліяграфічнай, асветніцкай працай, што безумоўна садзейнічала развіццю рэгіянальных даследаванняў і фарміраванню нацыянальнай і гістарычнай свядомасці насельніцтва.

У мясцовым і рэспубліканскім друку былі апублікаваны сотні артыкулаў краязнаўчай накіраванасці, дзяржаўнымі выдавецтвамі надрукаваны дзясяткі выданняў, у якіх асвятляліся пытанні гісторыі і культуры розных рэгіёнаў нашай краіны.

На працягу 1960–1980-х гг. відавочна цесная сувязь і ўзаемадзеянне дзяржаўнага і грамадскага накірункаў гістарычнага краязнаўства. Дзякуючы ўдзелу навуковых кадраў у працы грамадскіх краязнаўчых арганізацый, значна палепшылася якасць дзейнасці апошніх. У другой палове 1980-х гг., ва ўмовах палітыкі “перабудовы”, пэўная колькасць ініцыятыў прафесійных даследчыкаў была праведзена ў жыццё праз працу грамадскіх таварыстваў і арганізацый.

Рэпазіторый ВДУ

# ГЛАВА 3

# РАЗВІЦЦЁ ГРАМАДСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА Ў 1960–1980-Я ГГ.

## 3.1. Дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры

У канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. у сувязі з правядзеннем палітыкі лібералізацыі ў СССР назіраецца рост грамадскай актыўнасці, які на фоне пашырэння цікавасці да сусветнай і лакальнай гісторыі прывёў да стварэння арганізацый, што ставілі сваёй мэтай краязнаўчыя даследаванні краю.

На нашу думку, не менш істотным фактарам, чым змены ў грамадстве і праяўленне цікавасці да гісторыі, стаў грамадскі рух па ўшанаванню памяці салдат, ахвяраў вайны 1941–1945 гг. На жаль, і праз 20 гадоў пасля Перамогі помнікі ці не былі ўсталяваны наогул, ці былі выраблены на нізкім мастацкім ўзроўні і з нетрывалых матэрыялаў (дрэва, цэглы), ці іх стан проста перастаў адпавядаць патрабаванням часу.

Змены ў адносінах да вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны ў СССР і БССР у гэты час адбываліся ў межах агульнасусветнай актывізацыі цікавасці грамадства да гісторыі, пытанняў аховы помнікаў гісторыі і культуры. Насельніцтва еўрапейскіх краін актыўна пачынае прыцягваць ўвагу сваіх урадаў і само актыўна ўключаецца ў дзейнасць па аднаўленню страчаных у гады вайны гісторыка-культурных помнікаў.

Партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва адчула неабходнасць стварэння грамадскай арганізацыі, якая б садзейнічала вырашэнню важных грамадскіх задач, у першую чаргу, праз стварэнне сістэмы грамадскай аховы помнікаў гісторыі і культуры і заахвочванне насельніцтва, асабліва моладзі, да іх стварэння. У сярэдзіне 1960-х гадоў у кожнай савецкай рэспубліцы ствараюцца добраахвотныя таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Сярод прычын, паўплываўшых на стварэнне таварыстваў, перш за ўсё, рэалізацыя *жадання шырокіх слаёў насельніцтва* актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, выкліканае пераходам да палітыкі “адлігі”; па-другое, *імкненне кіруючых колаў* партыі і савецкага ўрада не толькі выкарыстаць патэнцыял грамадскага руху для развіцця актыўнасці людзей, але і трымаць яго пад кантролем, накіроўваць у патрэбным накірунку і, па-трэцяе, некаторыя *змены ў грамадскай свядомасці* людзей, выкліканыя грамадска-культурнымі рухамі ў сусветнай супольнасці, якія тым ці іншым чынам праявіліся ў Савецкім Саюзе.

Аналіз дзейнасці гэтых арганізацый дазваляе сцвярджаць, што іх

Рэпазіторый ВГУ

можна лічыць краязнаўчымі. Па-першае, з самага пачатку ў дакументах яны згадваюцца як краязнаўчыя, па-другое, утвораныя ў некаторых рэспубліках (Літоўскай ССР, Эстонскай ССР) такія ж таварыствы мелі назвы "Ахова помнікаў гісторыі і культуры і краязнаўства" ("LTSR paminklų apsaugos ir kraštotyros draugija")[395].

Галоўнымі накірункамі дзейнасці таварystваў сталі: захаванне помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, далучэнне шырокіх слаёў насельніцтва да вывучэння помнікаў гісторыі і культуры, палітычных і гістарычных з'яў, навукі, мастацтва і выкарыстанне іх з мэтай камуністычнага выхавання, "спалучаючы разумны адпачынак з пашырэннем культурнага і агульнаадукацыйнага кругагляду савецкіх грамадзян"[396].

У дзейнасці таварыства вызначаюцца некалькі перыядаў.

1) Падрыхтоўчы перыяд, які папярэднічаў яго ўтварэнню (1965–1968 гг.), калі праводзіліся галоўныя арганізацыйныя мерапрыемствы па стварэнні таварыства, а менавіта стварэнне пярвічных аддзелаў, гарадскіх, раённых і абласных арганізацый, выпрацоўка нарматыўных і метадычных палажэнняў дзейнасці, пошук арганізацыйных форм таварыства.

2) Наступны перыяд (1969 – сярэдзіна 1980-х гг.) характарызаваўся актыўным прыцягненнем да ўдзелу ў таварыстве шырокіх слаёў насельніцтва (у першую чаргу навучэнцаў, калектыўных і юрыдычных членаў), выпрацоўкай і стабілізацыяй асноўных накірункаў краязнаўчай дзейнасці, дасягненнем даволі значных вынікаў грамадскага навуковага руху.

3) Нарэшце, перыяд, які датуецца сярэдзінай 1980-х – 1991 г., калі колькасць членаў таварыства пачынае змяншаецца, узмацняюцца праявы фармалізму ў працы. На хвалі палітыкі "перабудовы" змяняецца тэматыка даследаванняў, частка найбольш актыўных членаў БДТАПГіК стараюцца выпрацоўваць новыя формы працы і навуковыя падыходы ў ахове гісторыка-культурнай спадчыны, творча асэнсоўваць атрыманыя матэрыялы.

Праца па стварэнні таварыства пачалася ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19.07.1965 года № 306 "Аб стварэнні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры"[397]. Першы ўстаноўчы з'езд таварыства адбыўся 7 снежня 1966 г. Арганізацыя справы была ўскладзена на абласныя, гарадскія і раённыя камітэты партыі, абласныя, раённыя і гарадскія Саветы дэпутатаў працоўных.

На пасяджэннях раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў працоўных

[395] Рачкаускас, К.Й. Краеведческое движение в Советской Литве (1961–1980): автореф. дис. … канд. ист. наук (07.00.02) / К.Й. Рачкаускас; ВГУ им. В. Капсукаса. – Вильнюс, 1986. – 20 с.

[396] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 5–9. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.

[397] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 4. Протоколы учредительных конференций Витебской областной, городских и районных отделений общества охраны памятников.



Репозиторий ВГУ

выбіраліся арганізацыйныя камітэты па стварэнні таварыства. Склад аргкамітэтаў быў даволі шырокім, але ўсё ж можна вызначыць прадстаўнікоў асноўных устаноў і арганізацый. У іх абавязкова ўключаліся адказныя работнікі рай- і гаркамаў КПБ, супрацоўнікі аддзелаў культуры, раённыя і гарадскія архітэктары, супрацоўнікі краязнаўчых музеяў, прадстаўнікі ўстаноў асветы (дырэктары школ, настаўнікі, піянерважатыя, супрацоўнікі гарадскіх і раённых аддзелаў адукацыі, выкладчыкі навучальных устаноў), работнікі раённых ваенных камісарыятаў, супрацоўнікі клубаў, бібліятэк, раённых газет, прадстаўнікі прадпрыемстваў, ветэраны[398]. Зацвярджэнне кіраўніцтва раённых, гарадскіх таварыстваў адбывалася на бюро гар- і райкамаў КПБ[399].

У арганізацыйны перыяд праца ў асноўным засяроджвалася на пытаннях тэхнічнага афармлення юрыдычнага членства ў таварыстве, стварэнні пярвічных арганізацый, пытаннях фінансавання, планавання мерапрыемстваў па ўліку і даследаваннях помнікаў гісторыі і культуры, арганізацыі шэфскай працы над помнікамі[400]. Сістэма мерапрыемстваў, якая была ўласціва першаму перыяду дзейнасці таварыства, вызначаецца наступным чынам: гарадскія і раённыя арганізацыі вялі сумесную арганізацыйную работу з абласнымі ўпраўленнямі культуры, адукацыі, абкамамі камсамола, упраўленнямі па будаўніцтву і архітэктуры, Саветамі прафсаюзаў, абласнымі арганізацыямі таварыства "Веды", абласнымі краязнаўчымі музеямі, клубамі ветэранаў баявой, працоўнай і рэвалюцыйнай славы[401].

Дзейнасць таварыства будавалася па секцыйнаму прынцыпу. Былі ўтвораны гістарычная, архітэктурная, этнаграфічная, маладзёжная, прапагандысцкая секцыі і навукова-метадычны савет. Пры Цэнтральным Савеце БДТАПГіК была створана секцыя помнікаў працоўнай славы, арганізавана праца сектара "Звод помнікаў гісторыі і культуры Беларусі"[402].

З мэтай актывізацыі дзейнасці членаў таварыства, абмену вопытам практычнай работы, здзяйсняліся камандзіроўкі ў суседнія саюзныя рэспублікі, на сацыялістычнае спаборніцтва было выклікана Таварыства аховы помнікаў і краязнаўства Літоўскай ССР[403].

Былі падрыхтаваны і надрукаваны дзясяткі выданняў рознай

Репозиторий ВГУ

[398] Тамсама. – Арк. 3–27. Протоколы учредительных конференций Витебской областной, городских и районных отделений общества охраны памятников.
[399] Тамсама. – Арк. 1. Протоколы учредительных конференций Витебской областной, городских и районных отделений общества охраны памятников.
[400] Тамсама. – Арк. 2. Протоколы учредительных конференций Витебской областной, городских и районных отделений общества охраны памятников.
[401] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 7. – Арк. 4. Отчет областного отделения за 1967–1968 гг.
[402] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 202. – Арк. 236–238. Пратаколы пасяджанняў Прэзідыума рэспубліканскага савета і дакументы да іх (24.01–1.10. 1984 г.).
[403] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 81. – Арк. 19. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1974 г.

тэматыкі, па-першае – метадычныя дакументы, па-другое – краязнаўчыя публікацыі. У Віцебскай вобласці, напрыклад, былі выдадзены: "Зварот да краязнаўцаў, гісторыкаў, членаў таварыства", плакаты "Па памятных мясцінах", "Шляхамі бацькоў-герояў", "Карта помнікаў Віцебскай вобласці"[404]. У 1968 годзе ў абласной, гарадской і раённых газетах было надрукавана каля 200 артыкулаў па тэматыцы таварыства. У гарадах і раёнах былі прачытаны цыклы лекцый па тэме аховы помнікаў гісторыі і культуры: "Помнікі Леніна ў БССР і на Віцебшчыне", "Помнікі 1812 году на Беларусі і на Віцебшчыне", "Помнікі рэвалюцыі на Беларусі і на Віцебшчыне", "Аб мэтах і задачах таварыства"[405].

Паўсюдна складаліся дакладныя спісы помнікаў гісторыі і культуры. Быў даследаваны стан помнікаў баявой славы, праведзена абследаванне тых, якія патрабавалі замены, распачата праца па складанні спісаў помнікаў працоўнай славы. Была арганізавана структура таварыства, утвораны пярвічныя, гарадскія, раённыя, абласныя арганізацыі.

Падкрэслім, што ўжо на пачатку дзейнасці БДТАПГіК для яго было характэрна разуменне сваёй дзейнасці як краязнаўчай. У дакументах часта сустракаўся тэрмін "краязнаўства". Напрыклад, Цэнтральны Савет таварыства звярнуўся ў Савет Міністраў БССР з прапановай аб арганізацыі пры Міністэрстве культуры навукова-метадычнага савета па ахове помнікаў культуры і ***краязнаўстве;*** накіраваў прапанову ЦК КПБ аб выданні ***краязнаўчага*** часопіса, перыядычнасцю 6 разоў у год[406]. Пашырэнне краязнаўчай працы меркавалася арганізоўваць праз упраўленне культуры і ***краязнаўчае*** бюро[407]. Асвету і прапаганду ведаў пра помнікі гісторыі і культуры павінны былі арганізоўваць універсітэты ведаў аб помніках гісторыі і ***краязнаўства***. У № 4 бюлетэня таварыства "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" У. Кісялёў змясціў артыкул "Наш папярэднік", прысвечаны часопісу "Наш край", які выдаваўся Цэнтральным Бюро Краязнаўства ў 1920-я гады. З назвы вынікае, што навукоўца (і рэдакцыя выдання) лічылі бюлетэнь спадкаемцам славутага краязнаўчага часопіса і прадаўжальнікам закладзеных ім традыцый.

На працягу другой паловы 1960-х – пачатку 1970-х гг. былі выпрацаваны навукова-метадычныя асновы дзейнасці таварыства ў дачыненні да аховы помнікаў гісторыі і культуры. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны паступова стала прыярытэтнай у гістарычным

[404] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 13. Отчеты, справки о работе областного, городских, районных отделений за 1968 г.
[405] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 7. – Арк. 9. Отчет областного отделения за 1967–1968 гг.
[406] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 44–47. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.
[407] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 31. – Арк. 3. Постановления и распоряжения президиума ЦС БДООПиК за 1970 г.



Рэпазіторый ВДУ

краязнаўстве Беларусі[408]. У ахоўнай дзейнасці члены таварыства выкарыстоўваліся розныя формы, але, як паказвае практыка, найбольш эфектыўнымі былі:

– назіранне за станам помнікаў гісторыі і культуры і іх вывучэнне;

– арганізацыя шэфства мясцовых пярвічных ячэяк і ўстанаўленне грамадскага кантролю па догляду за помнікамі;

– прадстаўленне абгрунтаванняў і рэкамендацый па паляпшэнню аховы помнікаў і памятных месцаў;

– перадача атрыманых звестак і матэрыялаў у архівы і дзяржаўныя музеі;

– арганізацыя чытання лекцый пра помнікі гісторыі і культуры па заяўках прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў;

– арганізацыя прапаганды краязнаўчай дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі;

– правядзенне масавых мерапрыемстваў і конкурсаў;

На працягу 1970-х – сярэдзіны 1980-х гг. колькасць членаў таварыства значна павялічылася, умацаваліся матэрыяльныя магчымасці, стабілізаваліся асноўныя накірункі працы. Аб дынаміцы росту арганізацыі і яго членаў сведчыць табліца 2:

Табліца 2[409]

| **Год** | **Колькасць пярвічных арганізацый** | **Колькасць членаў таварыства** |
|---|---|---|
| 1971 | 5000 | 967292 |
| 1977 | 10000 | 1700000 |
| 1981 | 12500 | 2000000 |
| 1987 | 12717 | 2428300 |
| 1991 | 12600 | 2100000 |

На працягу 1970–1980-х гадоў значная ўвага надавалася ўзвядзенню помнікаў і мемарыяльных комплексаў як мясцовага, так і рэспубліканскага значэння, прысвечаных ушанаванню памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайне воінаў, партызан і мірных жыхароў. Кожнаму такому мерапрыемству папярэднічала вялікая праца па вывучэнні падзей вайны на лакальным узроўні пярвічнымі аддзяленнямі БДТАПГіК, школамі, камсамольскімі арганізацыямі[410].

У гэты час пачалося правядзенне мерапрыемстваў па рэстаўрацыі і аднаўленні некаторых помнікаў культавага і мураванага дойлідства

[408] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – С. 46; Краеведение: пособие для учителя / под ред. А.В. Доринского. – М.: Просвещение, 1987. – С. 34.
[409] Падлічана намі на аснове справаздач ЦС БДТАПГіКБ.
[410] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 39. – Арк 23. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972 гг.

Рэпазіторый ВДУ

рэспубліканскага значэння. Напрыклад, у 1974 годзе на сродкі таварыства праводзіўся рамонт і рэстаўрацыя Сафійскага сабора ў Полацку, касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Мсціслаўлі, Свята-Раства-Багародзіцкай царквы ў г. Слаўгарадзе, часоўні ў в. Лясная Магілёўскай вобласці, замкаў у гарадскіх пасёлках Мір і Ружаны, праведзена кансервацыя руінаў замка ў Навагрудку, рэшткаў Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Праводзілася прыстасаванне пад музей былой царквы ў г. Капыль, узводзіўся ахоўны павільён над месцам раскопак старажытнага Бярэсця[411].

Толькі ў 1976 годзе на рамонт, рэстаўрацыю, добраўпарадкаванне помнікаў гісторыі і культуры таварыствам было вылучана 482,9 тыс. рублёў. У тым ліку на помнікі архітэктуры 244 тыс. рублёў, помнікі воінскай славы 223,9 тыс. рублёў. На выяўленне, вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры 15 тыс. рублёў. Лічбы яскрава сведчаць пра прыярытэты, якія складваліся ў сістэме грамадскай аховы помнікаў гісторыі і культуры[412].

Сродкі БДТАПГіК фарміраваліся наступным чынам: па-першае, узносы ад грамадзян і арганізацый, з якіх 25% сумы ішло ў распараджэнне раённых і гарадскіх арганізацый, 25% – абласных, 50% – рэспубліканскай. Па-другое, прыбыткі ад выдавецкай і вытворчай дзейнасці (пасля ўплаты падаткаў). З гэтых сум 50% заставалася раённым, па 25% абласным і рэспубліканскай арганізацыям. Прэзідыум Цэнтральнага Савета БДТАПГіК прасіў вызваліць даходы таварыства ад абкладання дзяржаўнымі падаткамі і зборамі[413].

На працягу 1970–1980-х гг. была складзена інфармацыйная база аб помніках гісторыі і культуры. Пры садзейнічанні таварыства праводзілася падрыхтоўка і выданне “Зводу помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”. Абласнымі, рэспубліканскай арганізацыямі былі падрыхтаваны і выдадзены сотні публікацый на краязнаўчую тэматыку (артыкулы ў газетах, часопісах, парады па арганізацыі працы, метадычныя дакументы). Напрыклад, у 1970 г. былі выдадзены даведнікі “Помнікі рэвалюцыйнай і баявой славы Беларусі”, “Выдатныя архітэктурныя помнікі БССР”, “Археалагічныя помнікі Беларусі”, лекцыі-даклады “Архітэктурная спадчына Беларусі”, “Гісторыка-рэвалюцыйныя помнікі БССР”[414].

У 1971 годзе Галоўным Упраўленнем геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў СССР накладам 12500 экземпляраў выдадзена карта з указаннем маршрутаў па славутых і памятных месцах Гродзенскай

---

[411] ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 310. – Арк. 68. Перспективны план сооружения, реконструкции и реставрации памятников истории и культуры Могилевской области на 1986–1990 гг.
[412] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 115. – Арк. 1. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1976 г.
[413] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк 40–41. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.
[414] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 37. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.



Репозиторий ВГУ

вобласці. На карце па прапанове абласнога таварыства былі адзначаны месцы і помнікі, звязаныя з гістарычнымі падзеямі; магілы Герояў Савецкага Саюза, якія загінулі на тэрыторыі Гродзеншчыны; абазначаны месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю выдатных дзеячаў, помнікі археалогіі і архітэктуры[415].

У тым жа годзе быў выдадзены агітплакат "Захаваем помнікі гісторыі і культуры Гродзеншчыны". За 1977–1986 гг. выдавецтва "Полымя" па заяўцы таварыства надрукавала каля 80 брашур, буклетаў і плакатаў, у тым ліку бібліяграфічны паказальнік "Горад Гродна і райцэнтры Гродзенскай вобласці (помнікі і памятныя месцы)"[416], кнігі Ф.В. Барысевіча "Помнікі працоўнай славы Беларусі", Ф.Д. Гурэвіч "Древние города Белорусского Понеманья", Г.А. КахаНоўскага "У родным краі", метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі пошукавай работы "Пошук", "Помнікі гісторыі і культуры Прынеманскага краю. Бібліяграфічны паказальнік літаратуры"[417].

Заўважым, што на ўсіх этапах дзейнасці таварыства акцэнт рабіўся на прапаганду ведаў аб помніках гісторыі і культуры (павялічвалася колькасць прачытаных лекцый, выдадзеных матэрыялаў) і актывізацыю працы маладзёжнай секцыі (праз удзел у турысцка-краязнаўчых экспедыцыях і паходах).

Важную ролю ў прапагандзе ідэй краязнаўства працягваў адыгрываць бюлетэнь БДТАПГіК "*Помнікі гісторыі і культуры*", які выдаваўся з 1970 па 1989 г. Разам з афіцыйнай інфармацыяй пра штодзённую дзейнасць Цэнтральнага Савета таварыства і яго рэгіянальных аддзяленняў рэдкалегія друкавала матэрыялы краязнаўчай накіраванасці як вядомых навукоўцаў, так і краязнаўцаў-аматараў з розных куткоў Беларусі. Выданне змяшчала пэўныя матэрыялы па развіцці краязнаўчага руху 60–80-х гадоў XX стагоддзя ў святле дзейнасці, накіраванай на ахову помнікаў гісторыі і культуры і зберажэння гістарычнай спадчыны Беларусі. Бюлетэнь змяшчаў *нарматыўныя акты*: Закон Беларускай ССР аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, Статут таварыства, пастановы пленумаў, з'ездаў таварыства; "Аб выніках рэспубліканскага конкурсу «На лепшае асвятленне ў друку пытанняў аховы і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры»"[418]. З 1988 г. у бюлетэні пачала выходзіць серыя "Нашы славутыя землякі". Па сутнасці, быў адзіным перыядычным выданнем, у якім змяшчаліся краязнаўчыя матэрыялы высокага навуковага

[415] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 37. – Арк. 55. Отчеты о работе областного совета общества с приложениями к нему за 1971 г.
[416] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 120. – Арк. 189–190. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1983 г.
[417] Тамсама. – Арк. 132, 163.
[418] Пастанова аб выніках рэспубліканскага конкурса "На лепшае асвятленне ў друку пытанняў аховы і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры" // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1974. – № 3. – С. 54.

Репозиторий БГУ

ўзроўню[419]. У 1989 г. на аснове бюлетэня заснаваны часопіс “Спадчына”.

На старонках бюлетэня знаходзіліся *рэкамендацыі* накіраваныя на актывізацыю працы па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Напрыклад: К.І. Рачкаўскас “Пішам гісторыю калгасаў і саўгасаў”[420], У.Ф. Ісаенка “Што шукаць краязнаўцу”[421]. Я.Н. Мараш, А.М. Плешавеня “Помнікі працоўнай славы, іх улік і класіфікацыя”[422], “Рэкамендацыі па выяўленні, вывучэнні і прапагандзе помнікаў працоўнай славы”, “Звесткі аб месцах захоўвання дакументаў (у дапамогу пошукавым атрадам)”[423], “Положение, программа и учебно-методические планы народных университетов знаний о памятниках истории и культуры”[424].

Вынікі навуковых экспедыцый па рэгіёнах краіны асвятляліся ў артыкулах Ю.А. Якімовіча “Экспедыцыя на Брэстчыну”[425], М.Р. Гнеўка “Студэнцкія маршруты”[426]. Апошні прысвечаны правядзенню гісторыка-краязнаўчай практыкі ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Арганізацыі і дзейнасці бібліятэк, музеяў і архіваў былі прысвечаны артыкулы С. Акуліча “Музей братоў Тышкевічаў”, В.А. Цыбулі “Прыватныя бібліятэкі, архівы і музеі”[427], Г.А. Каханоўскага “Збіраць, ахоўваць, вывучаць”[428].

Прыгадаем некаторыя артыкулы, прысвечаныя *гісторыі беларускага краязнаўства*. В.К. Бандарчык “Старонкі беларускага савецкага краязнаўства”[429] пра развіццё краязнаўства ў 1920-я гг. У артыкуле “Краязнаўства і музеі” Я.М. Мяшэчка[430] прызнаваў, што ў краіне былі створаны 2 краязнаўчыя арганізацыі – БДТАПГіК і Беларускае добраахвотнае таварыства прыроды і заклікаў да стварэння Рэспубліканскага цэнтра краязнаўства. У артыкуле Я.М. Суніца “Трыбуна краязнаўцаў”

---

[419] Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Інфармацыйны навукова-метадычны бюлютэнь Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1969–1988).
[420] Рачкаўскас, К.І. Пішам гісторыю калгасаў і саўгасаў / К.І. Рачкаўскас // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1975. – № 1. – С. 52–53.
[421] Ісаенка, У.Ф. Што шукаць краязнаўцу / У.Ф. Ісаенка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 2. – С. 41.
[422] Мараш, Н.Я. Помнікі працоўнай славы, іх улік і класіфікацыя / Н.Я. Мараш, А.М. Плешавеня // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 4. – С. 22–24.
[423] Звесткі аб месцах захоўвання дакументаў (у дапамогу пошуковым атрадам) // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1988. – № 3. – С. 38–39.
[424] Положение, программа и учебно-методические планы народных университетов знаний о памятниках истории и культуры // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1981. – № 4. – С. 45.
[425] Якімовіч, Ю.А. Экспедыцыя на Брэстчыну / Ю.А. Якімовіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1978. – № 1. – С. 38–39.
[426] Гнеўка, М.Р. Студэнтскія маршруты / М.Р. Гнеўка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 3. – С. 39.
[427] Цыбуля, В.А. Прыватныя бібліятэкі, архівы і музеі / В.А. Цыбуля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1982. – № 3. – С. 36–38.
[428] Каханоўскі, Г.А. Збіраць, ахоўваць, вывучаць / Г.А. Каханоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1983. – № 4. – С. 35–37.
[429] Бандарчык, В.К. Старонкі беларускага савецкага краязнаўства / В.К. Бандарчык // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1972. – № 3. – С. 41.
[430] Мяшэчка, Я.М. Краязнаўства і музеі / Я.М. Мяшэчка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1973. – № 1. – С. 51.

Рэпазіторый ВДУ

асвятлялася краязнаўчая дзейнасць газеты “Мінская праўда”[431]. Змяшчаліся цікавыя артыкулы пра гісторыю аховы помнікаў, жыццё і дзейнасць знакамітых беларускіх краязнаўцаў і выдатных людзей на Беларусі.

У бюлетэні змяшчаліся *рэцэнзіі* на выдадзеныя кнігі і *анатацыі*. Напрыклад, на кнігу Ф.Д. Гурэвіч “Старажытны Ваўкавыск” і кінастужку “У кадры Бабруйская крэпасць”[432]. У № 3 за 1985 г. распавядалася пра кнігу В.Э. Шомадзі “Маршрутами народной славы”, якая была адрасавана ўдзельнікам Усесаюзнай пошукавай экспедыцыі “Летапіс Вялікай Айчыннай” і Беларускай пошукавай экспедыцыі “У летапіс народнай славы”. Давалася ацэнка кнігам, прысвечаным помнікам архітэктуры, археалогіі розных рэгіёнаў краіны: “Помнікі працоўнай славы Гродзеншчыны. Матэрыялы ў дапамогу лектару”, А.Т. Федарук “Старинные парки Белоруссии”, Р.В. Баравы, А.А. Трусаў “Помнікі старажытнага Мсціслава”[433], П.Ф. Лысенко “Берестье”[434], Г.Н. Жаровіна, І.М. Чарняўскі, І.В. Дзімура “Помнікі Чачэрска”[435] і іншыя выданні.

Развіццё руху па ахове помнікаў гісторыі і культуры з неабходнасцю патрабавала вырашэння такой праблемы, як падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў. Такіх спецыялістаў востра не хапала. Адным з накірункаў іх падрыхтоўкі сталі народныя ўніверсітэты і факультэты па вывучэнні ведаў пра помнікі гісторыі і культуры, якія па сваёй сутнасці з’яўляліся галоўнай формай дзейнасці па прыцягненні насельніцтва да пазнання гісторыі і культуры свайго краю[436].

Дзейнасць абазначаных грамадска-вучэбных фарміраванняў пачалася з 1974 года, калі Цэнтральным Саветам таварыства была выдадзена адпаведная пастанова аб іх арганізацыі[437]. У Гродзенскай вобласці, напрыклад, пры народных універсітэтах культуры ў Гродне, Ваўкавыску, Лідзе, Навагрудку і Слоніме асаблівай папулярнасцю карысталіся факультэты, на якіх вывучалася традыцыйнае народнае адзенне беларусаў як гістарычны і этнаграфічны помнік[438]. У пачатку 1980 г. у БССР існавала 13 універсітэтаў ведаў пра помнікі гісторыі і культуры, у якіх атрымлівалі

[431] Суніца, Я.М. Трыбуна краязнаўцаў / Я.М. Суніца // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 4. – С. 39.
[432] Крупеня, Я. У кадры Бабруйская крэпасць / Я. Крупеня // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 4. – С. 44.
[433] Баравы, Р.В. Помнікі старажытнага Мсціслава / Р.В. Баравы, А.Л. Трусаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1986. – № 2. – С. 44–45.
[434] Трусаў, А. Падарожжа ў Бярэсце / А. Трусаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1986. – № 3. – С. 44.
[435] Трусаў, А. Горад на Чачоры / А. Трусаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1987. – № 3. – С. 45.
[436] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 120. – Арк. 192. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1983 г.
[437] НАРБ. – Фонд 1030. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 14. Пратаколы пасяджэнняў Прэзідыума Усесаюзнага таварыства па распаўсюджанні палітычных і навуковых ведаў (14.06.–26.12. 1987 г.).
[438] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 141. – Арк. 99–100. Документы о работе народных университетов знаний о памятниках истории и культуры (сведения, информация) за 1984–1987 гг.



Репозиторий ВГУ

веды 1500 слухачоў, і 64 факультэты універсітэтаў з 3160 слухачамі[439].

У 1980/1981 навучальным годзе у Віцебскай вобласці працавалі 3 універсітэты ведаў пра помнікі гісторыі і культуры – на базе Віцебскага педінстытута імя С.М. Кірава, культасветвучылішча, Глыбоцкага СПТВ і 4 факультэты: у гарадах Наваполацку, Талачыне, Паставах і Аршанскім раёне[440]. У 1982/1983 навучальным годзе ў сістэме таварыства дзейнічала 26 народных універсітэтаў і 65 факультэтаў ведаў пра помнікі гісторыі і культуры[441]. Пасля заканчэння вучобы выпускніку выдаваўся дыплом грамадскага прапагандыста гісторыі роднага краю[442]. У 1985 г. у таварыстве дзейнічала 10 народных універсітэтаў і 48 факультэтаў ведаў аб помніках гісторыі і культуры.

Трэба прызнаць, што народныя ўніверсітэты падрыхтавалі вялікую колькасць кадраў, і нягледзячы на тое, што яны не давалі "акадэмічнага" ўзроўню ведаў, але пры недахопе падрыхтаваных спецыялістаў у галіне аховы культурнай спадчыны яны адыгралі пэўную ролю ў развіцці грамадскай сістэмы аховы помнікаў і развіцці краязнаўства ў 1960–1980-х гг.

Дзейнасць таварыства садзейнічала вывучэнню і прапагандзе ведаў пра свой край. Адзначым, што, кожнае з абласных і гарадскіх аддзяленняў таварыства мела ўласныя прыярытэты ў такой дзейнасці. У якасці прыклада спашлемся на працу Мінскага гарадскога і Віцебскага абласнога саветаў таварыства. Для першага характэрна шырокая прапагандысцкая дзейнасць. На працягу 1970-х гг. члены арганізацыі прапанавалі:

– арганізаваць пастаянную перасоўную фотавыставу "Помнікі гісторыі і культуры г. Мінска";

– дабіцца правядзення здымак (на конкурснай аснове) не менш 5–6 кінафільмаў пра помнікі гісторыі і культуры г. Мінска;

– падрыхтаваць навукова-абгрунтаваную запіску аб захаванні гістарычных назваў вуліц у Мінску і ў іншых гарадах краіны: (Лагойскі тракт, Гарадскі вал, Чэрвеньскі тракт)[443];

– рэкамендаваць Мінскаму гарадскому выканкаму сфарміраваць пастаянную камісію па вывучэнню назваў вуліц горада Мінска; улічваючы пры гэтым неабходнасць захоўвання старых назваў;

– правесці навуковую канферэнцыю "Аб выданні тома «Звод помнікаў культуры народаў СССР па г. Мінску»";

– узяць пад дзяржаўную ахову царкву Аляксандра Неўскага, касцёл

[439] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 148. – Арк. 24. Постановления президиума республиканского Совета общества за 1985 г.
[440] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 177. – Арк. 25. Протоколы 2-го Пленума Витебского областного Совета от 28.04.1982 г. об итогах работы (1981).
[441] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 184. – Арк. 5. Постановления президиума Республиканского Совета БДООПиК (1983).
[442] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 141. – Арк. 24. Документы о работе народных университетов знаний о памятниках истории и культуры (сведения, информация) за 1984–1987 гг.
[443] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 26. Протоколы заседаний президиума областного отделения БДООПИиК за 1966 г.

Святога Роха, будынак касцёла на плошчы Леніна і іншыя гістарычныя помнікі[444];

– забяспечыць усталяванне мемарыяльных знакаў на найбольш буйных прадпрыемствах Мінска з указаннем даты іх заснавання[445];

– стварыць музей гісторыі Мінска ў Кацярынінскай царкве[446];

– разам з Дзяржаўным гістарычным музеем БССР вырабіць аб'ёмныя кампазіцыі-макеты "Мінск XI стагоддзя", "Мінск XVIII стагоддзя";

– сумесна з Мастацкім музеем БССР арганізаваць экспазіцыю "Мінск у творах мастакоў";

– прапанаваць тэматыку краязнаўчых артыкулаў для газеты "Вячэрні Мінск".

Да 80-годдзя рэвалюцыі 1905–1907 гг. быў падрыхтаваны спіс вуліц г. Мінска, якія носяць імёны ўдзельнікаў рэвалюцыі[447].

У Віцебскай вобласці праблемы захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны імкнуліся вырашыць у большай меры праз мерапрыемствы, накіраваныя на адраджэнне і рэстаўрацыю памятных месцаў. У 1970-я гады ў адпаведнасці з тэматыкай плана работ прадугледжвалася: аднаўленне дачы І.Я. Рэпіна ў Здраўнёва пад Віцебскам[448]; падрыхтоўка пад'язднай дарогі і добраўпарадкаванне месца гібелі Героя Савецкага Саюза Ю. Смірнова каля в. Шалашына Дубровенскага р-на; захаванне зоны старой забудовы г. Віцебска; увекавечанне гібелі ваеннаслужачых ў снежні 1943 г. каля воз. Лосвіда; стварэнне мемарыяльнага комплексу на месцы пахавання салдат у в. Рыленкі Дубровенскага р-на; рэстаўрацыя Сафійскага сабора ў Полацку, царквы ў в. Камаі Пастаўскага р-на; уключэнне ў гісторыка-археалагічны запаведнік будынкаў Багаяўленскага манастыра і брацкай школы ў Полацку; аднаўленне помніка 1812 году ў Полацку; стварэнне абласнога этнаграфічнага музея-запаведніка; карціннай галерэі Ю. Пэна ў Віцебску і іншыя мерапрыемствы[449]. З пазіцый сённяшняга дня трэба сказаць, што практычна ўсе намеры выкананы.

Востра ставілася пытанне аб аднаўленні зруйнаванай Дабравешчанскай царквы ў г. Віцебску[450] і адкрыцці ў ёй музея гісторыі горада. Віцебскі абласны савет таварыства хадайнічаў аб стварэнні другой зоны гісторыка-археалагічнага запаведніка ў Полацку (Спаса-

---

[444] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 27. Планы работы президиума областного Совета на 1970 г.

[445] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 17. – Арк. 22. Постановления президиума ЦС БДООПиК за 1969 г.

[446] Тамсама. – Арк. 23.

[447] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 175. – Арк. 43. Протоколы собеседований с ответственными секретарями районных отделений о перестройке работы (1987).

[448] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 2. Справаздачы Цэнтральнага і абласных саветаў БДТАПГіК аб працы за 1969 г.

[449] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 5. Протоколы заседаний президиума областного отделения БДООПИиК за 1966 г.

[450] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 25. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.

Рэпазіторый ВДУ

Еўфрасіннеўскага манастыра); рэстаўрацыі Куцеінскага манастыра ў Оршы (як цэнтра кнігадрукавання на Беларусі); стварэнні ў Смалянах запаведніка гісторыі беларускай архітэктуры[451].

У пачатку 1980-х гадоў у Віцебскім абласным савеце ўзнімалася пытанне аб тым, каб стварыць у яго структуры секцыю краязнаўцаў. У яе планавалася ўключыць актыўных даследчыкаў роднага краю, актывістаў таварыства, навукоўцаў ВНУ горада, якія змаглі б працаваць над напісаннем гісторыі асобных раёнаў і вуліц горада, збіраць неабходныя матэрыялы па азначанай тэме, праводзіць курсы па павышэнні навуковай і мастацкай кваліфікацыі членаў таварыства[452].

Практыка 60–80-х гадоў ХХ ст. сведчыць, што ў дзейнасці таварыства значная роля надавалася развіццю турызму. З мэтай пашырэння турысцка-краязнаўчай працы як актыўнага сродку вывучэння гісторыі і культуры быў распрацаваны шэраг грамадска значных мерапрыемстваў. Цэнтральны савет БДТАПГіК звярнуўся ў прэзідыум АН БССР з прапановай уключыць у падрыхтаваны да выдання “Звод помнікаў гісторыі і культуры” спецыяльны раздзел аб турысцкіх маршрутах па памятных мясцінах[453].

Сумесна з камітэтам па друку пры Савеце Міністраў БССР была прынятая пастанова аб ўключэнні ў планы дзяржаўных выдавецтваў кніг і брашур аб гісторыка-культурнай спадчыне, прац, прысвечаных аднаўленню і рэстаўрацыі старажытных гарадоў і помнікаў, даведнікаў, пуцяводнікаў, буклетаў, мастацкіх альбомаў, паштовак, плакатаў, метадычных дапаможнікаў па падрыхтоўцы правядзення экскурсій па памятных месцах Беларусі. Цэнтральным Саветам было прынята рашэнне стварыць у кожнай вобласці гаспадарчаразліковыя майстэрні па вытворчасці сувеніраў і значкоў[454].

Асобая ўвага звярталася на дзейнасць экскурсійных бюро. Для павышэння навуковага ўзроўню экскурсій грамадскім экскурсаводам прапаноўвалася пашырыць кантакты з кабінетамі палітычнай асветы гаркамаў, райкамаў КПБ, архівамі, дзяржаўнымі і грамадскімі музеямі; пастаянна працаваць над павышэннем кваліфікацыі экскурсаводаў. У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі ў Віцебскай вобласці было распрацавана 150 новых тэм экскурсій[455]. Пры правядзенні рэстаўрацыйных і рэканструкцыйных работ першапачатковая ўвага надавалася тым помнікам, якія знаходзіліся на турысцка-экскурсійных

[451] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 5. Планы работы президиума областного Совета на 1970 г.
[452] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 115. – Арк. 45. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1976 г.
[453] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 17. – Арк. 30. Постановления президиума ЦС БДООПиК за 1969 г.
[454] Тамсама. – Арк. 32–34.
[455] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 94. – Арк. 34–46. Даведкі, інфармацыі ў ЦК КПБ, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Савет міністраў БССР аб стварэнні ў рэспубліцы музея народнай архітэктуры, стане, уліку і ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, асноўных формах працы Бюро прапаганды ведаў пра помнікі гісторыі і культуры (1975–1976 гг.).



Репозиторий ВГУ

маршрутах. Напрыклад, у першую чаргу аднаўляўся Мірскі замак, праводзілася кансервацыя рэшткаў замкаў у Навагрудку, Лідзе, Крэве, Косаўскага і Ружанскага палацаў, царквы ў Мсціслаўі і іншых аб'ектаў. У жніўні 1977 года была прынята пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні экскурсійнага маршруту на гістарычных помніках у наваколлях Мінска (умоўная назва "Старажытнае кальцо Мінска").

Дзейнасць таварыства была б яшчэ больш выніковай, калі б ёй не перашкаджалі аб'ектыўныя, а часта і суб'ектыўныя прычыны. Перш за ўсё, можна адзначыць недастатковыя фінансавыя магчымасці таварыства.

Не задавальняла патрэбы БДТАПГіК невялікая колькасць і невысокі ўзровень спецыялістаў у галіне рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры (архітэктараў, рэстаўратараў, навуковых работнікаў), якія працавалі па замовах таварыства. Часта складвалася парадаксальная сітуацыя, калі па гэтай прычыне грошы заставаліся незасвоенымі. Напрыклад, на рамонт, рэстаўрацыю, кансультаванне, добраўпарадкаванне помнікаў архітэктуры ў 1970 годзе таварыствам было выдзелена 90 тыс. рублёў. Гэтыя грошы планавалася скарыстаць на рэстаўрацыйныя работы Сафійскага сабора ў Полацку (21,8 тыс. руб.); кансультацыйныя, даследчыя і праектныя работы па аднаўленню Мірскага замка (46 тыс. руб.); рамонтныя, даследчыя і праектна-каштарысныя работы помніка ў в. Лясная Магілёўскай вобласці (10,3 тыс. руб.), Слуцкай брамы ў Нясвіжы (8,5 тыс. руб.), драўлянай шатровай царквы ў Давыд-Гарадку (4 тыс. руб.)[456]. На самой справе аказалася, што з вылучаных сродкаў 24,6 тыс. рублёў (27,3%) так і не былі асвоены.

Шэраг недахопаў меўся ў рабоце спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрань: слабая матэрыяльна-тэхнічная база, малая колькасць кваліфікаваных рабочых, нізкая культура працы і інш.[457].

На наш погляд, станоўчай адзнакі ў развіцці краязнаўчых даследаванняў заслугоўвае імкненне кіраўніцтва таварыства да аб'яднання намаганняў грамадскасці і дзяржаўных устаноў і ведамстваў, а таксама вытворчых калектываў. Да прыкладу, на сумесных пасяджэннях прэзідыума Цэнтральнага савета БДТАПГіК і калегій Міністэрства асветы і Міністэрства культуры БССР 5 сакавіка 1971 г. была прынятая пастанова аб прыцягненні да прапаганды пошукавай працы рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі[458].

У адпаведнасці з пастановай была праведзена рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя "Помнікі рэвалюцыйнай і баявой славы савецкага народа і іх роля ў навучанні і выхаванні моладзі і школьнікаў", у 1972 годзе быў падрыхтаваны і выдадзены альбом-

---

[456] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 31. – Арк. 3–7. Постановления и распоряжения президиума ЦС БДООПиК за 1970 г.
[457] Тамсама. – Арк. 65–66.
[458] НАРБ. – Фонд 492. – Воп. 1. – Спр. 48. – Арк. 9. Справаздачы Цэнтральнага і абласных саветаў БДТАПГіК аб працы за 1971 г.



Рэпазіторый ВДУ

дапаможнік для навучэнцаў школ “Помнікі беларускай культуры”[459], створаны навукова-папулярны фільм “Выдатныя помнікі беларускай культуры”, арганізаваны цыкл радыё і тэлеперадач пра помнікі гісторыі і культуры для школьнікаў, рэдакцыя “Настаўніцкай газеты” пачала публікацыю матэрыялаў у дапамогу педагогам-краязнаўцам, а сярэднім школам было рэкамендавана аформіць падпіску на бюлетэнь “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”[460].

У 1986 г. БДТАПГіК налічвала 2 316 000 членаў, якія ўваходзілі ў 12 459 пярвічных арганізацый. Штогод адбываліся 3–4 семінары-нарады з адказнымі сакратарамі, архівамі, навуковымі ўстановамі і факультэтамі ведаў пра помнікі гісторыі і культуры, лекторыямі і кіналекторыямі. Навукова-метадычныя фарміраванні аб’ядноўвалі 569 чалавек – вучоных, краязнаўцаў, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў. На працягу 1969–1985 гадоў на будаўніцтва, рэстаўрацыю і добраўпарадкаванне помнікаў БДТАПГіК патраціла 5 млн 736,5 тыс. рублёў[461].

З сярэдзіны 1980-х гадоў разам з “перабудовай” грамадства пачаліся змены і ў працы таварыства. Новы час патрабаваў новых падыходаў да ўнутрыарганізацыйнай дзейнасці. Напрыклад, адказныя сакратары раённых аддзяленняў таварыства сталі праводзіць размовы аб “перабудове працы” з кіраўніцтвам абласных таварыстваў. Матэрыялы сведчаць, што такія гутаркі-справаздачы часта насілі фармальны характар, змяненні ў дзейнасці мясцовых арганізацый адбываліся марудна[462]. Можна меркаваць, што павелічэнне фармалізму ў працы таварыства ў некаторым сэнсе было адказам на неразуменне палітыкі “галоснасці”.

Палітыка “перабудовы” паўплывала на дзейнасць таварыства дваіста. З аднаго боку, ва ўмовах нарастаючых эканамічных цяжкасцей замаруджваецца рэстаўрацыйная дзейнасць, фінансуемая БДТАПГіК. З другога боку, з канца 1980-х гг. павялічваецца грамадская актыўнасць радавых членаў таварыства. Узнікае добраахвотны грамадскі рух у падтрымку аховы помнікаў гісторыі і культуры. Так, напрыклад, у Віцебску быў утвораны клуб добраахвотнай дапамогі рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры “Узгор’е”, у Гродне – клуб “Паходня”, у Магілёве – краязнаўчы клуб “Машэка” і іншыя. З’яўленне новых грамадскіх арганізацый было адказам на фармалізацыю працы таварыства. У дзейнасці БДТАПГіК складваецца сітуацыя, калі назіраецца ўсплёск цікавасці да краязнаўства, пашырэнне тэматыкі даследаванняў (славутыя землякі, славутыя роды, гісторыка-культурная спадчына дарэвалюцыйнага

[459] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 40. – Арк. 41. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972 гг.
[460] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 18. – Арк. 3. Постановления совета облоно, президиума областного совета БДООПиК за 1969 г.
[461] V з’езд Таварыства // Помнікі аховы гісторыі і культуры. – 1987. – № 1. – С. 3.
[462] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 175. – Арк. 8–12. Протоколы собеседований с ответственными секретарями районных отделений о перестройке работы (1987).

Рэпазіторый ВДУ

перыяду і іншыя), у той жа час узмацняецца недавер да старых метадаў дзейнасці, палітызацыя грамадства не спрыяе правядзенню даследаванняў .

Такім чынам, на працягу 1961–1991 гг. БДТАПГіК адыграла важную ролю ў развіцці грамадскага гістарычнага краязнаўства Беларусі. Таварыства ўцягнула ў сваю дзейнасць каля 2,1 млн індывідуальных членаў (на 1991 г.). Паступова вызначыліся асноўныя накірункі працы таварыства, была створана грамадская сістэма аховы помнікаў гісторыі і культуры, адрэстаўравана, адноўлена і збудавана вялікая колькасць помнікаў гісторыі і культуры і мемарыялаў мясцовага і рэспубліканскага значэння, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. З удзелам членаў таварыства падрыхтаваны і выдадзены шматлікія выданні краязнаўчай тэматыкі. Дзякуючы дзейнасці арганізацыі захавалася значная колькасць помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Вопыт, назапашаны ў падрыхтоўцы на грамадскіх пачатках кадраў для аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, ператварыў БДТАПГіК у своеасаблівую школу кадраў для дзяржаўных помніказберагаючых установ. У сваю чаргу кіраўнікі і супрацоўнікі такіх установ, якія бралі ўдзел у дзейнасці таварыства, паспяхова выкарыстоўвалі яго вопыт і магчымасці ў культурным будаўніцтве Беларусі. У 60-х – першай палове 80-х гг. XX ст. БДТАПГіК з’яўлялася па сутнасці адзінай грамадскай арганізацыяй, якая ставіла мэтай сваёй дзейнасці краязнаўчыя даследаванні і праводзіла іх у розных рэгіёнах краіны. Аднак магчымасцей і аўтарытэту гэтай арганізацыі не заўжды хапала для больш эфектыўнай абароны помнікаў мінуўшчыны, напрыклад, культавага характару.

## 3.2. Праца краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры і Беларускага краязнаўчага таварыства

У сярэдзіне 1980-х гг. становяцца адчувальнымі змены ў сацыяльна-палітычнай сітуацыі БССР. З аднаго боку, па-ранейшаму праводзіцца афіцыйная палітыка, накіраваная на сціранне этнасацыяльных адрозненняў, фарміраванне новай гістарычнай супольнасці – “савецкага народу”, з другога – назіраецца пэўны крызіс пануючай ідэалогіі, страта ў часткі народа даверу да камуністычных лозунгаў, складванне двааядумства. Спрабуючы знайсці выйсце з сітуацыі, Палітбюро ЦК КПСС у асобе Генеральнага сакратара М.С. Гарбачова абвясціла курс на “перабудову”, дэмакратызацыю і галоснасць савецкага грамадства. На гэтай хвалі абуджаецца дзейнасць шматлікіх аб’яднанняў і суполак. Галоўнае месца першапачаткова адводзілася вывучэнню гістарычна-этнаграфічна-краязнаўчых праблем.

Краязнаўства становіцца прадметам цікавасці шырокіх колаў грамадства: ад навуковай інтэлігенцыі, якая аб’яднала свае намаганні ў



Репозиторий ВГУ

складзе краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры, да простых грамадзян, якія стварылі нефармальныя аб'яднанні, з мэтай адраджэння нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Развіццё грамадскіх арганізацый, якія ставілі сваімі мэтамі лакальныя даследаванні, ішло ў двух накірунках: фармальным (арганізацыі ці падтрымцы дзяржаўнымі структурамі ўжо існуючых грамадскіх арганізацый: БДТАПГіК, Беларускага фонду культуры і краязнаўчай камісіі пры ім) і нефармальным (узнікненні грамадскіх ініцыятыў, якія ў новых умовах жадалі па-новаму вырашаць праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны: грамадскія аб'яднанні "Майстроўня", "Талака" (Мінск), "Талака" (Гомель), "Паходня", "Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя" (Гродна), "Узгор'е" (Віцебск), "Машэка" (Магілёў) і іншыя.

Актыўнае станаўленне арганізаванага краязнаўчага руху ў канцы 1980-х гадоў у БССР стала натуральнай рэакцыяй грамадства на змены ў палітычным і духоўным жыцці краіны. Яно разглядалася інтэлігенцыяй як сродак навуковага даследавання краю і форма навукова-папулярызатарскай дзейнасці з мэтай актыўнага ўплыву на культурнае развіццё сваёй мясцовасці. Вучоныя, даследчыкі, выкладчыкі-гісторыкі праз краязнаўства імкнуліся падыйсці да вырашэння набалелых праблем – фарміравання гістарычнай і нацыянальнай свядомасці, барацьбы супраць вандалізму ў адносінах да помнікаў мінулага, манкурцтва, нігілізму.

У выступленнях прадстаўнікоў інтэлігенцыі перыяду "перабудовы" прасочваецца думка аб тым, што грамадскае краязнаўства "трымалася" толькі на энтузіязме асобных людзей. (З такімі аргументамі, на нашу думку, можна не пагадзіцца, бо ў іх пераважалі эмоцыі і суб'ектыўны падыход). Актывісты краязнаўства ў сваіх выступленнях у канцы 1980-х гадоў адзначалі, што за 1930–1970-я гады краязнаўства страціла сваю прывабнасць шматгаліновай гуманітарнай дысцыпліны, а на практыцы часта зводзілася толькі да ваенна-патрыятычнага выхавання[463]. Застаючыся людзьмі свайго часу, удзельнікі краязнаўчага руху канца 1980-х гадоў прапаноўвалі адрадзіць традыцыі краязнаўства 1920-х гадоў "на аснове ленінскіх традыцый у краязнаўстве і гістарычнай навуцы"[464].

Пад імі яны разумелі, па-першае, пэўны плюралізм думак і поглядаў (пры захаванні прынцыпу партыйнасці), па-другое, масавы ўдзел насельніцтва ў краязнаўчым руху пры стварэнні дзяржаўнага арганізацыйнага і каардынацыйнага цэнтра кіраўніцтва краязнаўчай

Рэпазіторый ВДУ

---

463 Бабишин, С.Д. Из опыта краеведческой работы в школах (по материалам Хмельницкой области УССР) / С.Д. Бабишин // История СССР. – 1962. – № 2. – С. 237–238; Кабанов, П.И. О советском историческом краеведении / П.И. Кабанов, А.В. Ушаков // История СССР. – 1963. – № 3. – С. 3–17; Разгон, А.М. Пути советского краеведения / А.М. Разгон // История СССР. – 1967. – № 4. – С. 190–201.

464 Коткин, С. О краеведении и его методологии / С. Коткин // Методология региональных исторических исследований: материалы междунар. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 июня 2000 г. / РГГУ; Ист.-арх. ин-т; сост.: С.О. Шмидт (гл. ред.) [и др.]. – СПб.: Нотабене, 2000. – С. 16–22; Туманов, В.Е. Наследие в системе образования / В.Е. Туманов // Школьное краеведение: практический опыт, идеи. – М.: Книжная палата, 1995. – С. 67–69.

дзейнасцю, па-трэцяе, скіраванасць гістарычнага краязнаўства на нацыянальны кампанент гісторыі (не адмаўляючыся ад прынцыпаў сацыялістычнага інтэрнацыяналізму). Адзначым таксама, што гэта быў пэўны паўтор тых пазіцый, на якіх знаходзілася шмат гісторыкаў пачатку 1960-х гг.[465].

У 1987 годзе ў Кіеве адбылася I Усесаюзная канферэнцыя па гістарычным краязнаўстве. Арганізатарамі яе выступілі Акадэмія навук СССР, Міністэрствы культуры, асветы, вышэйшай і сярэдняй адукацыі СССР, Дзяржаўны камітэт СССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі, Дзяржаўны камітэт СССР па справах выдавецтва, паліграфіі і кніжнага гандлю, Савецкі фонд культуры, Саюз пісьменнікаў СССР, Усерасійскае і Украінскае таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры, Палтаўскі педагагічны інстытут імя В.Г. Караленкі, шэраг грамадскіх арганізацый. Факт правядзення канферэнцыі, удзелу ў ёй прадстаўнічых установ, ведамстваў і арганізацый сімвалізаваў сабой адраджэнне краязнаўства ў СССР. Заўважым, што падобныя мерапрыемствы не праводзіліся ў краіне з 1924 г.

Канферэнцыя выпрацавала праграмны дакумент “Асноўныя напрамкі далейшага развіцця гістарычнага краязнаўства ў СССР”, у якім вызначаліся канкрэтныя меры, накіраваныя на развіццё рэгіянальных гістарычных даследаванняў, адкрыццё музеяў, працы па ахове помнікаў, паляпшэння выкладання гісторыі роднага краю ў ВНУ, тэхнікумах, прафесійна-тэхнічных вучылішчах. Дакумент закранаў таксама і праблемы выдання краязнаўчай літаратуры, падрыхтоўкі падручнікаў, дапаможнікаў, нагляднасці.

Практычныя рэкамендацыі I Усесаюзнай канферэнцыі былі абмеркаваны на пасяджэнні бюро Аддзялення гісторыі АН СССР, якое выказала прапанову аб неабходнасці стварэння арганізацыйнага цэнтра як у маштабах СССР, так і ў кожнай рэспубліцы[466]. Хаця падобныя працэсы зафіксаваны і на Беларусі, але тут яны мелі свае асаблівасці. У прыватнасці, калі рэспубліканскія краязнаўчыя таварыствы на Украіне і Расіі ўтварыліся ў 1987 г., то стварэнне беларускага краязнаўчага таварыства адбылося толькі ў канцы 1989 года.

Цэнтрам згуртавання нацыянальна-культурных сіл, якія бачылі ў краязнаўстве адзін са сродкаў актывізацыі культурна-гістарычнага жыцця грамадства стала створанае ў красавіку 1987 г. Беларускае аддзяленне савецкага фонду культуры (БФК). З’яўляючыся добраахвотнай грамадскай арганізацыяй, БФК ставіла перад сабой задачы садзейнічання развіццю культуры ў Беларусі, у тым ліку і праз краязнаўства.

Репозиторий ВГУ

[465] Мамонтов, А.В. Нерешенные проблемы краеведения / А.В. Мамонтов, В. Николаев, Н. Щерба // Библиотекарь. – 1972. – № 6. – С. 16–19; Юньев, И.С. Возродить массовое краеведческое движение / И.С. Юньев // Коммунист. – 1960. – № 3. – С. 157–159.

[466] Тронько, П.Т. Развитие исторического краеведения на Украине / Р.Т. Тронько // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 8–15.

У складзе арганізацыі ў 1987 г. была ўтворана краязнаўчая камісія. У яе ўваходзілі вядомыя гісторыкі і краязнаўцы: Г.А Каханоўскі, А.А. Трусаў, Э.М. Загарульскі, Г.В. Кісялёў, А.М. Люты, Э.А. Ляўкоў, В.Н. Рабцэвіч, К.І. Тарасаў, А.К. Цітоў, В.А. Чамярыцкі, Г.В. Штыхаў, Э.В. Ялугін. Актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі краязнаўчага руху ў краіне (адпаведна дакументаў краязнаўчай камісіі БФК) П.П. Касцюкевіч, М.А. Ткачоў, Ю.А. Якімовіч і іншыя[467]. За межамі рэспублікі краязнаўчымі даследаваннямі займаліся А.К. Каўка, М.В. Мікалаеў, Л.В. Аляксееў, В.П. Грыцкевіч[468].

Краязнаўчай камісіяй БФК у мэтах сістэматызацыі вывучэння гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа была распрацавана праграма "Краязнаўства", якая вызначала апошняе як навуковую і навукова-папулярызатарскую дзейнасць па вывучэнні канкрэтнага рэгіёна, важны фактар фарміравання савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. Праграма прадугледжвала шэраг мер і мерапрыемстваў па разгортванню шырокага краязнаўчага руху ў БССР. Галоўны ўпор рабіўся на далучэнне працоўных краіны (асабліва моладзі) да пазнання духоўнага патэнцыялу родных мясцін, традыцый айчыннай гісторыі і культуры.

Праграмай былі акрэслены **задачы краязнаўчых арганізацый**. Яны дыялектычна спалучалі традыцыі краязнаўства папярэдніх часоў і новых рэалій канца 80-х гг. XX ст. У якасці асноўных накірункаў працы вызначаліся:

– пошукавая архіўна-бібліяграфічная работа;

– збор дакументальных і рэчавых крыніц (вывучэнне гісторыі краязнаўства, складанне мясцовай бібліяграфіі);

– працяг работы па выяўленні помнікаў гісторыі і культуры;

– арганізацыя разнапрофільных музеяў (падтрымка, удасканаленне і пашырэнне сеткі дзяржаўных, грамадскіх і школьных музеяў, куткоў працоўнай і баявой славы);

– мемарыялізацыя памятных падзей: напісанне гісторыі вёсак і гарадоў, складанне летапісаў населеных пунктаў, калектываў, навучальных устаноў[469].

З мэтай выканання апошняга накірунку прадугледжвалася вядзенне летапісных кніг кожнага прадпрыемства, кожнай арганізацыі дляператварэння іх у частку гісторыі горада, вёскі, сельскага савета, раёна.

Вялікую ўвагу планавалася надаць вывучэнню жыцця, дзейнасці, творчай спадчыны выдатных асоб беларускай навукі і культуры, біяграфій

467 НАРБ. – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Спіс вядучых краязнаўцаў Беларусі і саюзных рэспублік.
468 Трэпет, Л. Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1998. – Т. 4. – С. 257–260.
469 НАРБ – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Зварот краязнаўчай камісіі ў ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Міністэрства культуры.



Репозиторий ВГУ

знакамітых мясцовых жыхароў; прапагандзе гісторыі краю ў мясцовым друку; выданню краязнаўчых часопісаў, бюлетэняў; правядзенню краязнаўчых канферэнцый; дзейнасці народных універсітэтаў краязнаўства, арганізацыі свят і юбілеяў, вывучэнню тапанімікі, збіранню вуснай народнай творчасці і стварэнню фонду вуснай памяці, дапамозе органам асветы. Важнай задачай лічыўся працяг распрацоўкі турысцкіх і экскурсійных праграм. Адным з такіх прыкладаў можа служыць імкненне стварыць краязнаўчы турысцка-экскурсійны маршрут па месцах паўстання 1863–1864 гг.[470].

На працягу 1987–1990 гг. краязнаўчай камісіяй была праведзена значная праца па разгортванню арганізаванага краязнаўчага руху. Стала зразумела, што актыўнае развіццё грамадскага краязнаўства немагчыма без ***стварэння шырокай сеткі грамадскіх краязнаўчых арганізацый.*** Для гэтага прадугледжвалася, па-першае, вылучэнне актыўных краязнаўцаў і стварэнне картатэкі краязнаўцаў рэспублікі (у далейшым на аснове гэтых дадзеных планавалася выданне энцыклапедычнага даведніка “Краязнаўцы Беларусі”). Па-другое, падрыхтоўка і правядзенне ў 1988–1989 гг. абласных і рэспубліканскай навукова-практычных краязнаўчых канферэнцый, якія павінны былі стаць сродкам абмену і абагульнення перадавога вопыту і дапамаглі б вызначыць і спрагназаваць найбольш важныя накірункі ў краязнаўчай дзейнасці.

Вынікам такой працы павінна было стаць стварэнне рэспубліканскага краязнаўчага таварыства ў БССР. Беларускі фонд культуры разам з Міністэрствамі культуры, народнай асветы, ЦК ЛКСМБ, з удзелам аддзела культуры ЦК КПБ правёў у сакавіку 1989 г. рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю, якой папярэднічалі краязнаўчыя навукова-практычныя канферэнцыі ў Віцебску, Гродне, Брэсце і Гомелі[471]. Канферэнцыі мелі важнае значэнне для выпрацоўкі канкрэтных накірункаў арганізацыйна-практычнай работы, прапаганды краязнаўчых ведаў, развіцця даследаванняў па вывучэнні краю.

Практычным крокам па разгортванню краязнаўчага руху стала ***арганізацыя народных універсітэтаў краязнаўства*** ў краіне. Такія ўстановы абласнога, гарадскога і раённага прызначэння утвараліся пры ўдзеле партыйных, савецкіх органаў, таварыства “Веды”. Яны адрозніваліся ад народных універсітэтаў ведаў пра помнікі гісторыі і культуры больш шырокай тэматыкай разглядаемых пытанняў. Заняткі, якія праводзіліся на працягу навучання, адыгралі важную ролю ў адраджэнні гістарычнай і нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. У Мінску, напрыклад, праграма лекцыйнага курса складалася больш чым з 30 лекцый па актуальных тэмах беларускай гісторыі. Іх чыталі вядомыя навукоўцы Беларусі: А.П. Грыцкевіч,

[470] НАРБ – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Зварот краязнаўчай камісіі ў ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Міністэрства культуры. – Арк. 92.
[471] Тамсама. – Арк. 97.

Рэпазіторый ВДУ

Г.В. Штыхаў, К.І. Тарасаў, М.А. Ткачоў, В.А. Чамярыцкі, А.І. Мальдзіс, Г.В. Кісялёў, М.В. Біч, У.М. Конан, Н.Ф. Высоцкая, А.К. Цітоў і інш.[472].

Заслугоўвае ўвагі, што краязнаўчая камісія выйшла з прапановай аб пераглядзе старых і ***стварэнні новых падручнікаў*** па гісторыі Беларусі, дзе гістарычныя падзеі, якія мелі месца на Беларусі, адлюстроўваліся з пазіцый гістарызму і навуковай аб'ектыўнасці. Камісія звярнулася з прапановай да Міністэрства народнай асветы ўвесці ў сярэднія школы і ПТВ спецыяльны прадмет "Краязнаўства" як састаўную частку гісторыі СССР і арганізаваць у ВНУ і тэхнікумах краіны вывучэнне спецыяльнага прадмета па гісторыі і культуры Беларусі.

Яшчэ адна прапанова была накіравана ў Інстытут гісторыі АН БССР з пажаданнем садзейнічаць у ***распрацоўцы і публікацыі*** навуковых ***даследаванняў*** па асобных старонках гісторыі і культуры Беларусі, недастаткова вывучаных у гістарычнай і культуралагічнай навуках.

Неабходна звярнуць увагу на той факт, што прапановы ў большасці былі прынятыя. Напрыклад, быў падрыхтаваны спіс тэм навуковых даследаванняў і манаграфій па праблемах гісторыі Беларусі, якія патрабуюць распрацоўкі і папулярызацыі. Сярод іх – "Утварэнне Вялікага княства Літоўскага", "Лівонская вайна і яе наступствы для Беларусі", "Беларусь і крымскія татары", "Эміграцыйныя і інтэграцыйныя працэсы ў Беларусі на працягу апошніх 600 гадоў", "Паўстанне Т. Касцюшкі" і іншыя. Такім чынам краязнаўчая камісія, дзякуючы ўдзелу вядучых навукоўцаў і выдатных дзеячаў культуры распачала дзейнасць па вывучэнні "белых плям" і маладаследаваных тэм, якія і на цяперашні момант вывучаюцца гістарычнай навукай суверэннай Беларусі.

Камісія выступіла з ініцыятывай падрыхтоўкі і **публікацыі** такіх **арыгінальных выданняў**, як: 7-томная "Гісторыя гарадоў і сёл Беларусі", Поўны збор беларускіх летапісаў і хронік, штогадовыя зборнікі па гісторыі і археалогіі Беларусі, асобныя манаграфіі ("Слуцкія паясы", "Незахаваныя помнікі беларускай гісторыі і культуры"). Прапаноўвалася таксама перавыдаць шэраг работ вядомых гісторыкаў, краязнаўцаў, выдаць метадычныя матэрыялы ў дапамогу краязнаўцам, паштоўкі, календары, плакаты краязнаўчай тэматыкі. Сама камісія распачала працу над "Чырвонай кнігай гісторыка-геаграфічных назваў Беларусі"[473].

Былі і іншыя прапановы і канкрэтныя дзеянні камісіі з мэтай разгортвання краязнаўчага руху: для студэнцкіх атрадаў распрацавалі краязнаўчую праграму (адказныя Д.Л. Яцкевіч, А.І. Дзярновіч); вялася праца па стварэнні гісторыка-геаграфічных (гісторыка-літаратурна-архітэктурных) карт і атласаў Беларусі і рэгіёнаў. Члены камісіі звярнуліся ў ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Міністэрства культуры з прапановай, каб газетная

[472] НАРБ. – Фонд Беларускага фонду культуры (неапрацаваны). Спіс вядучых краязнаўцаў Беларусі і саюзных рэспублік.
[473] Каханоўскі, Г.А. Краязнаўства – клопат многіх / Г.А. Каханоўскі // ЛіМ. – 1988. – 22 крас. – С. 13.



Репозиторий ВГУ

рубрыка “Ці ведаеце Вы свой край?” стала пастаяннай на старонках рэспубліканскіх газет.

Цікава адзначыць ініцыятывы, якія былі прапанаваны абласнымі і гарадскімі краязнаўчымі арганізацыямі практычна ў кожным рэгіёне рэспублікі. У Мінску, напрыклад, да 500-годдзя (1990 г.) з дня нараджэння першадрукара і асветніка Ф. Скарыны прапанавалася ўзвесці помнік, а таксама надаць імя першадрукара Мінскаму інстытуту культуры; надаць імя Ф. Скарыны другой, больш добраўпарадкаванай вуліцы ў г. Мінску; садзейнічаць усталяванню мемарыяльнай дошкі Ф. Скарыны на будынку Кракаўскага ўніверсітэта (ПНР); заснаваць ў Мінску на базе аддзела рэдкай кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі музей рэдкай кнігі.

У Віцебскай вобласці у адпаведнасці з распрацаванай фондам культуры праграмай “Спадчына” прапаноўвалася на тэрыторыі Асвейска-Расонскай партызанскай зоны стварыць дзяржаўны мемарыяльны партызанскі запаведнік “Братэрскі край”; у Полацку – у будынку Брацкай школы ладзіць музей беларускага кнігадрукавання і добраўпарадкаваць вуліцу Ф. Скарыны.

Мясцовымі краязнаўцамі быў распрацаваны перспектыўны план узвядзення помнікаў і манументаў у гонар асоб, якія сваёй дзейнасцю прынеслі вядомасць Віцебшчыне, а менавіта: да 950-годдзя (1994 г.) з дня нараджэння князя Полацкага Усяслава Брачыславіча прапанавалася ўзвесці помнік у г. Полацку. Было прапанавана ўзвесці помнік легендарнай заснавальніцы Віцебска княгіне Вользе ў гонар 975-годдзя (1996 г.) згадвання горада ў пісьмовых крыніцах (1021 г.). Па прапанове краязнаўцаў да 445-годдзя (1995 г.) з дня нараджэння беларускага кнігадрукара Васіля Цяпінскага ўстанавіць мемарыяльную дошку ў в. Цяпіна Чашніцкага раёна і надаць яго імя адной з вуліц г. Віцебска. Да 370-годдзя (1999 г.) з дня нараджэння грамадскага дзеяча і асветніка Сімяона Полацкага ўзвесці помнік і надаць імя адной з вуліц у г. Полацку.

Аднак не ўсе з названых мерапрыемстваў былі рэалізаваны з прычыны пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў краіне. Шэраг прапаноў, якія былі выпрацаваны краязнаўцамі, падтрыманы і здзейснены ў наступныя гады дзяржаўнымі ўстановамі і арганізацыямі. Напрыклад, быў створаны музей-запаведнік рускага мастака І. Рэпіна ў в. Здраўнёва Віцебскага раёна, музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку, адкрыты мемарыяльныя дошкі беларускаму этнографу М.Я. Нікіфароўскаму ў г. Віцебску і на яго радзіме ў в. Вымна Віцебскага раёна, краязнаўцу У.Г. Краснянскаму ў Віцебску, створаны музей пісьменніка У. Караткевіча ў г. Оршы. Большасць з пранаванага здзейснілася ў сталіцы і Полацку на працягу наступных гадоў. Так, у склад Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага запаведніка ўваходзяць 12 музеяў.

Дзейнасць краязнаўчай камісіі БФК аказала пазітыўны ўплыў на развіццё краязнаўчага руху на Беларусі. Аб’ектыўна стала пытанне аб

Рэпазіторый ВДУ

стварэнні рэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі. Яно паспяхова вырашылася на Усебеларускай канферэнцыі краязнаўцаў, якая адбылася ў снежні 1989 г. У ёй прынялі ўдзел вядомыя навукоўцы і краязнаўцы з усіх рэгіёнаў Беларусі і СССР. Разглядаліся такія для таго часу актуальныя пытанні краязнаўства, як ахова гісторыка-культурнай спадчыны, выхаваўчыя магчымасці краязнаўства, выданне краязнаўчай літаратуры і прапаганда краязнаўчых ведаў, арганізацыя краязнаўчага руху ў рэгіёнах рэспублікі[474].

27 снежня 1989 г. канферэнцыя абвясціла сябе ўстаноўчым сходам Беларускага краязнаўчага таварыства. На працягу 1989–1990 гг. абласныя арганізацыі БКТ былі ўтвораны ва ўсіх абласцях і некаторых раёнах Беларусі. У Міністэрстве юстыцыі яно было зарэгістравана 4 чэрвеня 1991 г. З'яўляючыся па-сутнасці пераемніцай краязнаўчай камісіі БФК, Беларускае краязнаўчае таварыства ставіла перад сабой тыя ж задачы, што было адлюстравана ў статуце арганізацыі[475]. На жаль, узрастаючы эканамічны крызіс, а потым распад СССР і палітызацыя грамадства не дазволілі ў поўнай меры скарыстаць патэнцыял рэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі[476].

За вельмі кароткі час свайго існавання (у межах вывучаемага перыяду) краязнаўчая камісія БФК і яе спадкаемца БКТ зрабілі значны ўклад у развіццё краязнаўства і разгортвання яго як грамадскага руху. Адбыліся якасныя змены як у формах працы, так і змесце краязнаўчай дзейнасці. Шэраг ініцыятыў, шматлікія актуальныя праблемы гістарычнай навукі Беларусі былі сфармуляваны, актуалізаваны і акцэнтаваны менавіта намаганнямі гэтых арганізацый.

## 3.3. Краязнаўчая дзейнасць гісторыка-культурных грамадскіх таварыстваў і аб'яднанняў у другой палове 1980-х – 1991 г.

Новыя грамадска-палітычныя працэсы ў СССР, якія распачаліся з пачаткам палітыкі "перабудовы", прывялі да ўзнікнення "нефармальных рухаў", якія спачатку вызначаліся як клубы і гурткі па вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны. Адной з прычын іх фарміравання і развіцця была часта фармалізаваная дзейнасць у межах існуючага БДТАГіК, якая не задавальняла грамадзян з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Другой прычынай развіцця нефармальнага руху ў Беларусі стаў інтэнсіўны рост нацыянальнай самасвядомасці, перш за ўсё студэнцтва[477]. Узніклі

[474] Каханоўскі, Г.А. Ніва нашага патрыятызму / Г.А. Каханоўскі // ЛіМ. – 1990. – 19 кастр. – С. 4, 5, 7.
[475] Статут Беларускага краязнаўчага таварыства. – Мінск, 1991. – 27 с.
[476] Замест таго, каб вітаць... Адкрыты ліст да Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР // ЛіМ. – 1990. – 10 жн. – С. 1–2.
[477] Денисюк, О.Л. Неформальные объединения, общественно-политические движения, партии в СССР: предпосылки, становление, развитие (1985–1991) / О.Л. Денисюк. – Минск: БГУ, 2003. – С. 92.



репозиторий ВГУ

першыя аб'яднанні, члены якіх ставілі мэтай вывучэнне нацыянальнай этнаграфіі, культуры, гісторыі, рэлігіі.

Паколькі ў сваіх даследаваннях члены аб'яднанняў звярталіся да вывучэння гісторыі і культуры, перш за ўсё на мясцовым матэрыяле, ставілі задачы пазітыўных зменаў сваёй мясцовасці, то такую дзейнасць, на нашу думку, можна разглядаць як краязнаўчую.

У Беларусі аднымі з першых узніклі маладзёжныя гісторыка-культурныя аб'яднанні "Майстроўня" (1979), "Талака" ў г. Мінску (1985), "Паходня" і Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя ў г. Гродне (1986), "Узгор'е" у г. Віцебску (1986), "Машэка" у г. Магілёве (1989). У Гомелі існавала менш вядомае таварыства "Талака", у Оршы – клуб аматараў гісторыі і старажытнасцей "Повязь". Значная грамадская актыўнасць прывяла да стварэння ў Полацку адразу двух аб'яднанняў: "Маладзіка" і "Вытокаў".

Маладзёжнае творчае аб'яднанне "Беларуская спеўна-драматычная майстроўня", ці "Майстроўня" была ўтворана ў 1979 г. у Мінску студэнтамі БДУ і Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Пазней да яе далучыліся студэнты іншых ВНУ, аспіранты, школьная і рабочая моладзь Мінска. Асноўнай мэтай з'ўлялася адраджэнне ў гарадскім асяроддзі беларускай народнай абраднасці, святаў. Разам з вывучэннем народных песень, арганізацыяй святкавання Калядаў, гукання вясны, Купалля ў Мінску, Заслаўі, Вязынцы, члены таварыства бралі ўдзел у археалагічных раскопках, удзельнічалі ў талоках на рэстаўрацыйных аб'ектах у Траецкім прадмесці Мінска, праводзілі дабрачынныя акцыі, выступалі з канцэртамі, лекцыямі, гутаркамі. Арганізацыя спыніла сваю дзейнасць у 1984 г., але дала пачатак некалькім іншых тварыствам, у тым ліку "Талацэ"[478].

Мінскае гісторыка-культурнае аб'яднанне "Талака" пачало сваю дзейнасць у 1985 г. як "нефармальная" грамадская арганізацыя, налічвала каля 50 членаў. Члены клуба сваёй дзейнасцю садзейнічалі арганізацыі рэгіянальных гістарычных даследаванняў, удзельнічалі ў рэстаўрацыі помнікаў і археалагічных раскопках у Траецкім прадмесці Верхняга горада ў Мінску, стварэнні музея народнай архітэктуры і побыту ў в. Строчыцы Мінскага раёна і інш., будаўніцтве помнікаў (напрыклад, паўстанцам 1863 г. у в. Плябань Маладзечанскага раёна). Яны актыўна выступалі за шырокае выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці, стварэнне беларускіх школ, арганізоўвалі дыскусіі і асветніцкія лекцыі, фальклорныя святы, літаратурна-мастацкія вечарыны і іншыя мерапрыемствы. Арганізацыя спыніла сваё існаванне ў 1990 г. у сувязі з тым, што большая частка яе членаў стала актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці і пераходзіла ў іншыя грамадскія арганізацыі.

---

478 Дубавец, С. Майстроўня. Гісторыя аднаго цуду / Сяргей Дубавец; фота А. Канцавога. – [Б. м.]: Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2012. – 457 с.



Репозиторий ВГУ

12 сакавіка 1986 г. па ініцыятыве супрацоўнікаў Інстытута біяхіміі Акадэміі навук БССР у Гродне быў створаны клуб “Паходня”, пераўтвораны ў пачатку 1991 г. у гісторыка-культурнае таварыства. У Гродне, як і ў сталіцы Беларусі, працэс узнікнення грамадскіх гісторыка-культурных таварыстваў адбываўся хутчэй, чым у іншых рэгіёнах краіны. Важнае значэнне ў развіцці краязнаўства на Гродзеншчыне мела, па-першае, існаванне у Гродзенскім універсітэце імя Я. Купалы гістарычнага факультэта з высокакваліфікаванымі навуковымі кадрамі і, па-другое, наяўнасць Дзяржаўнага архіва з багатымі дарэвалюцыйнымі фондамі. Станоўчую ролю ў дзейнасці таварыства адыграў гісторык М.А. Ткачоў, які ў 1986–1989 гг. быў яго прэзідэнтам.

Удзельнікі “Паходні” займаліся вывучэннем гістарычных падзей, жыцця і творчасці выдатных прадстаўнікоў мінулага, помнікаў архітэктуры Гродзеншчыны, удзельнічалі ў паходах па гістарычных мясцінах Беларусі, сустракаліся з выдатнымі сучаснікамі, займаліся прапагандай беларускіх звычаяў і традыцый, музыкі, літаратуры, фальклору, беларускай мовы. Таварыства мела статут, зацверджаны УЦСПС і ЦК ЛКСМБ, членскі значок, памятны медаль, збіраліся членскія ўзносы[479].

У святле палітыкі “перабудовы” краязнаўцы прапанавалі рэалізаваць новыя перспектыўныя шляхі ў развіцці культуры Наднёманскага краю. Гэта добра бачна з прапаноў, з якімі звярнуліся члены клуба да першага сакратара Гродзенскага абкама КПБ Л.Г. Кляцкова. З улікам новых археалагічных даных і супастаўлення гісторыі г. Гродна з гісторыяй іншых гарадоў (перш за ўсё, Кіева) ставілася пытанне аб святкаванні ў 2000-м годзе 1000-гадовага юбілею горада. Прапанавалася распрацаваць і ажыццявіць 12-гадовую гісторыка-культурную праграму “Гродна – горад музей. Гродна – горад музеяў”.

Мерапрыемствамі прадугледжвалася адкрыццё новых музеяў, сярод якіх музей гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і Камсамола Заходняй Беларусі, музей камсамола Гродзеншчыны, музей славутых ураджэнцаў Гродзеншчыны з алеяй бюстаў землякоў, музей гісторыі горада Гродна, музей-аптэка і музей гісторыі медыцыны, музей сацыялістычных пераўтварэнняў Гродзеншчыны, музей гісторыі пісьменства, асветы і кніжнай справы на Гродзеншчыне, музей прыватных калекцый, музей старажытнага дойлідства (“Каложская царква”), музей Фонду культуры з карціннай галерэяй і іншыя (усяго 16 музеяў)[480]. Аб жыццёвасці і своечасовасці гэтых прапаноў сведчыць тое, што некаторыя з іх былі рэалізаваны на працягу 1990-х гадоў (а некаторыя рэалізуюцца і сёння).

---

479 Ткачоў, М. Паходня: кн. публіцыстыкі / М. Ткачоў; рэд.-склад. С.П. Самуэль. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 34.

480 Тамсама. – С. 66–70.

Репозиторий ВГУ

Былі і іншыя прапановы: паставіць помнік Кастусю Каліноўскаму ў Гродне, помнік на магіле маці Максіма Багдановіча, надаць культасветвучылішчу імя Цёткі, якое было прысвоена раней, але пра гэта ўжо забылі[481].

З мэтай правядзення даследаванняў айчыннай гісторыі і гісторыі Гродзеншчыны члены таварыства ладзілі паездкі ў архівы Вільнюса, Ленінграда. Атрыманыя вынікі друкаваліся на старонках мясцовых газет[482]. Актыўнасць праяўлялася не толькі ў вывучэнні пытанняў мясцовай гісторыі, але і ў практычнай дзейнасці па добраўпарадкаванню горада, раскопках на тэрыторыі Гродзенскага Старога замка.

Заслугоўваюць ўвагі дабрачынныя акцыі таварыства. Члены клуба прынялі ўдзел у пабудове помніка паўстанцам 1863 г. у Воранаўскім раёне, аднаўленні старажытнага гарадскога гадзінніка на званіцы Гродзенскага фарнага касцёла, працавалі на добраўпарадкаванні былой сядзібы Ф. Багушэвіча ў в. Кушляны Смаргонскага раёна, на Гродзенскіх могілках, праводзілі суботнікі па ачыстцы р. Гараднічанкі. У сакавіку 1987 г. дзейнасць клуба абмяркоўвалася на калегіі Міністэрства культуры БССР і атрымала станоўчую адзнаку.

З 1988 г. таварыства актыўна ўдзельнічала ў краязнаўчых канферэнцыях (да 100-годдзя Гродзенскага рэвалюцыйнага гуртка, 125-годдзя паўстання 1863–1864 гг., 400-годдзя Статута ВКЛ 1588 г. і інш.).

Меншую вядомасць атрымала дзейнасць грамадскага таварыства "Узгор'е" (1986) у Віцебску. Асноўнай мэтай на пачатку дзейнасці з'яўлялася "дапамога грамадскасці ў аднаўленні, рэстаўрацыі; абарона помнікаў гісторыі і культуры"[483] і іх рэшткаў у Віцебску, дапамога археолагам, якія праводзілі раскопкі на гэты час у горадзе. Данінай часу ў планах дзейнасці было "вывучэнне і прапаганда ленінскіх ідэй захавання гісторыка-культурнай спадчыны савецкага народа"[484]. Планавалася праводзіць сустрэчы з архітэктарамі, якія распрацоўваюць праекты рэстаўрацыі і рэканструкцыі помнікаў культуры, ладзіць мастацкія выставы. Такім чынам, асноўнай мэтай дзейнасці была "ахова помнікаў гісторыі і культуры, развіццё ў віцяблян беражлівых адносін да архітэктурных і культурных каштоўнасцей свайго горада, фарміраванне эстэтычнага густу"[485].

Падобныя накірункі дзейнасці былі абраны не выпадкова, таму што сітуацыю з аховай помнікаў і захаваннем культурнай спадчыны ў

---

[481] 30 гадоў Гарадзенскай "Паходні" [Электронны рэсурс] / Твой стыль. – Рэжым доступу: https://edu.hstry.co/timeline/30-ghadou-gharadzienskai-pakhodni. – Дата доступу: 27.05.2016.

[482] ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 175. – Арк. 8–12. Протоколы собеседований с ответственными секрктарями районных отделений о перестройке работы (1987).

[483] Статут клуба «Узгор'е» // Бягучы архіў Віцебскага аддзела БДТАПГіК. – С. 1.

[484] Паўлаў, М. Клуб аматараў старажытнасці / М. Паўлаў // Віцеб. рабочы. – 1987. – 17 студз. – С. 2.

[485] Паўлаў, М. "Узгор'е" / М. Паўлаў // Віцеб. рабочы. – 1986. – 12 сак. – С. 4; Узгор'е // Советская Белоруссия. – 1986. – 30 сак. – С. 4.



Репозиторий ВГУ

г. Віцебску у той час можна вызначыць як вельмі складаную. Да сярэдзіны 1980-х гг. была знішчана старая забудова на плошчы Свабоды і вуліцы Леніна. Рыхтаваўся да знішчэння комплекс трынітарскага кляштара (сучасная Пакроўская царква). Пэўная частка грамадства жадала прымаць удзел у фарміраванні архітэктурнага вобліку горада.

Афіцыйныя ўлады падтрымалі грамадскую ініцыятыву. Клуб быў зарэгістраваны пры гарадскім цэнтры культуры (у 1990 г. у дакументах статус аб'яднання змяняецца на "клуб аматараў даўніны"[486]). Назвалі клуб у гонар Узгорскага замка, з якога пачыналася летапісная гісторыя Віцебска.

Членам клуба мог быць любы чалавек, які прызнаваў і выконваў статут і палажэнні клуба, актыўна ўдзельнічаў у суботніках ці іншай дзейнасці, якая ішла на карысць захавання і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны.

Дзейнасць аб'яднання была дастаткова шматпланавай: праводзіліся пасяджэнні з абмеркаваннямі дакладаў па гісторыі і археалогіі Беларусі і Віцебска, па праблемам захавання помнікаў культуры, мовы, экалогіі з удзелам работнікаў абл- і гарвыканкамаў, ладзіліся суботнікі па падрыхтоўцы помнікаў да рэстаўрацыі, чыталіся лекцыі. Члены аб'яднання "Узгор'е" сустракаліся са школьнікамі, студэнтамі, навучэнцамі ПТВ, ладзілі вандроўкі па цікавых, славутых мясцінах Беларусі, багатых на архітэктурную спадчыну (Слонім, Нясвіж, Жыровічы, Мір і іншыя гарады). На свята «Дзяды» практыкаваліся выхады на Старасямёнаўскія могілкі[487]. У розных акцыях таварыства прымалі ўдзел ад дзясяткаў да сотні чалавек. Сярод тых, хто найбольш актыўна ўдзельнічаў у працы клуба, можна адзначыць В.М. Арлова, Л.У. Вакар, А.В. Куржалава, А. Мемуса, М. Паўлава, С.М. Цярэнцьева, Р.І. Пушкарову, Л. Хмяльніцкую, Т. Цаль, Ю.А. Якімовіча[488].

З мэтай захавання помнікаў гісторыі і культуры, змены адносін насельніцтва да гістарычнай спадчыны горада аб'яднаннем праводзіліся фотавыставы, прысвечаныя рэстаўрацыі, як на Беларусі, так і ў іншых месцах СССР[489]. Напрыклад, адна з такіх выставаў была размешчана ў вітрыне магазіна "1000 дробязей" на Маскоўскім праспекце г. Віцебска. Яна складалася з планшэтаў з лагатыпам клуба (сцяг Віцебскай харугвы: значок "Пагоні" на зялёным фоне), са здымкамі старога Віцебска, з інфармацыяй пра клуб, а таксама запрашэннем удзельнічаць у суботніках. Мэтай выставы была прапаганда гісторыі горада, адраджэнне мінуўшчыны.

[486] Праграма абласной навукова-практычнай канферэнцыі па гістарычнаму краязнаўству, 16–17 студз. 1990 года // Бягучы архіў Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК. – С. 9.
[487] Сарокіна, Т. Памочнікі рэстаўратараў // Віцеб. рабочы. – 1987. – 21 кастр. – С. 4.
[488] Навумчык, С. «Закрытых паседжанняў не робім» // Чырвоная змена. – 1989. – 7 студз. – С. 3.
[489] Наумчик, С. Сберегающие память / С. Наумчик // Знамя юности. – 1987. – 2 крас. – С. 2; Федоров, В. Сквозь глубь столетий / В. Федоров // Сельская газета. – 1987. – 3 сак. – С. 4.

Рэпазіторый ВДУ

Актыўна ўздымаліся пытанні экалогіі Віцебска і яго наваколляў (будаўніцтва атамнай электрастанцыі на Віцебшчыне, высечка лясоў, меліярацыя балот і інш.). Адзначым, што роля грамадскасці Віцебска (у тым ліку і “Узгор’я”) у адмене будаўніцтва АЭС у в. Мяжа Гарадоцкага раёна заслугоўвае асобнага даследавання.

Праводзілася вялікая асветніцкая і грамадская работа. Сябры клуба пісалі шмат артыкулаў на злабадзённыя тэмы: аб ахове помнікаў, мовы, пра экалагічныя праблемы. Пісалі міністру меліярацыі, у рэспубліканскія структуры адносна асушэння балот, высечкі лесу ў наваколлях Віцебска (напрыклад, ад птушкафабрыкі каля в. Хайсы да чыгуначнай станцыі Лосвіда). Пісалі ў ЦК КПБ, у Маскву Патрыярху Пімену (адносна Пакроўскай царквы, каб не даць забудаваць месца на Успенскай горцы). Быў напісаны ліст адносна стану беларускай мовы ў Віцебску на адрас аргкамітэта па падрыхтоўцы Пленума ЦК КПСС па нацыянальным пытанні. Сябры клуба ўжо ведалі, што падобны ліст быў накіраваны генеральнаму сакратару ад беларускай інтэлігенцыі 15.12.1986 г. і паўторны – 4.06.1987 г.[490]. У лісце ўзгорцы адзначалі, што беларуская мова павінна стаць дзяржаўнай, засяроджвалася ўвага на тым, што адсутнічае пераемнасць у вывучэнні мовы (дзіцячы садок–школа–інстытут), адсутнічаюць сацыяльна-палітычныя гарантыі функцыяніравання беларускай мовы, давалася гістарычная даведка. Была і рэакцыя на гэтую дзейнасць. У Віцебск прыязджалі адказныя асобы з Мінска і Масквы, якія звярталі ўвагу мясцовага кіраўніцтва на стан аховы помнікаў, на сітуацыю з мовай і культурай. Маўляў, “чаму грамадзяне звяртаюцца да нас, быццам вы не можаце вырашыць сітуацыю на месцы самастойна”. Такім чынам, можна адзначыць, што такі від дзейнасці даваў вялікі плён і прыводзіў да пэўных зменаў.

З 1988 года актывізуюцца кантакты “Узгор’я” з навастворанымі грамадскімі арганізацыямі і рухамі рэспублікі і СССР. Актыўныя члены клуба ўдзельнічалі ў сумесных пасяджэннях мінскіх груповак (напрыклад, “Талакі”), бралі ўдзел у акцыях і імпрэзах, якія яны праводзілі, а таксама ў сустрэчы актыву ў Маскве з міністрам культуры СССР В.Г. Захаравым.

Па прапанове членаў аб’яднання пры Віцебскім гарвыканкаме была створана камісія па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, у склад якой увайшлі не толькі адказныя работнікі партыйных і савецкіх органаў, але і прадстаўнікі грамадскасці. Старшынёй камісіі быў абраны В. Акуневіч, які працаваў на той час у абкаме кансультантам па нацыянальных адносінах. Сумеснымі намаганнямі ўдалося падрыхтаваць да рэстаўрацыі такія значныя для архітэктурнага аблічча г. Віцебска помнікі, як Пакроўская царква, касцёл Св. Варвары, не дазволіць забудову старажытнай часткі

[490] Денисюк, О.Л. Неформальные объединения, общественно-политические движения, партии в СССР: предпосылки, становление, развитие (1985–1991 гг.) / О.Л. Денисюк. – Минск, 2003. – С. 202, 282–288.

Віцебска (Успенская горка), паспяхова правесці археалагічныя раскопкі ў старажытнай частцы горада[491].

Трэба адзначыць, што ў сітуацыі з помнікамі гісторыі і культуры ў Віцебску знішчэння шэрага з іх можна было б пазбегнуць. Пры будаўніцтве большасці аб’ектаў у горадзе архітэктары прадстаўлялі планы толькі ў гаркам КПБ, без абмеркавання з шырокімі коламі грамадскасці. Партыйнае кіраўніцтва, як правіла, пагаджалася з любымі прапановамі архітэктараў, якія спасылаліся на свой прафесіяналізм, кампетэнтнасць і дасведчанасць. У выніку руйнаваліся помнікі старасветчыны. Па стварэнні камісіі такая практыка стала немагчымай. Напрыклад, прынянцце генеральнага плана забудовы цэнтра горада было зроблена келейна, без абмеркавання. Грамадзяне, якім быў неабыякавы лёс гістарычнай спадчыны горада, сярод якіх было шмат удзельнікаў клуба «Узгор’е», сталі пісаць лісты ў партыйныя ўстановы, артыкулы ў газеты. Паўторнае абмеркаванне адбылося ўжо ў прысутнасці камісіі па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Члены камісіі, якія адстойвалі думку грамадства, выказаліся адназначна – гістарычны цэнтр горада мусіць быць адноўлены. Архітэктары не пагаджаліся, лічылі, што будучыня цэнтра ў новабудоўлі, спасылаючыся на свой досвед і кампетэнтнасць. Грамадства апаніравала, гаворачы, што прафесіяналы не заўсёды кажуць праўду, прыводзілі прыклады з замежнага досведу, нагадвалі пра аднаўленне гістарычнага цэнтра Варшавы, Будапешта.

На вялікі жаль, не ўсе планы таварыства здзейсніліся. Не атрымалася стварыць майстэрні народнага мастацтва пры гарадскім цэнтры культуры, зрабіць галерэю выдатных ураджэнцаў Віцебшчыны, адкрыць помнік Грунвальдскай бітве. Планаваў клуб прычыніцца да стварэння музея «Старажытны Віцебск», які збіраліся арганізаваць у горадзе па выніку раскопак, што актыўна праводзіліся ў горадзе ў 1970–1980-я гады. На той час было знойдзена шмат рэшткаў драўляных забудоў, якія добра захаваліся, і планавалася адкрыццё археалагічнага музея па ўзоры музея “Старажытнае Бярэсце”, які існаваў у Брэсце. Саветам міністраў БССР была прынята Пастанова “Аб стварэнні ў г. Віцебску археалагічнага музея” ад 11 сакавіка 1980 г.[492]. На жаль, эканамічны крызіс не дазволіў спраўдзіцца гэтым цікавым ідэям.

Дзейнасць клуба была вельмі важнай і карыснай яшчэ і таму, што па прычыне закрыцця на рэканструкцыю абласнога краязнаўчага музея, яно фактычна адыгрывала ролю метадычнага цэнтра па вывучэнні гісторыі Віцебска і ахове помнікаў гісторыі і культуры.

---

[491] Перабудова і мы: урокі, спадзяванні, трывогі // ЛіМ. – 1989. – 13 студз. – С. 3; Плавінскі, М. Узважыць «за» і «супраць» / М. Плавінскі // Віцеб. рабочы. – 1989. – 26 жн.

[492] Постановление Совета министров БССР № 111 от 11 марта 1980 г. «О создании в г. Витебске археологического музея – филиала Витебского областного краеведческого музея // ЭБД «Эталон». Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна.



Репозиторий ВГУ

Пік актыўнасці культурна-асветніцкага аб’яднання “Узгор’е” прыйшоўся на канец 1980-х гадоў. У пачатку 90-х гг. XX стагоддзя, калі пачынаецца актыўная палітызацыя грамадства, выкліканая нарастаючым сацыяльна-палітычным крызісам, развалам СССР, эканамічнымі цяжкасцямі, большасць актыўных членаў клуба пачынае прымаць удзел у палітычнай барацьбе. Пэўная частка ўдзельнікаў, падзяляючы погляды БНФ “Адраджэнне”, становіцца членамі гэтай арганізацыі. Пытанні культуры і гісторыі ва ўмовах, што склаліся на той час, адыходзяць на другі план. Па прычыне палітычнай барацьбы да аб’яднання далучаюцца людзі, якія далёка стаялі ад ідэй аховы культурнай спадчыны Віцебска, але ў гэтай барацьбе жадалі выкарыстаць магчымасці і аўтарытэт клуба. Да ўсяго “далучаецца” эканамічны крызіс, які паставіў перад грамадствам зусім іншыя задачы. Лёс “Узгор’я” ў гэтым вельмі нагадвае лёс іншых беларускіх грамадскіх таварыстваў (“Талака”, “Паходня”), якія спынілі сваю дзейнасць на пачатку 1990-х гадоў. Патрэбна адзначыць, што падобныя тэндэнцыі адбываліся не толькі ў грамадскіх культурна-асветніцкіх арганізацыях Беларусі. Фактычна на гэты час спыніла сваю дзейнасць Віцебскае абласное аддзяленне Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Варта прыгадаць вынікі працы некаторых іншых грамадскіх аб’яднанняў Віцебшчыны, якія ўтварыліся і дзейнічалі ў перыяд “перабудовы”. **Клуб аматараў гісторыі і даўніны “Повязь”** узнік летам 1986 г. у г. Оршы. Асноўнымі мэтамі з’яўляліся: добраўпарадкаванне помнікаў даўніны, прапаганда гісторыка-культурнай спадчыны. Таварыства мела свой статут, выбарны савет. Так, у суботу-нядзелю ладзіліся талокі, на якіх праводзілася добраўпарадкаванне помнікаў, ачыстка ад смецця і друзу, падрыхтоўка да рэстаўрацыі. Напрыклад, у канцы мая – пачатку чэрвеня ладзіліся талокі ў вёсках Смаляны і Браздзетчына. Члены клуба бралі ўдзел у археалагічных раскопках, якія праводзіліся супрацоўнікамі Інстытута гісторыі АН БССР у Оршы. Пры клубе існавалі курсы вывучэння беларускай мовы, гісторыі і культуры. Яны праходзілі кожны аўторак у бібліятэцы на вул. Міра. На пасяджэнні прыходзіла каля дзесяці асоб. Кіраўніком клуба з’яўляўся Алесь Міхайлавіч Сярожкін. У склад актыву ўваходзілі Ю.А. Копцік, А.М. Шынкевіч[493].

**Грамадская арганізацыя “Маладзік”** была створана як гісторыка-культурнае аб’яднанне ў дапамогу рэстаўрацыі і археалагічным раскопкам у г. Полацку ў 1987 г. Арганізатарамі з’яўляліся У. Арлоў, С. Сокалаў (будучы Сокалаў-Воюш). Сярод найбольш актыўных удзельнікаў можна таксама адзначыць С. Залілава, Л.В. Малашэню, С.М. Глушко. Значную

493 Півавар, М.В. Гісторыка-культурныя грамадскія аб’яднанні Віцебшчыны канца XX ст. / М.В. Півавар // “Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.): матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 23–24 кастр. 2008 г. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І.І. Коўкель (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 402–406.



Рэпазіторый ВДУ

ролю адыгрывалі прадстаўнікі г. Наваполацка, лідэрам фракцыі з'яўляўся В. Храмцоў. Гэта група была больш арганізаваная, больш людная, і мела экалагічны накірунак.

Праца грамадскага аб'яднання была размеркавана па некалькіх секцыях: гісторыка-культурнай працы, удзелу ў рэстаўрацыйных работах, археалагічны, пошукавы (збор легенд, паданняў, звестак пра камяні, крыніцы). Удзельнікі таварыства ладзілі сустрэчы з цікавымі людзьмі (Н. Гілевічам, А. Марачкіным, З. Пазняком, С. Навумчыкам), вандравалі па Беларусі (Баруны, Гальшаны, Друя, Камаі, Крэва, Наваградак, Паставы, Опса). Члены таварыства выступілі супраць пабудовы ў цэнтральнай частцы горада шматпавярховых будынкаў, якія б непапраўна змянілі б выгляд горада.

Аматары даўніны ўдзельнічалі ў археалагічных раскопках у старажытнай частцы горада. У рэстаўрацыйных работах, ці археалагічных раскопках бралі ўдзел, як правіла, 10–15 чалавек. На пасяджэнні, якія праводзіліся ў будынку карціннай галерэі (месцілася ў Багаяўленскім саборы), прыходзіла 5–6 асоб.

Удзельнікі таварыства бралі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і Беларусі: праводзілі святкаванні юбілейных дат (юбілея Полацкай акадэміі, юбілея І. Хруцкага ў в. Захарнічы, на перапахаванні праха І. Луцкевіча ў Вільні, выступілі з ініцыятывай аднаўлення помніка 1812 г.).

У канцы 1980-х гг. пачынаецца палітызацыя дзейнасці таварыства. Большая частка членаў клуба (у асноўным прадстаўнікі Наваполацка) сталі членамі БНФ "Адраджэнне". Некаторая частка асоб, не жадаючых удзельнічаць у палітычнай барацьбе, утварыла **гістарычны клуб "Вытокі"**. Яны праз гарвыканкам атрымалі памяшканне (падвал будынка гаркама камсамола), у якім правялі рамонт. Удзельнікі актыўна займаліся краязнаўствам, вандравалі па Беларусі. Аднак прыкладна праз год палітызацыя закранула і гэтае аб'яднанне. Скарыстаўшыся тым фактам, што сярод членаў "Вытокаў" было шмат прыхільнікаў БНФ, клуб пакінулі без памяшкання. Дзейнасць яго спынілася.

Змест працы грамадскіх гісторыка-культурных таварыстваў, што існавалі ў іншых гарадах Беларусі (Гомельскае аб'яднанне "Талака", "Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя" (канец 1980-х гадоў), Магілёўскія гісторыка-культурных клубы "Магілёўцы", "Машэка" (1989–1993) прыкладна адпавядаў дзейнасці падобных арганізацый ў Гродне, Мінску і іншых гарадах краіны[494].

Ацэньваючы развіццё грамадскага краязнаўства Беларусі ў 1961–1980-я гады, можна зрабіць некалькі вывадаў.

Репозиторий ВГУ

[494] Пивовар, Н.В. Общественные краеведческие объединения Витебщины конца XX – начала XXI в. / Н.В. Пивовар // Третьи всероссийские краеведческие чтения, Москва–Коломна, 22–23 июня 2009 г. / отв. ред. В.Ф. Козлов. – М.: АНО ИЦ «Москвоведение»; ОАО «Московские учебники», 2009. – С. 20–24.

На працягу 1960 – першай паловы 1980-х гадоў адзінай грамадскай арганізацыяй краязнаўчай накіраванасці з'яўлялася БДТАПГіК. Дзякуючы дзейнасці таварыства ў краіне была арганізавана і функцыяніравала грамадская сістэма аховы помнікаў гісторыі і культуры, практычна была вырашана задача рэканструкцыі помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, узвядзення новых манументаў і мемарыяльных комплексаў мясцовага і рэспубліканскага значэння, звязаных з ушанаваннем памяці загінуўшых воінаў, партызан і мірных жыхароў. Адбыліся пэўныя змены ў свядомасці грамадства ў адносінах да помнікаў гісторыі і культуры. Адным з іх праяўленняў сталі цікавасць і даследаванне гістарычна сфарміраваўшыхся гарадскіх цэнтраў, рэстаўрацыя і аднаўленне шэрага помнікаў культавага і мураванага дойлідства рэспубліканскага значэння (Сафійскага сабора ў Полацку, Каложскай царквы ў Гродне, Белай вежы ў Камянцы і інш.). Была аказана значная дапамога дзяржаўным установам у падрыхтоўцы і выданні "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі", энцыклапедычных даведнікаў і інш., аформілася сістэма падрыхтоўкі кадраў (пры дапамозе таварыства "Веды", праз стварэнне народных універсітэтаў).

На аснове матэрыялаў мясцовых даследаванняў у краіне былі выдадзены сотні краязнаўчых выданняў, прысвечаных помнікам гісторыі і культуры і гісторыі пэўных рэгіёнаў. Важную ролю ў краязнаўчых даследаваннях Беларусі адыграў бюлетэнь "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі". Дзейнасць па ахове помнікаў стала школай грамадскай актыўнасці жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі. Задачы, якія ставіліся перад БДТАПГіК кіраўніцтвам рэспублікі, былі ў значнай ступені выкананы. Назапашаны вопыт грамадскай працы не згубіў актуальнасці і варты ўважлівага вывучэння і выкарыстання ў наш час.

У другой палове 1980-х – 1991 г. грамадскае краязнаўства Беларусі ва ўмовах палітыкі "перабудовы" атрымала далейшае развіццё. Яно характарызавалася ўзнікненнем новых грамадскіх таварыстваў і арганізацый, якія ставілі сваёй мэтай вывучэнне гісторыі і культуры пэўных рэгіёнаў ("Паходня", "Узгор'е", "Талака" і іншыя) і развіццё краязнаўчага руху ў краіне (Беларускі фонд культуры, Беларускае краязнаўчае таварыства). Дзякуючы дзейнасці гісторыка-культурных аб'яднанняў былі выратаваны некаторыя помнікі гісторыі і культуры ў гарадах Беларусі. На хвалі зменаў у палітычным жыцці краіны адбыліся адчувальныя змены ў адносінах да захавання нацыянальнай спадчыны як сярод простых грамадзян, так і ў адказных работнікаў дзяржаўных установаў.

Разам з паслабленнем цэнзуры назіраецца ўсплёск цікавасці да краязнаўства. На фоне зменаў некаторых прыярытэтаў у святле палітыкі "галоснасці" дзяржаўныя выдавецтвы сталі больш ахвотна друкаваць матэрыялы краязнаўчай накіраванасці. Гісторыкі і аматары атрымалі магчымасць карыстацца архівамі, доступ у якія быў раней абмежаваны.



Репозиторий ВГУ

Рост даследаванняў прывёў да важных пазітыўных зменаў у грамадскім накірунку краязнаўства. Павялічваецца колькасць конкурсаў, канферэнцый і іншых форм навуковай і грамадскай актыўнасці краязнаўцаў. Адбыліся змены ў тэматыцы даследаванняў (вядомыя землякі, славутыя роды, гісторыка-культурная спадчына дарэвалюцыйнага перыяду, рэпрэсіі 20–30-х гадоў XX стагоддзя і іншыя). Адзначым, аднак, што павелічэнне колькасці краязнаўцаў-аматараў, якія звярталіся да вывучэння свайго краю, і якасць іх даследаванняў не заўсёды адпавядалі патрабаванням сапраўдных навуковых даследаванняў і вялі да росту дылетанцтва ў навуцы.

Развіццё грамадскага накірунку гістарычнага краязнаўства Беларусі ў канцы 1980-х гадоў якасна адрозніваецца ад папярэдняга перыяду з прычыны спроб вяртання да нацыянальных каранёў. Сваёй дзейнасцю грамадскія арганізацыі ўнеслі важны ўклад у папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны, садзейнічалі краязнаўчым даследаванням розных рэгіёнаў Беларусі, спрыялі зменам у грамадскай думцы адносна мінуўшчыны нашай краіны. Змены, якія мелі месца ў той час, атрымалі далейшае развіццё пасля абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 4

# РАЗВІЦЦЁ ШКОЛЬНАГА КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ Ў 1961–1991 ГГ.

## 4.1. Сутнасць школьнага краязнаўства і яго турысцка-краязнаўчы накірунак

У адносінах да школьнага краязнаўства як у савецкай, так і ў постсавецкай навуцы не існуе адзінай дэфініцыі. Вядомы савецкі даследчык П.В. Іваноў у сваёй працы "Педагогические основы школьного краеведения" пад школьным краязнаўствам разумее "даступнае і пасільнае для навучэнцаў, усеагульнае і шматвобразнае па формах і метадах, пазнанне сваёй мясцовасці (школы, мікрараёна, горада, сяла, раёна), яго прыроды, працоўнага і грамадскага жыцця, эканомікі і культуры, яго мінулага і перспектыў развіцця, якое ажыццяўляецца ў працэсе вучэбнай і пазакласнай работы ў сувязі з задачамі агульнай і працоўнай адукацыі, выхавання і грамадска карыснай працы школьнікаў пры актыўным удзеле настаўнікаў"[495]. На нашу думку, фармуліроўка П.В. Іванова пераканаўчая, глыбока і сістэмна вызначае разуменне школьнага краязнаўства. У кантэксце гэтага вызначэння мы і будзем разглядаць развіццё гістарычнага аспекту школьнага краязнаўства.

На наш погляд, школьнае краязнаўства – гэта ўдалы прыклад спалучэння грамадскага і дзяржаўнага краязнаўства. З аднаго боку, у ім прысутнічае пэўнае кіраўніцтва з боку Міністэрства адукацыі і падначаленых яму структур (абласныя, гарадскія, раённыя аддзелы адукацыі), выдзяляюцца некаторыя сродкі на заробак захавальнікам школьных музеяў і кіраўнікоў краязнаўчых гурткоў. З другога – удзел настаўнікаў і вучняў у большай ступені мае добраахвотны характар і праяўляецца ў асноўным у выглядзе пазашкольнай дзейнасці. У вывучаемы перыяд (з 1960-х і да канца 1980-х гг.) краязнаўства ва ўрочнай, праграмнай працы ў школах Беларусі практычна адсутнічала. Нават само вывучэнне гісторыі БССР насіла факультатыўны характар.

Школьнае краязнаўства з'яўляецца састаўной часткай вучэбна-выхаваўчай працы з дзецьмі і падлеткамі. Не аналізуючы ўсяго кола праблем, якія закранае школьнае краязнаўства, мы разгледзім толькі яго выхаваўчы і навучальны аспекты, што фарміруюць патрыятычнае пачуццё да Радзімы; абуджэнне цікавасці да пазнання гісторыі краю, самастойнага гістарычнага мыслення і творчай працы; павышэнне інтарэсу вучняў (і настаўнікаў) да

---

[495] Иванов, П.В. Основы школьного краеведения / П.В. Иванов. – Петрозаводск: Изд-во ПГУ, 1986. – С. 23.



Рэпазіторый ВДУ

вывучэння гісторыі малой Радзімы; выхаванне любові да сваёй зямлі, адчування велічы працы землякоў; актывізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ходзе заняткаў краязнаўствам; устанаўленне больш цесных міжпрадметных сувязей у працэсе навучання. Удзельнікі краязнаўчай дзейнасці не толькі даследуюць свой край, але і змяняюць яго ў працэсе гэтай дзейнасці (праводзяць добраўпарадкаванне, узводзяць помнікі і абеліскі, разбіваюць паркі і сады і інш.). Адсюль, на наш погляд, вынікае асаблівая важнасць і запатрабаванасць школьнага краязнаўства ў педагагічнай працы.

Разглядаючы школьнае краязнаўства як від педагагічнай дзейнасці, патрэбна адзначыць, што яно ўключае ў сябе: па-першае, набыццё навучэнцамі ведаў пра Радзіму як праз тлумачэнне настаўніка, так і праз самастойнае вывучэнне гісторыі Беларусі; па-другое, самастойнае здабыванне ведаў ("пераадкрыццё" вядомых фактаў і з'яў акаляючага жыцця, якія ўжо вядомы з курсаў агульнай гісторыі ці гісторыі Беларусі).

На наш погляд, у школьным краязнаўстве вылучаюцца два асноўныя кампаненты: праграмны і пазашкольны. Праграмная краязнаўчая праца прадстаўляе сабой вывучэнне і накапленне канкрэтных фактаў і з'яў, звязаных з гісторыяй і сучаснасцю малой Радзімы, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе выкладання розных школьных прадметаў. Сюды можна аднесці работу настаўнікаў па вывучэнні роднага краю, распаўсюджванні краязнаўчых ведаў, падборы вучэбнага матэрыялу да ўрокаў і г.д.

З канца 1930-х і да пачатку 1960-х гадоў, да наступлення палітыкі "адлігі" і лібералізацыі ў культуры і адукацыі, краязнаўства было фактычна выключана са школьнага курса. Пачаткам адраджэння такой працы ў Савецкім Саюзе стала пастанова Міністэрства адукацыі РСФСР "Об усилении краеведческой работы в школах и создании краеведческих пособий для школ", прынятая ў 1961 г. У 1966/67 навучальным годзе ў школах РСФСР краязнаўства было ўключана ў школьную праграму па гісторыі ў 4–7 класах. З пачатку 70-х гадоў XX ст. пачала выдавацца вялікая колькасць літаратуры па методыцы краязнаўчай працы[496], актыўна праводзіліся педагагічныя чытанні. Яшчэ адным важным крокам у развіцці гістарычнага краязнаўства стала яго ўключэнне ў 1971 г. у вучэбныя праграмы гістарычных факультэтаў педагагічных інстытутаў як спецыяльнага вучэбнага прадмета[497].

У Беларусі гэта сітуацыя была некалькі іншай. Тут для вывучэння быў уведзены курс гісторыі БССР, што на той час у сістэме адукацыі выглядала рашучым крокам і можа расцэньваецца, як увядзенне краязнаўчага курса (яшчэ раз падкрэслім – на тыя часы). У праграме па

[496] Рыўкін, М.С. Эстэтычнае выхаванне вучняў у краязнаўчай рабоце па гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Вучпедвыд БССР, 1963. – 72 с.; Рыўкін, М.С. Скарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках гісторыі / М.С. Рыўкін. – Мінск: Нар. асвета, 1965. – 154 с.; Элькин, Г.Ю. Школьные музеи: пособие для учителей / Г.Ю. Элькин, З.А. Огрызко. – М.: Просвещение, 1972. – 123 с.

[497] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для исторических факультетов вузов республики / под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – С. 56.



Репозиторий ВГУ

гісторыі СССР да 20% навучальнага часу адводзілася на пазнанне навучэнцамі рэспубліканскай спецыфікі.

Больш актыўна краязнаўства выкарыстоўвалася ў пазашкольнай і пазаўрочнай працы. Такі від дзейнасці забяспечваў запатрабаванні і глыбокае задавальненне пазнавальных інтарэсаў школьнікаў у працэсе вывучэння асноў гуманітарных навук. Яно ажыццяўлялася праз дзейнасць гурткоў розных накірункаў, экскурсіі і паходы па родным краі, работу школьных музеяў, краязнаўчую працу навучэнцаў у складзе навуковых экспедыцый, праз ахову помнікаў, пошукавую і іншыя віды дзейнасці.

Школьнае гістарычнае краязнаўства ў 1960–1980-я гады развівалася ў наступных накірунках: ***турысцка-краязнаўчым; развіцці школьных музеяў; пошукавым***.

Як актыўны сродак выхавання і навучання турысцка-краязнаўчы накірунак з'яўляецца адным з важнейшых на беларускіх землях яшчэ з часоў Асветніцтва[498]. Але найбольш шырокае развіццё турысцкі накірунак атрымаў у савецкі час. У 1920-я гады ў СССР і БССР краязнаўства, напрыклад, разглядалася як дзейнасць, накіраваная на ўдзел усіх катэгорый працоўных у сацыялістычным будаўніцтве[499]. Гэта падкрэслівалася ў шэрагу пастаноў як у "цэнтры" (на узроўні СССР), так і на мясцовым узроўні (БССР, у абласцях і раёнах). З 1930-х гадоў, калі арганізаванае навуковае краязнаўства было ліквідавана, яго акцэнт быў перанесены ў сферу адукацыі і выхавання. Меркавалася, што сродкамі краязнаўства і асабліва турысцкага яго накірунку можна будзе лепей спрыяць выхаванню савецкага грамадзяніна.

Турызм як актыўны сродак фарміравання грамадзянскасці, найлепшым чынам падыходзіў да выканання пастаўленай задачы. Школьны турызм атрымаў форму цэнтралізаванага, масавага краязнаўчага руху ў 1941 г., калі Цэнтральная дзіцячая экскурсійна-турыстычная станцыя (ЦДЭТС) Наркамасветы РСФСР абвясціла аб правядзенні турысцкай экспедыцыі піянераў і школьнікаў у гонар 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка[500]. Але разгарнуцца школьнаму турызму як самай масавай форме краязнаўчай працы перашкодзіла Вялікая Айчынная вайна. Аднак адразу пасля вайны развіццё турысцка-краязнаўчага накірунку ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе стрымлівала маштабная праца па аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

З пачаткам палітыкі "адлігі" турысцкі накірунак школьнага краязнаўства быў вызначаны як прыярытэтны і пачаў развівацца хуткімі

---

[498] Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск: Белдзяржвыдат, 1929. – 159 с.; Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 256 с.; Book of British villages / A guide to 700 of the most interesting and attractive villages in Britain /. – London, 1980; Lachur, Cz. Krajoznawstwo i geografia turystyczna Polski: informator bibliograficzny / Cz. Lachur. – Opole: Wydaw. UO, 2000. – 115 s.

[499] Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск: Белдзяржвыдат, 1929. – С. 12.

[500] Туманов, В.Е. Школьное краеведение и исторические источники / В.Е. Туманов // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: Наук. думка, 1991. – С. 175.



Репозиторий ВГУ

тэмпамі. Абвешчаны курс на хуткую пабудову камуністычнага грамадства, лібералізацыя ў сферы культуры садзейнічалі актывізацыі грамадскага жыцця. У грамадстве павялічвалася цікавасць да гісторыі, у тым ліку і да гісторыі свайго краю. Рэформы ў сістэме адукацыі вымагалі засноўваць выхаваўчую працу на мясцовым краязнаўчым матэрыяле. Такім чынам, спалучэнне турызму і краязнаўства было запатрабавана часам[501]. З канца 1950-х гг. у БССР складавалася пэўная сістэма ў правядзенні мерапрыемстваў краязнаўчага характару.

Яшчэ летам 1957 г. Міністэрства асветы рэспублікі абвясціла Першы рэспубліканскі зорны турысцкі паход. Ён праводзіўся ў тры этапы: на першым прадугледжвалася праходжанне маршрутаў у 40 км на працягу 3 дзён з фінішам у вызначаным месцы, дзе ладзіліся масавыя мерапрыемствы. На другім, абласным этапе, які праходзіў у форме злёту, прымалі ўдзел лепшыя атрады раёнаў (маршрут 60 км, на працягу 5 дзён); на трэцім этапе, таксама ў форме злёту, удзельнікі прадстаўлялі справаздачы і дзённікі паходу, сабраныя для музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, баявыя лісткі, апісанні маршрутаў, карту-схему паходу, калекцыі і гербарыі, фотаздымкі).

У 1958 г. была выдадзена пастанова Міністэрства асветы БССР “Аб мерах па паляпшэнні экскурсійна-турысцкай і краязнаўчай работы ў школах, дзіцячых дамах і пазашкольных установах БССР”, у якой вызначаліся канкрэтныя меры па развіцці экскурсійна-турысцкай і краязнаўчай працы. З гэтага года сталі дзейнічаць летнія экскурсійныя базы ў Барысаве, Бабруйску, Баранавічах, Оршы. Сваю дзейнасць пачала Мінская абласная экскурсійна-турысцкая станцыя; было арганізавана правядзенне экспедыцыі піянераў і школьнікаў, прысвечанай 40-годдзю БССР і 40-годдзю ВЛКСМ. Усяго ў экспедыцыі прыняло ўдзел 42450 навучэнцаў[502].

Важную ролю ў развіцці турысцкага накірунку ў школьным краязнаўстве адыграла Цэнтральная дзіцячая экскурсійна-турыстычная станцыя Міністэрства асветы БССР. Створаная як Рэспубліканская турысцкая база Міністэрства асветы ў 1952 г., у маі 1953 г. пастановай ЦК ЛКСМБ (падпісанай П.М. Машэравым), яна была пераўтворана ў Рэспубліканскую экскурсійна-турыстычную станцыю. Станцыя праводзіла паходы, турысцкія злёты, тэматычныя экспедыцыі, арганізоўвала выставы, агляды-конкурсы музеяў, семінары па турызме, выдавала лістоўкі, плакаты, інфармацыйныя бюлетэні. Менавіта гэтая ўстанова з’яўлялася кіруючым і метадычным цэнтрам арганізаванай турысцка-краязнаўчай працы. У 1977 г. станцыя перайменавана ў Рэспубліканскую станцыю юных турыстаў. У 1991 г. па загадзе Міністэрства адукацыі станцыя

[501] Топчий, А.Т. Историческое краеведение, туризм и музейное дело [Электронны рэсурс] / А.Т. Топчий. – 2002. – Рэжым доступу: http://hist.dcn-asu.ru/borod3/14-19.html. – Дата доступу: 12.03.2005.
[502] Детский туризм и краеведение в Беларуси / авт.-сост. С.М. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 43.



Рэпазіторый ВДУ

перайменавана ў Рэспубліканскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму. Сучасная назва ўстановы – Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства[503].

Асноўная ўвага ў працы ЦДЭТС надавалася развіццю турызму спартыўнай накіраванасці. У 1963 г. калегія Міністэрства асветы абмеркавала дзейнасць ЦДЭТС. Прынятае рашэнне патрабавала палепшыць метадычную работу, вызначыць у аддзелах адукацыі асоб, адказных за турысцка-краязнаўчую працу, пашырыць сетку дзіцячых турысцкіх баз.

На працягу наступных трох гадоў такія базы былі адкрыты ў Полацку, Пінску, Мазыры і іншых гарадах рэспублікі. Сістэмны кантроль за выкананнем рашэння станоўча паўплываў на развіццё турысцка-краязнаўчай справы. З сярэдзіны 60-х гадоў ХХ стагоддзя ў рэспубліцы пачынаюць рэгулярна праводзіцца семінары дырэктараў і метадыстаў абласных дзіцячых турысцкіх станцый, вядзецца актыўны абмен вопытам працы і яго абагульненне.

Да сярэдзіны 1960-х гадоў у БССР склалася сістэма пазашкольных устаноў, адным з накірункаў дзейнасці якіх была турысцка-краязнаўчая работа (больш за 300, у тым ліку 7 станцый юных турыстаў, 16 дзіцячых турысцкіх баз). Для кіраўніцтва гэтымі ўстановамі ў БССР у 1965 г. у Міністэрстве адукацыі быў створаны аддзел пазашкольнай працы[504]. У гэтым жа годзе ў школах БССР была ўведзена пасада арганізатара пазашкольнай і пазакласнай работы з дзецьмі, пэўная частка працы якога мела дачыненне да вывучэння роднага краю[505]. Важнасць правядзення турысцка-краязнаўчых паходаў была яшчэ раз падкрэслена ў пастанове Міністэрства асветы БССР “Аб некаторых пытаннях работы настаўніка з піянерамі”[506].

Выкарыстанне краязнаўства ў выхаванні моладзі абмяркоўвалася на педагагічных чытаннях і канферэнцыях, якія сталі рэгулярнымі. Напрыклад, у “Матэрыялах Усесаюзнай канферэнцыі па праблемах выхавання вучняў у старэйшых класах” (Масква, 1967) адзначалася, што краязнаўчыя метады “…адны з найбольш уплывовых у выхаванні. Фарміраванне ў вучняў старэйшых класаў камуністычных перакананняў, грамадзянскай сталасці і высокіх маральных якасцяў найбольш эфектыўна праз такія формы работы, як лекцыі, арганізацыя школьных краязнаўчых і атэістычных музеяў, экскурсіі”[507].

На навукова-практычных канферэнцыях, прысвечаных краязнаўству, сістэматычна абагульняўся і распаўсюджваўся лепшы вопыт арганізацыі турысцка-краязнаўчай і экскурсійнай работы з вучнямі. Напрыклад, у сакавіку 1967 года ў Віцебску была праведзена навукова-практычная

---

[503] Структура и история РЦиК [Электронны рэсурс] // Республиканский центр экологии и краеведения. – Рэжым доступу: http://rctkum.by/information. – Дата доступу: 21.02.2016.
[504] Тамсама. – С. 26.
[505] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР. – 1966. – № 5. – С. 18, 20.
[506] Тамсама. – С. 14, 21.
[507] Тамсама. – С. 27, 45.

Репозиторий ВГУ

канферэнцыя краязнаўцаў-настаўнікаў, на якой абмеркоўвалася наступная праблема "Турызм і краязнаўства – важны сродак камуністычнага выхавання навучэнцаў". Абласной канферэнцыі папярэднічалі гарадскія і раённыя канферэнцыі, фарміраваліся выставы аб выніках краязнаўчай працы, у склад дэлегацый уваходзілі актыўныя ўдзельнікі краязнаўчай справы. На канферэнцыі былі заслуханы 63 даклады, прыняты адпаведныя рэкамендацыі, 49 настаўнікаў былі ўзнагароджаны граматамі аблана за ўдзел у краязнаўчай працы[508].

З мэтай разгортвання турысцка-краязнаўчага руху Міністэрствам асветы БССР была распрацавана і праводзілася ў жыццё праграма, якая прадугледжвала выкананне шэрага мерапрыемстваў, галоўнымі з якіх былі:

– пашырэнне сеткі турысцка-краязнаўчых гурткоў, секцый, клубаў;

– стварэнне гарадскіх, раённых пунктаў пракату турысцкага інвентару для школ. У гарадах былі створаны новыя стацыянарныя дзіцячыя турысцка-экскурсійныя базы, а ў раёнах і школах – дзіцячыя турыстычныя базы на грамадскіх пачатках;

– правядзенне сістэматычных курсаў, семінараў, лагерных збораў, а таксама арганізацыя пастаянна дзеючых гарадскіх, раённых семінараў па падрыхтоўцы грамадскіх інструктараў з ліку вучняў школ.

Карыснасць і важнасць турысцка-краязнаўчай працы адзначалася на самым высокім узроўні. Напрыклад, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР у сумеснай пастанове "Аб мерах па далейшаму развіццю турысцка-краязнаўчай і экскурсійнай работы з вучнямі агульнаадукацыйных школ, педагагічных вучылішчаў, студэнтаў педагагічных інстытутаў" адзначалі, што турысцка-экскурсійная справа павіннаператварыцца ў буйную галіну абслугоўвання насельніцтва, стаць дзейснай формай прапаганды, важным сродкам выхавання і ўмацавання здароўя моладзі.

У пастанове былі абазначаны агульныя і асобныя распараджэнні па ўсіх міністэрствах і ведамствах, якія мелі дачыненне да развіцця турысцка-краязнаўчай дзейнасці. Напрыклад, Дзяржкамітэт СССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю павінен быў павялічыць выпуск навукова-папулярнай, метадычнай, даведачнай літаратуры турысцка-экскурсійнай тэматыкі, плакатаў, паштовак, даведнікаў па турызме, гістарычных і памятных мясцінах, міністэрству гандлю прадпісвалася палепшыць гандаль сувенірамі[509].

Адной з цікавых і эфектыўных форм развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1980-я гады, патрыятызму, любові да Радзімы сталі саюзныя і ***рэспубліканскія экспедыцыі піянераў і школьнікаў*** па родным краі, якія абвяшчаліся на адзін-два гады. Галоўнымі мэтамі экспедыцыі вызначаліся: усебаковае вывучэнне гісторыі

[508] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 366. – Арк. 120–122, 194–198. Приказы заведующего по основной деятельности (1977).

[509] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР. – 1981. – № 3. – С. 12–24.



Рэпазіторый ВДУ

дзяржавы, садзейнічанне выхаванню ў моладзі пачуцця патрыятызму, павагі да подзвігаў, далейшае развіццё школьнага турызму, як аднаго з актыўных метадаў вывучэння гісторыі Радзімы і аздараўлення вучняў. Экспедыцыі арганізоўваліся Міністэрствам асветы СССР, ЦК ВЛКСМ, Цэнтральным саветам прафсаюзных арганізацый і адпаведнымі рэспубліканскімі структурамі. Яны пачалі праводзіцца з канца 1950-х гадоў, але найбольшае развіццё атрымалі ў 1960-я гады.

Кожная з экспедыцый прысвячалася якой-небудзь знамянальнай даце ў жыцці краіны. Напрыклад, першая Усесаюзная экспедыцыя піянераў і школьнікаў, якая адбылася ў 1956–1957 гг., была прысвечана святкаванню 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Трэцяя (1961–1962 гг.) – 40-годдзю піянерскай арганізацыі імя У.І. Леніна; чацвёртая (1963–1964 гг.) – вынікам выканання сямігодкі і праводзілася пад дэвізам “Па дарогах сямігодкі”. Кожная экспедыцыя мела асобнае заданне, звычайна звязанае з юбілейнай датай у гісторыі КПСС, Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі СССР ці БССР.

У экспедыцыях удзельнічалі ў асноўным вучні V–X класаў. Галоўнымі формамі працы былі паходы, экскурсіі, экспедыцыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, стварэнне музеяў, грамадска-карысная праца. Вынікі падводзіліся на абласных і рэспубліканскіх злётах. Падрыхтоўку заданняў арганізоўвала ЦДЭТС сумесна з музеямі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Я. Купалы, Я. Коласа, дзяржаўным гісторыка-краязнаўчым музеем, інстытутамі геалогіі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук і іншымі арганізацыямі.

Новы этап ў развіцці турысцка-краязнаўчага накірунку распачаўся ў 1970 г., калі была створана Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя Міністэрства асветы СССР. Утварэнне саюзнай структуры дало новы штуршок у развіцці турысцка-краязнаўчага руху.

ЦДТЭС Міністэрства асветы СССР распрацавала ідэю правядзення доўгатэрміновай Усесаюзнай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі *“Мая Радзіма – СССР”*. Экспедыцыя – з’ява настолькі маштабная, што заслугоўвае асаблівай увагі. У ёй спалучаліся навуковае пазнанне роднага краю, турызм і грамадска-карысная праца. Асновай экспедыцыі стала выкананне заданняў, накіраваных на адкрыццё і апісанне малавядомых ці малавывучаных падзей гісторыі СССР і адпаведна кожнай рэспубліцы. Характэрнымі рысамі адзначанага віда краязнаўчага руху з’яўляліся:

– арыентацыя на доўгатэрміновасць (з 1972 па 1980-я гады);

– апора на школьнае (вучэбнае і пазакласнае) і пазашкольнае краязнаўства, яго сувязь з вучэбна-выхаваўчымі мэтамі;

– накіраванасць на сістэмнасць і практычную выніковасць краязнаўчай работы;

– масавасць удзельнікаў экспедыцыі, разнастайнасць полаўзроставага складу.



Рэпазіторый ВГУ

Маршруты экспедыцыі знаёмілі моладзь з памятнымі месцамі краіны, гістарычнымі і архітэктурнымі помнікамі, перадавымі прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі. Удзельнікі экспедыцыі вялі пошук герояў вайны, збіралі воінскія і працоўныя рэліквіі, удзельнічалі ў стварэнні помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных комплексаў, музеяў.

Мэтазгодна абазначыць структуру кіраўніцтва турысцка-краязнаўчай экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР". З боку Міністэрства асветы БССР асноўнымі структурнымі элементамі былі: ЦДТЭС, абласныя, гарадскія і раённыя аддзелы адукацыі, штабы экспедыцыі ў сярэдніх школах і пазашкольных установах.

ЦДТЭС (якой падпарадкоўваліся 6 абласных, а таксама 39 дзіцячых турысцкіх баз) пры падтрымцы абласных бюро міжнароднага маладзёжнага турызму "Спадарожнік" стваралі і ўдасканальвалі сетку турысцка-экскурсійнага абслугоўвання. З мэтай паляпшэння такой работы з экскурсійнымі групамі школьнікаў, што прыязджалі ў Мінск ці іншыя гарады Беларусі, за абласнымі станцыямі юных турыстаў замацоўваліся школы гарадоў і раёнаў. Напрыклад, рашэннем Віцебскага абласнога аддзела адукацыі № 43 ад 24.02.1977 года "Аб замацаванні за турысцкімі арганізацыямі вобласці базавых школ па экскурсійным абслугоўванні навучэнцаў экскурсантаў" быў створаны абласны савет па турызме і экскурсіях, складзены сумесны план па арганізацыі працы[510].

ЦДЭТС адыгрывала вызначальную ролю ў аказанні метадычнай дапамогі ў дзейнасці, звязанай з правядзеннем экспедыцыі. Тут распрацоўваліся і дасылаліся на месцы інструкцыйна-метадычныя пісьмы аб рабоце абласных экскурсійна-дзіцячых станцый, палажэнне аб дзіцячых турыстычных базах і іншыя рэкамендацыі. Разам з навукова-даследчым інстытутам педагогікі ў 1967 г. былі распрацаваны праграмы дзейнасці школьных турысцка-краязнаўчых гурткоў.

Для кіраўніцтва экспедыцыямі ў кожным горадзе і раёне былі створаны адпаведныя штабы, якія працавалі на аснове калегіяльна распрацаваных і прынятых мерапрыемстваў па паляпшэнні турысцка-краязнаўчай працы. Штабы экспедыцыі былі створаны ў кожнай школе. У адпаведнасці з іх планамі разглядалася работа атрадаў, выдаваліся краязнаўчыя заданні.

Удзел школьных атрадаў ва Усесаюзнай экспедыцыі рэгулярна кантраляваўся. Пытанні ўдзелу ў экспедыцыі разглядаліся на педагагічных саветах школ, партыйных і камсамольскіх сходах і пасяджэннях камсамольскіх камітэтаў і бюро. У штаце школы існавала пасада адказнага за турысцка-краязнаўчую працу. Каардынуючы свае дзеянні з дырэктарамі школ, пазашкольных устаноў і камітэтамі камсамола школ, яны непасрэдна на месцах ажыццяўлялі правядзенне экспедыцыі: падрыхтоўку

[510] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 366. – Арк. 116. Приказы заведующего по основной деятельности (1977).



Рэпазіторый ВДУ

і правядзенне масавых паходаў у час канікулаў, распрацоўку заданняў для турысцкіх атрадаў, падвядзенне вынікаў паходаў і падарожжаў. У абавязак адказных уваходзіла правядзенне спаборніцтваў, святаў, канферэнцый, выстаў.

Кожны атрад атрымліваў асобнае заданне. Сярод цікавых мэтавых заданняў, на наш погляд, можна адзначыць: "Іх імёнамі названы", "Імя тваё невядома, подзвіг твой бессмяротны", "Нашы бацькі на працоўнай вахце", "Віцябчане – удзельнікі штурму Берліна". У Віцебску былі праведзены тэматычныя паходы на радзіму Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага ў в. Платы Віцебскага р-на, на месца бою танкавага экіпажа "Баявая сяброўка" пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза М. Акцябрскай, на радзіму двойчы Героя Савецкага Саюза А. Гараўца, шматлікія экскурсіі. Падобныя мерапрыемствы праводзіліся і ў іншых абласцях краіны[511].

Сістэму турысцка-краязнаўчай працы ў межах экспедыцыі можна прадставіць наступным чынам.

Камітэты камсамола:

– распрацоўвалі і зацвярджалі маршруты экспедыцыі;

– арганізоўвалі спецыялізаваныя паездкі для розных катэгорый моладзі, цягнікі дружбы па маршрутах экспедыцыі;

– наладжвалі абмен турысцкімі групамі паміж роднаснымі прадпрыемствамі і вучэбнымі ўстановамі (напрыклад, у БССР штогод прымалі звыш 60 тысяч удзельнікаў экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР" з розных абласцей і рэспублік нашай краіны);

– адказвалі за ідэйна-палітычную і пазнаваўчую каштоўнасць экскурсій моладзі, арганізоўвалі прапагандысцкую працу;

– складалі спісы гісторыка-экскурсійных аб'ектаў, над якімі бралася шэфства гарадскіх і раённых камсамольскіх арганізацый.

Прафсаюзныя арганізацыі:

– прадстаўлялі ўдзельнікам экспедыцыі турыстычныя базы, гасцініцы, кемпінгі, транспарт, кваліфікаваных экскурсаводаў;

– выдзялялі моладзі ільготныя турысцкія пуцёўкі для падарожжаў і экскурсій па рэспубліканскіх і ўсесаюзных маршрутах экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР".

Органы народнай адукацыі:

– ажыццяўлялі метадычнае кіраўніцтва школьнымі турысцкімі групамі;

– каардынавалі падарожжы і экскурсіі па маршрутах экспедыцыі з вучэбнымі праграмамі, вывучэннем гісторыі, літаратуры, грамадазнаўства;

– арганізоўвалі турысцка-краязнаўчую працу ў школах, Дамах піянераў.

---

[511] ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 15. Задания пионерским отрядам "Следопыты Октября", посвященные 50-летию Октябрьской революции за 1967 год.



Репозиторий ВГУ

Рэдакцыі маладзёжных газет і часопісаў, маладзёжнага радыё і тэлебачання рэспублікі:

– асвятлялі ход экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР";

– друкавалі матэрыялы з мэтай прапаганды экспедыцыі і вынікаў яе дзейнасці (спецыяльныя плакаты, буклеты, альбомы, паштоўкі, прысвечаныя гісторыі гарадоў, прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, музеям і помнікам, якія сталі аб'ектамі экспедыцыі).

ЦК ЛКСМБ і Міністэрства культуры БССР сумесна выдавалі каталог-даведнік маршрутаў і гісторыка-экскурсійных аб'ектаў экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР". Навучальнымі ўстановамі шырока выкарыстоўваўся зборнік "Школьные туристские маршруты по Белоруссии", у які было ўключана апісанне больш за 30 маршрутаў па ўсіх рэгіёнах рэспублікі.

Выкарыстоўваліся розныя формы і метады пазашкольнай і пазакласнай працы: экскурсіі, паходы, пасяджэнні гурткоў і клубаў, вечарыны, злёты, конкурсы. У прыватнасці, у школах Кастрычніцкага раёна г. Віцебска былі арганізаваны турысцка-краязнаўчыя гурткі, працавалі два турысцкія клубы, якія ўпершыню афармілі стэнды па гісторыі раёна і праводзілі экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы, стварылі летапіс "Прадпрыемствы Кастрычніцкага раёна". Краязнаўцы выступілі ініцыятарамі правядзення ўрачыстасцей (вечарын, лінеек, вахт і інш.) у гонар асоб, якія мелі дачыненне да гісторыі раёна: тут ёсць вуліца А. Гараўца, музей памяці патрыётаў Віцебшчыны ў былой турме СД, дзе была закатавана В. Харужая, музей легендарнага беларускага партызана Героя Савецкага Саюза М. Шмырова[512].

Адной з цікавых форм вывучэння роднага краю і прэзентацыі яго вынікаў былі конкурсы сачыненняў на мясцовую тэматыку. Заслугоўвае ўвагі і той факт, што акрамя вывучэння гісторыі роднай мясцовасці школьнікі ўдзельнічалі ў грамадска-карыснай працы, тым самым сцвярджаючы высокі статус сваёй дзейнасці. Напрыклад, у тым жа Кастрычніцкім раёне г. Віцебска даглядалася тэрыторыя школ, двароў, стадыёнаў, было ўзята шэфства над помнікамі, аказвалася дапамога ветэранам.

Для заахвочвання актыўных удзельнікаў быў зацверджаны нагрудны знак "Усесаюзнай экспедыцыі". Выдатнікі ўзнагароджваліся знакамі трох ступеней ВЛКСМ. Распрацаваны маркі, канверты з сімволікай экспедыцыі. Цэнтральным штабам быў арганізаваны выпуск 2 разы на год Інфармацыйнага бюлетэня аб вопыце героіка-патрыятычнага выхавання моладзі. Раз у 3 гады праводзіліся семінары кіраўнікоў Усесаюзнага паходу.

Лагічным заканчэннем і важнейшым вынікам працы кожнага таварыства, групы, гуртка было правільнае афармленне і захаванне

[512] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 72. – Арк. 89. Сводный отчет ОблОНО о работе школ области за 1968/1969 гг.

сабраных дакументаў, рэліквій, калекцый і іншых матэрыялаў, выкарыстанне іх у вучэбна-выхаваўчай працы, пры абсталяванні кабінетаў, стварэнні школьных музеяў.

У пастанове ЦК ЛКСМБ "Аб далейшым развіцці Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой, працоўнай славы савецкага народа" (1981) падводзіліся некаторыя вынікі працы, якія сведчаць пра маштабнасць праведзенай працы. За 15 год Усесаюзны паход ператварыўся ў масавы рух. Было створана звыш за 150 тысяч летапісаў партыйных і камсамольскіх арганізацый, куткоў, пакояў, музеяў, узведзена больш за 75 тысяч помнікаў, манументаў, мемарыяльных знакаў, на прадпрыемствах і ў арганізацыях выдзелены памяшканні для работы штабаў, раз у 3 гады праводзіліся семінары кіраўнікоў Усесаюзнага паходу.

Краязнаўчы прынцып экспедыцыі добра прасочваецца і падцвярджаецца тэматыкай Усесаюзных тэматычных маршрутаў, якія былі арыентаваны на вывучэнне асноўных накірункаў гісторыі краіны: падзей, звязаных з рэвалюцыяй, вайной, сацыялістычным будаўніцтвам. Яны прадстаўлены ў наступнай табліцы 3:

Табліца 3

| **Назва мэтавых экспедыцый** | **Чаму прысвечана** |
|---|---|
| «Памятныя ленінскія мясціны» | Знаёміла з мясцінамі, звязанымі з жыццём і дзейнасцю У. Леніна ў СССР |
| «Шляхам Вялікага Кастрычніка» | Расказвала пра гісторыю Кастрычніцкай рэвалюцыі і КПСС |
| «Ніхто не забыты, нішто не забыта» | Прысвечана падзеям, месцам, звязаным з гераічным мінулым нашай Радзімы, гісторыяй грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн |
| «Будні вялікіх будоўляў» | Прысвечана будоўлям першых пяцігодак, Усесаюзным ударным камсамольскім будоўлям, аб'ектам дзявятай пяцігодкі |
| «Ордэны Радзімы на сцягах камсамола» | Прысвечана гісторыі стварэння і дзейнасці ВЛКСМ, памятным мясцінам, звязана з гісторыяй станаўлення арганізацыі |
| «Шляхамі сяброўства» | Гісторыя і культура саюзных і аўтаномных рэспублік, рэспублік СССР |
| «Айчыны верныя сыны» | Прысвечана жыццю і дзейнасці выдатных грамадскіх дзеячаў, палкаводцаў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў СССР, месцам, звязаным з іх жыццём і дзейнасцю |
| «Па гарадах-помніках» | Прысвечана старажытным гарадам-помнікам, гісторыі і архітэктуры СССР |



Рэпазіторый ВГУ

Арыентацыя на краязнаўчы прынцып у пазашкольнай дзейнасці добра праглядаецца ў шэрагу пастаноў структурных устаноў Міністэрства асветы СССР. Спашлемся на "Інструкцыю па арганізацыі і правядзенню турысцкіх паходаў, вандровак і экскурсій з навучэнцамі агульнаадукацыйных школ", зацверджаную загадам Міністэрства асветы СССР № 38 ад 12.04.1974 г.[513]. Згодна з гэтымі дакументамі план школьных экскурсій павінен быў зацвярджацца ў гарадскіх ці раённых аддзелах адукацыі. У беларускіх умовах канкрэтызацыю загад атрымаў у пастанове Міністэрства асветы БССР "Аб мерах па далейшым паляпшэнні арганізацыі адпачынку вучняў школ", дзе падкрэслівалася, што турыстычныя падарожжы за межы вобласці магчымы *толькі* ў выпадку, калі школа ці іншая ўстанова дакументальна пацвердзіць наяўнасць ва ўдзельнікаў групы значка "Турыст СССР", атрыманага *за падарожжы па родным краі* [514].

Выкарыстанне краязнаўчага прынцыпу ў пазашкольнай дзейнасці ўстаноў адукацыі добра праглядаецца ў загадзе Віцебскага аблана "Аб мерах па папярэджанні парушэнняў парадку арганізацыі і правядзення дальніх экскурсій з навучэнцамі" (1977). У ім, у прыватнасці, адзначалася: "Забараніць выезд экскурсійных груп школ за межы рэспублікі без дазволу аблана. ***Забараніць правядзенне далёкіх экскурсій, калі вучні не вывучалі памятныя і гістарычныя месцы свайго раёна, вобласці***, рэспублікі і не выканалі нарматыўных патрабаванняў на значок «Турыст СССР»"[515].

За невыкананне загада шэраг арганізатараў турысцкай дзейнасці атрымалі вымовы, а абласной станцыі юных турыстаў было загадана распрацаваць і зацвердзіць два новыя экскурсійныя маршруты па Віцебскай вобласці для вучняў 7–10-х класаў і рэкамендаваць іх школам і пазашкольным установам[516]. Падобная практыка, на наш погляд, была карыснай і садзейнічала развіццю турысцка-краязнаўчага накірунку ў школьным краязнаўстве Беларусі з 1961 да 1980-х гадоў.

З другой паловы 1980-х гадоў адбываюцца некаторыя змены ў змесце турысцка-краязнаўчага накірунку краязнаўства. Гэта добра бачна па мерапрыемствах, якія праводзіла Міністэрства асветы. Загадам Міністэрства асветы СССР № 190 (1985) была зацверджана норма турысцка-краязнаўчых паходаў у школе – 2–3 паходы ў год. Верагодна, такія нормы некалькі ніжэшыя за магчымыя, аднак рэальна дасягальныя ў школе[517]. У 1986 г. Міністэрствам асветы БССР прыняты загад № 63

[513] Документы ЦК ВЛКСМ. 1974. – М.: Молодая гвардия, 1975. – С. 125.
[514] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР. – 1980. – № 10. – С. 5
[515] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 366. – Арк. 199. Приказы заведующего по основной деятельности (1977).
[516] ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 40. – Арк. 200. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972.
[517] Куликов, В.М. Школьный туризм. Концепция с критическими оценками современного состояния (28 тезисов) [Электронны рэсурс] / В.М. Куликов // Вестник детско-юношеского туризма в России. –

Репозиторий ВГУ

“Аб комплекснай мэтавай прагpаме па далейшым паляпшэнні занятасці дзяцей і падлеткаў у пазаўрочны час на 1986–1990 гады «Вольны час»”. У адпаведнасці з ім павялічвалася колькасць турысцка-краязнаўчых гурткоў, пашыралася сетка станцый і баз юных турыстаў, разам з Беларускім саветам па турызме і экскурсіях праводзіліся мерапрыемствы па падрыхтоўцы грамадскіх турысцкіх кадраў, распачаліся рэгулярныя турыстычныя злёты настаўнікаў. Як бачым, ухіл на турысцкую дзейнасць захоўваўся як сродак аздараўлення, адпачынку і выхавання.

На пачатку 1990-х небываламу ўзлёту школьнага краязнаўства спрыяла распрацоўка і правядзенне Усебеларускай экспедыцыі “Наш край”, якая стала своеасаблівым вынікам турысцка-краязнаўчай працы, праведзенай у папярэднія гады. Нягледзячы на падабенства назваў (“Наш край” – “Мая Радзіма – СССР”) гэта экспедыцыя вывела краязнаўчы рух на якасна новы ўзровень. Можна лічыць, што пастанова аб правядзенні Усебеларускай экспедыцыі “Наш край” аднавіла сапраўдны краязнаўчы рух у сучасным яго разуменні, вызваліла яго ад ухілу ў турысцка-аздараўленчую накіраванасць[518].

## 4.2. Краязнаўчая праца школьных музеяў

Другім важным накірункам развіцця школьнага краязнаўства ў 1960–1980-я гг. стала стварэнне ў школах Беларусі шырокай сеткі школьных музеяў, якія адыгрывалі значную ролю ў пазашкольнай і пазакласнай выхаваўчай працы.

Менавіта музей як навукова-даследчая і культурна-асветная ўстанова ажыццяўляе камплектаванне, улік, захаванне, вывучэнне і папулярызацыю помнікаў гісторыі і культуры. Правядзенне заняткаў на аснове матэрыяльных і дакументальных крыніц музейных экспазіцый значна павышае іх эфектыўнасць, развівае імкненне да ўдзелу ў пазакласных мерапрыемствах. Акадэмік С.Л. Ціхвінскі, напрыклад, называў школьны музей самай масавай формай далучэння моладзі да краязнаўчай работы[519].

У акрэслены перыяд у значнай колькасці школ уся сістэма краязнаўчай дзейнасці грунтавалася на аснове школьнага музея. Гэта не выпадкова. Па-першае, шырокае выкарыстанне матэрыялаў школьнага краязнаўчага музея садзейнічае павышэнню інтарэсу вучняў да гісторыі роднага краю, актывізуе навучальны працэс. Па-другое, краязнаўчая праца садзейнічае ўстанаўленню больш глыбокіх міжпрадметных сувязей. Па-трэцяе, стварэнне музея актывізуе працу школьных гурткоў, аказвае ўплыў

№ 3(23). – 1997(16–24). – 2002. – Рэжым доступу: http://kraevedenie.chat.ru/articls/kulikov.htm. – Дата доступу: 15.08.2005.

[518] Герасіменка, М.П. Экспедыцыя “Наш край” у дзеянні / М.П. Герасіменка // Детский туризм и краеведение в Беларуси / авт.-сост. С.М. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 75–84.

[519] Тихвинский, С.Л. Состояние и задачи дальнейшего развития исторического краеведения в СССР / С.Л. Тихвинский // Вопросы истории. – 1988. – № 1. – С. 24.



Репозиторий ВГУ

на выбар прафесіі вучнямі (праз сустрэчы з цікавымі людзьмі), дапамагае сур'ёзна падыйсці да пытання абрання месца ў жыцці.

Вывучэнне практыкі школьных музеяў паказвае, што яны заўсёды выступаюць як краязнаўчыя цэнтры, у якіх акумулююцца вынікі шматгадовай працы настаўнікаў і вучняў па вывучэнні роднага краю. Звычайна музеі ствараюцца на аснове раней праведзеных даследаванняў (у межах турысцка-краязнаўчага ці, напрыклад, пошукавага накірунку), як падвядзенне вынікаў такой працы.

Школьныя музеі з'яўляюцца месцамі, у якіх утрымліваюцца цікавыя матэрыялы па гісторыі Радзімы: дакументальныя, рэчавыя крыніцы, сабраныя ў час правядзення экспедыцый, матэрыялы, запісы і ўспаміны мясцовых жыхароў, ветэранаў. Каштоўнасць школьных музеяў яшчэ і ў тым, што ў іх сабраны дакументы і матэрыялы, звязаныя менавіта з мясцовым насельніцтвам, што сведчыць аб непарыўнасці роднасных гістарычных каранёў паміж пачынаючымі жыццё школьнікамі і тым старэйшым пакаленнем, якое захавала гэта жыццё для сучаснага юнацтва.

Можна пагадзіцца з расійскай даследчыцай Т.О. Размуставай, якая лічыць, што ў перыяд 1950–1980-х гг. ў краязнаўстве перавага аддавалася менавіта музеям, як дзяржаўным, так і грамадскім, што дае магчымасць вызначаць аўтару мадэль гэтага перыяду краязнаўства як музейную[520]. Калі ў 1958 г. у Беларусі было каля 400 школьных музеяў, то ў 1982 г. іх налічвалася ўжо каля 10 тысяч. З іх 3,5 тыс. музеяў, куткоў і залаў былі прысвечаны жыццю і дзейнасці У.І. Леніна, каля 3 тыс. музеяў і пакояў адлюстроўвалі рэвалюцыйную, баявую і працоўную славу мінулага краю, больш за 1 тыс. мемарыяльных музеяў, 2,5 тыс. гісторыка-краязнаўчых музеяў і гурткоў[521].

Каардынуючую ролю ў развіцці школьных музеяў ажыццяўляла Цэнтральная дзіцячая экскурсійна-турысцкая станцыя Міністэрства асветы БССР. Напрыклад, у 1961 г. спецыялістамі гэтага міністэрства і ЦДЭТС было выпрацавана палажэнне "Аб школьным гісторыка-краязнаўчым музеі", якое стала галоўным метадычным дакументам па стварэнні музеяў такога тыпу. Па распрацаваных ЦДЭТС рэкамендацыях вялася работа па назапашванні матэрыялаў і распрацоўцы экспазіцый, фарміраванні фондаў музеяў, арганізацыі турысцкіх паходаў, экспедыцый.

Адной з формаў падвядзення вынікаў работы школьных музеяў сталі агляды-конкурсы. Першы рэспубліканскі агляд гісторыка-краязнаўчых музеяў быў праведзены ў 1961 годзе Міністэрствамі асветы і культуры

[520] Размустова, Т.О. Исторические модели краеведения в России / Т.О. Размустова // Материалы Всерос. науч.-практ. конф. "Современное состояние и перспективы развития краеведения в регионах России". – М.: ЦДЮТур РФ, 1999. – С. 100.
[521] Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 64.



Репозиторий ВГУ

БССР[522]. Па яго выніках лепшымі былі прызнаны музеі Дрысенскай СШ № 2 Віцебскай, Юравіцкай СШ Гомельскай, Мар'інагорскай СШ № 2 Мінскай, Валеўскай СШ Гродзенскай, Пружанскай СШ № 2 Брэсцкай абласцей[523].

Актывізацыі развіцця школьных музеяў спрыяла пастанова Міністэрства асветы БССР "Аб правядзенні рэспубліканскага агляду работы музеяў У.І. Леніна, гісторыка-краязнаўчых музеяў школ, школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў, пазашкольных устаноў, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады" (1965 г.). У ходзе падрыхтоўкі да мерапрыемства распрацоўваліся новыя і пераафармляліся існуючыя экспазіцыі, актывізавалася збіральніцкая праца, сістэматызаваліся дакументальныя і рэчавыя крыніцы, атрыманыя ў выніку пошукавай працы; у музеях выдзяляліся спецыяльныя залы па гісторыі і геаграфіі свайго краю, гісторыі Савецкай дзяржавы[524].

Развіццю школьных музеяў садзейнічаў выдадзены ў 1968 г. загад Міністэрства асветы "Аб мерах па далейшаму паляпшэнню дзейнасці школьных музеяў", згодна з якім было распрацавана новае "Палажэнне аб школьным музеі"[525].

У 1960–1970-я гады ў школьным краязнаўстве развівалася супрацоўніцтва з Дзяржаўным гісторыка-краязнаўчым музеем БССР, абласнымі, гарадскімі і раённымі музеямі, пры якіх ствараліся клубы і секцыі юных краязнаўцаў, ладзіліся лекторыі для навучэнцаў. Удзел у гэтых структурах садзейнічаў паглыбленню і пашырэнню ведаў школьнікаў, развіццю іх пазнавальных і творчых здольнасцей. Дапамогу ў арганізацыі школьных краязнаўчых музеяў аказвалі музеі Міністэрства культуры. Разам з Дзяржаўным музеем Беларусі Міністэрства асветы БССР распрацавала палажэнне і метадычныя рэкамендацыі аб працы школьных музеяў, якія далі якасны штуршок развіццю школьнага краязнаўства.

Прынятыя рашэнні садзейнічалі развіццю школьных музеяў, павелічэнню іх колькасці, павышэнню ролі ў вучэбна-выхаваўчай працы. Напрыклад, толькі ў школах Віцебскай вобласці ў 1968/1969 навучальным годзе налічвалася 80 музеяў Леніна, 1345 ленінскіх куткоў, 99 гісторыка-краязнаўчых музеяў, 810 куткоў баявой славы. Пры ўсіх музеях працавалі лекторыі[526]. Заўважым, што пры стварэнні музеяў асаблівая ўвага надавалася не толькі пытанням вучэбна-педагагічнага характару (змест і формы працы, напрыклад), але і праблемам уліку і захоўвання фондаў[527].

---

[522] ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 95. – Арк. 45. Документы о проведении конкурса на лучший общественный музей.
[523] Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 59.
[524] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР, 1966. – № 2. – С. 27.
[525] Тамсама. – 1967. – № 8. – С. 21.
[526] Документы ЦК ВЛКСМ. 1971. – М.: Молодая гвардия, 1973. – С. 240.
[527] Документы ЦК ВЛКСМ. 1974. – М.: Молодая гвардия, 1975. – С. 250.



Репозиторий ВГУ

Прынятыя меры садзейнічалі таму, што ў вучняў расла цікавасць да мясцовай гісторыі, пошукавай і даследчай краязнаўчай працы. Пад кіраўніцтвам настаўнікаў фарміраваліся новыя экспазіцыі, у выхаваўчай працы выкарыстоўваліся каштоўныя помнікі рэгіянальнай гісторыі і культуры. У якасці ініцыятараў і арганізатараў музейнай справы ў навучальных установах рэспублікі гэтых часоў працавалі вопытныя педагогі-краязнаўцы Р. Атаманаў, Ю. Мельнікаў, А. Нядзведская, М. Сямак, Г. Яцына, У. Урбановіч.

Вывучэнне школьнікамі гісторыі сваіх мясцін, як правіла, завяршалася стварэннем музеяў калгасаў, саўгасаў, прамысловых прадпрыемстваў, устаноў адукацыі, воінскіх падраздзяленняў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У якасці прыклада прывядзём стварэнне музея баявой славы 953-га Віцебскага штурмавога авіяцыйнага палка, створанага ў Віцебскім ПТВ-96, музея 39-й Арміі, якая вызваляла Віцебск – у віцебскай СШ № 32[528]. Сярод лепшых назавём таксама музеі Глухскай СШ Быхаўскага раёна, СШ № 4 г. Слоніма, СШ № 6 г. Калінкавічы, СШ № 10 г. Мазыра, СШ № 4 і 44 г. Гомеля, СШ № 2 г. Пінска, СШ № 1 і 12 г. Брэста, СШ № 5 г. Магілёва, СШ № 1 г. Беразіно, СШ № 17 г. Барысава і СШ № 1 г. Жодзіна Мінскай вобласці, СШ № 19, 97, 100 г. Мінска.

Важным крокам у развіцці краязнаўства праз школьныя музеі стала прыняцце ў 1979 годзе Міністэрствам культуры БССР "Палажэнне аб музеі, які працуе на грамадскіх пачатках". Яно вырашыла шмат набалелых пытанняў у арганізацыі музейнай работы (фінансавання, атрымання памяшканняў для музея, праблему захавання фондаў). У дзяржаве былі створаны ўмовы для пашырэння сеткі школьных грамадскіх музеяў[529].

Развіццю школьных музеяў садзейнічала святкаванне юбілейных і памятных дат. Яны актывізоўвалі працу па арганізацыі новых музеяў, удасканаленню дзейнасці ўжо адкрытых, папулярызацыі музейнай справы ў школе, планаванні работы на будучыню. У якасці прыкладу можна прывесці святкаванне ў 1980 г. 110-й гадавіны У.І. Леніна. Юбілею прысвячаўся рэспубліканскі агляд школьных музеяў. У ім удзельнічала 5 тысяч ленінскіх пакояў, музеяў, залаў, музеяў баявой і працоўнай славы, гісторыі камсамольскіх і партыйных арганізацый, краязнаўчых, мемарыяльных.

У выніку праведзенай да святкавання юбілею школьнымі музеямі працы аддзеламі народнай асветы, педагагічным актывам школ і пазашкольных устаноў зроблена значная праца па *ўдасканаленні* дзейнасці школьных музеяў. Было створана больш за 300 новых музеяў, залаў,

---

528 Музеі школ і ПТВ Віцебскай вобласці: даведнік / склад. А.В. Куржалаў. – Віцебск: Друкарня імя Камінтэрна, 1995. – С. 65.

529 Документы ЦК ВЛКСМ, 1981. – М.: Молодая гвардия, 1982. – С. 89; Документы ЦК ВЛКСМ, 1982. – М.: Молодая гвардия, 1983. – С. 110.



Репозиторий ВГУ

пакояў, школьных летапісаў народнай славы. Праведзеная праца садзейнічала *папулярызацыі* краязнаўства сярод моладзі, *прапагандзе* ведаў пра свой край і далучэнню большай колькасці дзяцей да вывучэння роднага краю, *аптымізацыі* і *заахвочванню* музейнай працы ў школе, *карэкцыі* вызначаных недахопаў, *удакладненню* і *развіццю* на будучыню.

Мерай, якая садзейнічала развіццю школьных музеяў, стала арганізацыя двухгадовых універсітэтаў тэорыі і практыкі музейнай справы для настаўнікаў. У 1981 годзе, дзякуючы намаганням ЦДТЭС і Дзяржмузея, такі ўніверсітэт быў створаны для педагогаў г. Мінска і Мінскай вобласці, а ў 1985 г. падобныя ўніверсітэты і курсы былі арганізаваны ва ўсіх абласцях рэспублікі. З мэтай падрыхтоўкі кіраўнікоў школьных музеяў праводзіліся профільныя семінары з удзелам прадстаўнікоў органаў культуры, адукацыі, навукі, педагогаў-практыкаў. ЦДТЭС і абласныя станцыі юных турыстаў распрацоўвалі і выдавалі метадычныя рэкамендацыі па дзейнасці школьных музеяў.

Абагульніўшы набыткі ў школьнай краязнаўчай справе ў сваёй пастанове “Аб выніках рэспубліканскага агляду школьных музеяў”, Міністэрства асветы БССР даручыла абласным аддзелам народнай адукацыі да студзеня 1981 года завяршыць стварэнне школьных музеяў, залаў, пакояў У.І. Леніна, баявой і працоўнай славы ва ўсіх сярэдніх школах краіны.

Ад дырэктараў школ патрабавалася не перагружаць настаўнікаў, якія кіруюць музеямі, іншымі грамадскімі даручэннямі, нават вызваляць іх пры неабходнасці ад класнага кіраўніцтва. Лепшыя кіраўнікі школьных музеяў былі адзначаны ўзнагародамі.

Адзначым, што пытанні развіцця школьных музеяў і меры па іх развіцці пастаянна аналізаваліся Міністэрствам асветы СССР. Напрыклад, у выдадзенай у 1983 г. пастанове “Аб рабоце школьных музеяў і мерах далейшага ўдасканальвання іх дзейнасці” прапанавалася шырэй выкарыстоўваць маральныя формы заахвочвання лепшых настаўнікаў; падрыхтаваць для выдання зборнік нарматыўных і метадычных дакументаў па пытаннях музейнай работы, упраўлення кадраў. Цэнтральнай дзіцячай турысцка-экскурсійнай станцыі, па дамоўленасці з Упраўленнем культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры СССР, было прапанавана распрацаваць тыпавую праграму для курсаў павышэння кваліфікацыі настаўнікаў; навукова-даследчым часопісам сістэматычна публікаваць артыкулы і матэрыялы з вопыту работы школьных музеяў; Галоўнаму упраўленню школ правесці ў 1985–1986 гг. Усесаюзны семінар-нараду арганізатараў школьных музеяў[530]. Такая ўвага, безумоўна, давала плён: на люты 1983 года ў БССР было больш за 10 тысяч школьных музеяў[531].

---

[530] Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР. – 1987. – № 4. – С. 3.
[531] Тамсама. – 1983. – № 8. – С 3.



Репозиторий ВГУ

Змены ў духоўным жыцці савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гадоў прывялі да ўзнікнення новых падыходаў у школьным краязнаўстве. У сітуацыі эканамічнай і ідэалагічнай напружанасці, спробы рэформаў, пошукаў новых шляхоў развіцця, рэзкіх метамарфоз у грамадскай свядомасці і зменаў у палітычных арыенцірах краіны патэнцыял школьнага краязнаўства зноў аказаўся запатрабаваным. На гэты раз – у якасна новым стане, як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Заслугоўваюць увагі мерапрыемствы, якія праводзіліся з мэтай аптымізацыі дзейнасці школьных музеяў у час "перабудовы". За перыяд 1985–1991 гг. Рэспубліканскім цэнтрам дзіцячага і юнацкага турызму і экскурсій Міністэрства адукацыі і навукі Беларусі праведзены шэраг мерапрыемстваў па аказанні метадычнай дапамогі кіраўнікам музеяў і арганізатарам музейнай справы ў навучальна-выхаваўчых установах: рэспубліканскі семінар-нарада кіраўнікоў краязнаўчых і этнаграфічных музеяў; рэспубліканскі семінар кіраўнікоў літаратурных музеяў; праверка і абагульненне вопыту работы шэрагу школьных музеяў у г. Мінску, Гомельскай, Віцебскай і Мінскай абласцях; распрацоўка рэкамендацый па змесце і афармленні музеяў, распрацоўка і выданне даведнікаў "Школьныя літаратурныя музеі", "Школьныя народныя музеі баявой славы".

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. актывізацыі дзейнасці школьных музеяў спрыялі новыя формы працы: быў праведзены шэраг конкурсаў-аглядаў музеяў па профілях: краязнаўчых, музеяў баявой, партызанскай і працоўнай славы. Пачаў стварацца камп'ютарны банк дадзеных пра музеі навучальна-выхаваўчых устаноў Беларусі[532].

Тэндэнцыя адлюстравання гісторыі краю закранула не толькі школы, але і ўстановы рэгіянальнага маштабу. У якасці такога факта можна прывесці звесткі пра спробы стварэння музея адукацыі Віцебскай вобласці. Загадчыкам Віцебскага аблана 29.09.1985 г. быў выдадзены загад "Аб стварэнні музея гісторыі народнай адукацыі Віцебскай вобласці", які можна разглядаць як факт пашырэння ўвагі да краязнаўства і арганізаванай канкрэтнай працы па вывучэнню рэгіянальнай гісторыі адукацыі[533]. На жаль, на пачатку 2010-х гадоў музей перастаў існаваць.

Адзначым, што напрацоўкі ў дзейнасці школьных музеяў працягвалі рэалізоўвацца ў пазнейшы час. Напрыклад, Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь прапаноўвала органам адукацыі знаходзіць магчымасць увядзення ў школьныя штаты стаўкі заработнай платы кіраўнікам школьных музеяў[534].

[532] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 1004. Приказы заведующего ОблОНО по основной деятельности за 1987 г.
[533] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 893. – Арк. 70. Приказы заведующего по основной деятельности (1985); ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 895. – Арк. 45. Справки и информации о работе учреждений просвещения области за 1985 г.
[534] Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства народнай адукацыі БССР. – 1992. – № 8.

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў музеі становяцца цэнтрамі вывучэння і адраджэння гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, народных традыцый і абрадаў. Аднак, трэба адзначыць аб’ектыўныя эканамічныя і арганізацыйныя цяжкасці, якія ў гэты час мелі месца. У працы музеяў назіраюцца пэўныя змены: з аднаго боку, вызначылася тэндэнцыя скарачэння колькасці музеяў, з другога – перапрафіляванне існуючых. Асноўнай прычынай закрыцця музеяў з’явілася неадпаведнасць экспазіцый “Палажэнню аб музеі навучальна-выхаваўчай установы”. Нярэдка да музейных экспазіцый адносілі невялікія школьныя калекцыі краязнаўчых матэрыялаў, што захоўваліся у рэкрэацыях школьных будынкаў і вучэбных кабінетах без адпаведнага догляду і ўмоў захоўвання. Статус музея мелі і ленінскія куткі, пакоі, пастаянна дзеючыя выстаўкі ідэалагічнай тэматыкі. У многіх з іх не было належнай навукова-даследчай асновы, частая змена кіраўніцтва музеяў пазбаўляла магчымасці ўсялякага кантролю за экспанатамі, якія проста губляліся. Аднатыпныя і малазмястоўныя экспазіцыі большасці з такіх музеяў не здолелі выканаць свёй функцыі ў сістэме агульнаадукацыйнай школы, зрабіць музей цэнтрам культурна-асветніцкай работы ў асяроддзі вучнёўскай моладзі. Такія музеі былі выключаны з навучальна-выхаваўчага працэсу.

Перапрафіляванне музеяў стала магчымым з прычыны таго, што амаль перастае існаваць практыка пэўнага ігнаравання краязнаўчага прынцыпу пры складанні тэматыка-экспазіцыйных планаў школьных музеяў. Асабліва гэта тычыцца афармлення музеяў мемарыяльных, баявой, партызанскай і працоўнай славы, экспазіцыі якіх прысвячаліся падзеям сацыялістычнай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны, дзейнасці дзяржаўных, палітычных і ваенных кіраўнікоў краіны. З канца 1980-х гадоў шэраг школ і ПТВ перааформілі і перапрафілявалі свае музеі ў адпаведнасці з патрэбамі навучальных праграм, захавалі сувязі і працягваюць працаваць з ветэранамі, славутымі землякамі, вядуць плённую пошукавую работу[535].

Калі раней большасць з іх мела вузкую ваенна-патрыятычную альбо этнаграфічную накіраванасць, а экспазіцыі распрацаваны ў жорсткім падпарадкаванні ідэалагічным задачам камуністычнага выхавання, то к канцу 80-х і асабліва на пачатку 90-х гадоў XX ст. профіль школьных музеяў змяняецца, галоўным чынам на гісторыка-краязнаўчы, экспазіцыі становяцца комплекснымі[536]. Абавязкова распрацоўваліся раздзелы аб гісторыі роднай школы, старадаўняй гісторыі роднага краю і яго лепшых людзях. У гэты час

---

[535] Сураго, Т.Н. Экспозиция школьного музея во внеклассной работе / Т.Н. Сураго // Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ ім. Я. Купалы; абл. аддзял. Беларус. добраахвотнага тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ. – С. 69.

[536] Півавар, М.В. Музеі Віцебска на пачатку XXI ст.: манаграфія / М.В. Півавар. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – С. 54.



Репозиторий ВГУ

праводзілася пашпартызацыя музеяў школ і ПТВ краіны, якую прайшлі 1465 навучальных устаноў[537]. Незалежна ад профілю музея ў кожным з іх праводзілася выхаваўчая работа: дзейнічалі клубы і гурткі, наладжваліся народныя святы і абрадавыя дзеянні, праводзіліся ўрокі па школьных прадметах і экскурсіі для наведвальнікаў. У шматлікіх музеях можна было бачыць цікавыя аўтэнтычныя экспанаты, якіх не маюць нават дзяржаўныя музеі. Вынікам дзейнасці стала стварэнне новых музеяў, аднаўленне і дапаўненне існуючых экспазіцый, афармленне этнаграфічных куткоў[538].

Пры ўсіх пазітыўных зменах у рабоце школьных музеяў у канцы 1980-х – 1991 гг. існавала шмат праблем. Вельмі востра стаяла праблема захаванасці экспанатаў, недахопу экспазіцыйных плошчаў, сродкаў на іх афармленне. Нездавальняюча ажыццяўляліся меры па заахвочванні педагогаў-кіраўнікоў школьных музеяў[539].

## 4.3. Пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці

Значэнне пошукавай працы для моладзі, асабліва, у перыяд станаўлення яе грамадзянскіх якасцей, нельга пераацаніць. Пошук імёнаў невядомых салдат, якія загінулі, абараняючы Айчыну, сама па сабе высакародная справа, важная ў выхаванні патрыятызму. Удзел у падобных мерапрыемствах дапамагае моладзі зразумець, што такое абавязак і чалавечая годнасць, спрыяе фарміраванню пазітыўнага погляду на службу ў войску.

У вывучаемы перыяд пошукавы рух атрымаў вялікае развіццё яшчэ і з прычыны актуальнасці тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны – зусім няшмат часу прайшло з яе заканчэння. Улічваючы, што моладзь краіны 1960–1980-х гадоў вырасла пасля вайны і не ведала цяжкасцей ваеннага часу, актуалізавалася запатрабаванасць ва ўдасканаленні работы па ідэйна-патрыятычным выхаванні. Вельмі важна было, каб юнакі і дзяўчаты разумелі і адчувалі цану заваяванай Перамогі. Правядзенне такой работы садзейнічала ўшанаванню памяці загінуўшых воінаў, добраўпарадкаванню месцаў пахавання і, канешне, пошуку загінуўшых у час вайны.

Першыя спробы вызначэння імёнаў загінуўшых салдат у сваёй мясцовасці, пошук прапаўшых без вестак, рэканструкцыя падзей вайны ў сваім мікрарэгіёне, верагодна, маглі мець месца яшчэ ў часы старажытнасці. У СССР у 1920-я гады ў некаторых школах ствараліся атрады, якія займаліся пошукам імёнаў салдат Чырвонай Арміі, загінуўшых у гады грамадзянскай вайны, даглядалі месцы іх пахаванняў,

---

537 Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 55–66.

538 Рыженко, В.Г. Общественные музеи советской эпохи в культуре российской провинции [Электронны рэсурс] / В.Г. Рыженко. – Омск, 2003. – Рэжым доступу: http://www.ic.omskreg.ru/~cultsib/mus/rigenko.htm. – Дата доступу: 11.05.2005.

539 Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства асветы БССР. – 1967. – № 8. – С. 20.



Репозиторий ВГУ

вывучалі падзеі вайны ў сваім краі [540]. Але масавы маштаб пошукавы рух атрымаў толькі ў другой палове XX стагоддзя.

Адзначым, што па розных прычынах пошукавы рух як у часы Вялікай Айчыннай вайны, так і некаторы час пасля яе быў пад неафіцыйнай забаронай, бо адкрытыя пры пошуках факты маглі ісці ў разрэз з афіцыйным поглядам на падзеі вайны. Абвешчаныя Сталіным чалавечыя страты СССР у Вялікай Айчыннай вайне ў 7 млн чалавек цяжка было тлумачыць пры некантраляваным пошукавым руху. Сапраўдныя лічбы страт, высветленых у выніку пошукаў, маглі б па-новаму акрэсліць прычыны паражэнняў на пачатковым этапе вайны і сапраўдны "кошт" перамогі. З другога боку, не спрыяла развіццю пошукавага руху і цяжкае эканамічнае становішча краіны.

З пачатку 60-х гадоў XX ст. адбыліся пэўныя змены ў адносінах да пошукавага руху. Былі абнародаваны больш поўныя статыстычныя звесткі аб чалавечых стратах СССР у Вялікай Айчыннай вайне – 13,6 млн салдат і 7 млн мірнага насельніцтва[541].

Паступова вызначаюцца тры асноўныя арганізатары грамадскага пошукавага руху ў СССР. Перш за ўсё, гэта былі сваякі і родзічы загінуўшых ці прапаўшых без вестак салдат і афіцэраў; па-другое, жыхары тых месцаў, дзе адбываліся баі; па-трэцяе, ветэраны баёў, якія шукалі звесткі аб сваіх аднапалчанах і дамагаліся ўвекавечання памяці загінуўшых. Дзейнасць двух апошніх груп, на наш погляд, складае спецыфічную частку краязнаўчых даследаванняў. Так, для рэканструкцыі падзей вайны ў пэўнай мясцовасці ад удзельнікаў пошукавага руху патрабавалася праца ў архівах; збор матэрыялаў праз апытанні мясцовага насельніцтва, сведкаў падзей, удзельнікаў баёў; агляд тэрыторыі і іншыя дзеянні, якія вялі да вывучэння краю. Як сведчыць практыка, найбольш удзельнічала ў пошукавым руху менавіта мясцовая моладзь.

Разумеючы значнасць школьнага краязнаўства як важнага элемента адукацыйна-выхаваўчай працы па фарміраванні савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, дзяржава падтрымала ідэю масавага пошукавага руху. Яшчэ ў канцы 1950-х гадоў па ініцыятыве юных гісторыкаў г. Ленінграда пачаўся рух "чырвоных следапытаў" у горадзе, што яшчэ больш узмацніла гістарычны напрамак школьнага краязнаўства[542].

Развіццю цікавасці да вывучэння героіка-патрыятычнай тэматыкі паспрыяла дзейнасць пісьменніка С.С. Смірнова, які адкрыў краіне праўду

---

[540] Садовников, С.И. Становление и развитие поискового движения в России (1950–90-е гг.) / С.И. Садовников // Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы Всерос. науч.-практ. конф., Москва, 10–11 дек. 1998 г. / РАПН; отв. ред. С.О. Шмидт. – М., 1999. – С. 87.

[541] Всемирная история XIX–XX вв.: учебник для 11 кл. общеобразов. шк. / В.С. Кошелев [и др.]. – Минск: Нар. асвета, 2002. – С. 303.

[542] Садовников, С.И. Становление и развитие поискового движения в России (1950–90-е гг.) / С.И. Садовников // Современное состояние и перспективы развития в регионах России: материалы Всерос. науч.-практ. конференции, Москва, 10–11 дек. 1998 г. / РАПН; отв. ред. С.О. Шмидт. – М., 1999. – С. 84.



Репозиторий ВГУ

пра герояў Брэсцкай крэпасці, узняў праблему гібелі і занядбання 10-й Арміі ў Мясным Бары пад Ноўгарадам. З канца 1950-х – пачатку 60-х гадоў актывізуецца выдавецкая дзейнасць на азначаную тэматыку. Выходзяць у свет масавыя навукова-публіцыстычныя выданні, выдаюцца мемуары ветэранаў вайны, мастацкія, дакументальныя творы на ваенна-гістарычную тэматыку. Саюз журналістаў БССР сумесна з ЦК ЛКСМБ штогод праводзіў конкурс-агляд гэтых публікацый, іх вынікі былі прадстаўлены ў газетах, на тэлебачанні, радыё.

Сваю ролю адыграў і Усесаюзны паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. У выніку былі выяўлены тысячы імёнаў, узведзены, уладкаваны сотні абеліскаў, створаны музеі. Напрыклад, у 1962 г. у СШ № 40 г. Мінска быў створаны гісторыка-краязнаўчы клуб "Юны патрыёт", да якога потым далучыліся следапыты 47-й, 62-й і 65-й школ горада, дзейнасць якіх стала асновай для стварэння мінскага гарадскога гісторыка-краязнаўчага клуба "Юны патрыёт". Клубы чырвоных следапытаў з'явіліся і ў іншых гарадах і абласцях Беларусі.

Аднак Рэспубліканскі клуб чырвоных следапытаў школ і пазашкольных устаноў рэспублікі "Пошук" быў створаны значна пазней, у адпаведнасці з сумеснай Пастановай Бюро ЦК ЛКСМБ, Міністэрства асветы БССР, Дзяржаўнага камітэта БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні і Прэзідыума Рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, прынятай 23 студзеня 1980 г. У маі 1983 г. да гэтай пастановы далучылася ЦК ДТСААФ БССР. У 1988 г. была ўтворана пастаянная камісія Прэзідыума Рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў па ўвекавечанні памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны. Усе грамадскія таварыствы, якія былі аб'яднаны адзіным кіраўніцтвам, працавалі па адным, скаардынаваным плане[543].

На працягу вывучаемага перыяду ў пошукавым руху выкарыстоўваліся розныя формы працы, якія дазваляюць вызначыць характар такіх мерапрыемстваў, як краязнаўчы. У гэтай працы вызначаюцца тры этапы: вывучэнне дакументальных матэрыялаў і вусных крыніц; праца з атрыманымі матэрыяламі з мэтай прадстаўлення іх у ваенкаматы, архівы; выкарыстанне ў выхаваўчай і адукацыйнай дзейнасці.

Мерапрыемствы, якія праводзіліся пошукаўцамі, можна падзяліць на тры вялікія групы. Да першай можна аднесці наступныя: пошук месцаў пахавання па просьбах сваякоў загінуўшых; збор матэрыялаў аб дзейнасці партызанскіх атрадаў і падпольных арганізацый на тэрыторыі краю, аб воінскіх злучэннях, вызваляўшых Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; збор звестак пра землякоў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны; збор звестак пра вучняў і настаўнікаў, якія ўдзельнічалі ў вайне.

---

[543] Шомоди, В.Э. Из истории поискового движения / В.Э. Шомоди // Детский туризм и краеведение Беларуси / авт.-сост. С.С. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 89.



Репозиторий ВГУ

Да другой – хадайніцтвы перад Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні раней невядомых герояў Вялікай Айчыннай вайны; складанне летапісаў партызанскіх брыгад, атрадаў, падпольных антыфашысцкіх груп, воінскіх злучэнняў; напісанне альманахаў; стварэнне кінафільмаў[544]; распрацоўка і папаўненне экспазіцый школьных музеяў; узвядзенне помнікаў, манументаў і мемарыяльных дошак, закладка Курганоў Славы, шэфства над помнікамі і брацкімі могілкамі.

Да трэцяй – турысцкія злёты каля памятных месцаў (напрыклад, каля в. Шалашына Дубровенскага раёна – месца гібелі Героя Савецкага Саюза Ю. Смірнова)[545]; паходы па месцах баёў (асобна і сумесна з ветэранамі-удзельнікамі баёў); правядзенне сустрэч са славутымі землякамі (звычайна партызанамі, падпольшчыкамі, ветэранамі вайны); сустрэчы з таварышамі герояў; сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза; арганізацыі творчых вечарын; арганізацыі ленінскіх і ваенна-патрыятычных чытанняў, чытацкіх канферэнцый[546] і іншыя мерапрыемствы.

Важную ролю ў развіцці пошукавага руху ў Беларусі адыграла экспедыцыя "Летапіс Вялікай Айчыннай". Яна праводзілася з 1981 г. у межах Усесаюзнай пошукавай экспедыцыі камсамольцаў і моладзі, піянераў і школьнікаў "Летапіс Вялікай Айчыннай". Кіраўніцтва экспедыцыяй было даручана Рэспубліканскаму штабу Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі[547]. Аб тым, як праходзіла экспедыцыя, сведчаць шматлікія дакументы і пастановы ЦК ВЛКСМ 1982–1983 гг.[548]. У адпаведнасці з планавымі мерапрыемствамі школамі рэспублікі быў арганізаваны пошук і збор дакументаў і рэліквій ваеннага часу, запісы успамінаў франтавікоў, удзельнікаў партызанскага руху, працаўнікоў тылу. З мэтай забеспячэння захавання іх для будучых пакаленняў, атрыманыя матэрыялы перадаваліся ў дзяржаўныя і грамадскія музеі краіны і архіўныя ўстановы.

На працягу 1960–1980-х гг. удзельнікамі пошукавага руху была праведзена значная праца. Былі ўстаноўлены імёны больш за 30 тысяч воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, якія доўгі час лічыліся прапаўшыя без вестак. Каля 2 тысяч воінаў, якія былі ўзнагароджаны ў гады вайны баявымі ўзнагародамі, але па шэрагу прычын не змаглі атрымаць іх, атрымалі гэтыя ўзнагароды[549].

Пры ўдзеле членаў руху на тэрыторыі БССР былі пабудаваны больш за 6 тыс. помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных дошак і іншых памятных

---

[544] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 321. – Арк. 18. Справки и информации о работе органов просвещения за 1976 г.
[545] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 248. – Арк. 226. Протоколы совета ОблОНО и материалы к ним.
[546] ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 6. – Арк. 18. Сводный отчет о работе школ области за 1965/1966 гг.
[547] Документы ЦК ВЛКСМ. 1971. – М.: Молодая гвардия, 1973. – С. 143.
[548] Документы ЦК ВЛКСМ, 1982. – М.: Молодая гвардия, 1983. – С. 108, 135.
[549] Шомоди, В.Э. Из истории поискового движения / В.Э. Шомоди // Детский туризм и краеведение Беларуси / авт.-сост. С.С. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 90.



Рэпазіторый ВДУ

знакаў, закладзена каля 2 тыс. паркаў, садоў, сквераў у гонар герояў. У навучальных установах створана 726 клубаў баявой славы, 4,5 тыс. музеяў (з іх 809 сталі народнымі), пакояў і куткоў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. На іх аснове вялася праца па выхаванні патрыятызму, інтэрнацыяналізму, грамадзянскіх якасцей моладзі. Следапытамі былі аформлены больш за 10 тысяч "Школьных летапісаў народнай славы", большасць з якіх – на мясцовым матэрыяле, напісаны 1523 летапісаў калектываў, камсамольскіх арганізацый[550]. Выдадзены сотні кніг, брашур, буклетаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны ў пэўных мясцовасцях. У краіне рэгулярна праводзіліся масавыя мерапрыемствы ("Вахты Памяці", аперацыі "Доўг", "Памяць", "Імя на абеліску"), якія садзейнічалі актывізацыі пошукавай і краязнаўчай працы сярод насельніцтва краіны.

У газетах, на тэлебачанні, радыё рэгулярна друкаваліся і перадаваліся матэрыялы аб справах чырвоных следапытаў, заснаваныя на мясцовым матэрыяле. Матэрыялы, атрыманыя пошукаўцамі ў 1960–1980-я гады, актыўна выкарыстоўваліся пры стварэнні гісторыка-дакументальных хронік раёнаў "Памяць"[551]. Прыведзеныя лічбы пераканальна пацвярджаюць вылучаны намі тэзіс: калі пачатак пошукаваму руху быў пакладзены яшчэ ў 1920-я гады, то па-сапраўднаму ён разгарнуўся толькі ў 1960-я гады.

Важнасць і запатрабаванасць пошукавай працы, якая была праведзена школьнікамі Беларусі на працягу 1960–1980-х гадоў, атрымала свой працяг у 1990-х гадах. На цяперашні час у рэспубліцы існуе каля 500 пошукавых атрадаў і груп. Большасць з іх аб'яднана ў Беларускую рэспубліканскую асацыяцыю пошуку і ўвекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны "Пошук". З 1228 школьных музеяў, якія дзейнічаюць у краіне, 272 маюць статус музеяў воінскай славы[552]. У 1994 г. пры Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь быў створаны пошукавы батальён і ўпраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны.

Такім чынам, пытанне, узнятае грамадствам, стала вырашацца дзяржаўнымі структурамі. Хаця адзначым, што гэта не выправіла да канца сітуацыю і больш за 1,1 мільёна салдат, якія загінулі на Беларусі, застаюцца невядомымі[553].

Пры ўсіх станоўчых момантах і выніках пошукавага руху, у 1960–1980-я гг. мелі месца і пэўныя негатыўныя з'явы. Пошукавы рух падлягаў

[550] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для ист. факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – С. 56.

[551] Дадатковыя рэкамендацыі па збору матэрыялаў і напісанню гісторыка-дакументальных кніг "Памяць". – Мінск: МП "Белтэст", 1992. – 69 с.

[552] Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 56.

[553] Бруева, Л.Н. Пока не похоронен последний солдат [Электронны рэсурс] / Л.Н. Бруева // Наш край – Віцебшчына. – 2004. – Рэжым доступу: www.kraj.vitebsk.net/?page=vov&sod=_bru_00. – Дата доступу: 15.08.2005.

Репозиторий ВГУ

кантролю. З аднаго боку, дзяржава не магла супрацівіцца масавай грамадскай ініцыятыве, з другога – яна ў некаторым сэнсе абмяжоўвала яго развіццё. Напрыклад, у 1979 годзе К. Сіманаў выступіў з ініцыятывай стварыць аддзел "Запісаў успамінаў ветэранаў". Прапанова не была прынятая, і нават было выдадзена адпаведнае партыйнае пастанаўленне аб немэтазгоднасці стварэння падобнага аддзелу.

У некаторых выпадках меў месца фармальны падыход у арганізацыі музейнай і пошукавай краязнаўчай працы. Справамі школьных музеяў даволі часта займаліся выключна дарослыя. Некаторыя музеі былі толькі размешчаны ў памяшканнях школ, а стваралі іх Саветы ветэранаў вайсковых часцей і злучэнняў. Не заўсёды прысутнічаў грунтоўны аналіз развіцця і перспектыў удасканалення дзейнасці, што зніжала эфектыўнасць працы.

У выніку гэтага, у пошукавай краязнаўчай працы сталі праяўляцца элементы фармалізму, а з іх развіццём маглі губляцца адукацыйная і выхаваўчая сутнасць. Напрыклад, пошукавай дзейнасцю лічылася правядзенне выставы, прысвечанай 30-годдзю Перамогі СССР[554].

У некаторых выпадках у школьнай краязнаўчай працы пераважала менавіта пошукавая накіраванасць, галоўнай лічылася тэматыка Вялікай Айчыннай вайны і ігнараваліся іншыя накірункі гістарычнага краязнаўства. Можна прывесці прыклад Брэста, у якім школьнікі распрацоўвалі амаль выключна тэму абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Не варта вінаваціць толькі школьнае краязнаўства. У энцыклапедычным даведніку "Брест: энциклопедический справочник" прыведзены спіс літаратуры краязнаўчай накіраванасці пра Брэст, які складаецца з 119 найменняў[555]. З іх 91 (76%) назва прысвечана абароне Брэсцкай крэпасці; 10 (8%) – археалогіі, архітэктуры, гісторыі, геаграфіі горада і наваколляў; іншыя – эканоміцы, персаналіям. Па-за ўвагай, такім чынам, заставаліся пытанні іншых перыядаў гісторыі горада. Але, на нашу думку, на такую тэматычную абмежаванасць нельга глядзець "сучаснымі вачыма". У СССР у 1960–1980-я гады пошукавая тэматыка адпавядала ідэалогіі савецкага грамадства і поўнасцю супадала з пастаўленымі грамадствам і часам задачамі.

Ацэньваючы ў цэлым развіццё школьнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1980-я гады, можна зрабіць некалькі высноў.

Школьнае краязнаўства з'яўлялася ўдалым прыкладам спалучэння грамадскага і дзяржаўнага накірункаў. З аднаго боку, у ім прысутнічала пэўнае кіраўніцтва з боку Міністэрства асветы і падначаленых яму структур. З другога – удзел настаўнікаў і вучняў у большай ступені меў добраахвотны характар і праяўляўся ў асноўным у форме пазашкольнай дзейнасці. Школьнае краязнаўства развівалася ў выглядзе пазакласнай і ўрочнай работы.

[554] Туманов, В.Е. Школьный музей: метод. пособие / В.Е. Туманов. – М.: ЦДЮТиК, 2003. – С. 43.
[555] Брест: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – С. 405–407.



Репозиторий БГУ

Вядучымі напрамкамі школьнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1980-я гады з'яўляліся турысцка-краязнаўчы, музейны і пошукавы. У школьным краязнаўстве была створана сістэма дзейнасці, у якой важную ролю адыгрывалі Міністэрства асветы, грамадскія арганізацыі (КПСС/КПБ, ЛКСМБ, БДТАПГіК, таварыства "Веды"). Важную ролю ў развіцці гісторыка-краязнаўчага руху Беларусі адыграла Усесаюзная турысцка-краязнаўчая экспедыцыя "Мая Радзіма – СССР". У арганізацыі і правядзенні комплексу гэтых мерапрыемстваў галоўную ролю адыгралі Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя, абласныя і раённыя яе адгалінаванні.

Займаючыся школьным краязнаўствам, навучэнцы моцны, сабралі і захавалі тысячы помнікаў гісторыі і культуры. Краязнаўства стала арганічнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу, увайшло ў сістэму выкладання асноў гістарычных ведаў. Матэрыялы, атрыманыя краязнаўцамі, выкарыстоўваліся пры стварэнні гісторыка-дакументальных хронік раёнаў "Памяць" і іншых выданняў. "Школу" краязнаўства прайшлі мільёны людзей, успрыняўшы дэмакратычную сутнасць краязнаўчай дзейнасці, пачуццё беражлівых адносін да культурнай і прыроднай спадчыны.

Развіццё школьнага краязнаўства аб'ектыўна аказала моцны ўплыў на духоўнае развіццё Беларусі, было важным сродкам і метадам выхавання патрыятызму, інтэрнацыяналізму, грамадзянскіх якасцей беларускай моладзі, з'явілася важным этапам у развіцці гістарычнага краязнаўства ў цэлым; стварыла аснову для яго хуткага росту ў 1990-я гады і на цяперашнім этапе.

Репозиторий ВГУ

# ГЛАВА 5

# ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЦАЎ У 1961–1991 ГГ.

## 5.1. Каго лічыць краязнаўцам? Тыпалогія даследчыкаў (краязнаўцаў)

Краязнаўства, гэта найперш – людзі. Ім займаюцца тысячы асоб. Некаторыя вывучаюць край у межах выканання службовых абавязкаў (супрацоўнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, выкладчыкі ВНУ, журналісты, адміністрацыйныя работнікі), некаторыя робяць гэта для сябе, па позве сэрца і душы.

Але далёка не ўсе з іх, на нашу думку, з’яўляюцца сапраўднымі краязнаўцамі. Што ж іх адрознівае? Паспрабуем вылучыць асноўныя рысы “тыповага” краязнаўцы. Найбольш уласцівымі катэгорыямі, на нашу думку, з’яўляюцца:

1. Комплексны характар ведаў (вялікі дыяпазон тэм даследаванняў, шырокае кола ведаў пра край, іх энцыклапедычнасць, універсальнасць).
2. Рэгулярнасць і пастаяннасць правадзімых даследаванняў.
3. Значныя вынікі працы (выданне кніг, артыкулаў у перыядычным друку, адкрыццё музеяў і падрыхтоўка выстаў, значная грамадская, педагагічная праца, спонсарская дзейнасць, удзел у добраўпарадкаванні помнікаў і памятных мясцін).
4. Любоў да краю. Края*знаўца* – заўжды края*люб*.

*Тыпалогія даследчыкаў (краязнаўцаў).* Можна вызначыць наступныя катэгорыі персаналій, якія праводзяць даследаванні рэгіёна:

1. Навукоўцы, якія даследуюць пэўную мясцовасць (Інстытут гісторыі НАН).
2. Супрацоўнікі музеяў (дзяржаўных, грамадскіх, школьных, ведамасных).
3. Супрацоўнікі архіваў.
4. Супрацоўнікі бібліятэк (сектараў краязнаўства).
5. Выкладчыкі ВНУ.
6. Журналісты і супрацоўнікі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі.
7. Настаўнікі, стваральнікі школьных музеяў, супрацоўнікі цэнтраў дзіцячай творчасці.
8. Супрацоўнікі дзяржаўных органаў (кіраўнікі аддзелаў культуры, спорту і турызму рай- і гарвыканкамаў, спецыялісты ўстановы “Белпраектрэстаўрацыя”).
9. Экскурсаводы.
10. Краязнаўцы-аматары.

Репозиторий ВГУ

11. Іншыя.

Такім чынам, краязнаўцамі, на думку аўтара, можна лічыць шырокае кола асоб, якое ўключае ў сябе як падрыхтаваныя навуковыя кадры, якія вывучаюць пэўную тэрыторыю на прафесійным узроўні, атрымліваюць за гэта грошы (гісторыка, напрыклад, які даследуе стан пэўнай тэрыторыі ў асобны перыяд (Полацк у часы Сярэднявечча), так і аматараў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі і займаюцца даследаваннямі з прычыны цікавасці ці любові да пэўнага краю. Сюды таксама аднясем асоб, якія не ставяць перад сабой мэты вывучэння пэўнага краю, але сваёй дзейнасцю *спрыяюць* такому *вывучэнню*, робяць шмат справы для *папулярызацыі* ведаў пра свой край і асветы асобных бакоў жыцця сярод насельніцтва рэгіёна. У манаграфіі мы сканцэнтруемся на некалькіх катэгорыях: навукоўцах, краязнаўцах-аматарах і вылучым лепшых краязнаўцаў-настаўнікаў.

З больш чым дзесяці катэгорый асоб, якія займаюцца краязнаўчымі даследаваннямі, вылучым асноўныя, выкарыстаўшы як крытэрый дачыненне да прафесіі гісторыка. На наш погляд, усіх краязнаўцаў можна ўмоўна падзяліць на  навукоўцаў, аматараў і педагогаў.

## 5.2. Краязнаўчая дзейнасць навукоўцаў

Пачаць варта з асобы, якую многія даследчыкі лічаць “бацькам” сучаснага беларускага краязнаўства, які сваёй нястомнай дзейнасцю і энергіяй у другой палове XX ст. абуджаў да краязнаўчай працы дзясяткі асоб, быў чалавекам, які прыклаў шмат намаганняў для стварэння Беларускага краязнаўчага таварыства ў канцы 1980-х гадоў.

Гэты чалавек, гісторык, доктар гістарычных навук, археолаг, фальклярыст, музеязнаўца, папулярызатар краязнаўчай і музеязнаўчай навукі – Генадзь Аляксандравіч **Каханоўскі**. Нарадзіўся ён 08.01.1936 г. у вёсцы Дамашы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Пасля службы ў Савецкай Арміі скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1963). Падчас навучання ў МДПІ узначальваў зямляцтва студэнтаў-беларусаў. Сустракаўся з У. Дубоўкам, К. Буйло, М. Улашчыкам і іншымі беларусамі, якія пражывалі ў Маскве. Пасля заканчэння інстытута працаваў настаўнікам у Ленкаўскай васьмігадовай школе і ў Маладзечне. З 1964 г. – у Мінскім абласным краязнаўчым музеі, які размяшчаецца ў г. Маладзечне (1964–1981), на пасадах навуковага супрацоўніка, намесніка дырэктара па навуковай рабоце, дырэктарам. Завочна скончыў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН БССР. З 1981 г. перайшоў на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, дзе працаваў да 1991 г. З гэтага ж году працаваў загадчыкам аддзела краязнаўства ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны.

Энергія, з якой Г. Каханоўскі займаўся краязнаўчай дзейнасцю,

Рэпазіторый ВДУ

ставіць яго ў лік найвыдатнейшых даследчыкаў і арганізатараў вывучэння Беларусі. Можна вылучыць два важнейшыя накірункі дзейнасці Г. Каханоўскага: арганізацыйны і даследчыцкі. У першую чаргу адзначым арганізатарскія ўменні навукоўцы. Шмат вандруючы па Беларусі і СССР, ён сустракаўся з мясцовай інтэлігенцыяй, настаўнікамі, наведваў рэгіянальныя музеі, меў стасункі з калекцыянерамі, аматарамі-краязнаўцамі. Вёў перапіску з сотнямі краязнаўцаў-аматараў, заахвочваў іх да актыўнай публікацыйнай дзейнасці, арганізацыі музеяў, правядзення даследаванняў, даваў кансультацыі, дапамагаў метадычна. Для шэрага краязнаўцаў-аматараў дзейнасць Г. Каханоўскага стала ўзорам, штуршком, прыкладам. Дзясяткі даследчыкаў лічаць яго сваім "духоўным" бацькам у краязнаўстве. З пачаткам палітыкі "перабудовы" у СССР, Г. Каханоўскі актыўна распачаў працу па арганізацыі і стварэнні Беларускага краязнаўчага таварыства, першым старшынёй якога і стаў (1989). Прамая сувязь і стасункі лідара з краязнаўцамі на месцах, вялізны досвед у даследчай і арганізатарскай справе жывілі дзейнасць таварыства. Не будзе перабольшваннем лічыць, што дзейнасць арганізацыі трымалася ў многім менавіта на асабістай энергіі, аўтарытэце Г. Каханоўскага.

Як даследчык Г. Каханоўскі меў шырокія навуковыя інтарэсы: гісторыя краязнаўства, этнаграфія, фальклор, славутыя землякі, гісторыя і культура свайго рэгіёна і іншыя. У 1984 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную гісторыі краязнаўства і археалогіі на Беларусі. На яе аснове была выдадзена манаграфія "Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст."[556], якая выкарыстоўваецца як дапаможнік па гісторыі краязнаўства ў ВНУ краіны. У 1992 г. абараніў доктарскую дысертацыю па крыніцазнаўстве матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі, што было першай дысертацыяй такога роду ў краіне[557].

Вынікі даследаванняў і краязнаўчых росшукаў былі апублікаваны на старонках рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку (пачаў выступаць з 1962 г.). Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1986). Друкаваўся пад псеўданімамі Габрук Верасень, Г. Гак, Г. Дамашовец, Г. Канстанцінаў. Асобным рэгіёнам і сюжэтам прысвечаны кнігі "Маладзечна" (1971), "Маладзечна, 600 гадоў" (1988), "Вілейка" (1974), "Адчыніся, таямніца часу" (1984), "Повязь часоў" (1985), а таксама асобныя нарысы-даследаванні пра невядомыя факты з жыцця і творчасці Я. Купалы – "На запаветнай зямлі" (1974) і М. Багдановіча – "У родным краі" (1983). "Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму" (з Л. Малаш і К. Цвіркам, 1989), "Прадвесне навукі" (1990)[558].

На жаль, дзейнасць Г. Каханоўскага выклікала ў некаторых асоб

---

556 Каханоўскі, Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

557 Мальдзіс, А. Ён валодаў таямніцай часу / А. Мальдзіс // Звязда. – 1996. – 11 студз. – С. 3.

558 Каханоўскі Генадзь // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. – Мінск: БелЭН, 1994. – Т. 3. – С. 213–215.



Рэпазіторый ВДУ

незадаволенасць. З-за сваёй патрыятычнай пазіцыі ў канцы 1960-х гадоў ён абвінавачваўся ў нацыяналізме і звальняўся з працы. Загадчык аддзела культуры г. Маладзечна Л. Сурпін абвінавацію яго ў нацыяналізме на падставе сцвярджанняў Г. Каханоўскага аб тым, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны гады ў БССР загінуў кожны чацвёрты жыхар. Гэтым самым, лічыў Л. Сурпін, Г. Каханоўскі штучна завышаў ролю беларускага народа. На працы Г. Каханоўскага аднавілі толькі дзякуючы заступніцтву Г. Бураўкіна, Я. Брыля, І. Новікава, М. Танка, гісторыкаў М. Ткачова і М. Чарняўскага. Абвінавачванні паўтарыліся і ў 1974 годзе падчас разгрому так званага "акадэмічнага асяродку".

Роля Г. Каханоўскага ў беларускім краязнаўстве і беларускай навуцы да канца не даследавана і не асэнсавана. Працуючы на стыку навук (займаючыся комплексным краязнаўствам) гісторыі, літаратуразнаўства, этнаграфіі, фалькларыстыкі, мовазнаўства, архівістыкі, Г. Каханоўскі змог шмат. Але шмат і не паспеў. З яго адыходам фактычна перастала дзейнічаць Беларускае краязнаўчае таварыства, сціх і арганізаваны краязнаўчы рух. Памёр Г. Каханоўскі 15.01.1994 г., пахаваны ў в. Насілава Маладзечанскага р-на.

Яшчэ адным выдатным навукоўцам, даследаванні якога мелі ў значнай меры краязнаўчы характар, з'яўляўся і працягвае быць Адам Іосіфавіч **Мальдзіс** (07.08.1932). Непасрэдна роднаму раёну ён прысвяціў у 1977 г. нарыс "Астравеччына, край дарагі..."[559]. Іншыя даследаванні адносяцца ў асноўным не да пэўнага рэгіёна, а да Беларусі ў цэлым, аднак засноўваюцца на такіх лакальных і рэгіянальных сюжэтах, што робіць іх сапраўднымі краязнаўчымі энцыклапедыямі. Сярод іншых прыгадаем зборнік нарысаў "Падарожжа ў XIX стагоддзе" (1969), "Таямніцы старажытных сховішчаў" (1974), "Шляхі вялі праз Белрусь" (1980, разам з В. Грыцкевічам)[560], "З літаратуразнаўчых вандраванняў" (1987). А. Мальдзіс выступаў кіраўніком навуковай тэмы "Беларускія пісьменьнікі", вынікам якой стаў біябібліяграфічны слоўнік пісьменнікаў, які складаецца з 6 тамоў[561]. Падрыхтаваў зборнік, прысвечаны А. Міцкевічу, "Зямля навагрудская, краю мой родны" (1969).

Асобна адзначым арганізацыю і кіраванне А. Мальдзісам Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны (1991–1998), які, на нашу думку, можна ў нечым параўнаць з працай Цэнтральнага бюро краязнаўства ў 1920-я гады ў БССР. На працу ў Цэнтр былі прыцягнуты выдатныя даследчыкі краіны. Калі б планам, якія былі распрацаваны ў Цэнтры была магчымасць збыцца, мы б мелі іншыя набыткі і магчымасці развіцця нашай нацыянальнай гісторыі і культуры. Правядзенне канферэнцый, падрыхтоўка слоўніка "Краязнаўцы Беларусі", падрыхтоўка

[559] Мальдзіс, А. Астравеччына, край дарагі... / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 208 с.
[560] Грыцкевіч, В. Шляхі вялі праз Беларусь / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 272 с.
[561] Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1992–1995.

Репозиторий ВГУ

і выданне краязнаўчага даведніка “Літаратурныя мясціны Беларусі”[562] – толькі некаторыя ініцыятывы Цэнтра, якім кіраваў А. Мальдзіс.

Навукоўцам, дзейнасць якога ў многім грунтавалася на краязнаўчых даследаваннях, з’яўляўся Генадзь **Кісялёў** (1931–2008). Пасля заканчэння Маскоўскага гісторыка-архіўнага інстытута (1953) ён працаваў у архіўных установах Літвы, у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук Беларусі. Стаў кандыдатам гістарычных навук (1964), доктарам філалагічных навук (1994), абараніўшы доктарскую дысертацыю па тэме “Беларуская літаратура ХІХ ст. Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі”.

На мяжы гісторыі і літаратуразнаўства, археаграфіі і фалькларыстыкі нараджаліся кнігі аўтара. Гісторыка-літаратурныя нарысы “Сейбіты вечнага” (1963), “З думай пра Беларусь” (1966), “Героі і музы” (1982), даследаванні “Загадка беларускай «Энеіды»” (1971), “Пошукі імя” (1978), “Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча” (1988), літаратуразнаўчая дылогія “В поисках классика…” (1989), гістарычныя нарысы “Паплечнік Каліноўскага” (1976), “На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 года на Міншчыне” (1990)[563].

Спачатку галоўная праца праводзілася ў архівах Вільні, Масквы, Ленінграда, Мінска, Гродна. Істотную частку працы складалі росшукі ў пэўнай мясцовасці, выезды на месцы, вусныя апытанні, праца з мясцовымі краязнаўцамі, ліставанне са сваякамі, спецыялістамі. Так, працуючы над вызначэннем аўтарства ананімнай на той час паэмы “Тарас на Парнасе”, актыўна прапрацоўваў версіі аб “магілёўскім” і “гарадоцкім” следзе твора. У творчай супрацы з М.Ф. Мельнікавым (Крычаў) і М.Х. Плавінскім (Віцебск), адкрываліся такія акалічнасці, якія не маглі б быць выяўлены толькі ў час працы ў архівах. Істотным аргументам на карысць аўтарства ўраджэнца гарадоччыны К. Вераніцына сталі звесткі, атрыманыя ў час апытанняў, інтэр’ю, праведзеных М.Х. Плавінскім[564], якія ён рабіў па просьбе Г. Кісялёва. Так, напрыклад, М. Плавінскім у наваколлях Віцебска быў лакалізаваны тапонім “Пуцявішча” – месца дзеяння паэмы “Тарас на Парнасе”. Г. Кісялёў ужыў атрыманыя звесткі пры напісанні кнігі “В поисках классика”[565]. Яны сталі важным аргументам на карысць “віцебскіх” каранёў легендарнай паэмы. Сувязі навукоўца і краязнаўцаў не былі эпізадычнымі.

Найбольш значнай фігурай савецкага краязнаўства 1961–1991 гг., які займаўся даследаваннямі краю не ў Беларусі, а ў Маскве, на нашу думку, варта лічыць Мікалая Мікалаевіча **Улашчыка** (1906–1986).

На пачатку 1920-х гадоў ён стаяў ля вытокаў савецкага беларускага краязнаўства, калі будучы студэнтам БДУ правёў шэраг вандровак,

---

[562] Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязн. даведнік: дапаможнік для настаўнікаў: у 3 кн. / Л. Кулажанка. – Мінск: БелЭн, 2000. – Кн. 1. Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці. – 286 с.
[563] Киселев Г. “Разыскивается классик…”. – Минск: Маст. літ., 1989. – 416 с.
[564] Плавінскі, М. Сцежкамі легендарнага Тараса / М. Плавінскі // Віцеб. рабочы. – 1991. – 25, 26, 27 верас.
[565] Киселев, Г. “Разыскивается классик…” / Г. Киселев. – Минск: Маст. літ., 1989. – С. 97–99, 398.



Репозиторий ВГУ

даследаванняў, з’яўляўся адным з арганізатараў краязнаўчага таварыства ва ўніверсітэце. Вынікі працы публікаваў у перыядычным друку[566]. Сярод найбольш важных навуковых дасягненняў, стала, напрыклад, адкрыццё гарадзішча Банцараўшчына і яго даследаванні. Краязнаўчая праца, любоў да Беларусі стала прычынай ажно чатырох арыштаў даследчыка, яго высылкі з Беларусі і зняволення[567]. Нават пасля рэабілітацыі, атрымання вучонай ступені доктара гістарычных навук, навуковага прызнання ў СССР і Еўропе, на Беларусі яго не чакалі і стаць выкладчыкам БДУ не дазволілі. Працаваў М. Улашчык у Інстытуце гісторы АН СССР.

Важнейшым укладам у развіцці краязнаўства Беларусі стала выданне М. Улашчыкам “Нарысаў па археаграфіі і крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі феадальнага перыяду”[568]. У ім упершыню прыводзіўся комплекс каштоўных выданняў, даваўся іх агляд, характарыстыка выдаўцоў і іх поглядаў. Яшчэ адным своеасаблівым помнікам М. Улашчыку стала падрыхтоўка і выданне беларуска-літоўскіх летапісаў. Амаль дзесяць гадоў аддаў даследчык навуковаму апісанню, каментаванню і выданню 32[569] і 35[570] тамоў “Поўнага збору рускіх летапісаў” (ПСРЛ), якія пабачылі свет у 1975 і 1980 гг. Са знаёмства з “Нарысамі” і “беларускімі” тамамі “ПСРЛ” павінны пачынаць, на нашу думку, сваю працу як беларускі будучы прафесійны гісторык, так і беларускі краязнаўца-аматар.

А навукова-папулярнае выданне М. Улашчыка “Хроніка Быхаўца”[571] спрыяла павелічэнню цікавасці да гісторыі Беларусі і беларускага летапісання ў прыватнасці. Артыкулы[572], рэцэнзіі на кнігі[573], выдаваемыя ў Беларусі, з’яўляліся важнымі дакументамі, якія давалі ацэнку развіцця беларускай гістарычнай навукі, пазначалі асноўныя кірункі руху.

Самай выдатнай, узорнай краязнаўчай працай М. Улашчыка стала кніга, прысвечаная роднай вёсцы Віцкаўшчына Дзяржынскага раёна. Кніга “Была такая вёска” выйшла ў свет ужо пасля смерці вучонага ў 1989 годзе

---

[566] Улашчык, М. Першы сход краязнаўчага гуртка пры БДУ / М. Улашчык // Сав. Беларусь. – 1924. – 23 снеж.; Ён жа. Паездка ў Койданаў студэнтаў БДУ // Наш край. – 1925. – № 1. – С. 66; Ён жа. Ахова помнікаў старасветчыны на Беларусі // Сав. Беларусь. – 1926. – 1 жн.; Улашчык, М. Краязнаўчая праца студэнтаў БДУ // Сав. Беларусь. – 1927. – 14 студз.; Ён жа. Слуцкая старасветчына // Сав. Беларусь. – 1928. – 16 сн.

[567] Мікалай Улашчык [Электронны рэсурс] // Дзяржынская цэнтральная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://www.dzerlib.by/pages/dzerlit/imenu/picmenniki_zemlyaki/16ylashcik.html. – Дата доступу: 21.12. 2015.

[568] Улащик, Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик / АН СССР. Ин-т истории СССР. – М.: Наука, 1973. – 303 с.

[569] Полное собрание русских летописей / АН СССР. Ин-т истории СССР. – Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская и Быховца. – Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырского / сост., ред. и авт. предисл. Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1975. – 233 с.

[570] Полное собрание русских летописей // АН СССР. Ин-т истории СССР. – Т. 35. Летописи Белорусско-Литовские / сост., ред. и авт. предисл. Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1980. – 306 с.

[571] Хроника Быховца / предисл., коммент., пер. Н.Н. Улащика. – М.: Наука, 1966. – 154с.

[572] Улашчык, М.М. Прыклад, варты пераймання: Аб напісанні гісторыі населенных пунктаў на Украіне і Смаленшчыне / М.М. Улашчык // Помнікі гісторыіі і культуры Беларусі. – 1972. – № 4. – С. 49–51; Ён жа. Прыгоды Радзівілаўскага летапісу: Б-ка АН СССР Ленінград // ЛіМ. – 1982. – 21 мая (№ 20). – С. 14.

[573] Улашчык, М. Пытанні тапанімікі Беларусі / М. Улашчык // Полымя. – 1968. – № 6. – С. 236–241; Ён жа. История с … «Историей» / М. Улашчык // Нёман. – 1983. – № 3. – С. 168–171.

Репозиторий ВГУ

ў перакладзе на беларускую мову У. Арлова. На падставе сур'ёзнага вывучэння дакументаў цэнтральных дзяржаўных архіваў БССР і ЛітССР, а таксама вусных інтэрв'ю былых жыхароў вёскі, уласных успамінаў і запісаў, М. Улашчык склаў летапіс гісторыі сваёй вёскі. Каштоўным з'яўляецца сама структура выдання, якая ўключае не толькі гісторыю населенага пункта, але і планіроўку вёскі і сядзіб, гаспадарчых пабудоў, заняткі жыхароў: мужчын, жанчын і дзяцей, сямейныя адносіны і шлюб. Напісана кніга простай мовай, але на высокім навуковым узроўні, што робіць яе ўзорнай для любога даследчыка, які захоча напісаць гісторыю свайго населенага пункта. Кнігу можна ўмоўна параўнаць з выданнем М. Нікіфароўскага "Нарысы Віцебскай Беларусі", якое называюць "энцыклапедыяй народнага жыцця" Беларусі другой паловы XIX ст. Такой жа "энцыклапедыяй" адной вёскі, а з ёй і тысяч іншых беларускіх вёсак, з'яўляецца і кніга М. Улашчыка "Была такая вёска".

Больш падрабязна пра краязнаўчую працу, якую праводзіў М. Улашчык, можна даведацца з ягоных дзённікаў, выдадзеных у 1999 годзе[574], а таксама ў томе, прысвечаным выдатнаму даследчыку ў серыі "Беларускі кнігазбор"[575].

Істотную ролю ў развіцці айчыннага краязнаўства адыграў гісторык, архівіст Віталь Уладзіміравіч **Скалабан** (1947–2011). Працуючы ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, ён узначальваў аддзел краязнаўства, стаў ініцыятарам шэрага ініцыятыў, у тым ліку стварэння даведніка "Краязнаўцы Беларусі"[576]. Не пакінуўшы вялікіх краязнаўчых прац, ён тым не менш зрабіў для краязнаўства краіны вялізную справу. Найбольш важная рыса дзейнасці В. Скалабана, як і Г. Каханоўскага – энергічныя захады па актывізацыі краязнаўчай працы на месцах, працы лакальных даследчыкаў. Ніхто як ён мог "запаліць" у краязнаўцы веру ў сябе на новыя справы – арганізацыю музея, напісанне кніг і артыкулаў, працу ў архіве, накіраваць на новую, перспектыўную, маладаследаваную тэму, падтрымаць у цяжкую хвіліну, даць каштоўную параду, дапамагчы ў выпраўленні памылак. І ўсё гэта шчыра, са спагадай, з добрым пачуццём гумару.

Актыўна займаўся краязнаўчай дзейнасцю (і працягвае займацца цяпер) паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч Сяргей Сцяпанавіч **Панізнік** (*С. Папар*, *Сяргей Папар*) (10.05.1942, в. Бабышкі Лявонпальскага с/с Мёрскага р-на). Член Саюза журналістаў (1966), Саюза беларускіх пісьменнікаў (1967). Скончыў Лявонпальскую СШ (1959), факультэт

---

[574] Улашчык, М.М. Краязнаўства: Нататкі пра бадзяньнні ў 1924–1929 гады: з рукапіснай спадчыны / М.М. Улашчык. – Мінск: Пейто,1999. – 158 с.

[575] Выбранае. Мікалай Улашчык / уклад. А. Каўкі, А. Улашчыка. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 604 с.

[576] Скалабан, В. Ствараецца даведнік "Беларускія краязнаўцы" / В. Скалабан // Кантакты і дыялогі. – 2001. – № 1. – С. 28–30; Скалабан, В. Сучасныя беларускія краязнаўцы / В. Скалабан // Краязн. газ. – 2005, сак.-кастр.



Репозиторий ВГУ

журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча СА і ВМФ (1967). Служыў ва Узброеных сілах СССР (1967–1976). Працаваў карэспандэнтам газеты “Вячэрні Мінск” (1977–1978), рэдактарам на Беларускім тэлебачанні (1980–1982), рэдактарам выдавецтва “Юнацтва” (1982–1996), вучоным сакратаром Літаратурнага музея Янкі Купалы (1996–1999), літаратурным кансультантам Беларускага саюза пісьменнікаў (з лютага па верасень 2000).

Асноўнымі накірункамі краязнаўчай дзейнасці на працягу другой паловы XX ст. з’яўляліся літаратурнае краязнаўства, збор прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры (фальклорных, этнаграфічных, лексічных матэрыялаў), стварэнне музеяў.

У гэты перыяд займаўся вывучэннем лёсу славутых землякоў. Збіраў фальклорную і этнаграфічную спадчыну роднага краю. З 1968 г. пачаў рабіць запісы песень, прымавак, тапанімічнага матэрыялу, збіраць іканаграфічны, этнаграфічны матэрыялы. Так, сфатаграфаваў і запісаў на магнітафон вяселле ў вёсцы Лявонпаль і музыку інструментальнай капэлы з вёскі Ліпава Мёрскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1979 г. стварыў у вёсцы Цінкаўцы Бігосаўскага сельскага савета Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці на сваёй сядзібе літаратурна-краязнаўчы музей “Хата бабкі Параскі” (“На Шляху з грэкаў у варагі”). У ім захоўваліся мэбля, дываны, ручнікі, кавальскія вырабы, посуд, дарэвалюцыйныя выданні і іншыя рэчы матэрыяльнай культуры Друйска-Дрысенскага Падзвіння.

Прапанаваў стварыць пры раённай бібліятэцы літаратурны музей Верхнядзвіншчыны, куды перадаў шэраг матэрыялаў па гэтай тэматыцы. На працягу 1980–1990-х гг. выступаў ініцыятарам і актыўным удзельнікам сустрэч з вучнямі школ Верхнядзвінскага раёна, правядзення мерапрыемстваў пад агульнай назвай “Падарожжа па літаратурнай карце Верхнядзвіншчыны”, дзе знаёміў з жыццём і дзейнасцю І. Храпавіцкага, Н. Арсенневай, Э. Самуйлёнка, Г. Гародніка, С. Сартакова, В. Мядзюты і інш. Распрацоўваў тэмы “Літаратурная Мёршчына”, “Беларускія пісьменнікі Латвіі”, “Ян Райніс і Беларусь”. Збіраў матэрыялы для кніг, прысвечаных літаратурным сувязям беларусаў у Еўропе: “Дыфузія культур” (“Мы” – у Львове, Рызе, Празе), “Лексіка Лявонпальскага мацерыка” (пазней друкавалася ў “Краязнаўчай газеце”). У 1988–1994 гг. быў актыўным удзельнікам міжнароднага праекта “Дзвіна–Даўгава”.

Краязнаўца, археолаг Міхаіл Іванавіч **Алексяюк** (1907–1983), працаваў у розных арганізацыях па меліярацыі Палесся. Адначасова праводзіў археалагічныя і краязнаўчыя даследаванні, адкрыў шэраг палеалітычных стаянак, свайныя пабудовы эпохі неаліта на воз. Ула Вілейскага р-на. З 1954 г. з’яўляўся членам вучонага савета Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, з 1967 г. – яго навуковым супрацоўнікам. Загадваў археалагічным музеям “Бярэсце” (1981–1982). Вынікам працы

Рэпазіторый ВДУ

даследчыка стала больш за 150 работ па гісторыка-краязнаўчай тэматыцы[577].

Значны ўклад у вывучэнне рэгіёнаў Беларусі зрабіла навукоўца, археолаг, жонка пісьменніка У.С. Караткевіча – Валянціна Браніславаўна **Караткевіч** (дзявочае прозвішча Ватковіч) (1934–1983). Скончыла БДУ імя У.І. Леніна (1956). Працавала навуковым супрацоўнікам у Ашмянскім краязнаўчым і Брэсцкім гісторыка-краязнаўчым музеях, выкладчыкам у Брэсцкім педінстытуце, старшым навуковым супрацоўнікам ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1969–1983). У 1965 г. атрымала вучоную ступень кандыдата гістарычных навук. Асноўнымі тэмамі, над якімі працавала даследчыца, з'яўляліся паморская культура на тэрыторыі Беларусі, гісторыя гарадоў. Па родзе дзейнасці ў 1970–1980-я гг. займалася краязнаўчымі даследаваннямі розных рэгіёнаў Беларусі. Карпатліва гісторыю і культуру Віцебшчыны прыйшлося вывучаць пад час працы над падрыхтоўкай "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі". Праводзіла археалагічныя даследаванні Ушацкага, Чашніцкага раёнаў. Аўтар амаль сотні артыкулаў у віцебскім томе "Збору помнікаў гісторыі і культуры", прысвечаных у асноўным помнікам археалогіі, архітэктуры, славутым землякам, героям Савецкага Саюза – ураджэнцам раёнаў і гарадоў Віцебшчыны[578]. Аўтар кнігі "Памятники истории Витебска"[579].

Гісторык, журналіст, кандыдат гістарычных навук (1971) Эдуард Аляксандравіч **Карніловіч** (05.04.1936, в. Любанічы Талачынскага р-на Віцебскай вобл.) даследаваў удзел ураджэнцаў Беларусі ў дзяржаўным кіраўніцтве, рэвалюцыйным руху ў царскай Расіі, біяграфіі беларускіх палітычных дзеячаў ХХ ст. Аўтар прац "Рэвалюцыяй прызваныя" (1980), "Людзі рэвалюцыйнага подзвігу" (1985). Складальнік зборнікаў (разам з Э.А. Забродскім) успамінаў ураджэнцаў Беларусі пра падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. "У жалезных батальёнах рэвалюцыі" (1987). Шэраг матэрыялаў пра рэвалюцыянераў-землякоў апублікаваў у кнігах "Памяць" гарадоў і раёнаў Віцебскай вобласці, мясцовых перыядычных выданнях. Напрыклад, артыкулы "Наркам працы"

[577] Алексяюк Міхаіл Іванавіч [Электронны рэсурс] // Музеі Беларусі. – Рэжым доступу: file:///D:/Мои%20документы/10379-1.pdf. – Дата доступу: 12.12.2014.

[578] Уводзіны // ЗПГіКБ. Віцебская вобласць. – С. 38–39; Дом, у якім знаходзіўся Віцебскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў // Тамсама. – С. 53–54; Мемарыяльная дошка Леніну У.І. // Тамсама. – С. 69; Месца паўстання гараджан у 1623 г. // Тамсама. – С. 70; Радзіма Бескіна І. // Тамсама. – С. 82; Радзіма Жалезняка Р. // Тамсама. – С. 82–83; Радзіма Маўзона А. // Тамсама. – С. 83; БелДРЭС // Тамсама. – С. 99; (разам з Кулагіным А.) Сядзіба (в. Высокае Аршанскага раёна) // Тамсама. – С. 103–104; Магіла Сімацкага У. (г.п. Асвея) // Тамсама. – С. 162; Радзіма Нікіфароўскага М.Я. // Тамсама. – С. 184; (разам з Ліхтаровіч Н.С.) Сядзіба, месца працы Янкі Купалы (Старая Беліца) // Тамсама. – С. 407; Радзіма Рылько А. // Тамсама. – С. 418; Курганны могільнік (Ушачы) // Тамсама. – С. 424; Месца стварэння Чашніцкай партызанскай брыгады // Тамсама. – С. 429; Месца спаленай вёсцы (в. Мурагі) // Тамсама. – С. 433; (разам з Лапцэвіч Л.Г.) Мемарыяльны комплекс "Прарыў" // Тамсама. – С. 433–435; Помнік воінам Айчыннай вайны 1812 г. (в. Копцэвічы Чашніцкага раёна) // Тамсама. – С. 448; Замчышча, курганны могільнік (в. Красамай Шаркаўшчынскага раёна) // Тамсама. – С. 468 [і інш.].

[579] Памятники истории Витебска. Мінск: Полымя, 1975. – 24 с.



Репозиторий ВГУ

(А.М. Ціхан), "Пад імем «Швітурыс» (С.С. Турла) і іншыя[580].

Прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Міхайлавіч **Пяткевіч** (30.03.1931) аўтар і суаўтар шэрага кніг, артыкулаў, змешчаных у энцыклапедыях, падручніках, зборніках, часопісах, прысвечаных культуры Беларусі і асобна Гродзеншчыне. Сярод іх важнае месца займаюць: "Літаратурная Гродзеншчына"[581], "Людзі культуры з Гродзеншчыны", "Маршрутамі кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне". Усе яны выдадзены пасля 1991 г., але матэрыялы збіраліся аўтарам на працягу 1970–1990-х гадоў. Асаблівы клопат праяўляе пра развіццё роднай мовы і культуры[582]. З сярэдзіны 1980-х гадоў, на хвалі нацыянальнага адраджэння А.М. Пяткевіч прапанаваў стварыць ў ГрДУ імя Я. Купалы кафедру беларускай культуры, а з 1991 па 2001 г. загадваў ёю. У свой час прапаноўваў увесці на ўсіх факультэтах ГрДУ імя Я. Купалы спецкурс "Этнакультурная гісторыя Гродзеншчыны", ці "Культура гродзенскага рэгіёна"[583].

Для кандыдата эканамічных навук Уладзіміра Мікалаевіча **Кісялёва** (1931) даследаванне гісторыі Наднямоння (роднай Уздзеншчыны, а таксама Стаўбцоўскага, Капыльскага раёнаў) было справай асабістых перакананняў. У час адной з вандровак ён зацікавіўся, хто быў уладальнікам маёнтка "Наднёман". Пачаўшы працу ў архіве, даведаўся пра прафесара электраграфіі і магнетызму Якуба Наркевіча-Ёдку. У той час пра яго на Беларусі забыліся, пры тым, ён з'яўляўся выдатным навукоўцам XIX ст., меў зносіны з В. Рэнтгенам і Л. Пастэрам, сябраваў з К. Фламарыёнам. Я. Наркевіч-Ёдка рабіў вопыты з электрычнасцю, лячыў ёю людзей і, нават лічыцца вынаходнікам радыё[584]. Развіваючы тэму гісторыі роднага краю, У. Кісялёў адкрыў для беларусаў імёны і іншых

[580] Карніловіч, Э.А. Як Акулік спрачаўся з Бухарыным / Э.А. Карніловіч // Маладосць. – 1999. – № 11; Ён жа. Сацыяёлаг, правазнаўца, грамадскі дзеяч [Петражыцкі Л.І.] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. – Мінск: ПК "Паліграфафармленне", 2003. – С. 67; Ён жа. Слухач школы ў Ланжумо [Брэслаў Б.] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. – Мінск: БелСЭ, 1988. – С. 76–80; Ён жа. Рэвалюцыянер з Коханава [Левіт С.] // Тамсама. – С. 84–86; Ён жа. Матрос з Кранштата [Маслакоў Я.] // Тамсама. – С. 86–88; Ён жа. Яркасць сэрца чалавечага [Клімчанка Я.] // Тамсама. – С. 628–630; Ён жа. Бальшавік з Янова [Янушкевіч К.] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мёрскага раёна. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 154–157; Ён жа. Красный генерал [Станкевіч А.У.] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск: БелТА, 2001. – С. 140–141; Ён жа. Грыдзюшка І.Л. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 101–102.

[581] Пяткевіч, А.М. Літаратурная Гродзеншчына / А.М. Пяткевіч. – Мінск: Выдав.цэнтр "Бацькаўшчына", 1996. – 96 с.; Ён жа. Людзі культуры з Гродзеншчыны. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2000. – 356 с.; Ён жа. Маршрутамі кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне. – Варшава, 2002.

[582] Лабовіч, А. Аляксей Пяткевіч: Як мы сьмяяліся з газэтаў 1950-х [Электронны рэсурс] / А. Лабовіч // Наша ніва. – Рэжым карыстання: http://nn.by/?c=ar&i=1168. – Дата доступу: 23.04.2015.

[583] Журавлев, В. Мы живем не чуя земли под ногами // Местечко Новый свержень [Электронны рэсурс]. – Рэжым карыстання: http://sverzen.16mb.com/Petkevich.html. – Дата доступу: 13.05.2015.

[584] В Беларуси появился Благотворительный фонд имени Я.О. Наркевича-Иодко [Электронны рэсурс] // Выток Нёмана, Уздзеншчына. – Рэжым доступу: http://istoknemana.ucoz.org/publ/vytok_njomana_uzdzenshchyna_2012_god/vytok_njomana_uzdzenshchyna_2/blagotvoritelnyj_fond_imeni_ja_o_narkevicha_iodko/3-1-0-29. – Дата доступу: 31.09.2015.



Репозиторий ВГУ

знакамітых асоб свайго часу – багаслова Уладзіміра Завітневіча, ваяводы кіеўскага Адама Кісяля і другіх ураджэнцаў Уздзеншчыны, якія пакінулі значны след у навуцы, літаратуры, культуры.

Роднаму краю была прысвечана кніга “На истоках неманских”, якая пабачыла свет у 1985 годзе, а гадамі пазней выйшлі дапоўненыя выданні “Пуцявінамі Наднямоння”[585], якое аўтар лічыць галоўным зборнікам сваіх даследаванняў[586].

Краязнаўчы кампанент ў навуковай дзейнасці стаў складаючым для літаратуразнаўца, публіцыста, гісторыка, кандыдата філасофскіх навук (1980) Уладзіміра Маісеевіча **Ліўшыца** (01.02.1946, в. Красны Кут Саратаўскай вобл.). Доўгі час працаваў выкладчыкам Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (БДСГА), стаў заснавальнікам і дырэктарам Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея (1998–2005), музея-кабінета М. Гарэцкага. З 1970 па 1984 гг. надрукаваў шмат артыкулаў па гісторыі Горак і акадэміі ў рэспубліканскім, абласным і раённым перыядычным друку. На аснове іх была складзена і выдадзена кніга “Горки. Историко-экономический очерк” (1984, 2-е выданне, 1989), “Белорусская сельскохозяйственная академия: Памятники и памятные места” (1990), “Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей: даведнік” (1991), “Горки и окрестности: справочник-путеводитель” (1993), “Горацкай зямлі адважныя сыны” (1994), “Ішло ў бяссмерце горацкае гетта…” (1995), “Летапіс горада Горкі” (1995) і іншыя.

Важнае месца ў даследаваннях У. Ліўшыца належыць літаратуразнаўчаму краязнаўству і вызначэнне сувязей з Горкамі расійскіх пісьменнікаў: Г. Дзяржавіна, М. Чарнышэўскага, І. Тургеньева, Л. Талстога, А.П. Чэхава; беларускіх і савецкіх пісьменнікаў, якія вучыліся, працавалі ці нарадзіліся ў Горках: М. Гарэцкага, Л. Чарняўскай, С. Фаміна, Ю. Гаўрука, М. Ганчарыка, А. Вечара, Н. Тулупава, В. Каваля, М. Булахава, А. Каршунова, Г. Шчарбатава і Л. Разгона. Вынікі даследаванняў абагульнены ў кнігах і брашурах, выдадзеных пазней: “Раскопкі вакол горацкага «Парнаса»”. Метадычны матэрыял і парады ў дапамогу прапагандыстам кнігі” (1992), “Максім Гарэцкі – жыццё і творчасць” (1993); “Літаратурны музей Максіма Гарэцкага. Кароткі даведнік” (1997); “Сын вёскі. Кароткі нарыс аб жыцці і дзейнасці пісьменніка Васіля Каваля” (1997), “Даследчык беларускай літаратуры. Кароткі нарыс аб жыцці і творчасці літаратуразнаўцы Барыса Іофэ” (1999), “Раскопкі вакол горацкага «Парнаса»”. Літаратуразнаўчыя нарысы” (2001). Усяго У. Ліўшыц з’яўляецца аўтарам больш за 50 кніг і брашур, 650 артыкулаў па

Репозиторий ВГУ

---

585 Киселев, В.Н. На истоках Неманских: Очерки / В.Н. Киселев. – Мінск: “Полымя”, 1985. – 111 с.; Ён жа. Пуцявінамі Наднямоння. – Мінск: “Полымя”, 1994. – 303 с.; Ён жа. Наднёманскімі пуцявінамі. – Мінск: В.П. Ильин, 2009. – 403 с.

586 Вядомы даследчык, краязнавец і літаратар Уладзімір Кісялёў адзначыў свой 80-гадовы юбілей [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://news.21.by/culture/2011/05/26/307547.html – Дата доступу: 04.05.2015.

філасофіі, паліталогіі, сацыялогіі, педагогіцы, правазнаўстве, гісторыі дзяржавы і права, гісторыі Горак, гісторыі аграрнай адукацыі і навукі Беларусі, гісторыі БДСГА, этнаграфіі і літаратуразнаўстве[587].

У свой час У. Ліўшыц стаў арганізатарам і старшынёй Горацкага раённага краязнаўчага таварыства "Бацькаўшчына", Горацкага раённага культурна-асветніцкага яўрэйскага таварыства імя Б. Іофэ. У 1992 г. выступіў ініцыятарам і адным з арганізатараў правядзення ў Горках Першых Гарэцкіх навуковых чытанняў (1992).

Асобна ў гісторыі краязнаўства Віцебска стаіць імя педагога, краязнаўцы, кандыдата педагагічных навук (1971) Міхаіла Сцяпанавіча **Рыўкіна** (1931–2010). У 1953 г. скончыўшы ВДПІ імя С.М. Кірава, ён працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 3 г. Віцебска, а потым на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта кафедры педагогікі ВДПІ імя С.М. Кірава (ВДУ імя П.М. Машэрава) (1971–2002).

На працягу паловы стагоддзя (з 1954 г.) прадметам цікавасці вучонага стаў цэлы шэраг тэм: краязнаўства ў навучанні гісторыі, пазакласная краязнаўчая праца па гісторыі, методыка школьнага гістарычнага краязнаўства, школьны турызм і краязнаўства, эстэтычнае выхаванне і краязнаўства, археалогія Віцебшчыны, гісторыя і культура Віцебска, край у гады Вялікай Айчыннай вайны, славутыя землякі і інш. Асобна даследавалася тэма краязнаўства ў піянерскім лагеры. На працягу шэрага гадоў разам з дзецьмі удзельнічаў у археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам Л.В. Аляксеева.

З вынікамі сваёй працы выступаў на саюзных рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх педчытаннях і навукова-практычных канферэнцыях. Распрацаваў методыку выкладання гісторыі БССР у школьным курсе гісторыі СССР, якая стала пазней тэмай дысертацыйнага даследавання: "Преподавание истории союзной республики в школьном курсе истории СССР (на материале VII–VIII классов школ Белорусской ССР)" (1971). Аўтар артыкулаў у педагагічным друку па вывучэнні гісторыі, выкарыстанні краязнаўства ў школе[588], гісторыі горада Віцебска[589].

Репозиторий ВГУ

---

[587] Пугач, А. Старэйшына краязнаўчага цэху Магілёўшчыны / А. Пугач // Краязн. газ. – 2006. – № 4, студз. – С. 6.

[588] Ривкин, М.С. Из опыта внеклассной краеведческой работы по истории / М.С. Ривкин. – М.–Л.: Академия педагогических наук, 1961. – 40 с.; Ён жа. Эстэтычнае выхаванне вучняў у краязнаўчай рабоце па гісторыі. – Мінск: Вучпедвыд БССР, 1963. – 72 с.; Ён жа. Скарыстанне краязнаўчага матэрыялу на уроках гісторыі СССР. – Мінск: Нар. асвета, 1965. – 154 с.; Вывучэнне гісторыі БССР у 7–8 класах. – Мінск: Нар. асвета, 1968. – 143 с.; Ён жа. Витебск (по страницам истории): метод. пособие. – Витебск: ВОБ, 1974. – 29 с.; Ён жа. (тры главы па гістарычным краязнаўстве) // Методика обучения в средней школе. – Ч. 2. – М., 1978.

[589] Ривкин, М.С. Витебск. Площадь Победы / М.С. Ривкин. – Мінск: Полымя, 1978; Ён жа. Юдэль (Юрий) Пэн. Художник и педагог / А. Шульман. – Витебск: Типография витебского телезавода, 1994. – 72 с.; Ён жа. Витебск в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.).: библиографический указатель / Д.Н. Генина. – Витебск: ЦГБ им. М. Горького, 1995; Ён жа. Породненные войной / А. Шульман. – Витебск: ВОТ, 1997. – 61 с.; Ён жа. Наш вечный дом (из истории еврейских кладбищ в Витебске) / А.М. Падліпскі. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2003. – 80 с.; Вечная память: справочник / сост.: М. Рывкин, А. Шульман. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2003. – Ч. 2. Евреи – жертвы нацизма,

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. з’яўляўся сябрам камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Віцебскім гарвыканкаме. У артыкулах “Ля апошняй мяжы” (“Як гінуць помнікі” і “Што і чаму страчваем” апублікаваных у газеце “Віцебскі рабочы” ў чэрвені 1990 года) адным з першых узняў праблему знішчэння помнікаў гісторы і культуры, якасці рэстаўрацыйных работ у Віцебску.

М. Рыўкіну належыць вялізная роля ў арганізацыі святкавання 1000-годдзя Віцебска ў 1974 годзе. Па даручэнні гаркама партыі меў камандзіроўку ў Маскву, у інстытут археалогіі АН СССР. Сустракаўся з акадэмікам Б.А. Рыбаковым з нагоды ўдакладнення даты заснавання Віцебска. Аднавіў гісторыю бацькоўскага дома М. Шагала. Першым з даследчыкаў знайшоў архіўны дакумент (прашэнне бацькоў М. Шагала на будаўніцтва дома), які пераканаўча даказваў, што дом на вул. Пакроўскай сапраўды належаў сям’і Шагалаў. Гэтая падзея стала адной з падстаў прыняцця рашэння гарвыканкамам аб стварэнні ў гэтым будынку Дома-музея М. Шагала.

Браў удзел у падрыхтоўцы выдання “Витебск: энциклопедический справочник”. З’яўляўся членам гарадской камісіі па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі “Памяць” г. Віцебска, аўтар некаторых артыкулаў у ёй. Займаўся даследаваннем Халакосту на Віцебшчыне ў гады Другой сусветнай вайны. Па матэрыялах архіва Яд-Вашэм у Ерусаліме склаў спіс яўрэяў (930 прозвішчаў), забітых фашыстамі ў Віцебску ў 1941–1944 гг. Удакладніў спіс разам з А. Шульманам па мясцовых крыніцах. Разам з А. Падліпскім правёў значную працу па добраўпарадкаванні Стараўланавіцкіх могілак. Большасць артыкулаў краязнаўцы сабрана ў кнізе, выдадзенай у Віцебску ўжо пасля ягонай смерці[590].

Справай жыцця Ніны Іванаўны **Дарафеенка** (Маісеевай) (1923–2015) стала гісторыя партызанскага і падпольнага руху супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Віцебшчыны, адкрыццё праўды і ўшанаванне памяці пра подзвіг віцебскіх падпольшчыкаў.

Былая падпольшчыца і партызанка, працуючы выкладчыкам на кафедры гісторыі і эканамічнай тэорыі ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С.М. Кірава (1962–1980), сабрала значную колькасць матэрыялаў, на аснове якіх падрыхтавала і абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі і дзейнасці віцебскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1967), абапіраючыся на якую быў складзены і зацверджаны спіс удзельнікаў віцебскага падполля. Працавала ў архіве, правяла апытанне і інтэрв’юіраванне некалькіх соцень чалавек,

---

погибшие в оккупированном Витебске в 1941–1944 гг. – 64 с.; Ён жа. Хроника страшных дней. Трагедия Витебского гетто / А. Шульман. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2004. – 151 с.

[590] Рывкин, М.С. Краеведческие очерки и статьи [сост., предисл., и примеч. А.М. Подлипский] / М.С. Рывкин. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2011. – 159 с.



Репозиторий ВГУ

запісала ўспаміны. На аснове сабраных матэрыялаў напісала кнігу (разам з М.І. Пахомавым і М.У. Дарафеенка) “Витебское подполье”[591].

Даследаванні Н.І. Дарафеенка вярнулі светлае імя многім людзям, на якіх ляжаў цень падазрэння. Мікалай К., сын загінуўшага падпольшчыка, пісаў ёй: “Вы, як сонца, увайшлі ў наш дом, прынеслі праўду і радасць пра нашага бацьку. Многа гадоў мы былі прыгнечаны думкай, хаця цвёрда верылі і ведалі, што прыйдзе час, і праўда пераможа”. Высветлілася, што многія падпольшчыкі ўзнагароджаны, але не ведаюць пра гэта. Тыя, што яшчэ жылі, атрымалі ўзнагароды. Менавіта дзякуючы працы даследчыцы ў Віцебску былі адкрыты помнікі і мемарыяльныя дошкі падпольшчыкам[592].

Часта сустракаючыся з дзецьмі, яна шмат разоў чула пытанне: ці ўдзельнічалі ў вайне дзеці і падлеткі? Н.І. Дарафеенка прывяла некалькі прыкладаў. А пасля распачала сур’ёзнае даследаванне, да якога прыцягнула студэнтаў. Яны шукалі герояў-юнакоў – удзельнікаў падпольнай і партызанскай барацьбы па сваіх раёнах. Яна апрацоўвала інфармацыю. На матэрыялах вялікай пошукавай працы была падрыхтавана і выдадзена кніга “Юные герои Витебщины”[593], прысвечаная падлеткам і юнакам Віцебшчыны – удзельнікам антыфашысцкага супраціву. У форме нарысаў у ёй апісаны лёсы больш за 120 юных змагароў. Прадмову да выдання напісаў Васіль Быкаў[594]. Даследчыца брала ўдзел у падрыхтоўцы экспазіцый Віцебскага абласнога краязнаўчага музею, прысвечаных гісторыі партызанскага руху на Віцебшчыне. Распрацоўвала тэму і выступала з лекцыямі “Працоўныя Віцебска і Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны”.

Шчыльна звязанае з гістарычным, літаратурнае краязнаўства на Брэстчыне старанна вывучала Вера Якаўлеўна **Ляшук** (01.11.1933). Скончыўшы Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (1959), яна працавала настаўніцай у Дамачаўскай і Камароўскай сярэдніх школах Брэсцкага раёна. З 1963 г. пачала працаваць на кафедры беларускай літаратуры ў Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А.С. Пушкіна. З 1980 па 1985 год займала пасаду дэкана філалагічнага факультэта. Кандыдат філалагічных навук (1987), прафесар (1991), член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі (1995), заслужаны работнік вышэйшай школы БССР.

591 Дорофеенко, Н. Витебское подполье / Н. Дорофеенко, Н.И. Дорофеенко, М.И. Пахомов. – Минск: Беларусь, 1974. – 248 с.

592 Дулаў, А.М. Гісторыя віцебскага падполля ў працах Н.І. Дарафеенка / А.М. Дулаў // Вклад белорусского народа в Великую Победу: материалы респ. науч.-практ. конф., Минск, 27 нояб. 2009 г. / редкол.: Е.А. Гребень (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГАТУ, 2010. – С. 88–95.

593 Дорофеенко, Н. Юные герои Витебщины / Н. Дорофеенко, В.Г. Скопа, Т.И. Глинка, Г.М. Акентьев. – Минск: Нар. асвета, 1980. – 127 с.

594 Дулаў, А.М. Н.І. Дарафеенка – удзельніца руху супраціўлення і даследчыца Віцебскага падполля // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрв. 2009 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2009. – С. 117–128.



Репозиторий ВГУ

З’яўляецца аўтарам вучэбных дапаможнікаў і манаграфій: ”Краязнаўчы матэрыял на ўроках літаратуры” (1980), “Літаратурнае краязнаўства ў школе” (1991). Значны вопыт працы і матэрыялы, назапашаныя на працягу выкладчыцкай дзейнасці, ляглі ў аснову кніг, выдадзеных пазней: “Літаратурная Берасцейшчына”[595], “«Літаратурныя старонкі» гісторыі Лунінеччыны”[596].

Шлях да краязнаўства архівіста Канстанціна Мікалаевіча **Коласава** (1917–1977) быў доўгім. Дваццаць гадоў ён служыў ва Узброеных сілах СССР (1938–1958), а пасля выхаду ў адстаўку працаваў дырэктарам Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (1958–1977). У большасці архіўных устаноў кіраўнікі галоўным чынам займаюцца гаспадарчымі і адміністрацыйнымі справамі. Але К.М. Коласаў знаходзіў час для асабістай працы з матэрыяламі, публікацый, актыўнай грамадскай справы, выступленняў на радыё, у калектывах. Надрукаваў больш за 75 артыкулаў у мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку. З яго ўдзелам падрыхтаваны і праведзены 20 радыёперадач і 30 тэлеперадач, у якіх асвятляліся розныя тэмы па гісторыі Віцебшчыны: “Этапы рэвалюцыі”, “Герой шабельных паходаў” [пра І.Ф. Шубіна], “Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі пры вызваленні Віцебска”, “На рубяжы ХХ стагоддзя” (з гісторыі Віцебска), “Першыя крокі” (да 40-годдзя Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа) і інш. Такім чынам, К. Коласаў унёс істотны ўклад у арганізацыю работы па папулярызацыі гісторыі горада праз сродкі масавай інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне, фотавыстаўкі).

Кандыдат біялагічных навук (1972) Анатоль Максімавіч **Дарафееў** (1941–2010) займаў вельмі высокія пасады. Напрыклад, з 1990 па 1994 г. ён быў старшынёй Дзяржкамітэта па экалогіі, а потым першым міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. З 1994 па 2002 г. ён з’яўляўся першым прарэктарам ВДУ імя П.М. Машэрава. Яго імя ўпісана ў гісторыю навукі, экалогіі і адукацыі нашай краіны. Але важнейшай справай свайго жыцця ён лічыў краязнаўства.

Краязнаўчую дзейнасць распачаў, калі быў студэнтам Віцебскага педінстытута імя С.М. Кірава. Вялікі ўплыў на фарміраванне поглядаў і цікавасці да краязнаўчых даследаванняў зрабіў загадчык кафедры заалогіі ВДПІ Анатоль Іванавіч Радкевіч. Праводзіў комплекснае вывучэнне Віцебшчыны, аддаючы перавагу некаторым пытанням прыродазнаўчага, літаратурнага, гістарычнага краязнаўства. Даследаваў становішча нацыянальных меншасцяў Віцебшчыны. З’яўляўся арганізатарам мемарыялізацыі мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю выдатных

[595] Ляшук, В.Я. Літаратура Берасцейшчыны / В.Я. Ляшук, Г.М. Снітко. – Брэст: Лаўроў, 1999. – 373 с.; Ляшук, В.Я. Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я. Ляшук, Г.М. Снітко. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2008. – 319 с.

[596] Зарэцкая, В.Я. Зарунела літаратурная ніва…: “Літаратурныя старонкі” гісторыі Лунінеччыны: дадатак да альманаха “Лунінецкая муза” / В.Я. Зарэцкая. – Лунінец, 2008. – 28 с.

землякоў – Я. Баршчэўскага, К. Вераніцына, Я.К. Мароза, П.М. Машэрава, палкоўніка У.М. Карпава і інш. Аказаў дапамогу ў стварэнні экспазіцыі аддзелаў прыроды і этнаграфіі ВАКМ, Гарадоцкага, Расонскага, Полацкага краязнаўчых музеяў. Актыўны ўдзельнік навуковага жыцця краіны. Арганізатар і ўдзельнік Міжнародных арніталагічных кангрэсаў, Усесаюзных, рэспубліканскіх заалагічных і арніталагічных канферэнцый. Ініцыятар і арганізатар правядзення літаратурна-краязнаўчых і навуковых міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцый і чытанняў, прысвечаных Я. Баршчэўскаму, паэме "Тарас на Парнасе", "Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў" і іншых мерапрыемстваў. Ініцыятар і арганізатар правядзення шматлікіх прырода-літаратурна-краязнаўчых экспедыцый па Віцебшчыне. Ініцыятар стварэння Нацыянальнага парка "Браслаўскія азёры", ландшафтных, паляўнічых, батанічных заказнікаў на Беларусі і Віцебшчыне ў прыватнасці.

Выдатны знаўца Віцебшчыны і наваколляў Віцебска. У 70–80-я гады XX ст. актыўна ўдзельнічаў у працы Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК, з'яўляўся Ганаровым членам Беларускага таварыства аховы прыроды (1979, 1991). Дзякуючы яго актыўным намаганням быў захаваны для нашчадкаў помнік археалогіі гарадзішча "Буракова" ў Гарадоцкім раёне, хоць і ў пашкоджаным стане. Даследаваў дзейнасць і лёс выдатных выпрабавальнікаў (натуралістаў)-віцяблян, калекцыі У.А. Плюшчэўскага-Плюшчыка.

Аўтар больш за 150 навуковых прац па арніталогіі, ахове прыроды і методыцы выкладання заалогіі, у тым ліку 7 кніг, адказны рэдактар і ўкладальнік 10 зборнікаў, 2 прэс-рэлізаў. Аўтар некалькіх артыкулаў у кнізе "Памяць" Гарадоцкага раёна[597]. Меў больш за 120 сшыткаў дзённікавых запісаў. У рукапісах знаходзяцца дзённікі экалагічных назіранняў (1959–2009), "Акварэлі прыроды" (12 кніжак нарысаў аб прыродзе). У мясцовым і рэспубліканскім друку змяшчаліся шматлікія артыкулы, прысвечаныя экалогіі, гісторыі і культуры Віцебшчыны. Шэраг матэрыялаў (кнігі, копіі артыкулаў, некаторыя калекцыі і інш.) перадаў у ВАКМ, Гарадоцкаму раённаму, Лепельскаму, Полацкаму, Расонскаму краязнаўчым музеям, экалагічнаму музею Краснапольскай СШ Расонскага раёна.

Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2000), доктар біялагічных навук (1996), прафесар (1997) Андрэй Георгіевіч **Майсяёнак** з'яўляецца не толькі вядомым беларускім вучоным у галіне біяхіміі і вітаміналогіі, але і гісторыкам медыцыны і краязнаўцам. Нарадзіўся ў Глыбокім (01.06. 1943), выхоўваўся ў сям'і ўрача. Атачэнне, лад жыцця спрыялі фарміраванню любові да Радзімы, цікавасці да яе гісторыі і культуры. Скончыў

[597] Язэп Драздовіч на Гарадоччыне // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў / укл. С.У. Садоўская. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 164–165; Гарадоцкая старонка з жыцця пісьменніка А. Пшчолкі // Тамсама. – С. 215–218; Палкоўнік артылерыі Каразееў Г.П. // Тамсама. – С. 416–417.



Репозиторий ВГУ

Гродзенскі медыцынскі інстытут (1968), абараніў кандыдацкую дысертацыю (1971). Працаваў у мединстытуце. З 1970 г. – вучоным сакратаром, загадчыкам лабараторыі, намеснікам дырэктара па навуковай працы, в.а. дырэктара аддзела рэгуляцыі і абмену рэчываў АН БССР, (з 1980 г. Інстытута біяхіміі АН БССР (г. Гродна)). Аўтар больш за 500 навуковых прац, 6 манаграфій, 15 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы.

Звязаўшы жыццё з Гроднам, А.Г. Майсяёнак актыўна вядзе актыўную грамадскую і краязнаўчую працу. У час "перабудовы" ён стаў адным з арганізатараў краязнаўчай працы на Гродзеншчыне (канец 1980-х – 1990-я гг.). З 1989 па 1996 г. з'яўляўся намеснікам старшыні камісіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў па навуцы, культуры і адукацыі, а з 1989 г. – старшынёй Гродзенскай краязнаўчай асацыяцыі. У рамках праграмы "Наш радавод" пры Гродзенскім абласным аддзяленні БФК А.Г. Майсяёнак стаў адным з арганізатараў Браслаўскіх, Дзісненскіх, Навагрудскіх краязнаўчых чытанняў. Аўтар ідэі стварэння беларускага фонду А. Міцкевіча.

Аўтар артыкулаў пра вядомых землякоў у кнігах "Памяць" г. Гродна, а таксама Браслаўскага, Глыбоцкага, Мёрскага, Шаркаўшчынскага раёнаў[598]. Даследаваў малавядомыя старонкі жыцця Я. Драздовіча (адным з першых прыцягнуў увагу да жыцця і лёсу "вечнага вандроўніка", удакладніў шэраг фактаў з яго біяграфіі, час, месца і абставіны смерці), ураджэнца в. Чарневічы (Глыбоччына), камбрыга, каменданта г. Ленінграда П.В. Пугачэўскага, медыкаў з Глыбоччыны У. Шырана і М. Алехны-Гушчы і інш. Перадаў шэраг рэчаў і кнігазбораў у Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей, Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі.

Артыкулы на краязнаўчую тэматыку друкаваліся ў рэспубліканскіх ("Свіцязь", "Чырвоная змена", "Краязнаўчая газета") і мясцовых ("Браслаўская звязда", "Веснік Глыбоччыны", "Кліч Радзімы", "Мёрскія навіны") перыядычных выданнях.

Выступіў ініцыятарам усталявання помнікаў С. Нарбуту і Грунвальдскай бітве ў Гродне. Браў удзел у стварэнні музея-аптэкі ў Гродне. Перадаў туды лекі міжваеннага часу, якія захоўваў бацька. Некаторыя матэрыялы перадаў у Музей гісторыі медыцыны.

[598] Генерал з Чарневіч [Пугачэўскі П.В.] // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. – Мінск: БелЭн, 1995. – С. 164–165; Крыжовы шлях лекараў з Глыбоччыны // Тамсама. – С. 173–174; Светаадчуванне і жыццёвы шлях Э. Плятар // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск, 1998. – С. 174–179; Станіслаў Нарбут // Тамсама. – С. 202–206; Вянцэслаў Пелікан // Тамсама. – С. 209–210; Доктар Шыран з вёскі Лужкі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: Белта, 2004. – С. 144–146.

## 5.3 Дзейнасць краязнаўцаў-аматараў. Асаблівасці дзейнасці краязнаўцаў-аматараў у 1961–1991 гг.

Важную ролю ў развіцці гістарычнага краязнаўства адыгралі **краязнаўцы-аматары.** Людзі розных прафесій, якія не мелі, як правіла гістарычнай адукацыі, яны тым не менш сваімі даследаваннямі, пошукам і вывучэннем матэрыялаў, публікацыямі ў рэспубліканскім і мясцовым друку ўнеслі значны ўклад у развіццё гістарычнай навукі, дапаможных гістарычных дысцыплін, выхаванне патрыятызму, гістарычнай свядомасці, сацыялістычнага інтэрнацыяналізму і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Сярод аматараў-даследчыкаў было шмат людзей, для якіх збор матэрыялаў, палявыя даследаванні, публікацыя артыкулаў і папулярызацыя ведаў станавіліся галоўнай мэтай жыцця. Менавіта такія падзвіжнікі-адзіночкі былі той сілай, якая пашырыла краязнаўчы рух, надала яму сапраўдную масавасць.

Значны ўклад у развіццё краязнаўства Беларусі з 1961 па 1980-я гг. зрабілі У.А. Калеснік, М.П. Клімец, А.М. Мартынаў (Брэсцкая вобласць), М.А. Маніс, І.П. Дэйніс, А.М. Падліпскі, М.Х. Плавінскі, М.У. Паўлаў, К.С. Шыдлоўскі, В.А. Ермалёнак, А.Э. Райчонак (Віцебская вобласць), У.М. Верамейчык, Ф.Р. Шкляраў (Гомельская вобласць), А.М. Белакоз, Э.С. Корзун, М. Ляпеха, А. Палубінскі, М. Петрыкевіч, В. Супрун, У.А. Урбановіч, А. Цыхун (Гродзенская вобласць), І.І. Філіповіч, М.Ф. Мельнікаў (Магілёўская вобласць), А.М. Карлюкевіч, В. Аляшковіч, Р. Родчанка (г. Мінск і Мінская вобласць) і іншыя.

Знаўцам гісторыі і культуры Кобрына з’яўляўся Аляксей Міхайлавіч **Мартынаў** (1904–1999). Скончыўшы толькі Кобрынскае прыходскае вучылішча, ён самастойна вывучыў і добра валодаў англійскай, французскай, нямецкай, польскай, украінскай мовамі, эсперанта. Займаўся літаратурнай дзейнасцю, вёў перапіску з М. Алданавым, М. Арцыбашавым, М. Асаргіным, І. Буніным. Стаў арганізатарам і дырэктарам першай у Кобрыне гарадской бібліятэкі, першым і шматгадовым (32 гады) дырэктарам музея імя А.В. Суворава[599]. Звязваўся з рознымі музеямі СССР, ездзіў у Ізмаіл, іншыя гарады, каб атрымаць матэрыялы пра жыццё і дзейнасць А.В. Суворава. Узначальваў Кобрынскае аддзяленне БДТАПГіК (1965–1972), пры яго ўдзеле да 30-годдзя вызвалення БССР былі ўсталяваны 24 абеліскі і мемарыяльныя дошкі ў памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны на Кобрыншчыне. Чалавек энцыклапедычных ведаў, А. Мартынаў не абмяжоўваўся толькі “сувораўскай” і “ваеннай” тэматыкай у сваіх даследаваннях і комплексна вывучаў Кобрыншчыну. Вынікі росшукаў былі апублікаваны ў артыкулах у рэспубліканскім і мясцовым

[599] Рысь, А. Захавальнік гісторыі [Электронны рэсурс] / А. Рысь // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: http://ikobrin.ru/martinov-104.php. – Дата доступу: 30.07.2015.



Репозиторий ВГУ

друку[600].

Станіслаў Аляксандравіч **Шчарбакоў** (21.02.1940) доўгі час працаваў на пасадзе дырэктара Баранавіцкага краязнаўчага музея. У 1972 годзе закончыў гістарычны факультэт Кубанскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У гэтым жа годзе пачаў працаваць навуковым супрацоўнікам у Баранавіцкім краязнаўчым музеі, а з 1985 года – дырэктарам. У мэтах папулярызацыі краязнаўчых ведаў і музейнай справы шмат выступаў у СМІ. У 1989 г. была выдадзена яго кніга “Барановичи”[601]. Пазней былі падрыхтаваны кнігі “Барановичи. Страницы истории”[602], “Барановичи на старых открытках и фотографиях” (2002)[603]. За гады працы ў краязнаўчым музеі С. Шчарбакоў падрыхтаваў і надрукаваў дзясяткі артыкулаў па гісторыі краю, прымаў удзел у выданні кнігі “Памяць. Баранавічы. Баранавіцкі раён”[604].

Беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, Аляксей **Карпюк** (1920–1992) вядомы як аўтар твораў пра жыццё Заходняй Беларусі ў першай паловы ХХ ст. Аповесць “Данута”, раман-быль “Вершалінскі рай” і іншыя творы напоўнены фактамі і звесткамі па гісторыі краю, што робіць іх своеасаблівымі краязнаўчымі помнікамі. Сярод выдадзеных кніг аповесцей і апавяданняў А. Карпюка ёсць дакладна краязнаўчыя: нарыс “Мая Гродзеншчына” (1960), “След на зямлі: Скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны” (1972). А яшчэ дзясяткі артыкулаў у перыядычным друку, такія грунтоўныя, як напрыклад, эсэ, прысвечанае гісторыі гродзенскіх мастоў[605]. Арганізацыйная дзейнасць на пасадах кіраўніка абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР, дырэктара Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі ў Гродне (1977–1981), загадчыка агенцтва “Інтурыст” спрыяла разгортванню краязнаўчых даследаванняў і далучэння да іх шырокага кола прадстаўнікоў інтэлегенцыі Гродзеншчыны.

Слонімскі краязнаўца Васіль Рыгоравіч **Супрун** (1926–2007) у 1947 г. быў арыштаваны і асуджаны на 25 год пазбаўлення волі і 5 гадоў пазбаўлення правоў за антысавецкую дзейнасць. Пасля вызвалення ў 1956 г. вярнуўся ў Слонім. Скончыў гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1969), аднак, працаваць па спецыяльнасці не дазволілі, таму 25 год адпрацаваў на будаўніцтве. Улады нават патрабавалі, каб В. Супрун пакінуў Беларусь. Нейкі час пражыў у Алушце (Крым), а затым пераехаў у

---

600 Спіс публікацый А. Мартынава [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: http://ikobrin.ru/martinov-102.php. – Дата доступу: 30.07.2015.

601 Щербаков, С.А. Барановичи: на русск. и фин. яз. / С.А. Щербаков, А.В. Примшиц. – Минск: Полымя, 1989. – 84 с.

602 Щербаков, С. Барановичи. Страницы истории: [части 1–10, посвящ. первым семидесяти годам городской истории \1871–1941 гг.\] / С. Щербаков. – БКМ, 1996. – Машинопись, ксерокс.

603 Щербаков, С.А. Барановичи на старых открытках и фотографиях I пол. XX в. – БКМ, 2002. – 89 с.

604 Шчарбакоў, С.А. Персанальная бібліяграфія [Электронны рэсурс] / С.А. Шчарбакоў // Кзбай. – Рэжым доступу: http://kzbydocs.com/docs/3602/index-6667.html. – Дата доступу: 11.09.2015.

605 Карпюк, А. З гісторыі гродзенскага маста, 1392–1944 гг. / А. Карпюк // Беларусь. – 1983. – № 2. – С. 22–25.



Рэпазіторый ВДУ

Брэст, дзе працаваў старэйшым навуковым супрацоўнікам па помніках у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі (1968–1969), пасля чаго зноў вярнуўся ў Слонім, дзе працаваў будаўніком. У вольны час вывучаў археалагічныя помнікі краю. З 1963 па 1970-я гг. даследаваў, выявіў і апісаў каля 200 старажытных стаянак, селішчаў, гарадзішчаў, курганных і бескурганных могільнікаў у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Разглядаў этнічныя пытанні і праблемы гісторыі архітэктуры сярэднявяковай Беларусі. З краязнаўчымі матэрыяламі стаў выступаць пачынаючы з 1960 г. На аснове назапашаных матэрыялаў у 1990-я гг. былі выдадзены кнігі гісторыка-краязнаўчых нарысаў "За смугою часу" (1994), "Дзеі над Шчарай"[606] (2000), "100 пытанняў і адказаў з гісторыі Слонімшчыны" (2002) і аўтабіяграфічныя "Штрыхі з успамінаў" (2003)[607].

Выдатным знаўцам Гродзеншчыны з'яўляўся педагог, краязнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі Аляксандр Сямёнавіч **Палубінскі** (1921–2007). Пад час працы настаўнікам, дырэктарам у Стоцкай, Велікасельскай школах, Свіслацкай школе-інтэрнаце (1960–1972), Свіслацкай СШ, навуковым супрацоўнікам Свіслацкага гісторыка-краязнаўцага музею, ён шмат зрабіў для захавання і прапаганды гісторыка-культурнай спадчыны белавежскага краю. Шмат А.С. Палубінскі зрабіў для стварэння Свіслацкага гісторыка-краязнаўчага музея[608]. Заснаваў у СШ № 1 музей гісторыі школы[609]. Доўгі час працаваў адказным сакратаром Свіслацкай раённай арганізацыі БДТАПГіК (1970–1990). Меў стасункі з архівамі Мінска, Гродна, Вільнюса, Варшавы, Кракава, Беластока. Прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы раённай кнігі "Памяць", аўтар шэрага матэрыялаў у ёй. Друкаваўся ў рэспубліканскім і мясцовым друку. Сталы аўтар "Свіслацкай газеты" (з 1949 г.). Адзін з ініцыятараў стварэння Алеі памяці ў Свіслачы.

Выдатным знаўцам і аматарам творчасці Ф. Багушэвіча, самаахвярным захавальнікам Кушлянскай сядзібы з'яўляўся Міхал Сымонавіч **Ляпеха** (1903–1992). Атрымаўшы пачатковую адукацыю ў польскай школе, ён з 1945 г. працаваў майстрам па выкапцы вапны ў Смаргонскім раёне. Высветліў месцазнаходжанне сядзібнага дома Ф. Багушэвіча ў в. Кушляны, арганізаваў яго выкарыстанне ў якасці бібліятэкі. Стаў першым бібліятэкарам і вартаўніком Кушлянскай бібліятэкі. На колькі было цяжка працаваць у пасляваенныя гады, але М. Ляпеха заставаўся на сваёй пасадзе да 1951 года[610]. Потым працаваў

---

[606] Супрун, В.Р. Дзеі над Шчарай: З гісторыі зямлі Слонімскай / В.Р. Супрун. – Слонім: ГАУПП "Слонімская друкарня", 2000. – 168 с.

[607] 10 сакавіка нарадзіўся Васіль Супрун [Электронны рэсурс] // Слонімблог. – Рэжым доступу: http://slonimblog.net/?p=7092. – Дата доступу: 23.03.2015.

[608] Культурные традиции Свислоччины [Электронны рэсурс] // Свислочский район. – Рэжым доступу: http://uctopuk.info/regions/svisloch/history/?id=753. – Дата доступу: 09.11.2015.

[609] Полубинский Александр Ссеменович [Электронны рэсурс] // Гісторыя Свіслацкага краю. – Рэжым доступу: http://istoriya-sv.ucoz.ru/index/polubinskij_aleksandr_semenovich/0-36. – Дата доступу: 21.04.2015.

[610] Камароўская, Т.А. "Альбом гісторыі адкрыты" (з гісторыі развіцця бібліятэчнай справы на



Рэпазіторый БДУ

загадчыкам дома-музея Ф. Багушэвіча да 1988 г. На грамадскіх пачатках на працягу амаль сарака гадоў праводзіў рамонтна-рэстаўрацыйныя і ахоўныя работы, збіраў матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменніка, стварыў мемарыяльную экспазіцыю, арганізоўваў экскурсійны агляд сядзібнага комплекса. Быў вельмі дасціпным чалавекам, вёў экскурсіі з гумарам. Рыфма “Во будзе смеху, калі памрэ Ляпеха”[611] так і засталася гумарам. Музей Ф. Багушэвіча створаны намаганнямі краязнаўцы існуе і цяпер.

Выдатным краязнаўцам Міншчыны ў вывучаемы перыяд з’яўляўся Уладзімір Ільіч **Содаль** (1937–2015). Першыя свае апавяданні апублікаваў у 1955 годзе ў газеце “Піянер Беларусі”. Даследаваў беларускую літаратуру і культуру XIX–XX ст., канцэнтруючы ўвагу на жыццёвым і творчым шляху В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, М. Багдановіча, Ядвігіна Ш., Зоські Верас і інш. Вынікі сваіх даследаванняў апублікаваў у кнігах “Людзьмі звацца” (1977), “Пуцявінамі сейбіта” (1982), “Кушлянскі кут”, “Сцежкамі Мацея Бурачка” (абедзве 1990), “Жупранская старонка” (1992) і іншых, выдадзеных у пазнейшы час. Распрацаваў навучальныя дыяфільмы “Праўдашукальнік” (пра Ф. Багушэвіча), “Дудар Беларускі” (пра В. Дуніна-Марцінкевіча), “Кастусь Каліноўскі”. Стаў укладальнікам зборнікаў твораў Францішка Багушэвіча: “Мая дудка” (1987), “Каму дудка паслушна” (1990), “Францішак Багушэвіч. Творы” (разам з Я. Янушкевічам, 1991). Аўтар сцэнарыяў навучальных дыяфільмаў пра Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага і інш. З’яўляўся актыўным удзельнікам грамадскага жыцця краіны. Удзельнік Установчага з’езду БНФ, ТБМ, адзін з падпісантаў ліста творчай інтэлігенцыі ў ЦК КПСС аб стане беларускай мовы ў рэспубліцы[612].

Рыгор Віктаравіч **Родчанка** (1919–1994), выдатны знаўца Случчыны, фальклрарыст, літаратуразнаўца, паэт. Служыў на флоце, а пасля выхаду ў адстаўку па стану здароўя, жыў у Слуцку. Скончыў ваенна-фінансавае вучылішча, а потым завочна атрымаў вышэйшую адукацыю і працаў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Вывучаць родны край, як і публікаваць вынікі своіх росшукаў, Р. Родчанка пачаў у 1959 г. (з пачаткам сталага жыцця ў Слуцку)[613]. Да сыходу з жыцця ён надрукаваў сотні артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым друку. Але сотні артыкулаў, гэта не галоўны вынік працы Р. Родчанкі. Здаецца, ні ў аднаго краязнаўцы Беларусі савецкіх часоў да 1991 г. не было столькі выданняў, як у Р. Родчанкі:

Смаргоншчыне) [Электронны рэсурс] / Т.А. Камароўская // Смаргонская раённая бібліятэка. – Рэжым доступу: http://www.cbssmorgon.by/history.htm. – Дата доступу: 04.05.2015.

[611] Корбут, С. Сладкие пейзажи с горьким кофе [Электронны рэсурс] / С. Корбут // Беларусь сегодня. – Рэжым карыстання: http://www.sb.by/kultura/article/sladkie-peyzazhi-s-gorkim-kofe.html. – Дата доступу: 21.05.2015.

[612] Содаль Уладзімір [Электронны рэсурс] // Камунікат. орг. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/Sodal_Uladzimir.html. – Дата доступу: 12.05.2015.

[613] Гучок, Я. Ах, Родчанка! / Я. Гучок // Лыч, Л. Створым серыю кніг краязнаўцаў // Краязн. газ. – 2012. – № 35, верас. – С. 3.

“Старэйшая школа Беларусі”[614] (1985), “З вечнага” (зборнік фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў Случчыны) (1984, 1990); “Альгерд Абуховіч-Бандынэлі. Нарыс жыцця і творчасці”[615] (1984); “Альгерд Абуховіч. Творы” (1991); “Слуцкая старасвеччына (факты і разважанні)”[616] (1991).

На Магілёўшчыне актыўнымі краязнаўцамі ў 1960–1980-я гг. з’яўляліся Д.М. Абрамовіч, Э.І. Бальчэўскі, В.Д. Гузаў, М.Ф. Мельнікаў, І.І. Філіповіч.

Найлепшым знаўцам гісторыі Магілёва ў другой палове XX ст. з’яўляўся Іеранім Іосіфавіч **Філіповіч** (1912–1998). Гістарычнай адукацыі ён не атрымаў. Скончыў толькі сямігадовую польскую школу, два курсы палітасветінстытута. Працаваў гідратэхнікам, музейным супрацоўнікам, супрацоўнікам Магілёўскага гістарычнага архіва. Аднак па ўзроўні метадалогіі працы з гістарычнымі крыніцамі, І. Філіповіч адносіўся да лепшых дасведчаных археографаў краіны.

Цікавасць да гісторыі горада ўзнікла яшчэ ў 1930-я гады, але сабраныя ім матэрыялы былі згублены ў гады вайны. Сістэмную комплексную працу па пошуку і выяўленню ў архівах, бібліятэках матэрыялаў, якія адносіліся да гісторыі Магілёва пачаў з 1958 г. Толькі з 1963 па 1992 год прапрацаваў 198 фондаў у архівах БССР і СССР, сістэматызаваў у 1556 адзінак захоўвання. Картатэка І.І. Філіповіча налічвае 12000 картак, запісы занатаваны ў 117 агульных сшытках[617].

У пачатку 1960-х гг. выявіў у Ленінградзе ўнікальныя крыніцы па гісторыі Магілёва, якія дагэтуль былі невядомыя ці лічыліся страчанымі[618]. Сярод іх – рукапіс “Хронікі Магілёва” Т. Сурты і Трубніцкіх. З прычыны дрэннага стану рукапісу зняць з яго копіі было немагчыма і І.І. Філіповіч звольніўся з працы і на працягу 8 месяцаў працаваў з дазволу дырэкцыі ў Салтыкоўскай публічнай бібліятэцы ў Ленінградзе ад часу адкрыцця да паўночы, перапісваючы каштоўны гістарычны дакумент[619]. Дзякуючы хроніцы ўдалося скласці план магілёўскага замка, зрабіць чарцёж сярэднявечнага Магілёва.

Свае матэрыялы краязнаўца друкаваў у газеце “Могилевская правда”, часопісе “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, з’яўляўся аўтарам каля 50 цікавых публікацый па гісторыі г. Магілёва[620]. Асновай публікуемых

[614] Родчанка, Р. Старэйшая школа Беларусі: [аб сярэдняй школе № 1 г. Слуцка] / Р. В. Родчанка. – Мінск: Нар. асвета, 1985. – 76 с.
[615] Родчанка, Р. Альгерд Абуховіч-Бандынэлі: нарыс жыцця і творчасці / Р. Родчанка. – [б. м.]. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 41 с.
[616] Родчанка, Р. Слуцкая старасвеччына (факты і разважанні) / Р. Родчанка. – Мінск: Полымя, 1991. – 71 с.
[617] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Фонд 1244. – Воп. 2. – Спр. 1. – Арк. 58–62. Краязнаўцы Магілёўшчыны: Філіповіч І.І.
[618] Філіповіч Іеранім Іосіфавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 2003. – Т. 6, ч. 2. – С. 40.
[619] Калініна, Т. Іеранім Філіповіч – даследчык Магілёўшчыны [Электронны рэсурс] / Т. Калініна // Магілёўскія ведамасці. – Рэжым доступу: http://www.mogved.by/kultura/5018. – Дата доступу: 05.04.2015.
[620] Даследчыкі роднага краю (краязнаўцы і гісторыкі-ураджэнцы Магілёўшчыны: біяграфічна-бібліяграфічны паказальнік). – Магілёў: Абл. б-ка, 1995. – С. 60.



Рэпазіторый ВДУ

артыкулаў акрамя архіўных дакументаў з’яўляліся і матэрыялы, надрукаваныя ў дарэвалюцыйных магілёўскіх газетах, памятных кніжках, выяўленых у бібліятэках АН БССР, Дзяржаўнай бібліятэцы імя У.І. Леніна, дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Е. Салтыкова-Шчадрына, і Магілёўскай абласной. Першыя артыкулы па гісторыі Магілёва і Падняпроўя з’явіліся ў перыядычным друку ў 1960-х гг. У 1993 г. была выдадзена першая кніга “Міфы і праўда аб Магілёве”, потым другая – “Могилев: хроника событий 1917–1918 (по архивным и печатным материалам)” (1995)[621].

Гораду Крычаву Магілёўскай вобласці пашчаслівілася на тое, што ў ім нарадзіўся і жыў Міхаіл Фёдаравіч **Мельнікаў** (1921–1993). Рэдкі выпадак у гісторыі Беларусі, калі намаганнямі аднаго чалавека ў горадзе быў створаны дзяржаўны краязнаўчы музей з выдатнай экспазіцыяй. Дзякуючы ягонай стойкасці, вынослівасці, нязмернай сіле волі, энергіі, рашучасці, самаахвяраванню і, самае галоўнае – любові да роднага краю, яму ўдалося зрабіць справу свайго жыцця[622].

Аднак на пачатку, калі М. Мельнікаў прапанаваў уладам стварыць музей на аснове ягонай прыватнай калекцыі, ён сутыкнуўся з абыякавасцю і непаразуменнем улад. Многія лічылі яго дзіваком. А адзін з кіраўнікоў раёна ў адказ на чарговую просьбу краязнаўцы прама адказаў: “Жылі без музея і яшчэ сто гадоў пражывём”. Таму першую экспазіцыю Мельнікаў адкрыў у прыбудове да ўласнага дома[623].

15.10.1961 г. Крычаўскі дзяржаўны раённы краязнаўчы музей быў адкрыты, але праз год быў пераўтвораны ў грамадскі. Канец 1962, 1963 і 1964 гг. М. Мельнікаў працаваў адзін, не атрымліваючы ніякага заробку. Летам 1964 г. М. Мельнікаў звярнуўся з лістом да М.С. Хрушчова, у якім пісаў аб агульным заняпадзе беларускай культуры, пагардлівых адносінах улад да музеяў, скарачэнні іх колькасці і пераводзе на грамадскія пачаткі. З падобнымі лістамі М. Мельнікаў звяртаўся ў Міністэрства культуры БССР. Пасля вяртання дзяржаўнага статуса ў 1965 г. развіццё Крычаўскага музея працягнулася[624].

Матэрыялы па гісторыі Крычаўшчыны краязнаўца збіраў, працуючы ў бібліятэках, архівах Масквы, Ленінграда, Мінска, Магілёва, Пярмі, Пяцігорска. Зрабіў тысячы сустрэч, інтэрв’ю, апытанняў розных людзей, напісаў тысячы лістоў у розныя куткі краіны і замежжа. Таленавіты журналіст (член Саюза журналістаў СССР з 1960 г.), нумізмат, філатэліст,

Репозиторий ВГУ

[621] Іеранім Іосіфавіч Філіповіч [Электронны рэсурс] // Магілёўская абласная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://library.mogilev.by/kray/Znak_new/mogreglib/86.htm. – Дата доступу: 22.05.2015.
[622] История создания краеведческого музея в г. Кричеве [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Крычаўскага раённага выканаўчага камітэта. – Рэжым доступу: http://krichev.mogilev-region.by/ru/nasledie/sozdanie. – Дата доступу: 21.03.2015.
[623] Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі [Электронны рэсурс] / А. Гужалоўскі // Камунікат. арг. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=10378 – С. 79. – Дата доступу: 13.03.2015.
[624] Тамсама.

ён добра разбіраўся ў жывапісе і скульптуры. Дасягнуў усяго гэтага самаадукацыяй.

На жыццёвым шляху М.Ф. Мельнікава сустракаліся шматлікія складаныя сітуацыі. Дзесяць гадоў ён адбыў у сталінскіх лагерах. Там, дарэчы, атрымаў добрую адукацыю, таму, што давялося ў няволі знаходзіцца з выдатнымі даследчыкамі, педагогамі, спецыялістамі, якія аказаліся за кратамі як “ворагі народа”. У памяць аб лепшым знаўцы краю на будынку Крычаўскага краязнаўчага музея ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў яго гонар, а адна з вуліц Крычава носіць яго імя.

Д.М. **Абрамовіч** падрыхтаваў шмат матэрыялаў па гісторыі Быхаўшчыны (пра ўстанаўленне савецкай улады, сялянскія хваляванні на Быхаўшчыне і інш.), вядомы як аўтар рэцэнзій на кнігі і часопісы[625]. В.Д. **Гузаў** з’яўляўся аўтарам некалькіх дзясяткаў рукапісных і аддрукаваных на друкарскай машынцы брашур на розныя тэмы з гісторыі Бялыніцкага краю, сярод якіх “Героі Сацыялістычнай працы раёна”, “Заслужаныя настаўнікі БССР нашага раёна”, “Партызанскія песні” і шмат іншых[626].

З 1950-х гадоў веткаўскі жыхар, народны майстар, мастак Фёдар Рыгоравіч **Шкляраў** (1925–1988) пачаў збіраць уласную, “хатнюю” калекцыю прадметаў побыту, археалогіі, старадрукаваных і рукапісных кніг, ікон. Праз некаторы час збор стаў добра вядомым. Каб пазнаёміцца з ім, у Ветку пачалі прыязджаць пісьменнікі, журналісты, краязнаўцы, выкладчыкі, мастакі (у тым ліку вядомыя мастакі Арлен Кашкурэвіч, Барыс Забораў, Іван Рэй, Мікалай Казакевіч), грамадскія дзеячы Беларусі, Расіі і іншых саюзных рэспублік. Для наведвальнікаў Ф. Шкляраў завёў кнігу водгукаў, упрыгожыў яе ў стылі веткаўскіх рукапісных кніг.

У 1970-х гадах Ф.Р. Шкляраў працаваў мастаком па тканінах на веткаўскай ткацкай фабрыцы. Выкарыстоўваючы для сваіх малюнкаў на тканіны ўзоры з неглюбскіх ручнікоў і посцілак, Ф.Р. Шкляраў адкрыў для ўсяго свету самабытнае неглюбскае ткацтва. А веткаўскія тканіны атрымлівалі дыпломы і прызавыя месцы на міжнародных выстаўках у Маскве, Мінску, Ленінградзе[627].

На аснове калекцыі Ф.Р. Шклярава ў Ветцы быў створаны музей народнай творчасці. Адпаведная пастанова Савета Міністраў БССР была прынята 28.11.1978 г. Музей размясціўся ў двухпавярховым доме ў гістарычным цэнтры Веткі на Чырвонай плошчы — помніку архітэктуры XIX ст., доме былога купца Ц.П. Грошыкава. Адразу Ф. Шкляраў перадаў у музей 500 экспанатаў з уласнай калекцыі, а ў 1983 г. ён падарыў найбольш каштоўную яе частку: калекцыю старадрукаваных і рукапісных

---

[625] ДАМВ. – Фонд 1244. – Воп. 3. – Спр. 1–25. Краязнаўцы Магілёўшчыны: Абрамовіч Д.М.
[626] ДАМВ. – Фонд 1244. – Воп. 19. – Спр. 1–15. Краязнаўцы Магілёўшчыны: Гузаў В.Д.
[627] Раманава, Л. Ветка — жыццё, шчасце, Радзіма мая! [Электронны рэсурс / Л. Раманава. – Рэжым доступу: http://news.21.by/culture/2011/01/12/229842.html. – Дата доступу: 15.05.2015.



Репозиторий ВГУ

кніг XVI–XIX ст. У яе складзе – кнігі першых беларускіх і рускіх друкароў І. Фёдарава, П. Мсціслаўца, А. Радзішэўскага. І не адзін раз пасля таго Ф.Р. Шкляраў дарыў музею рэдкія і каштоўныя экспанаты. Справа па стварэнні музея вымагала шмат сіл і энергіі. Першая экспазіцыя была адчынена толькі 01.11.1987 г. У гэтым жа годзе Ф. Шкляраву было прысвоена званне "Заслужаны работнік культуры".

Стварэнне музея было надзвычай актуальнай і надзённай справай для Веткаўшчыны і Беларусі, бо на працягу другой паловы XX ст. адбываўся адток унікальных выданняў і рэчаў мастацтва ў іншыя рэгіёны СССР. Так, толькі ў пачатку 1970-х гг. у выніку археалагічных і этнаграфічных экспедыцый у Веткаўскі і Старадубскі раёны каля 500 рукапісных і старадрукаваных кніг XV – пачатку XX ст. паступілі ў Навуковую бібліятэку Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З іх сфарміраваўся Веткаўска-Старадубскі фонд, у які ў 1980-я гг. паступіла яшчэ каля 150 кніг[628].

Стаўшы кіраўніком Веткаўскага музея Ф.Р. Шкляраў працягваў актыўную экспедыцыйную працу на тэрыторыі Веткаўскага і суседніх з ім раёнаў. Для прыкладу, у 1983 годзе, калі быў набыты ўласны транспарт, было зроблена больш за 60 паездак. У 1983 г. музей набыў кнігу І. Фёдарава "Апостал", выдадзеную ў 1574 г. У гэтым жа годзе, які ЮНЕСКА абʼявіў годам І. Фёдарава, больш ніхто ў свеце не адшукаў выданняў першадрукара.

Іван Пятровіч **Дэйніс** (1900–1985) зʼяўляўся, бадай, адным з найбуйнейшых даследчыкаў гісторыі і культуры г. Полацка XX ст. Ягоная краязнаўчая дзейнасць пачалася яшчэ ў 1920-я гг., калі ён кіраваў адным з вучнёўскіх краязнаўчых гурткоў пры педтэхнікуме і лестэхнікуме, а таксама браў актыўны ўдзел у дзейнасці Полацкага краязнаўчага таварыства. Удзельнічаў у працы камісіі па ўскрыцці мошчаў Еўфрасінні Полацкай.

У другой палове XX ст. ён працягваў вывучэнне полацкай даўніны. Найбольш плённымі быў час пасля выхаду І. Дэйніса на пенсію (1967). Вынікі даследаванняў публікаваў у артыкулах у навуковым рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Напісаў успаміны пра гісторыю Полацка "Полацк у XX ст. (1905–1967 гг)", якія ўяўляюць сабой рукапіс абʼёмам 220 лістоў (433 старонак па аўтарскай нумарацыі чырвоным алоўкам). Перададзены аўтарам 26 красавіка 1972 г. у Полацкі краязнаўчы музей. Рукапіс захоўваецца ў фондах НПДГКМЗ (КП-5-2774). Мемуары выдадзены М. Баўтовічам пад назвай "Полацкая даўніна" ў перакладзе на беларускую мову ў 2007 г. Вялікая рукапісная спадчына краязнаўцы захоўваецца ў архіве. Сярод іншых рукапісы: "Богоявленский монастырь", "Борисоглебский или Бельчанский монастырь", "Главная

[628] Рукапісная кніга Веткі [Электронны рэсурс] // Гомельская областная универсальная библиотека им. В.И. Ленина. – Рэжым доступу: http://goub.org/article/a-250.html. – Дата доступу: 21.06.2015.

Репозиторий ВГУ

площадь города Полоцка. Исторический очерк”, “Иезуиты в Полоцке”, “Мой командир (воспоминания о начальнике 43-х Полоцких комкурсов Я.Ф. Фабрициусе)”, “Полоцк в XX веке”, “Полоцкие замки”, “Полоцкий лесной техникум”, “43-и Полоцкие объединенные курсы комсостава рабочее-крестьянской Красной армии”, “Софийский собор и униаты в Полоцке”, “Спасо-Евфросиньевский монастырь”, “Учебные заведения в Полоцке до Октябрьской революции”. Адным з талентаў І. Дэйніса было маляванне. У 1970-я гг. ён па памяці зрабіў замалёўкі самых знакавых пабудоў Полацка XIX–XX ст. У выніку атрымалася пяць альбомаў, якія ён разам іншымі дакументамі, узнагародамі, рэчамі падарыў краязнаўчаму музею. За шматгадовую педагагічную працу, актыўны ўдзел у жыцці Полацка ў 1967 г. І. Дэйнісу было нададзена званне “Ганаровы грамадзянін горада Полацка”.

Другім вядомым даследчыкам Полацка другой паловы XX ст. з’яўляўся Мікалай Аляксандравіч **Маніс** (1912–1996). Краязнаўца комплексна даследаваў гісторыю Полаччыны, аддаючы перавагу гісторыі савецкага перыяду. Вывучаў гісторыю рэвалюцыйнага руху на Полаччыне і ў 3-й Арміі Заходняга фронту. Сустракаўся з удзельнікамі рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны, збіраў іх успаміны. Вынікі працы публікаваў у дзясятках артыкулаў па гісторыі Полацка і Полацкага раёна ў мясцовым і рэспубліканскім перыядычным друку. З’яўляўся адным з аўтараў кнігі “Полацк” (1962). Браў удзел у падрыхтоўцы матэрыялаў для кніг “Памяць” Полацка і Полацкага раёна, быў аўтарам артыкулаў. На аснове сабраных матэрыялаў была напісана і выдадзена кніга “Память о них жива в Белоруссии” (1988). Удзельнічаў у працы Полацкага аддзялення БДТАПГіК, быў лектарам таварыства “Веды”, дзе чытаў лекцыі па гісторыі Полацка.

Лепельшчына ў другой палове XX ст. стала прадметам вывучэння Анатоля Сямёнавіча **Ханяка** (17.09.1919). Мінуўшчынай роднага краю ён зацікавіўся яшчэ ў 1953 г., калі пачаў працаваць дырэктарам Лепельскай сямігодкі. Разам з вучнямі даследаваў гісторыю школы, школьнай адукацыі на Лепельшчыне, гісторыю будаўніцтва і дзейнасці Бярэзінскай воднай сістэмы (XVIII–XIX стст.). Вывучаў развіццё партызанскага руху ў раёне ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, дзейнасць выдатных землякоў: Д. Даўгялы, І.Д. Гарбачэўскага, М.Ф. Кусцінскага, лепельскага селекцыянера Язэпа Мароза, якога называлі “беларускім Мічурыным” і іншых.

На працягу працы ў школе арганізаваў шэраг паходаў па родным краі. На аснове сабраных матэрыялаў і праведзеных даследаванняў стварыў музей у СШ № 3 г. Лепеля. Стаў ініцыятарам і актыўным удзельнікам стварэння музея ў Лепельскай школе-інтэрнаце. Распачатая калектывам настаўнікаў і вучняў Лепельскай сямігадовай школы ў 1950-я гг. краязнаўчая праца з’яўлялася станоўчым прыкладам для разгортвання збіральніцкай працы і стварэння рознага па зместу музеяў у многіх школах Лепельскага раёна. Выступаў з дакладам “Краязнаўчая работа ў школе” аб

Репозиторий ВГУ

вопыце работы на канферэнцыях ў Віцебску і Львове (1958). Падрыхтаваў зборнік артыкулаў пад агульнай назвай “Аб тым што бачыў, што перажыў, пра што думаў”, які ўтрымлівае каля 50 артыкулаў на краязнаўчыя і грамадска-палітычныя тэмы. Зберагаецца ў фондах Лепельскага краязнаўчага музею.

Найвыдатным даследчыкам Бешанковіччыны з’яўляецца Анатоль Вячаслававіч **Крачкоўскі** (06.04.1949). Вывучаць гісторыю і культуру роднага краю пачаў у краязнаўчым гуртку Крулеўшчызненскай СШ Докшыцкага раёна (1965). Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці аказаў настаўнік гэтай школы А.У. Чарнаруцкі. У складзе гуртка ўдзельнічаў у паходах па родным краі.

Прызначаны першым дырэктарам Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея (1981–1989), А.В. Крачкоўскі фактычна ўзначаліў працу па яго стварэнні. Браў непасрэдны ўдзел у зборы экспанатаў і стварэнні экспазіцый. З гэтай мэтай працаваў і падтрымліваў зносіны з галоўнымі музеямі, архівамі і бібліятэкамі СССР. Стварыў краязнаўчы музей у Рубежскай сярэдняй школе Бешанковіцкага раёна (1989).

Пры падтрымцы выдавецтва  “Полымя” выдаў кнігу “Край наш Наддзвінскі” (1990), а пасля прапанаваў раённаму начальству стварыць кнігу “Памяць”. Паабяцаў, што калі дадуць пяць сакратар-машыністак, то падрыхтуе рукапіс за палову года. Па асабістаму распараджэнню першага сакратара райкама КПБ для гэтай працы была сабрана 10 работнікаў і рукапіс быў падрыхтаваны за тры месяцы. Значная колькасць матэрыялаў не ўвайшла ў выданне, але сталі асновай іншых падрыхтаваных кніг: “Светлы бешанковіцкі куток” (2001), а таксама падрыхтаваных і выдадзеных саматужна ў некалькіх экзэмплярах: “...Біліся, як і львы. Да 190-годдзя бітвы пад Астроўна”, “Акрыленыя. З гісторыі аднаго авіяпалка” [гісторыя 132-га Дальнебамбардзіровачнага палка, які размяшчаўся ў Бешанковічах і Уле], “Бачэйкава”, “Залатая Зорка Міхаіла Ткачэнкі”, “Бешанковічы. Гісторыка-эканамічны нарыс”, “Ула. У сутоцы дзвюх рэк”, “Астроўна. Мястэчка на беразе возера”, “Акадэмік жывапісу з Улы” і іншых.

Асаблівую ўвагу выклікае “Энцыклапедычны даведнік Бешанковіцкага раёна” (аб’ёмам у 47 друкаваных аркушаў), праца над якім працягвалася трыццаць год. Па алфавітным прынцыпе змяшчаюцца артыкулы, прысвечаныя тапаніміцы, населеным пунктам, персаналіям, гістарычным падзеям, эканоміцы, геаграфіі, прыродзе Прыдзвінскага краю ў межах сучаснага раёна. У падрыхтаваную “Ваенную энцыклапедыю Бешанковіцкага раёна” (26 друк арк.) ўваходзяць артыкулы пра падзеі ваеннай гісторыі ў краі, а таксама пра землякоў, якія ўдзельнічалі ў Крымскай, Першай сусветнай, савецка-фінскай, Вялікай Айчыннай войнах. Змяшчаюцца матэрыялы пра кавалераў двух і болей ордэнаў і медалёў “За адвагу” ці “За баявыя заслугі”. Сярод іншых ненадрукаваных, але падрыхтаваных да выдання прац прыгадаем: “Зямля пад чорнымі крыламі”



Репозиторий ВГУ

[Бешанковіцкі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны] (150 с.); “Храналогія гісторыі Бешанковіцкага раёна” (70 с.); “Гонар і слава Прыдзвіння” (350 с.); “Гісторыя Бешанковіцкага раёна” (350 с.); “Людзі вёскі прыдзвінскай” (500 с.); “Цяжкія гады станаўлення” [гісторыя раёна] (60 с.)[629].

Акрамя напісання кніг, А.В. Крачкоўскі з’яўляецца сталым аўтарам у выданнях рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку. Некалькі соцень артыкулаў на краязнаўчую тэматыку былі надрукаваны ў бюлетэні “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, часопісе “Нёман”, газетах “Звязда”, “Советская Белоруссия”, “Чырвоная змена”, “Знамя Юности”, “Веснік Глыбоччыны”, “Голас Сенненшчыны”, “Кліч Радзімы”, “Лепельскі край” і ў першую чаргу бешанковіцкай раённай газеце “Зара”.

Стваральнікам музея віцебскага трамвая і прапагандыстам ведаў пра электрычны транспарт у Віцебску стаў Леанід Аляксандравіч **Забэла** (? – 1996). З 1959 па 1985 г. ён працаваў у Віцебскім трамвайна-тралейбусным упраўленні і звярнуў увагу на тое, што ні жыхары горада, ні нават супрацоўнікі трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення не ведаюць, што віцебскі трамвай старэйшы ў БССР. Стаў збіраць матэрыялы, паставіўшы мэтай напісанне кнігі і стварэнне музея віцебскага трамвая. Запісваў успаміны работнікаў дарэвалюцыйных часоў, працаваў у архівах Беларусі і Віцебска. На працягу 1966, 1974, 1985 гадоў правёў тры экспазіцыі. Падрыхтаваў рукапіс, на аснове якога былі выдадзены кнігі “История Витебского трамвая” (1998)[630] і “История электрического транспорта Витебска 1898–2003” (2003)[631].

Усё жыццё адпрацаваў на чыгунцы цесляром Мікола Хведаравіч **Плавінскі** (1925–2012?). Ніяк не звязаны з гістарычнай навукай, працуючы цесляром, ён актыўна займаўся вывучэннем гісторыі горада Віцебска і яго наваколляў. На працягу 30 гадоў ён падпісваўся амаль на ўсе рэспубліканскія выданні і склаў багатую картатэку матэрыялаў пра Віцебшчыну і Беларусь. Быў знаёмы, актыўна перапісваўся з Я. Брылём, В. Быкавым, С. Грахоўскім, У. Караткевічам, А. Мальдзісам, Я. Скрыганам, М. Улашчыкам, С. Шушкевічам і інш. Разам з доктарам філалагічных навук Г.В. Кісялёвым увёў у навуковы ўжытак новыя матэрыялы аб гісторыі стварэння паэмы “Тарас на Парнасе”, знайшоў месца пахавання малавядомага ў беларускай мастацкай культуры пісьменніка і грамадскага дзеяча І. Манькоўскага, які на той час лічыўся верагодным аўтарам паэмы “Энеіда навыварат”, высветліў месца пахавання маці латышскага паэта Яна Райніса. З’яўляўся даследчыкам жыцця і дзейнасці беларускага савецкага пісьменніка 1920–1930-х гадоў Змітра Максімавіча Жыткевіча, стаў аўтарам артыкула пра яго ў энцыклапедыі “Пісьменнікі Беларусі”.

[629] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. / М.В. Півавар. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – С. 172.

[630] История витебского трамвая. – Витебск: ВОУТ им. Коминтерна, 1998. – 128 с.

[631] История электрического транспорта Витебска 1898–2003 гг. – Витебск: ВОУТ, 2003.

Першым у рэспубліканскім друку ўзняў тэму “беларускага салаўя” – М. Забэйды-Суміцкага, з якім перапісваўся больш за 17 гадоў, стаў “адкрывальнікам” яго імя для нашага часу.

Найвыдатнейшым знаўцам гісторыі Віцебска стаў Аркадзь Міхайлавіч **Падліпскі** (18.03.1946). Найбольш распрацаванымі тэмамі гэтага краязнаўцы ў вывучаемы перыяд сталі: архітэктура Віцебска, бібліяграфія, біяграфіі і жыццёвыя лёсы выдатных асоб Віцебска і Віцебшчыны. Скончыўшы фізмат Віцебскага педагагічнага інстытута, ён працаваў некаторы час настаўнікам-метадыстам, а потым журналістам у малатыражнай газеце трэста № 9 “Будаўнік”. Затым карэспандэнтам, загадчыкам аддзела лістоў у абласной газеце “Народнае слова”. За гэты час ён напісаў некалькі тысяч артыкулаў на краязнаўчую тэматыку. Сотні артыкулаў ён публікаваў у навуковым і перыядычным рэспубліканскім, абласным і мясцовым друку. Усе яны напісаны на аснове сур’ёзнай працы ў архівах, апытанняў сваякоў, сучаснікаў падзей. Дзясяткі асоб, якія адыгрывалі істотную ролю ў жыцці горада былі вернуты з нябыту. Асобна адзначым артыкулы даследчыка, якія былі прысвечаны выдатным, але малавядомым дзеячам гісторыі і культуры Віцебшчыны, якія публікаваліся ў бюлетэні ДБТАПГіК “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі” (ПГіКБ): “Летапісец Віцебшчыны”[632], прысвечаны У. Стукалічу, “Заснавальнік Віцебскага музея”[633] – А. Брадоўскаму, “З любоўю да роднага краю”[634] – М. Багародскаму, “Краязнаўца і даследчык”[635] – У. Краснянскаму, “Буйнейшы калекцыянер” – В. Феадаровічу, “Асілак з веліканавага хутара” самаму вялікаму чалавеку ў свеце – Фёдару Махнову, “Гражданственность лиры…” – буйному калекцыянеру Віцебшчыны, Г. Тэадаровічу[636], “Первый метеоролог Витебщины” – А. Бялыніцкаму-Бірулі[637]. Усе артыкулы былі заснаваны на мясцовым матэрыяле і ўводзілі ў навуковы зварот новыя матэрыялы, не вядомыя раней ні рэспубліканскім, ні рэгіянальным гісторыкам-прафесіяналам.

Невялічкія брашуркі, якія выдаваліся на сродкі Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК: “Губернаторский дворец в Витебске”[638], “Городская ратуша Витебска”[639], “Памятник героям Отечественной войны

Репозиторий ВГУ

---

[632] Падліпскі, А.М. Летапісец з Віцебшчыны [Стукаліч У.] / А.М. Падліпскі // ПГіКБ. – 1978. – № 1. – С. 26–27.

[633] Падліпскі, А.М. Заснавальнік віцебскага музея [Брадоўскі А.] / А.М. Падліпскі // ПГіКБ. – 1980. – № 2. – С. 19–20

[634] Падліпскі, А.М. З любоўю да роднага краю [Багародскі М.] / А.М. Падліпскі // ПГіКБ. – 1981. – № 2. – С. 29–30.

[635] Падліпскі, А.М. Краязнаўца і даследчык / А.М. Падліпскі // ПГіКБ. – 1985. – № 1. – С. 28–29

[636] Подлипский, А. Гражданственность лиры… // А.М. Падліпскі / Неман. – 1982. – № 5. – С. 175–176.

[637] Подлипский, А.М. Первый метеоролог Витебщины / А.М. Падліпскі // Неман. – 1983. – № 4. – С. 174–175.

[638] Подлипский, А. Губернаторский дворец в Витебске / А. Подлипский. – Витебск: Типография им. Коминтерна, 1990. – 4 с.

[639] Подлипский, А. Соратники В.И. Ленина на Витебщине. М.И. Калинин в Витебске и Орше / А. Подлипский. – Витебск: ВОУТ им. Коминтерна, 1987. – 4 с.

1812 года в Витебске"[640], фактычна сталі першымі асобнымі краязнаўчымі выданнямі за доўгія гады, якія папулярызавалі гісторыка-культурную спадчыну Віцебска.

Ужо пазней, у асноўным у канцы 1990-х гг. – пачатку XXI ст. А.М. Падліпскі выдаў некалькіх дзясяткаў кніг. Частка матэрыялаў А.М. Падліпскага па гісторыі горада і жыцці асоб, звязаных з горадам, была выкарыстана пры напісанні шэрага работ, прысвечаных Віцебску[641].

Усё жыццё Іосіф (Язэп) Уладзіміравіч **Бунто** (22.07.1926, в. Мацюкі Чарэскія Браслаўскага пав. Віленскага ваяв.) працаваў рэвізорам, юрыстконсультам ва ўпраўленні гандлю Маладзечанскага аблвыканкама (1959–1960), а пазней ў Глыбоцкім райспажыўсаюзе (1960–1986). Аднак яго заняткі краязнаўствам вывелі даследчыка ў лік лепшых у краіне знаўцаў гісторыі.

Цікавіцца гісторыяй Я. Бунто пачаў яшчэ ў юнацкія гады. Больш арганізаваную краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1970 г., калі стаў вывучаць архіўныя дакументы і збіраць гістарычную літаратуру. Комплексна вывучае гісторыю Глыбоччыны, Мёршчыны, Браслаўшчыны і тых рэгіёнаў, якія ўваходзілі ў Браслаўскі і Дзісненскі паветы Другой Рэчы Паспалітай, населеных пунктаў, жыццёвы шлях вядомых дзеячаў Заходняй Віцебшчыны, падзеі паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863 г. на Браслаўшчыне і Дзісеншчыне. З мэтай выяўлення інфармацыі пра гісторыка-культурныя каштоўнасці краю працаваў у архівах і бібліятэках БССР, а таксама г. Вільнюса ў Літве. Заказваў і набываў ўсе выданні, якія былі звязаны з гісторыяй Беларусі. Праз міжбібліятэчны абанемент выпісваў рэдкія дарэвалюцыйныя выданні, польскія кнігі міжваеннага перыяду з Масквы, Ленінграда, рабіў копіі матэрыялаў па гісторыі Заходняй Віцебшчыны. Пад час службы часта бываў ў камандзіроўках, набываў букіністычную літаратуру, якая мела дачыненне да гісторыі Віцебшчыны.

Ведаючы высокі ўзровень падрыхтоўкі даследчыка рэдакцыя "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" прапанавала супрацоўніцтва пры падрыхтоўцы тома, прысвечанага Віцебскай вобласці. Я. Бунто склаў спіс рухомых і нерухомых каштоўнасцей Глыбоцкага раёна і падрыхтаваў даведкі пра іх; працаваў над спісам літаратуры па гісторыі былога Дзісненскага і Браслаўскага паветаў, які ўключае больш 350 найменняў[642]. Аднак значная частка з падрыхтаванага матэрыялу не ўвайшла ў выданне па ідэалагічных меркаваннях і з прычыны значнага аб'ёму інфармацыі (рухомыя помнікі (іконы), помнікі культавага будаўніцтва, месцы здзяйснення подзвігаў і інш.).

---

[640] Подлипский, А. Памятник героям Отечественной войны 1812 года в Витебске / А. Подлипский. – Витебск: Типография им. Коминтерна, 1990. – 4 с.

[641] Аркадий Михайлович Подлипский. Библиография основных публикаций 1968–2005 гг. / сост.: А.М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск: ГУ "Витебская областная библиотека им. В.И. Ленина", 2006. – 78 с.

[642] Помнікі Віцебскай вобласці. Макет для абмеркавання. – Мінск, 1981. – Т. 1. – 668 с.; Помнікі Віцебскай вобласці. Макет для абмеркавання. – Мінск, 1981. – Т. 2. – 645 с.



Репозиторий ВГУ

Я. Бунто браў актыўны ўдзел у навуковым жыцці краіны. Напрыклад, пасля таго, як даслаў у рэдакцыю Беларускай энцыклапедыі аналіз памылак, якія былі дапушчаны пры выданні “Гісторыі БССР”, атрымаў падзяку рэдактара, ганарар, а таксама прапанову супрацоўнічаць. Дапамагаў у падрыхтоўцы навуковых артыкулаў, удакладненні акалічнасцей навукоўцам (Г.В. Штыхаў), а таксама аказаў дапамогу ў зборы матэрыялаў, кансультацыямі шэрага мясцовых і замежных краязнаўцаў (К. Шыдлоўскаму, У. Скрабатуну, К. Шыталю, Я. Забэлу і інш.).

Браў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі “Памяць” Глыбоцкага раёна, напісаў для яе шэраг артыкулаў. Значная колькасць матэрыялаў па гісторыі раёна ў XVI–XVIII ст., сабраных і падрыхтаваных асабіста, а таксама з іншымі краязнаўцамі ляглі ў аснову артыкулаў, напісаных для кнігі навукоўцамі з Інстытута гісторыі АН БССР.

Аўтар артыкулаў у “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”, “Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць”, зборніках “Браслаўскія чытанні” (1991, 1994, 1997, 2000, 2003), “Дзісненскіх чытаннях”, бюлетэні “Нашы карані” (Паставы). Апублікаваў шэраг матэрыялаў у перыядычным і мясцовым друку: газетах “Народнае слова”, “Веснік Глыбоччыны”, “Вольнае Глыбокае”, “Браслаўская звязда”, “Кліч Радзімы” (Шаркаўшчына), “Сцяг працы” (Мёры).

Падрыхтаваў да друку працу “Гісторыя Чарэскага краю XVI–XX стст.”. Сабраў калекцыю кніг па гісторыі Беларусі, геаграфічных карт Браслаўска-Дзісненскага рэгіёна, выдадзеных у XVII–XX стст. на польскай і рускай мовах[643]. Зрабіў пераклад з польскай мовы кніг О. Гэдэмана “Глыбокае”, “Школа валер’янаўскіх піяраў Лужэцкіх”. Я. Бунто адзін з найбольш аўтарытэтных краязнаўцаў Глыбоцкага краю[644].

Напрыканцы прыгадаем прозвішча самага старога краязнаўцы нашай краіны, Іосіфа Іосіфавіча **Стаброўскага**, які пражыў амаль 100 гадоў (1870–1968). Скончыў Полацкі кадэцкі корпус, Маскоўскае Аляксандраўскае ваеннае вучылішча, служыў у расійскім войску. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. Служыўшы у войску, зацікавіўся археалогіяй і гісторыяй роднага краю. Скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут, Археалагічныя курсы пра Самарскім універсітэце. З 1921 г. жыў у Слоніме, дзе займаўся збіральніцкай працай, вывучаў край. Даследаваў больш за 150 курганоў на Гарадзеншчыне, напісаў і надрукаваў дзясяткі артыкулаў па краязнаўстве і гісторыі краю.

Яшчэ ў 1928 г. у горадзе было арганізавана аддзяленне Польскага краязнаўчага таварыства. Праз год пры яго дапамозе на аснове калекцыі І. Стаброўскага адчынены краязнаўчы музей, дырэктарам якога ён з’яўляўся з 1929 па 1948 г. Урачыстае адкрыццё адбылося ў прысутнасці

643 Цярохін, У. Калекцыяніраванне / У. Цярохін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 22.
644 Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны. – С. 65.



Рэпазіторый ВГУ

прэзідэнта Польшчы І. Масціцкага. Пасля вайны Іосіфу Стаброўскаму ў Слоніме жылося даволі цяжка. Улады вырашылі перанесці музей са Слоніма ў цэнтр вобласці, якімі былі на той час Баранавічы. Натуральна, што І. Стаброўскі пратэставаў супраць гэтага. Але значная частка экспанатаў была перададзена ў абласны цэнтр. Іосіф Іосіфавіч быў абвінавачаны ў растраце сродкаў на музей, якіх нават і не атрымліваў і звольнены са створанага ім жа музея. Да апошніх дзён жыў у беднасці і забыты мясцовымі ўладамі. На сённяшні дзень Слонімскі раённы краязнаўчы музей у горадзе носіць імя заснавальніка.

У 1960 – першай палове 1980-х асноўная колькасць аматараў з'яўляліся настаўнікамі (як і ў 1920-я гг.). У другой палове 1980-х спектр асоб, якія пачынаюць займацца краязнаўчым вывучэннем рэгіёнаў, шырыцца. "Перабудова", "галоснасць", паслабленне цэнзуры, палягчэнне доступу ў архівы абумовілі лавінападобную хвалю цікавасці да пытанняў гісторыі, у тым ліку і гісторыі краю, сваёй сям'і. Пэўнымі даследаваннямі пачалі займацца амаль усе. Гэта парадзіла значны рост дылетантызму ў гістарычных даследаваннях. Абмежаванні цэнзуры дазволілі публікаваць аматарскія, часта памылковыя звесткі на старонках раённых газет. Пашыраецца колькасць артыкулаў, якія насілі мемуарны характар. Інтэлігентны чалавек, дасягнуўшы сталага ўзросту, маючы вольны час і жаданне занатаваць і падзяліцца ўражаннем пра сваё жыццё, меркаванні, погляды на гісторыю населенага пункта, падзеі XX стагоддзя пачынае пісаць успаміны. Але пашырыцца гэтая з'ява ў асноўным у 1990-я і пачатку XXI ст. А гэта ўжо іншы перыяд і яго вывучэнне патрабуе асобных даследаванняў.

У 1960–1980-я гады для краязнаўцаў-аматараў вострай была праблема выдання сваіх матэрыялаў у выдавецтвах. Вузкалакальная накіраванасць кніг у тагачаснай выдавецкай дзейнасці лічылася неперспектыўнай, таму шматлікія працы краязнаўцаў не выдаваліся. Прыкладам можа служыць лёс кнігі "Была такая вёска"[645], якую напісаў вядомы гісторык М.М. Улашчык. Яна не друкавалася на працягу дзясяткаў гадоў і была выдадзена толькі ў 1989 годзе. На наш погляд, кнігу і на цяперашні момант можна лічыць адной з найлепшых краязнаўчых прац і ўзорам для ўсебаковага апісання вёскі.

Па-ранейшаму важнай праблемай краязнаўства з'яўляецца адсутнасць пераемнасці ў працы. Пасля адыходу з жыцця вядомага краязнаўцы, калі няма наступніка, які працягне справу, выдатны музей з багатымі калекцыямі і каштоўнымі экспанатамі паступова прыходзіць у заняпад і праз нейкі час перастае існаваць. Багаты кніжны збор, складзены з літаратуры, прысвечанай краю, рукапісаў, успамінаў, незанатаванай спадчыны прадаецца ці проста губляецца абыякавымі спадчыннікамі.

[645] Улашчык, М.М. Была такая вёска / М.М. Улашчык // Віцкаўшчына Дзяржын. р-на: гіст.-этнагр. нарыс / пер. з рус. У. Арлова. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 174 с.

Асвятляючы гісторыю краязнаўчага руху ў другой палове XX ст. у краіне, варта звяртаць увагу на некаторыя **акалічнасці і асаблівасці** тых часоў, якія на наш час могуць быць незразумелымі сучаснікам.

Ідэалагічная складаючая абмяжоўвала даследаванні галоўным чынам савецкім перыядам. Ідэалогія была моцным складнікам працы любога, нават нацыянальна-арыентаванага краязнаўцы. У падручніку 9 класа па беларускай літаратуры канспектавалася і вывучаліся на памяць урыўкі артыкула У.І. Леніна "Літаратура і сацыялізм". З іх вынікала, што літаратура павінна была стаць партыйнай. Прынцып партыйнасці, метад сацыялістычнага рэалізму дамінавалі ў літаратуры, журналістыцы, гісторыі, грамадазнаўстве. Заідэалагізаванасць адчуваецца ў выданнях усіх вядомых краязнаўцаў.

У 1960–1980-я гг. амаль у кожнага краязнаўцы былі абавязкова артыкулы, прысвечаныя перамозе савецкай улады ў раёне ці горадзе, развіццю асветы, першым мерапрыемствам савецкай улады, працы камбедаў, арганізацыі камун, сацыялістычнай індустрыялізацыі. Артыкулы друкаваліся да святочных дат. Асабіста каштоўным было знайсці нейкую сувязь правадыра сусветнага пралетарыяту У.І. Леніна з рэгіёнам. З улікам таго, што У. Ленін толькі праязджаў праз Беларусь з Еўропы ў Маскву ці Пецярбург, зрабіць гэта было складана. У такім разе ішлі ўскосныя сведчанні пра тое, што "Ленін думаў пра Беларусь". Выдатны віцебскі краязнаўца А.М. Падліпскі выдаў брашуру "Соратники В.И. Ленина на Витебщине. М.И. Калинин в Витебске и Орше"[646], артыкулы прысвячаліся музеям: "Музей У. І. Леніна"[647], "Вянок У. Леніну"[648], "Музей революции в Витебске"[649]. Неверагодным поспехам і вынікам працы ў архіве для краязнаўцы было знайсці лісты працоўных У.І. Леніну, напрыклад, аб прызначэнні яго ганаровым качагарам, ці занясенні ў спісы пачэсных работнікаў[650], ці, як ўдалося М.С. Рыўкіну – выказванняў У. Леніна пра Віцебшчыну[651].

Аднак не варта глядзець на падзеі тых часоў з пазіцыі сучаснасці. Нехта шчыра верыў, нехта быў прыспасабленцам, і рабіў гэта дзеля кар'еры, ганарараў, нехта, каб не выпячвацца і застацца па-за пільнай увагай кантралюючых і караючых органаў.

У другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя (у сувязі з палітыкай "галоснасці") адбываюцца змены ў тэматыцы даследаванняў і адносінах да публікацый аматараў. Іх краязнаўчыя нарысы становяцца папулярным і часта ўжывальным жанрам у навукова-папулярнай літаратуры і сродках

[646] Подлипский А. Соратники В.И. Ленина на Витебщине. М.И. Калинин в Витебске и Орше. – Витебск: ВОУТ им. Коминтерна, 1987. – 4 с.

[647] Падліпскі, А. Музей У. І. Леніна / А. Подлипский // Маладосць. – 1970. – № 3. – С. 98.

[648] Падліпскі, А. Вянок У. Леніну / А. Подлипский // Беларусь. – 1974. – № 1. – С. 9.

[649] Падліпскі, А. Музей революции в Витебске / А. Подлипский // Неман. – 1978. – № 12. – С. 185.

[650] Маніс, М.А. Масква, Крэмль, Леніну / М.А. Маніс // Віцеб. рабочы. – 1980. – 4 крас. – С. 2.

[651] Рыўкін, М.С. Выказванні У.І. Леніна аб Віцебшчыне / М.С. Рыўкін // Віцеб. рабочы. – 1970. – 27 студз. – С. 2–3.



Репозиторий ВГУ

масавай інфармацыі. Краязнаўцы-аматары актыўна ўдзельнічаюць у выданні энцыклапедычных даведнікаў, прысвечаных абласным цэнтрам Беларусі. Іх матэрыялы актыўна выкарыстоўваліся пры стварэнні гісторыка-дакументальных хронік раёнаў "Памяць". Яны часта і становяцца найбольш актыўнымі аўтарамі, кіраўнікамі груп па стварэнні гэтых хронік. Толькі па Віцебскай вобласці – К. Шыдлоўскі – Браслаўскі раён, А. Крачкоўскі – Бешанковіцкі, А.Ф. Бубала – Верхнядзвінскі, В.А. Ермалёнак – Мёрскі раён, Н.Т. Кіндзяева – Чашніцкі і іншыя. Менавіта артыкулы краязнаўцаў-аматараў запаўняюць у мясцовых перыядычных выданнях інфармацыйную лакуну па гісторыі краю як да Кастрычніцкай рэвалюцыі, так і пасля яе. Шырыцца тэматыка даследаванняў, якой пачынаюць займацца краязнаўцы-аматары. Калі ў 1960-я – першую палову 1980-х г. краязнаўцаў найбольш цікавілі тэмы: рэвалюцыйныя падзеі і падзеі грамадзянскай вайны ў пэўным рэгіёне, сацыялістычнае будаўніцтва, гісторыя прадпрыемстваў, гісторыі піянерыі і камсамола, розныя аспекты аховы помнікаў гісторыі і культуры, славутыя землякі, пошукавая дзейнасць. У другой палове 1980-х – 1991 г. гэта сталі рэпрэсіі 1930-х гг., некаторыя аспекты Вялікай Айчыннай вайны ("кошт перамогі", асаблівасці партызанскага руху ў раёне), славутыя роды, гісторыка-культурная спадчына дарэвалюцыйнага перыяду, канфесійнае жыццё і іншыя тэмы.

*Колькі ж краязнаўца-аматараў дзейнічала ў БССР у 1960–1980-я гг?* У артыкуле "Краязнаўства – клопат многіх" Г. Каханоўскі прыводзіць лічбу ў 175 чалавек на 1988 г.[652] Абапіраючыся на дадзеныя нашага даведніка "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст.", мы падлічылі колькасць асоб, якія вывучалі розныя аспекты гісторыі і культуры Віцебшчыны ў заяўлены перыяд. Іх каля 600. Не менш паловы жылі і працавалі ў 1961–1991 гг. Прааналізаваўшы даведнікі "Краязнаўцы Магілёўшчыны", "Людзі культуры з Гродзеншчыны", дапускаючы, што ў кожнай з абласцей (у залежнасці ад памераў, гістарычных традыцый) магло працаваць ад 200 да 300 краязнаўца-аматараў, атрымліваем ад 1,5 да 2 тыс. краязнаўцаў-аматараў. Натуральна, што тых з іх, якія працавалі на высокім навуковым узроўні, дасягнулі значных вынікаў, сталі аўтарамі шэрага артыкулаў, кніг, стваральнікамі музеяў, уплывалі на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, было некалькі сотняў. Можна пагадзіцца з меркаваннем Г. Каханоўскага, што на пачатак "перабудовы" колькасць актыўных краязнаўйцаў-аматараў, якія валодалі методыкай гістарычнага даследавання, мелі пэўныя вынікі працы, было каля 200 на БССР. Але іх колькасць імкліва пачала павялічвацца з правядзеннем палітыкі "галоснасці", паслабленнем цэнзуры, палітызацыяй грамадства і іншых акалічнасцей.

[652] Краязнаўства – клопат многіх // ЛіМ. – 1988. – 2 верас. – С. 13.

## 5.4. Праца лепшых краязнаўцаў-педагогаў

Сярод краязнаўцаў-аматараў асобнае месца займаюць настаўнікі. Для іх вывучэнне краю часта абумоўлена спецыфікай выхаваўчай працы ў навучальнай установе – правядзеннем паходаў па родным краі, стварэннем экспазіцыі, арганізацыяй музея. Такой справай займаліся тысячы настаўнікаў па краіне. І толькі дзясяткі з іх дасягнулі найвыдатнейшых вынікаў. Вылучым іх у асобную частку і распавядзем пра некаторых больш падрабязна.

Адным з лепшых краязнаўцаў Беларусі з’яўляецца Алесь Мікалаевіч **Белакоз** (11.11.1928 в. Ляткі, Ваўкавыскага павету, цяпер в. Гудзевічы Мастоўскага р-на, Гродзенскай вобл.), настаўнік беларускай мовы і літаратуры, стваральнік літаратурна-этнаграфічнага музея Гудзевіцкай СШ Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Яго шлях да краязнаўства пачаўся з педагагічнай дзейнасці ў школах Мастоўскага раёна. У 1966 г. разам з вучнямі пачаў выдаваць машынапісны літаратурна-краязнаўчы альманах “Праменьчык”. У перыяд 1960-х гадоў гэта была новая, незвычайная з’ява. Выданне выходзіла раз у два гады і да канца 1980-х гадоў выйшла 14 нумароў, па 4 асобнікі кожны.

Галоўнай справай жыцця А. Белакоза стала стварэнне літаратурна-краязнаўчага музея. Ён быў арганізаваны ў 1968 г. на базе кабінета беларускай мовы і літаратуры. Спачатку месціўся ў адным маленькім пакойчыку. У 1981 г., дзякуючы падтрымцы шэфскай гаспадаркі, да школы была перавезена старая хата, у якой арганізаваны этнаграфічны аддзел музея, у якім адноўлены інтэр’ер сялянскай хаты сярэдзіны XIX ст.

Першая і другая залы музея прысвечаны беларускай літаратуры. У іх можна пазнаёміцца з гісторыяй стварэння музея, лістамі вядомых пісьменнікаў, паэтаў, убачыць фотаздымкі, кнігі з аўтографамі. Сярод унікальных экспанатаў: першае выданне кнігі Ф. Багушэвіча “Дудка беларуская” (1896), арыгінальны здымак выдатнага беларуса, ручка, якой Уладзімір Караткевіч пісаў раман “Каласы пад сярпом тваім”, буквар, выдадзены ў 1918 г. пад рэдакцыяй А. Смоліча і іншыя артэфакты[653]. Трэцяя зала прэзентуе народныя промыслы: ткацтва, кавальства, сталярства, ганчарства, салома і лазапляценне. У чацвёртай зале былі змешчаны творы мастакоў, якія звязаны з беларускай літаратурай[654]. Акрамя таго, раённы аддзел адукацыі патрабаваў, каб у музеі была створана зала баявой і працоўнай славы, што і было зроблена, але значна пазней. У гэтай зале былі прадэманстраваны экспанаты, звязаныя з жыццём і працай простых і выбітных людзей. Паказана праца і бедных сялян, і аднаасобнікаў, і

---

[653] Виртуальная экскурсия по Гудевичскому музею [Электронны рэсурс] // Масты. – Рэжым доступу: http://masty.eu/virtualnaya-ehkskursiya-po-gudevichskomu-muzeyu/.

[654] Жыццё і прыгоды Алеся Белакоза [Электронны рэсурс] // АДВЕЧНАЕ. – Рэжым доступу: //http://belarus.kulichki.net/index.php?option=com_content&task=view&id=902&Itemid=71&limit=1&limitstart=5.



Рэпазіторый ВДУ

кулакоў. Паказаны лёсы людзей, якія ваявалі ў Другую сусветную вайну[655]. Сам А. Белакоз шкадаваў, што ў гэтай зале мала была прадстаўлена дакастрычніцкая гісторыя. Але гэта было асаблівасцю ўсіх музеяў таго часу і ідэалагічным патрабаваннем савецкай музеялогіі і педагогікі.

З будаўніцтвам новай школы вызвалілася шмат падсобных памяшканняў, у якіх сталі ствараць новыя залы. Да 1984 года было ўжо чатыры пакоі, у якіх былі раздзелы: літаратурны, этнаграфічны, гісторыі школы, гісторыі Беларускай сялянска-работніцкай грамады і КПЗБ, народной медыцыны, ільна і ткацтва, гісторыі вёскі Гудзевічы, карысных выкапняў.

З 1990 г. Гудзевіцкі літаратурна-этнаграфічны музей мае статус дзяржаўнага і налічвае больш за 12 тысяч экспанатаў, сабраных настаўнікам разам з вучнямі. На працягу ўсяго часу працы ў школе А. Белакоз разам з вучнямі працягваў займацца збіральніцкай дзейнасцю, удасканальваў экспазіцыі, калекцыі. Досвед працы па далучэнні вучняў да літаратурна-краязнаўчай працы, музейнай справы, а праз выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці любові да каштоўнасцей беларускай гісторыі і культуры А. Белакоз аформіў у некаторых публікацыях[656].

Да ліку выдатнейшых арганізатараў школьнага краязнаўства Беларусі можна аднесці Алега Васільевіча **Куржалава** (18.10.1953, г. Віцебск). Працуючы на пасадзе адказнага сакратара БДТАПГіК Кастрычніцкага раёна г. Віцебска, пачаў займацца вывучэннем і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры падведамственнай тэрыторыі. Сур'ёзна ставячыся да пытання ўліку ахоўных аб'ектаў, рыхтаваў адпаведныя дакументы (інфармацыйныя даведкі, гістарычныя запіскі, абгрунтаванні), неабходныя для ўзяцця пад ахову выяўленых аб'ектаў. Вычытваў і пісаў абгрунтаванні на дасланыя гранкі другога тома "Збору помнікаў гісторыі і культуры", прысвечанага Віцебскай вобласці. Па ягонай ініцыятыве былі ўсталяваны дзве мемарыяльныя дошкі ў Віцебску: адна з іх у гонар паўстання 1863 г. на будынку ратушы (знята і не адноўлена з пачатку рэстаўрацыі будынку).

У першай палове 1980-х гг. з пачаткам руйнавання старой забудовы г. Віцебска (будынкаў па вуліцы Леніна, старой аптэкі на плошчы Свабоды) выказваўся супраць акцый па знішчэнні ахоўваемых аб'ектаў.

У 1984 г. актыўна ўдзельнічаў у працы па выратаванні Пакроўскай царквы, якую планавалася зруйнаваць. Як кіраўнік раённага аддзялення БДТАПГіК, даслаў запыт у "Белрэстаўрацыю" аб гістарычнай каштоўнасці гэтага помніка. Звярнуўся да архітэктараў Віцебска (Я. Калбовіч) з прапановай распрацаваць каляровы праект стварэння ў будынках

[655] Вялікія і жывыя: Інтэрв'ю з Алесем Белакозам [Электронны рэсурс] // Наша зямля. – Рэжым доступу: http://nashaziamlia.org/2011/04/30/4218/. – Дата доступу: 14.08.2015.

[656] Белакоз, А. Школьны літаратурна-краязнаўчы музей / А. Белакоз // ПГіКБ. – 1973. – № 4; Ён жа. Як стварыць этнаграфічны музей у школе // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 8; Ён жа. Гудзевіцкі літаратурна-этнаграфічны музей // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1996. – Т. 3.– С. 170–171.



Репозиторий ВГУ

манастыра карціннай галерэі, залы арганнай музыкі. Падрыхтаваныя матэрыялы даслаў у Маскву, у Міністэрства культуры СССР. Не чакаючы адказу з Масквы, стаў збіраць подпісы пад калектыўнымі лістамі супраць зносу будынка. Такія лісты былі сабраны ад некаторых арганізацыяў, ад будаўнікоў, што у той час працавалі на рэстаўрацыі ратушы. Нарэшце, прыйшоў адказ з Масквы ў Міністэрства культуры БССР, Рэспубліканскі Савет БДТАПГіК і Дзяржбуд, у якім станоўча ацэньвалася ініцыятыва стварэння культурнага комплексу ў будынках былога манастыра. Працы па разбурэнні былі прыпынены, а потым і згорнуты ўвогуле. Новы кіраўнік вобласці – У.В. Грыгор’еў – пераглядзеў справу аб зносе будынкаў манастыра і праз пэўны час прыняў рашэнне аб перадачы будынка праваслаўнай царкве. За дзейнасць, якая перашкодзіла зносу будынка, А. Куржалаў быў выкліканы на парткам і звольнены з працы (з фармулёўкай “няўзгодненасць дзейнасці з кіраўніцтвам”).

Найбольш важны ўклад у развіццё краязнаўства Беларусі А. Куржалаў, зрабіў працуючы на пасадзе загадчыка сектара беларусазнаўства і краязнаўства ў Віцебскім абласным цэнтры пазашкольнай працы. Менавіта тут раскрыўся арганізатарскі талент А. Куржалава, які дазволіў стаць яму з адных найлепшых арганізатараў школьнага краязнаўства на Віцебшчыне. У 1989/90 навучальным годзе ён стаў адным з ініцыятараў і арганізатараў правядзення першай сур’ёзнай справы па нацыянальным адраджэнні ў галіне народнай адукацыі. Былі праведзены экскурсійна-навучальныя спаборніцтвы настаўнікаў г. Віцебска пад назвай “Літаратурная Віцебшчына”. У выніку гэтага мерапрыемства да краязнаўства далучылася значная колькасць настаўнікаў. Гісторыяй сваёй мясцовасці зацікавілася шырокае кола жыхароў горада і вобласці. Шматлікія матэрыялы, сабраныя падчас конкурсу (у тым ліку лісты В. Быкава, якія былі адшуканы на гарышчы бацькоўскай хаты ў в. Бычкі), былі перададзены ў фонды абласнога краязнаўчага музею.

У далейшым (з 1990-х па 2010 г.) А. Куржалавым арганізаваная сістэма школьнага краязнаўства, якая вывела педагогаў Віцебшчыны на першыя месцы ў рэспубліцы. Сістэмная метадычная праца з выкладчыкамі, арганізацыя конкурсаў, канферэнцый, пошук сярод педагогаў таленавітых, здольных на актыўную працу над праектамі, падтрымка і настаўнікаў, і вучняў і іх праектаў на ўсіх узроўнях падрыхтоўкі, выдавецкая дзейнасць, сталі важнейшымі чыннікамі поспеху. Галоўную ролю ў выніковасці віцебскіх настаўнікаў, арганізаваных А. Куржалавым, на нашу думку адыгала і стварэнне сістэмы “пазітыўнай канкурэнцыі”. Сярод краязнаўцаў, якія, як правіла, займаюцца даследаваннямі аднаго краю, на адным матэрыяле часта існуе пэўная канкурэнцыя, зайздрасць, рэўнасць, якія часта пераходзяць ад узроўню ціхай непрыязні да ўзаемнай непавагі, адмове ў сумеснай працы і г.д. А. Куржалаву ўдалося пазбегнуць гэтага. Пастаянна арганізуючы канферэнцыі, семінары, агляды музеяў, вывучэнне і распаўсюджванне лепшага досведу, ён змог скласці пэўнае кола лепшых настаўнікаў краю, якія



Репозиторий ВГУ

змаглі арганізаваць выдатныя музеі ў сваіх школах, рыхтаваць для рэспубліканскіх конкурсаў пераможныя работы. Склалася сітуацыя, калі краязнаўцы не супернічалі, а спаборнічалі, дапамагалі адзін аднаму. На традыцыйныя зборы, якія арганізоўваў аддзел беларусазнаўства і краязнаўства, а таксама канферэнцыі, якія ладзіліся Рэспубліканскім цэнтрам турызму і краязнаўства стараліся прыехаць усе школьныя краязнаўцы з новымі знаходкамі, выдадзенымі кнігамі, падрыхтаванымі даследаваннямі, метадычнымі распрацоўкамі. Сярод лепшых адзначым В. Бандарэвіча (Сянно), А. Бубалу (Верхнядзвінск), В. Грыбко (Чашніцкі раён), В. Ермалёнка (Мёры), Д. Карасёва (Полаччына), Л. Нікіціну (Віцебскі раён), І. Пракаповіча (Паставы), В. Пячонкіна (Орша), Р. Шарыпкіна (Глыбоччына).

Найстарэйшым краязнаўцам Віцебшчыны можна лічыць Іосіфа Аляксандравіча **Быхаўца** (1916). Працуючы завучам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Лынтупскай СШ Пастаўскага раёна (1952–1981), дзеля таго, каб зацікавіць вучняў беларускай мовай (школа мела рускую мову навучання), пачаў знаёміць дзяцей з творчасцю і жыццёвым шляхам пісьменнікаў, з родным краем, гісторыяй Беларусі. Склаў і выдаў летапіс Лынтупаў (1967, 1972). Вынікі краязнаўчай працы па вывучэнні Лынтупаў падсумаваў у кнізе “Лынтупы і наваколле”[657]. Частка матэрыялаў змешчана ў кнізе “Памяць” Пастаўскага раёна. Арганізаваў музей пры Лынтупскай СШ. Аўтар шэрага артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Працаваў пазаштатным карэспандэнтам выданняў “Роднае слова”, “Настаўніцкая газета”, “Пастаўскі край”. Публікаваў артыкулы ў ”ЛіМе”, “Звяздзе”, “Чырвонай Полаччыне”. Браў удзел у арганізацыі краязнаўчых экскурсій. Выдаваў рукапісныя часопісы “Героі жывуць сярод нас”, “Нашы ардэнаносцы”, “Наша радзіма – Беларусь”. Некаторыя нарысы з іх друкаваліся ў раённай газеце.

Адным з найвыдатнейшых краязнаўцаў-педагогаў Віцебшчыны з’яўляецца Вітольд (Вітаўт) Антонавіч **Ермалёнак** (28.07.1954, в. Жэймяны Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.). Яшчэ падчас вучобы ў ГрДУ імя Я. Купалы займаўся ў гісторыка-краязнаўчым гуртку пад кіраўніцтвам прафесара Я.Н. Мараша. Пасля заканчэння ВНУ працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 1 г. Мёры (1976–1981), настаўнікам гісторыі ў СШ № 3 (з 1981 г. па цяперашні час). З 1976 г. у раённым Доме піянераў В. Ермалёнак пачаў весці гурток “Кароткі курс гісторыі Беларусі на прыкладзе мясцовага краю”. Назва праз пэўны час была зменена на больш рамантычную – “Арганаўты мінулага”. Прграма была разлічана на 144 гадзіны і прадугледжвала напачатку практычнае вывучэнне мінулага Мёрскага краю. З 1976 г. разам з гурткоўцамі стаў удзельнічаць у археалагічных раскопках на тэрыторыі Мёрскага раёна, якія праводзілі Л. Дучыц, Э. Зайкоўскі, П. Ціхановіч, В. Шадыра.

---

[657] Быхавец, І. Лынтупы і наваколле: гістарычны нарыс / І. Быхавец. – Паставы: Пастаўская ўзбуйнёная друкарня, 1993. – 84 с.

Непасрэдны ўдзел у археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам спецыялістаў, самаадукацыя далі практычны вопыт, узбагацілі тэарэтычна, далі магчымасць рабіць самастойны аналіз, вывады. З 1990-х гг. археолагі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ВНУ краіны сталі праводзіць менш раскопак, прыцягваючы да іх студэнтаў гістарычных факультэтаў, якія праходзілі археалагічную практыку. Немаючы дазволу на асабістыя раскопкі, разам з гурткоўцамі перайшоў ад археалагічных раскопак да краязнаўчых разведак. Гэта мела свае станоўчыя бакі. Так, на працягу адной вандроўкі па раёне можна было адшукаць месцы раней невядомых гарадзішчаў, паселішчаў, курганных груп. Акрамя археалагічных доследаў, збіралі ўспаміны пра мінулае краю. Праца гуртка набыла сістэмнасць і пераемнасць. Абавязковай стала тэарэтычная падрыхтоўка. У 1980 г. быў створаны герб гуртка. Пачалі весці хроніку гуртка (з 1976 г.).

Праз пэўны час узнікла духоўная патрэба ў падсумаванні знойдзеных знаходак. Узнікла ідэя стварыць музей. У 1970–1980-я гг. у Мёрскім раёне не было ніводнага музея. З прычыны адсутнасці ў школе памяшкання, першая экспазіцыя была створана ў калідоры школы, яна праз пэўны час была разрабавана. Даследчык у 1983 г. выступіў адным з ініцыятараў святкавання 350-годдзя Мёраў[658]. Падрыхтаваў часовую экспазіцыю ў 2-х пакоях у былым будынку пошты, у якім месціўся аддзел культуры Мёрскага райвыканкама. Перадаў больш за 400 экспанатаў, сярод якіх манеты, кнігі, этнаграфічныя матэрыялы. З гэтага пачалося функцыянаванне раённага краязнаўчага музея. Аднак фінансаванне не было прадугледжана, матэрыялы пачалі раскрадацца.

У 1986 г. на аснове знойдзеных матэрыялаў стварыў краязнаўчы музей у СШ № 3. Многія экспанаты з'яўляюцца ўнікальнымі для нашай краіны, нават для Усходняй Еўропы. Напрыклад, фальшывы арабскі дырхем X ст., якога няма нават у Эрмітажы (СПб).

Прыняў актыўны ўдзел у стварэнні экспазіцый Мёрскага, Глыбоцкага і Браслаўскага раённых краязнаўчых музеяў, перадаў туды шэраг знойдзеных матэрыялаў. У Браслаўскім музейным аб'яднанні і Мёрскім краязнаўчым музеі праводзілася 2 персанальныя выставы. Адмовіўся ад прапановы заняць пасаду дырэктара раённага музея (як у свой час ад аспірантуры), бо лічыць, што адміністрацыйная работа вымагае шмат часу. Аказаў дапамогу пры стварэнні шэрага школьных музеяў раёна і вобласці. Перадаў туды частку знойдзеных у час разведак экспанатаў, аказваў кансультацыі. Разам з Т.М. Пацеенак вядзе летапіс СШ № 3 г. Мёр, які на 2008 г. складае 8 тамоў.

У 1963 годзе настаўнікам Эдуардам Сямёнавічам **Корзунам** быў створаны гісторыка-краязнаўчы музей у Гальшанскай школе Ашмянскага

[658] Півавар, М.В. Педагог, краязнаўца, грамадзянін Вітольд Ермалёнак / М.В. Півавар // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., Віцебск, 30–31 сак. 2010 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2010. – С. 232–238.



Репозиторий ВГУ

раёна Гродзенскай вобласці, які з маленькай выставы – калекцыі старадаўніх манет і прыладаў сялянскага побыту з часам пераўтварыўся ў музей рэспубліканскага значэння і мае ганаровае званне “Народны”[659]. Сярод найцікавейшых рэчаў: старажытныя фібулы, агніва, каталог бібліятэкі графа Чапскага і інш. Няўрымслівы краязнаўца і выдатны педагог стаў аўтарам кнігі “Гальшаны”[660]. У 2002 г. Ашмянскі райвыканкам з улікам грамадскай думкі прыняў рашэнне надаць школьнаму музею ў Гальшанах імя Эдуарда Корзуна[661].

Уся краязнаўчая дзейнасць у Валеўскай школе Навагрудскага раёна была арганізавана педагогамі на базе школьнага музея. Ён быў створаны яшчэ ў 1955 годзе. У ім былі гісторыка-этнаграфічны і аддзел прыроды. З прыходам на працу ў 1959 г. настаўнікам Уладзіміра Аляксандравіча **Урбановіча** з’явіўся і літаратурны аддзел. На высокім узроўні ён пачаў вывучаць жыццё і творчасць беларускіх пісьменнікаў, а таксама пісьменнікаў-землякоў. Што найбольш каштоўна, не толькі асабіста, але з вучнямі аб’ехалі на веласіпедах, пешшу абыйшлі, апісалі мясціны, звязаныя з творчасцю пісьменнікаў гэтага краю: Адама Міцкевіча, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Цішкі Гартнага. Атрыманы значныя матэрыялы па літаратурнай Баранавіччыне, Дзятлаўшчыне, Навагрудчыне, Стаўбцоўшчыне, Слонімшчыне, Уздзеншчыне. Разам са зборам матэрыялаў пра пісьменнікаў, праводзіўся збор і вуснай народнай творчасці. На 1980 г. у Валеўскім народным краязнаўчым музеі налічвалася 1895 экспанатаў, з іх 978 – арыгінальных, у тым ліку рэчы, звязаныя з “Хронікай Быхаўца”, з гісторыяй Любчанскай друкарні, матэрыялы пра Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Цёткі, кнігі, паштоўкі, выдадзеныя суполкай “Загляне сонца і ў наша ваконца”, друкарнямі Марціна Кухты і “Нашай нівы”. Шырока была прадстаўлена заходнебеларуская літаратура, а таксама газеты і часопісы таго часу, фотаздымкі беларускіх літаратараў, каштоўныя дакументы[662].

У музеі, як і доме У. Урбановіча, пабывалі дзясяткі дзеячаў беларускай культуры і пісьменнікаў. Сярод іншых Максім Танк, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль, Генадзь Каханоўскі, Уладзімір Калеснік, Ігар Лучанок, Аляксей Карпюк, Барыс Сачанка, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Фёдар Янкоўскі, Ян Скрыган, сваякі Якуба Коласа і Адама Міцкевіча і сотні іншых вядомых асобаў[663].

Сабраныя матэрыялы знайшлі адлюстраванне ў артыкулах, нарысах, рэцэнзіях у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Пісаў пра

---

[659] Лабуніна, В. Стваральнік музея і яго прадаўжальнік / В. Лабуніна // Краязн. газ. – 2012. – № 8, люты. – С. 3
[660] Корзун, Э.С. Гольшаны / Э.С. Корзун. – Мінск: Полымя, 1987. – 85 с.
[661] Жалкоўскі, А. Імя краязнаўцы – яго музею [Электронны рэсурс] / А. Жалкоўскі // Биржа информации. – Рэжым доступу: http://www.gazeta.grodno.by/249/n1.html. – Дата доступу: 23.10.2015.
[662] Чыгрын, С. Педагог, нацыяналіст, дэлегат [Электронны рэсурс] / С. Чыгрын // Новы час. – Рэжым доступу: http://novychas.info/asoba/pjedahoh_nacyjanalist_deliehat/. – Дата доступу: 05.04.2015.
[663] Чыгрын, С. Педагог, нацыяналіст, дэлегат [Электронны рэсурс] / С. Чыгрын // Новы час. – Рэжым доступу: http://novychas.info/asoba/pjedahoh_nacyjanalist_deliehat/. – Дата доступу: 05.04.2015.



Рэпазіторый ВДУ

літаратурныя мясціны і лёсы пісьменнікаў роднага краю, выкладанне беларускай літаратуры ў школе, арганізацыю ў ёй навучальнага працэсу, пра друк Беларусі, беларускі фальклор, людзей культуры.

У 1965 годзе Міністэрства адукацыі БССР зацвердзіла "Праграму літаратурна-краязнаўчых гурткоў для васьмігадовых і сярэдніх школ і пазашкольных дзіцячых устаноў", аўтарам якой з'яўляўся У. Урбановіч. Адным з першых у пасляваенныя гады ён напісаў і выдаў у БССР краязнаўчую кнігу "Па дарагіх мясцінах" (1964), а крыху пазней – кнігу "Шляхамі паэтаў і герояў" (1970). У выданнях аўтар дзяліўся вопытам краязнаўчай работы па беларускай літаратуры ў сваёй Валеўскай СШ, распавядаў пра школьны літаратурны гурток, музей, паходы.

Настаўнік, краязнавец, музейны работнік Міхась Фёдаравіч **Петрыкевіч** (1913–1999) за сваё жыццё прычыніўся да стварэння адразу некалькіх вядомых музеяў. Працуючы завучам у Валеўскай СШ Навагрудскага раёна, стварыў у ёй краязнаўчы музей. Дапамагаў яму ў гэтым і настаўнік Уладзімір Урбановіч. Музей у Валеўцы стаў цэнтрам краязнаўчай і выхаваўчай працы ў школе і стаў вядомы на ўсю Беларусь. За створаную сістэму працы М.Ф. Петрыкевіч быў уганараваны званнем заслужанага настаўніка БССР (1965), а музею было прысвоена званне народнага (1968). У 1967 г. М. Петрыкевіч пераехаў у г. Дзятлава Гродзенскай вобласці і адразу пачаў шукаць матэрыялы ў вёсках і мястэчках раёна, праводзіць даследчую працу ў архівах, бібліятэках, музеях. Вынікам стала адкрыццё Дзятлаўскага раённага музея народнай славы (1968). За сваё жыццё Міхась Петрыкевіч быў узнагароджаны шматлікімі дыпломамі, медалямі, ганаровымі граматамі. Дзякуючы нястомнай пошукавай і даследчай працы, М. Петрыкевічу ўдалося вярнуць імёны дзясяткаў слаўных асоб краю. З яго ініцыятывы былі ўсталяваны помнікі і адкрыты мемарыяльныя шыльды. Вынікі сваіх краязнаўчых даследаванняў друкаваў у рэспубліканскіх і мясцовых газетах і часопісах. Вёў перапіску з Я. Брылём, А. Іверсам, У. Калеснікам, У. Караткевічам, Я. Скрыганам і іншымі беларускімі пісьменнікамі. Данінай памяці стала пасмяротнае занясенне ў 2013 г. імя М. Петрыкевіча ў ганаровую Кнігу славы Дзятлаўскага раёна, а таксама выданне намаганнямі слонімскага краязнаўцы С. Чыгрына кнігі артыкулаў руплліўцы і ўспамінаў пра яго[664].

Педагог, краязнавец, літаратар "Заслужаны настаўнік БССР" (1967) Апанас **Цыхун** (1910–2005) стварыў у в. Лаша Гродзенскага раёна ўнікальны музей Яўхіма Карскага, пра які ведалі далёка за межамі Беларусі[665]. Аўтар соцен артыкулаў пра славутых землякоў: М. Пачобута-Адляніцкага, І. Легатовіча, А. Баліцкага, К. Якаўчыка, А. Грыгаровіча,

---

[664] Петрыкевіч, М. Народжаны вечнасць тварыць: краязнаўчыя артыкулы, успаміны, пісьмы / М. Петрыкевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 200 с.

[665] Каханоўскі, Г. Педагог – краязнавец / Г. Каханоўскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 8. – С. 75–76

М. Краўцова, Г. Капыцкага і інш[666]. Напісаў і выдаў кнігу "Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф. Карскі" (1992), зборнік "Песні з народных глыбіняў" (2000). Напрыканцы жыцця была выдадзена кніга ўспамінаў А. Цыхуна "Пройдзеныя шляхі-пуцявіны" (2003)[667].

Настаўнік, краязнаўца Іван Пятровіч **Драўніцкі** (06.05.1932, в. Гвоздавічы Свянцянскага пав. Віленскага ваявод. (цяпер Пастаўскі р-н), усё жыццё адпрацаваў настаўнікам беларускай мовы і дырэктарам Куцькаўскай школы (1958–1992).

Краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1960 г. у Камароўскай (Куцькаўскай) СШ Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Вялікі ўплыў на краязнаўчую дзейнасць аказалі І. Быхавец, Я. Якубоўскі, А. Мальдзіс, М. Улашчык, М. Ермаловіч, Г. Каханоўскі[668]. Комплексна даследуе Свіршчыну, Нальшаншчыну – край, які цяпер уваходзіць у склад Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцей. Распрацоўвае тэмы "Славутыя землякі", "Легенды і паданні краю", вывучае мікратапаніміку наваколляў. Зрабіў цікавыя знаходкі. Доўгі час з'яўляўся кіраўнікам клуба "Валошкі".

Шмат артыкулаў на краязнаўчую тэматыку апублікаваў у кнізе "Памяць" Пастаўскага раёна, часопісах "Куфэрак Віленшчыны", "Байрам", "Нашы карані", "Роднае слова" (урок-распрацоўка прысвечана літаратурнай карце Мядзельшчыны), "Праблемы выхавання", раённых газетах: "Астравецкая праўда", "Нарачанская зара", "Пастаўскі край".

На падставе вялізнай збіральніцкай працы, а таксама працы ў архівах выдадзены кнігі "Мая Віленшчына" (2004), "Мястэчка пры Полацкім тракце" (2005), "Касцёл у Канстанцінаве", у суаўтарстве "Пацеркі хваляў і сосен бурштын". Мае некалькі кніг у рукапісах: "Гісторыя вёскі Куцькі", "Мястэчка Свір", "Радавод Драўніцкіх"

На пачатку 1970-х гг., фізік па адукацыі, Аляксандр (Алесь) Пятровіч **Госцеў** (02.05.1948) захапіўся краязнаўствам. Тады ж пачаў рабіць краязнаўчую картатэку: збіраў звесткі, імёны, даты па гісторыі Гродзеншчыны. У той жа час пазнаёміўся з Аркадзем Падліпскім, калекцыянерам паштовак з Віцебска. Аднойчы ён прывёз у Гродна брашурку "Храналогія Віцебска". Тады А. Госцеў вырашыў стварыць падобнае выданне, прысвечанае Гродну[669]. У 1986 г. на адным з паседжанняў клуба "Паходня" такая тэма абмяркоўвалася. Ведаючы, што А. Госцеў шмат збірае матэрыялу па храналогіі горада, прапанавалі

[666] Даніловіч, М.А. Цыхун А. [Электронны рэсурс] / М.А. Даніловіч // Лінгвістычнае краязнаўства Гродзеншчыны. – Рэжым доступу: // http://ebooks.grsu.by/ling_grodno/tsykhun-apanas-pyatrovich.htm. – Дата доступу: 12.09.2015 г.

[667] Цыхун Апанас Пятровіч // Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны / А. Пяткевіч. – Гродна, 2000. – С. 316–317.

[668] Высоцкі, А. Іван Драўніцкі: "Родная мова як паветра, як зямля, як маці" [Электронны рэсурс] / А. Высоцкі // Рэгіянальная газета. – Рэжым доступу: http://www.rh.by/by/238/10/7246/. – Дата доступу: 12.09.2015.

[669] Госцеў, А. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.) / А. Госцеў, В. Швед. – Гродна: Выданне НВК "Пергамент", 1993. – 320 с.

Репозиторий ВГУ

падрыхтаваць нешта кшталту даведніка[670]. Удзел у працы па яго стварэнні прыймаў таксама М. Ткачоў, а потым В. Швед, матэрыялы якіх папоўнілі кнігу А. Госцева амаль на трэць.

Грунтоўныя веды А. Госцева па гісторыі Гродна сталі падставай рэдакцыі "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" звярнуцца менавіта да яго з прапановай напісаць артыкулы "Гродна", пра гісторыка Я.Ф. Арлоўскага, вялікага князя Літоўскага, караля Рэчы Паспалітай С. Баторыя і іншых. Разам з іншымі даследчыкамі ён стаў суаўтарам кніг "Горадзен", "Горадня", "Я хацеў бы спаткацца з вамі" (прысвечана М. Багдановічу). Менавіта ён стварыў генеалагічнае дрэва гродзенскіх князёў.

Майсей Абрамавіч і Рувім Якаўлевіч **Рыцы**, працуючы на пасадах дырэктароў СШ у г. Верхнядзвінску, зрабілі значную справу ў арганізацыі краязнаўчага вывучэння краю. М.А. Рыц заснаваў у 1960 г. краязнаўчы музей ў СШ № 2, першы ў Верхнядзвінскім раёне, досвед сваёй працы абагульніў у брашуры "Краеведение – живая школа воспитания"[671]. Р.Я. Рыц стварыў і ўзначальваў на працягу трыццаці гадоў музей баявой славы ў СШ № 1.

Краязнаўчая дзейнасць дырэктара СШ № 3, потым № 8 г. Полацка Сцяпана Антонавіча **Клокава** (1909–1992) прыпала на другую палову XX ст. Ён аказаў значную дапамогу ў даследчай рабоце, якую вялі ў Полацку навукоўцы: А.Р. Мітрафанаў, М.К. Каргер, Г.В. Штыхаў. З дапамогай апошняга С. Клокаў узяў на ўлік усе помнікі Расонскага раёна. Матэрыялы даследчыка былі ўлічаны пры стварэнні карты археалагічных помнікаў. Падрыхтаваў і чытаў многія гады лекцыі пра помнікі археалогіі роднага краю, пра іх захаванне, пра старажытныя помнікі Полацка. Надрукаваў па гэтых тэмах шэраг артыкулаў у перыядычным друку: газетах "Віцебскі рабочы", "Сцяг камунізма", "Полацкі веснік" і іншых. Вывучаў падзеі вайны 1812 г. на Полаччыне і ўдзельнікаў гэтых падзей. Сабраныя матэрыялы пра генерала Я.П. Кульнёва перадаў у Клясціцкую СШ. Шмат гадоў збіраў звесткі пра героя грамадзянскай вайны У.М. Азіна. На аснове сабраных матэрыялаў і дакументаў (успаміны родных, першага настаўніка, баявых паплечнікаў, землякоў і шэрага інш.) быў створаны музей У.М. Азіна у школе, дзе на той час працаваў С.А. Клокаў. Арганізаваў збор матэрыялу пра Я. Фабрыцыўса, што кіраваў у Полацку школай Чырвоных афіцэраў (1921–1923)[672]. Страціўшы зрок у 1977 г. працягваў займацца грамадскім жыццём і вывучэннем краю.

Іван Іванавіч **Волкаў** (1930 – ~2001), настаўнік, краязнаўца, паэт, больш за 20 гадоў узначальваў школу ў вёсцы Псуя Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Збіраў фальклорныя, этнаграфічныя матэрыялы: прымаўкі, прыказкі, мясцовыя гаворкі, народныя песні, прыпеўкі, побыт,

---

[670] Госцеў, А. Твой стыль [Электроннае выданне] / А. Госцеў. – Рэжым доступу: http://www.t-styl.info/by/114/society/9502/. – Дата доступу: 12.09.2015.
[671] Риц, М.А. Краеведение – живая школа воспитания. Из опыта работы СШ 2 г. Верхнедвинска / М.А. Риц. – Минск: Нар. асвета, 1966. – 32 с.
[672] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны. – С. 154–155.



Рэпазіторый ВДУ

вераванні, замовы, легенды і паданні роднай мясцовасці. Даследаваў мясцовую тапаніміку. Аўтар рэцэнзій на даведнікі, слоўнікі, энцыклапедыі, у якіх аналізаваў змешчаныя ў кнігах матэрыялы, якія мелі дачыненне да Глыбоччыны. Даслаў у Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі больш за 500 мясцовых прыкладаў да слоўніка гаворак Я. Драздовіча "Слоўнік гаворак Дзісненшчыны". Склаў слоўнік мясцовых гаворак вёскі Псуя. Асаблівую каштоўнасць выклікаюць матэрыялы па тапаніміцы, лексіцы, разам з якімі дае тлумачэнні словаў з прыкладамі іх ужывання.

Браў удзел у падрыхтоўцы выдання кнігі "Памяць" Глыбоцкага раёна. Шэраг матэрыялаў апублікаваў на старонках газет "Звязда", "Шлях Перамогі". Удзельнічаў у конкурсе "Агульны сшытак", які абвясціла газета "Звязда", атрымаў першае месца за збор матэрыялаў у намінацыі "Сам сабе чараўнік". Значная колькасць сабраных матэрыялаў аформлена ў форме рукапісу "Дыяменты роднай мовы", які захоўваецца ў Глыбоцкім краязнаўчым музеі[673].

Пасля вайны ў г. Сураж Суражскага раёна пражывала Валянціна Цімафееўна **Кухарава** (1922–2009). Працуючы настаўніцай геаграфіі ў Суражскай СШ (1960–1977) яна звярнула ўвагу на тое, што мясцовыя жыхары амаль не цікавяцца роднай гісторыяй. Звязвала гэта з тым, што большая частка жыхароў горада была не мясцовымі: яўрэяў, якія складалі значную частку насельніцтва мястэчка, знішчылі ў часы вайны немцы, людзі, якія перасяліліся у горад, былі ў большасці абыякавымі да гісторыі краю. Таму, працуючы ў школе, пачала збіраць матэрыялы і друкаваць артыкулы пра жыццёвыя лёсы людзей, якія ўдзельнічалі ў вайне. Потым, пачала пісаць пра славутых жыхароў горада, якія бралі ўдзел у лакальных канфліктах, выпрабаваннях ядзернай зброі, мелі дачыненне да пабудовы касмадромаў СССР і інш. Першыя матэрыялы былі прысвечаны ўдарнікам камуністычнай працы. Сярод іншых накірункаў перавагу надавала: пошукаваму руху (выяўленні імёнаў і лёсаў салдат, загінуўшых на тэрыторыі Суражчыны), высвятленню жыццёвых лёсаў землякоў, асветніцкай працы сярод мясцовага насельніцтва, збіраннем матэрыялаў, арганізацыі і кіраўніцтву школьным музеем.

Важнейшымі заслугамі і дасягненнямі В.Ц. Кухаравай у развіцці краязнаўства Віцебшчыны, з'яўляецца асветніцкая дзейнасць сярод жыхароў горада Суража, грамадскія ініцыятывы, пошукавая дзейнасць і аднаўленне гістарычнай памяці мясцовага насельніцтва. У Суражы пры жыцці краязнаўцы бытавала прымаўка – "У Суражы ўсе ведаюць толькі бацюшку і Кухараву".

Штогод на працягу 1940–1980-х гг. праводзіла турысцка-краязнаўчыя паходы для дзяцей СШ № 1 г.п. Лёзна настаўніца беларускай, нямецкай, рускай моваў Марыя Данілаўна **Ермалаева** (05.09.1923 в. Бубнова

[673] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны. – С. 60.

Рэпазіторый ВДУ

Лёзненскага р-на Віцебскай вобл.). Удзельнічала ў стварэнні музея народнай славы СШ № 1 г.п. Лёзна, ваенна-гістарычнага музея (цяпер раённы краязнаўчы музей). Брала ўдзел у стварэнні кнігі “Памяць” Лёзненскага раёна. Друкавала некаторыя матэрыялы на старонках раённай газеты “Сцяг Перамогі”. Перадала шэраг матэрыялаў у раённы краязнаўчы музей, музей СШ № 1 г.п. Лёзна, Лёзненскі РАА[674].

Асобна сярод краязнаўцаў-аматараў, якія ў большасці з’яўляюцца педагогамі варта вылучыць асоб, якія займаюцца **пошукавым рухам**. Традыцыйна, першае месца ў краіне належыць Віцебшчыне. Найбольш вядомымі педагогамі з’яўляюцца Л.Н. Бруева, Я.А. Трапезнікава, А.А. Бурдо, І. Гутнікаў, Т.П. Марчык, Р. Шарай[675]. Старэйшым “пошукавікам” Віцебшчыны з’яўляецца Яўгенія Анатольеўна **Трапезнікава** (снежань 1931). Працуючы настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў СШ № 2 г. Новаполацка (з 1968 г.), яна стала ініцыятарам стварэння і арганізатарам школьнага музея баявой славы. На яго аснове стварыла ў сваім класе атрад чырвоных следапытаў “РВС” (“Разведчики воинской славы”), які пазней быў ператвораны ў пошукавы клуб. Асноўнымі накірункамі дзейнасці аб’яднання сталі: добраўпарадкаванне і дагляд воінскіх магілак, удзел у раскопках на месцах баёў, устанаўленне звестак пра загінуўшых асоб у гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамога і падтрымліванне адносін з ветэранамі, удзел у Вахтах памяці, выданне школьнай штомесячнай газеты “Следопыт”.

У 1960–1980-я гг. удзельнікі пошукавага клуба ўсталявалі мемарыяльную дошку (1969) ў в. Рубанава Полацкага р-на на месцы партызанскай пераправы, узвялі помнік на брацкай магіле ў в. Грышына Расонскага р-на (1975) і вызначылі імёны 170 загінуўшых савецкіх салдат 28-й стралковай дывізіі. Членамі клуба вызначана 7 месцаў гібелі самалётаў. У 1983 г. устанавілі прозвішчы лётчыкаў, загінуўшых на самалёце Іл-2, а ў 1985 г. узвялі ў г. Новаполацку на месці гібелі экіпажа памятны знак. Усяго дзякуючы даследчай працы членамі клуба і савета музея баявой славы ў горадзе ўстаноўлена чатыры помнікі, а ў Полацкім раёне 4 мемарыяльныя дошкі і 3 помнікі. Я.А. Трапезнікава – аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, кнігі “Мы ищем на земле ровесников следы”, у якой змешчаны нарысы па гісторыі і дзейнасці “РВС”, сцэнарыі патрыятычных мерапрыемстваў.

Адной з самых выбітных асоб у беларусім пошукавым руху, стваральнікам і ў свой час прэзідэнтам Беларускай асацыяцыі пошукавых клубаў “Пошук” з’яўляецца Ларыса Навумаўна **Бруева** (24.02.1953, г. Віцебск). Скончыла ПТВ № 96 г. Віцебска, дзе і засталася працаваць майстрам (1969–1990), была на розных пасадах у Віцебскім абласным аб’яднанні пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі (1990–2006).

---

[674] Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны. – С. 48.

[675] Поисковое движение на Витебщине [Электронны рэсурс] // Витьбичи. – Рэжым доступу: http://www.vitbichi.by/?p=13841. – Дата доступу: 22.02.2015.

Репозиторий ВГУ

Заняткі турызмам садзейнічалі ўключэнню ў актыўны пошукавы рух. У 1969 г. стварыла ў ПТВ турысцкі клуб "Искатель". У адным з паходаў па Беларусі пазнаёмілася з М.Р. Гаравым, які адзін з першых у краіне стаў займацца пошукавай дзейнасцю. Наведаўшы музей, створаны ў адным з Гомельскіх ПТВ, узнікла ідэя заняцца пошукавай дзейнасцю больш сур'ёзна. У 1983 г. клубам было прынятае рашэнне стварыць музей 953-га Віцебскага штурмавога авіяпалка. Пачалі працу па збору матэрыялаў пра баявы шлях гэтага воінскага злучэння. У выніку шматгадовай дзейнасці ў ПТВ № 96 г. Віцебска быў створаны музей авіяпалка. У 1990 г. музею было нададзена званне "народнага". Шляхам правядзення гутарак з мясцовымі жыхарамі сталі шукаць месцы гібелі савецкіх самалётаў.

Актыўна ўключыўшыся ва Усесаюзны пошукавы рух сталі браць удзел у правядзенні Вахтаў памяці. Выступіла ініцыятарам і адным з арганізатараў пошукавага летніка аддзела народнай адукацыі на воз. Лосвіда (лета 1990 г.). Стала ініцыятарам і арганізатарам стварэння асацыяцыі пошукавых клубаў Віцебскай вобласці (1990), потым і Беларускай арганізацыі. Арганізатар правядзення Вахтаў памяці 1991 г. (г. Віцебск/в. Арлова), 1992 г. (в. Заронава), 1995 г. (Дубровенскі раён).

З мэтай каардынацыі дзейнасці пошукавых атрадаў вобласці і рэспублікі выспела рашэнне аб стварэнні рэспубліканскай асацыяцыі пошукавых клубаў. Па прапанове дырэктара Рэспубліканскага цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій Міністэрства адукацыі С.С. Мітраховіча такая асацыяцыя была створана на аснове віцебскага абласнога аб'яднання, якое ўключала 12 пошукавых атрадаў і клубаў. Рэспубліканская асацыяцыя пошукавых клубаў "Пошук" (Поисковые отряды школ, училищ, клубов) была зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі ў сакавіку 1995 г. прэзідэнтам стала Л.Н. Бруева, намеснікамі – Мікалай Мікалаевіч Дубовік і Надзея Сцяпанаўна Астапенка.

Ініцыятар стварэння некалькіх помнікаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці: лётчыкам 953-га штурмавога авіяпалка на 10-м кіламетры шашы Віцебск–Масква (непадалёк ад в. Вароны), дзе 03.02.1944 г. было збіта 7 экіпажаў гэтай воінскай часці. У некалькіх вёсках Сенненскага раёна, на месцы баёў танкавай бітвы 06–07.07.1941 г. (каля в. Чарнагосце), у гонар байцоў салдат 1-й Маскоўскай штурмавой камсамольскай брыгады.

Рыгор Сцяпанавіч **Шарай** (17.02. 1954, г. Орша) зацікавіўся пошукавай справай яшчэ ў час вучобы ў педвучылішчы. У 1988 г. арганізаваў у ПТВ № 110 г. Оршы ваенна-парыятычны клуб "Русічы". Асноўная тэма даследаванняў – падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Аршаншчыне і ўшанаванне памяці загінуўшых воінаў Савецкай Арміі. Члены клуба займаюцца пошукам і пахаваннем загінуўшых воінаў на тэрыторыі Аршанскага і Дубровенскага раёнаў, а таксама ў іншых раёнах Віцебскай вобласці, Беларусі, аднаўленнем іх імёнаў, выязджаюць на Вахты памяці ў Расійскую Федэрацыю. Па выніках працы ў ПТВ № 110

Репозиторий ВГУ

быў створаны музей гісторыі вызвалення Оршы і дзейнасці пошукавага клуба "Русічы" (1992). Даследуе тэму вядомых землякоў. Збірае матэрыял для кнігі "Земля умеет говорить", якая прысвечана лёсу загінуўшых і прапаўшых без вестак воінаў пры вызваленні Аршаншчыны і дзейнасці клуба па аднаўленні памяці пра загінуўшых.

Думаем, што варта было б стварыць **помнік беларускаму краязнаўцу.** У многім менавіта дзякуючы адданай працы гэтых людзей захоўваецца сувязь пакаленняў, традыцыі ў малых гарадах і вёсках нашай краіны.

Па меркаваннях некаторых даследчыкаў, такі помнік ужо ёсць. У ліпені 2015 г. у г. Глыбокім Віцебскай вобл. устанавілі манументальна-дэкаратыўную скульптуру "Дзед-глыбачанін". Скульптура адлюстроўвае пажылога інтэлігентнага мужчыну ў капелюшы, на каленях у якога ляжыць кніга. Мужчына вяртаецца з рыбалкі, а ў лодцы знаходзіцца злоўленая рыба. Побач з мужчынам сядзіць кот. За фігурай дзеда ўзвышаюцца абрысы глыбоцкіх храмаў: касцёла і царквы, якія сімвалізуюць духоўнасць, добрасуседства вернікаў розных канфесій.

Гэта збіральны вобраз жыхара горада. Але прататыпам яго з'яўляецца настаўнік, краязнаўца з Глыбокага Аляксандр Антонавіч **Сабалеўскі**[676]. У 1926 г. ён скончыў сацыяльна-гістарычнае аддзяленне педфака БДУ. Вось як пра вучобу ўспамінаў ягоны сын – Антон Сабалеўскі: "Мой бацька, якому таксама, як і М.М. Улашчыку пашчасціла вучыцца ў першым беларускамоўным па духу ўніверсітэце, слухаць лекцыі, рыхтаваць семінарскія, курсавыя і дыпломную працу пад кіраўніцтвам славутых беларускіх гісторыкаў У.І. Пічэты, М.В. Доўнар-Запольскага, З.І. Даўгалы, выкладчыкаў-прафесараў А. Смоліча, І.І. Замоціна і іншых"[677]. Да вайны А. Сабалеўскі жыў у Мінску. У першыя дні вайны ён патрапіў пад зачыстку органаў НКУС. Калону вязняў гналі па дарозе на Чэрвень. А. Сабалеўскаму пашчасціла – калону канваіры распусцілі, а не расстралялі, як гэта было, напрыклад, у мястэчку Ула на Віцебшчыне. А. Сабалеўскі з сям'ёй пешшу прыйшлі з Мінска ў акупаванае немцамі Глыбокае. Выкладаў на настаўніцкіх курсах пад нямецкай акупацыяй. Пасля вайны А. Сабалеўскі не быў арыштаваны і працягваў педагагічную дзейнасць.

Яшчэ ў 1950-я – пачатку 1960-х гг. ён напісаў "Гістарычны нарыс г. Глыбокае з 1235–1963 гг.". Дастаткова смелая на тыя часы праца, у якой падавалася гісторыя горада не толькі савецкага перыяду, але і дарэвалюцыйнага часу. Прычым, з нацыянальна-арыентаваных пазіцый, амаль без жорсткай крытыкі феадалаў і прыгнятальнікаў. Паказвалася побытавая і канфесійная гісторыя з адзначэннем станоўчай ролі каталіцкіх

[676] Скульптуру "Дзед-глыбачанін" адкрылі ў Глыбокім [Электронны рэсурс] // Наша ніва. – Рэжым доступу: // http://nn.by/?c=ar&i=152355. – Дата доступу: 14.07.2015.
[677] Каментары [Электронны рэсурс] // Наша ніва. – Рэжым доступу: http://m.nn.by/ru/articles/152355/comments/. – Дата доступу: 23.09.2015.



Репозиторий ВГУ

ордэнаў у развіцці гаспадаркі краю. Рукапіс захоўваецца ў Занальным архіве ў г. Глыбокім[678]. Лёс і дзейнасць на ніве краязнаўства А.А. Сабалеўскага дазваляюць лічыць скульптуру і помнікам краязнаўцу Беларусі.

Абагульняючы сказанае, адзначым, што ў другой палове XX ст. краязнаўцы-аматары знаходзіліся па-за межамі афіцыйнага гістарычнага дыскурсу. Абмежаваныя ў тэмах і трактоўках падзей, яны маглі быць абвінавачаны ў "мелкотемье", наўмысным скажэнні сэнсу стваральнай працы савецкага народа, ці нават у нацыяналізме. Па сутнасці, абвінавачванні, якія былі высунуты краязнаўцам ў 1929 г., не былі зняты ў БССР да 1991 г. За гэта іх, праўда, не растрэльвалі і не высялялі ў Паўночныя раёны СССР.

Грамадская краязнаўчая праца па вывучэнні роднага краю канцэнтравалася галоўным чынам вакол школьных настаўнікаў, краязнаўцаў-аматараў, некаторых краязнаўчых музеяў, дзейнасць якіх залежала ад актыўнай грамадзянскай пазіцыі кіраўніка ці супрацоўнікаў. Краязнаўства было справай "піянераў і пенсіянераў". Праўда соцень і тысяч. Але гісторыкі і выкладчыкі ВНУ рэдка займаліся менавіта краязнаўчымі даследаваннямі.

Трэба сказаць, што пэўнае зняважлівае стаўленне прафесійных гісторыкаў да краязнаўцаў мае месца і ў нашы дні. Яно заснавана на старых стэрэатыпах пра дылетанцтва краязнаўцаў-аматараў, нізкі ўзровень іх падрыхтоўкі, ігнараванне метадаў гістарычнага даследавання.

Тым не менш краязнаўцы-аматары адыгралі важную ролю ў развіцці даследаванняў гісторыі "малой Радзімы". Праз сустрэчы са школьнікамі, выступленні ў якасці кансультантаў па асобных пытаннях мясцовай гісторыі і культуры, стварэнне асабістай (часта непрафесійнай) інфармацыйнай базы звестак пра родны край, выступленні ў рэспубліканскім і мясцовым друку яны фарміравалі цікавасць да гістарычнага лёсу Радзімы і жаданне мясцовага насельніцтва да вывучэння гісторыі краю. У адрозненне ад навукоўцаў краязнаўцы-аматары мелі больш свабоды ў выражэнні сваіх думак і меркаванняў. Вузкая выдавецкая база не давала магчымасці аматарам, як, між іншым, часта і навукоўцам, друкаваць свае матэрыялы. Нягледзячы на абмежаванні і ідэалагічныя патрабаванні свайго часу (1960–1980-я гг.), краязнаўцы зрабілі значны ўклад у развіццё гісторыі і культуры краіны. Навуковае даследаванне іх дзейнасці патрабуе далейшых даследаванняў.

[678] Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. – Фонд 200. – Воп. 1. – Спр. – 2. Рукапіс "Исторический очерк г. Глубокое за 1235–1963 гг." // Цытавана па: Краткий справочник по фондам учреждения зональный государственный архив в г. Глубокое. – С. 243–248.



Репозиторий ВГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі

1. На працягу 1960–1980-х гадоў найбольшы ўклад у вывучэнне рэгіёнаў Беларусі быў унесены інстытутамі АН БССР, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, дзяржаўнымі і ведамаснымі музеямі, архівамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі. Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці з'яўляліся: навуковае вывучэнне гісторыі і культуры рэгіёнаў краіны, ахова помнікаў, збор і вывучэнне дакументаў і матэрыялаў па гісторыі краю, асветніцкая дзейнасць. У развіцці гістарычнага краязнаўства даследуемага перыяду галоўную ролю адыграла партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР праз вызначэнне асноўных накірункаў дзейнасці, фінансаванне дзяржаўных устаноў і даследаванняў, назначэнне на адказныя пасады партыйных работнікаў.

Цэнтральнае месца ў структуры дзяржаўнага краязнаўства на працягу 1960–1980-х гг. займалі Інстытут гісторыі і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, якія з'яўляліся арганізуючымі і метадычнымі цэнтрамі для дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый. Дзяржаўнымі навуковымі ўстановамі была праведзена значная праца па вывучэнні рэгіёнаў краіны. На гістарычных факультэтах у вышэйшых навучальных установах быў уведзены курс гістарычнага краязнаўства, які выкладаўся па распрацаванаму выкладчыкамі БДУ падручніку "Историческое краеведение Белоруссии", праводзіліся краязнаўчая, археалагічная, музейная, архіўная практыкі, рыхтаваліся курсавыя і дыпломныя работы на мясцовым матэрыяле, што садзейнічала больш глыбокаму вывучэнню рэгіёнаў краіны. Мясцовыя краязнаўчыя музеі сталі арганізуючымі і каардынуючымі цэнтрамі краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах краіны, забяспечвалі збор інфармацыі па гісторыі і культуры краю, яе захаванне і выкарыстанне ў мэтах выхавання насельніцтва. Вялікая збіральніцкая, асветніцкая, бібліяграфічная праца краязнаўчай накіраванасці праводзілася архівамі, бібліятэкамі, спецыялізаванымі ўстановамі краіны. Значную ролю ў падрыхтоўцы і выданні краязнаўчай літаратуры адыграла выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя".

Вылучаюцца два асноўныя этапы развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі. На працягу першага (1961–1985 гг.) былі праведзены грунтоўныя археалагічныя даследаванні ў рэгіёнах краіны, адбылося фарміраванне грамадскай сістэмы аховы помнікаў, росквіт галоўных напрамкаў школьнага краязнаўства: турысцкага, музейнага і пошукавага. З пачаткам палітыкі "перабудовы" пачынаецца новы этап (1985–1991 гг.), які працягваецца да атрымання нашай краінай суверэнітэту і характарызуецца актывізацыяй краязнаўчай дзейнасці дзяржаўных устаноў і арганізацый, павелічэннем грамадскай актыўнасці насельніцтва, пашырэннем тэматыкі і

Рэпазіторый ВДУ

колькасці краязнаўчых даследаванняў, некаторай зменай у метадалагічных падыходах. Дзяржаўнымі навуковымі ўстановамі і ВНУ Беларусі, грамадскасцю краіны вызначаны шэраг мерапрыемстваў па адраджэнні гістарычнай спадчыны, ажыццяўленне якіх праводзілася пазней. У той жа час на развіцці краязнаўства гэтага этапу адмоўна адбілася палітызацыя грамадства, сацыяльная нестабільнасць і, асабліва, эканамічны крызіс, які абвастрыўся на пачатку 1990-х гг. Абмежаванасць тэматыкі даследаванняў на папярэднім этапе абумовіла ў другой палове 1980-х гг. павышаную цікавасць да так званых “белых плям гісторыі”, што выклікала залішні радыкалізм у ацэнцы савецкага перыяду і прывяло ў пэўных выпадках да міфалагізацыі гісторыі.

2. У 60–80-я гады ХХ ст. важную ролю ў развіцці грамадскага краязнаўства адыграла Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК). Таварыства прыцягнула да краязнаўчай працы значную колькасць насельніцтва краіны. Паступова склаліся асноўныя напрамкі дзейнасці таварыства, была створана грамадская сістэма аховы гісторыка-культурнай спадчыны, адрэстаўравана, адноўлена і збудавана вялікая колькасць помнікаў гісторыі і культуры і мемарыялаў мясцовага і рэспубліканскага значэння, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Значная колькасць помнікаў Беларусі захавалася выключна дзякуючы дзейнасці таварыства. У той жа час шэраг культавых помнікаў быў знішчаны нягледзячы на захады таварыства. Былі падрыхтаваны і надрукаваны дзясяткі выданняў краязнаўчай тэматыкі. Істотную ролю ў развіцці краязнаўчага руху адыграў бюлетэнь “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, які выдаваўся таварыствам. Вопыт, назапашаны ў справе аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, рабіў БДТАПГіК своеасаблівым пастаўшчыком кадраў для савецкіх помніказберагаючых устаноў. Значную ролю ў развіцці грамадскага краязнаўства адыгралі ЛКСМБ, таварыства “Веды”, піянерская і некаторыя іншыя грамадскія арганізацыі. Дзякуючы іх дзейнасці адбыліся змены ў грамадскай думцы адносна помнікаў гісторыі і культуры.

З другой паловы 1980-х гадоў адметную ролю ў развіцці гістарычнага краязнаўства адыгралі рэспубліканскія грамадскія аб’яднанні: краязнаўчая камісія Беларускага фонду культуры, Беларускае краязнаўчае таварыства, рэгіянальныя культурна-асветніцкія таварыствы “Талака”, “Паходня”, “Узгор’е”, “Машэка” і іншыя. Дзейнасць грамадскіх арганізацый краязнаўчай накіраванасці садзейнічала пашырэнню тэматыкі гістарычных даследаванняў. Сваімі даследаваннямі, пошукам і вывучэннем матэрыялаў, публікацыямі ў рэспубліканскім і мясцовым друку краязнаўцы-аматары ўнеслі значны ўклад у выхаванне патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі.

3. У 1960–1980-я гг. у краіне была створана дзейсная сістэма школьнага краязнаўства, у якім асноўнымі напрамкамі былі турысцка-

краязнаўчы, музейны і пошукавы рух. Прыярытэт атрымаў турысцка-краязнаўчы, які таксама спрыяў дзейнасці музейнага і пошукавага. На працягу 70–80-х гг. ХХ ст. арганізуючую і каардынуючую ролю ў развіцці ўсіх трох напрамкаў школьнага краязнаўства адыгрывала Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя Міністэрства асветы БССР, якая мела абласныя і раённыя філіялы. У арганізацыі і правядзенні комплексу мерапрыемстваў па вывучэнні краіны важную ролю адыграла Усесаюзная турысцка-краязнаўчая экспедыцыя “Мая Радзіма – СССР” і мэтавыя экспедыцыі. Пошукавы рух са справы адзінак энтузіястаў ператварыўся ў шырокі грамадскі рух, які падтрымліваўся як КПБ, ЛКСМБ, Міністэрствам адукацыі, так і Міністэрствам абароны. Дзякуючы працы пошукаўцаў былі вернуты з нябыту тысячы імёнаў абаронцаў Айчыны, якія паклалі сваё жыццё за яе незалежнасць. Значным дасягненнем пошукавага руху з’яўляецца матывацыя юнацтва на вывучэнне падзеяў Вялікай Айчыннай вайны, выхаванне любові да Радзімы. У 1960–1980-я гады ў БССР школьнае краязнаўства паспяхова выконвала задачы, пастаўленыя перад ім дзяржавай: выхаванне савецкага патрыятызму, інтэрнацыяналізму.

4. На працягу 1960–1980-х гг. усе напрамкі гістарычнага краязнаўства развіваліся ў цеснай узаемасувязі. Дзякуючы ўдзелу навуковых кадраў у працы шэрага грамадскіх краязнаўчых арганізацый, значна палепшылася якасць іх дзейнасці. Удзел вядомых беларускіх навукоўцаў у дзейнасці грамадскіх арганізацый спрыяў павышэнню іх узроўню. Значная колькасць ініцыятыў прафесійных даследчыкаў была праведзена ў жыццё праз працу грамадскіх таварыстваў і арганізацый. Шэраг грамадскіх ініцыятыў (адкрыццё новых музеяў, распрацоўка і выданне навукова-папулярных даследаванняў, пошук загінуўшых абаронцаў Айчыны, ушанаванне славутых землякоў) быў падтрыманы і здзейснены намаганнямі дзяржаўных органаў на працягу вывучаемага перыяду і ў пазнейшы час. Праца грамадскіх таварыстваў дапамагла вырашыць важныя дзяржаўныя задачы ў галіне патрыятычнага выхавання, рэгіянальных даследаванняў, ахове помнікаў гісторыі і культуры.

5. У 60–80-я гады ХХ ст. гістарычнае краязнаўства адыграла важную ролю ў жыцці грамадства Беларусі, вывучэнні яго гісторыі і захаванні культуры, з’яўлялася важным інструментам вырашэння задач, якія стаялі перад партыйным кіраўніцтвам і савецкім грамадствам. Навуковымі ўстановамі праведзена вывучэнне рэгіёнаў Беларусі. Пашырана сетка краязнаўчых музеяў, створаны краязнаўчыя аддзелы ў бібліятэках краіны, арганізавана грамадская сістэма аховы помнікаў гісторыі і культуры. Дзякуючы сумесным намаганням, створаны “Збор помнікаў гісторыі і культуры”, пачалося выданне ўнікальных гісторыка-дакументальных хронік “Памяць”, надрукаваны сотні кніг, прысвечаных розным гарадам і мясцовасцям Беларусі. У справе выхавання савецкага патрыятызму добра

Рэпазіторый ВДУ

зарэкамендавала сябе створаная ў 1960–1980-я гг. сістэма школьнага краязнаўства.

Краязнаўчая праца ў дадзены час мела шэраг асаблівасцей – выхаваўчы накірунак (адыграла значную ролю ў выхаванні ў моладзі савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму), абмежаваную тэматыку (вывучэнне ў асноўным гісторыі савецкага перыяду: падзей грамадзянскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва ў пэўным рэгіёне). Краязнаўства набыло масавы характар, але ў той жа час часта мела праявы фармалізму. Больш шырокаму развіццю сістэмы краязнаўчай працы ў школе і дзейнасці грамадскіх арганізацый перашкаджала вузкая інфармацыйная і выдавецкая база, недахоп падрыхтаваных кадраў для вядзення краязнаўчай працы, пэўныя абмежаванні ў адносінах да даследаванняў дасавецкага перыяду гісторыі, гісторыі царквы, якія тлумачыліся панаваннем у грамадстве сацыялістычнай ідэалогіі. Вынікі навуковай, даследчай і ахоўнай дзейнасці розных накірункаў краязнаўства ў 1960–1980-я гг. у значнай ступені з'явіліся асновай для яго сучаснага развіцця, працягваюць выкарыстоўвацца беларускім грамадствам пасля атрымання незалежнасці і спрыяюць развіццю нацыянальнай культуры ўжо ў новых палітычных умовах.

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

1. На думку аўтара, мэтазгодна працягваць планавае вывучэнне рэгіёнаў краіны. Праведзены аналіз дзейнасці некаторых *ВНУ* Беларусі дазваляе зрабіць вывад пра тое, што гістарычныя факультэты з'яўляюцца важнымі цэнтрамі краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах краіны (Гродна, Гомель, Магілёў, Мінск). У адпаведнасці з гэтым мэтазгодна ў рэгіянальных універсітэтах стварыць пры кафедрах гісторыі Беларусі лабараторыі краязнаўства, якія б маглі фарміраваць і папаўняць банк дадзеных па рэгіёне. Увесці абавязковую краязнаўчую практыку тэрмінам да двух-трох тыдняў, пашырыць тэматыку курсавых і дыпломных работ студэнтаў за кошт краязнаўчага кампанента. Для выдання навукова-папулярнай літаратуры, на нашу думку, варта было б увесці рэцэнзаванне кніг і матэрыялаў краязнаўчага характару ў друкарнях. Такая, на першы погляд, жорсткая мера магла б спрыяць павышэнню ўзроўню выдаваемых кніг і памяншэнню ўзроўню дылетанцтва і антынавуковай прапаганды, якія пашыраюцца ў апошні час у грамадстве. Развіццю краязнаўчых даследаванняў, безумоўна, будзе спрыяць выданне рэгіянальнымі *архівамі* зборнікаў дакументаў па розных тэмах гісторыі і культуры.

З улікам таго, што ў айчыннай навуцы практычна адсутнічаюць працы, у якіх бы асвятляліся пытанні тэорыі і гісторыі гістарычнага краязнаўства, уяўляецца неабходным правесці іх вывучэнне, падрыхтаваць акадэмічныя даследаванні, прысвечаныя гісторыі краязнаўства Беларусі, работ па гісторыі краязнаўства асобных рэгіёнаў,

Репозиторий ВГУ

музеяў, краязнаўчых таварыстваў, выдаць "Беларускую краязнаўчую энцыклапедыю", дапрацаваць з улікам новых дадзеных і перавыдаць энцыклапедычныя даведнікі, прысвечаныя абласным цэнтрам, падрыхтаваць даведнік "Краязнаўцы Беларусі", а таксама падобныя выданні пра краязнаўцаў абласцей, гарадоў і раёнаў. Перавыдання і пэўнай дапрацоўкі патрабуе навучальны дапаможнік "Историческое краеведение Белоруссии", выдадзены ў 1980 г., які стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. Наспеў час для стварэння новага дапаможніка па гістарычным краязнаўстве нашай краіны. Неабходна спрыяць выданню рэгіянальных часопісаў, альманахаў, бюлетэняў краязнаўчага характару. З мэтай развіцця ўнутранага турызму мэтазгодна стварыць цэнтры краязнаўчай інфармацыі.

2. Грамадскія таварыствы краязнаўчай накіраванасці патрабуюць некаторай фінансавай падтрымкі дзяржавы. Заслугоўвае ўвагі пазітыўны вопыт цеснага супрацоўніцтва дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый, краязнаўцаў-аматараў, асабліва ў справе выхавання моладзі. Можам меркаваць, што грамадскае краязнаўства можа даваць і пэўны гаспадарчы эфект: узяць на сябе пэўную частку выдаткаў у фінансаванні ахновы гісторыка-культурнай спадчыны, у развіцці мясцовага турызму, фарміраванні турысцкай інфраструктуры.

3. У сістэме адукацыі неабходна працягваць выкарыстанне краязнаўства ў выхаванні патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці. У галіне школьнага краязнаўства добра зарэкамендавала сябе экспедыцыя "Наш край", "Жыву ў Беларусі, тым ганаруся", папярэднікам якіх з'яўлялася "Мая Радзіма – СССР". У той жа час можна прапанаваць больш цеснае супрацоўніцтва з акадэмічнымі ўстановамі, ВНУ, рэгіянальнымі музеямі, асабліва пры правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў. З мэтай стымулявання развіцця і павышэння статусу маладзёжных краязнаўчых даследаванняў пажадана правядзенне рэспубліканскіх навуковых краязнаўчых канферэнцый школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў.

4. Выкладзены ў манаграфіі матэрыял можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, спецыяльных курсаў па гісторыі краязнаўства. Асэнсаванне назапашанага вопыту можа служыць не толькі навуковаму даследаванню гісторыі краязнаўства і грамадскіх адносін, але і выкарыстання ў патрыятычным выхаванні. Уведзеныя ў навуковы абарот новыя матэрыялы, абагульненні і высновы даследавання могуць спрыяць пошуку і распрацоўцы новых аспектаў даследуемай тэмы.



Рэпазіторый ВДУ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.

2. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси в XVI веке – 30-е годы XX века / Л.В. Алексеев. – Минск: Беларус. навука, 1996. – 206 с.

3. Алексяюк Міхаіл Іванавіч [Электронны рэсурс] // Музеі Беларусі. – Рэжым доступу: file:///D:/Мои%20документы/10379-1.pdf. – Дата доступу: 12.12.2014.

4. Андрощенко, Н.К. Дорогами подвигов. Путеводитель по местам революционной, боевой, трудовой славы на Минщине / Н.К. Андрощенко. – Минск: Беларусь, 1970. – 168 с.

5. Аркадий Михайлович Подлипский. Библиография основных публикаций 1968–2005 гг. / сост.: А.М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск: ГУ "Витебская обласная библиотека им. В.И. Ленина", 2006. – 78 с.

6. Ахметова, С.Ш. Развитие исторического краеведения в Советском Казахстане: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / С.Ш. Ахметова; Алма-Атинский гос. ун-т. – Алма-Ата, 1981. – 16 с.

7. Ахметова, С.Ш. Историческое краеведение в Казахстане / С.Ш. Ахметова. – Алма-Ата: Казахстан, 1982. – 167 с.

8. Ашурков, В.Н. Историческое краеведение: учеб. пособие для исторических факультетов педагогических институтов / В.Н. Ашурков, Б.В. Кацюба, Г.Н. Матюшин; под ред. Г.Н. Матюшина. – М.: Просвещение, 1980. – 192 с.

9. Бабишин, С.Д. Из опыта краеведческой работы в школах (по материалам Хмельницкой области УССР) / С.Д. Бабишин // История СССР. –1962. – № 2. – С. 237–238.

10. Бабишин, С.Д. Краеведение как средство связи школы с жизнью / С.Д. Бабишин. – М.: Просвещение, 1963. – 16 с.

11. Бажан, О.Г. Культурні ініціативи українських дисидентів по збереженню національної культурної спадщини в 60–80-х р.р. [Электронны рэсурс] / О.Г. Бажан // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/t4/07.html. – Дата доступу: 21.09.2005.

12. Бандарчык, В.К. Старонкі беларускага савецкага краязнаўства / В.К. Бандарчык // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1972. – № 3. – С. 41.

13. Баравы, Р.В. Помнікі старажытнага Мсціслава / Р.В. Баравы, А.Л. Трусаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1986. – № 2. – С. 44–45.

14. Барыс, С. Краязнаўства ў школе. Якім яму быць? / С. Барыс // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 4. – С. 76–77.

15. Батракова, К.П. Основные направления краеведческой работы в


Репозиторий ВГУ

ЦГИА БССР в г. Гродно / К.П. Батракова // Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Гродна, 8–9 кастр. 1990 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей; ГрДУ ім. Я. Купалы; абл. аддзял. Беларус. добраахв. тав-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры; рэдкал.: В.М. Царук [і інш.]. – Гродна: ГОУТ. – С. 54–56.

16. Бахта, В.Н. Краеведение и музейное дело в СССР / В.Н. Бахта. – М.: Просвещение, 1977. – 123 с.

17. Белакоз, А. Школьны літаратурна-краязнаўчы музей / А. Белакоз // ПГіКБ. – 1973. – № 4.

18. Белакоз, А. Як стварыць этнаграфічны музей у школе / А. Белакоз // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 8.

19. Белакоз, А. Гудзевіцкі літаратурна-этнаграфічны музей / А. Белакоз // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1996. – Т. 3.

20. Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўнік: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1992–1995.

21. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / Ин-т истории НАН РБ; сост.: А.А. Коваленя (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БЕЛТА, 2005. – С. 513.

22. Белорусская краеведческая библиография: анализ библиотечных пособий областных библиотек // Отраслевые библиографии БССР / гос. б-ка БССК им. В.И. Ленина; ред. В.А. Фокеев. – Минск: Высш. шк., 1972. – С. 191.

23. Бельский, Б.В. Историческое краеведение в школах Хакасии / Б.В. Бельский. – М.: Просвещение, 1973. – 16 с.

24. Бердинских, В.А. Основные этапы развития краеведения в XX веке [Электронны рэсурс] / В.А. Бердинских // Рос. гос. гуманит. ун-т. – 2003. – Рэжым доступу: http://iai.rgu.ru/berd.htm. – Дата доступу: 15.08.2005.

25. Бескоровайный, И.И. Школьное краеведение как средство повышения качества знаний / И.И. Бескоровайный. – М.: Просвещение, 1963. – 53 с.

26. Библиографический указатель литературы по истории Гродно / сост.: Е.М. Таюрская, Г.М. Регилева. – Гродно: ГОУТ, 1978. – 38 с.

27. Брест: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – 408 с.

28. Бруева, Л.Н. Пока не похоронен последний солдат [Электронны рэсурс] / Л.Н. Бруева // Наш край – Віцебшчына. – 2004. – Рэжым доступу: www.kraj.vitebsk.net/?page=vov&sod=_bru_00. – Дата доступу: 15.08.2005.

29. Булгак, В.А. Вилейка / В.А. Булгак, В.И. Кебец, М.Н. Клемантович. – Минск: Беларусь, 1984. – 80 с.

30. Быхавец, І. Лынтупы і наваколле: гістар. нарыс / І. Быхавец. – Паставы: Пастаўская ўзбуйненая друкарня, 1993. – 84 с.

31. Бяспанскі, С. Да гісторыі пошукавага руху на Магілёўшчыне /

Репозиторий ВГУ

С. Бяспанскі // Магілёўская даўніна / рэдкал.: А. Агееў [і інш.]. – Магілёў: УПКП “Магілёўская ўзбуйненая друкарня”, 2001. – С. 133–139.

32. Бяспанскі, С. Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Беларусі (восень 1943 г. – вясна 1944 г.) / С. Бяспанскі // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 1. – С. 24–28.

33. В Беларуси появился Благотворительный фонд имени Я.О. Наркевича-Иодко [Электронны рэсурс] // Выток Нёмана, Уздзеншчына. – Рэжым доступу: http://istoknemana.ucoz.org/publ/vytok_njomana_uzdzenshchyna_2012_god/vytok_njomana_uzdzenshchyna_2/blagotvoritelnyj_fond_imeni_ja_o_narkevicha_iodko/3-1-0-29. – Дата доступу: 31.09.2015.

34. Валаханович, А.И. Кличевщина: ист.-эконом. очерк / А.И. Валаханович, И.И. Савченко. – Минск: Полымя, 1989. – 62 с.

35. Валодзька, Г. Краязнаўцы Паазер’я – яднайцеся / Г. Валодзька // Віцебскі рабочы. – 1991. – 4 крас. – С. 4.

36. Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсы людзей: матэрыялы навук.-практ. краязн. канф., Ваўкавыск, 22 сн. 1995 г. / ГрДУ ім. Я. Купалы; склад. І.П. Крэнь (гал. рэд.). – Ваўкавыск: Гродз. друк. 1997. – 246 с.

37. Витебск: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с.

38. Витебску – 1000: рекоменд. материалы в помощь библиотекам области / сост. Н.С. Китович. – Витебск: ВОБ, 1973. – 19 с.

39. Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Навуковы архіў. – Фонд 1248. – Спр. 10. – Арк. 70. Справаздача Віцебскага абласнога краязнаўчага музея за 1970 г.

40. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 1–5. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за перыяд 1976–1980 гг.

41. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 1. – Арк. 14. Справаздача ВАКМ за 1976 г.

42. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1075. – Спр. 2. – Арк. 13. Справаздача ВАКМ за 1977 г.

43. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 1–15. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за перыяд 1961–1975 гг.

44. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 13. – Арк. 86. Планы і справаздачы аб працы ВАКМ за 1973 гг.

45. ВАКМ. Н/А. – Фонд 1248. – Спр. 14. – Арк. 67. Справаздача ВАКМ за 1974 г.

46. Васілючак, М.В. Іўе: гіст.-эканам. нарыс / М.В. Васілючак, І.П. Крэнь, Я.Н. Мар. – Мінск: Беларусь, 1991. – 127 с.

47. Виртуальная экскурсия по Гудевичскому музею [Электронны рэсурс] // Масты. – Рэжым доступу: http://masty.eu/virtualnaya-ehkskursiya-po-gudevichskomu-muzeyu/.

48. Воршыч, А. Макракніга пра мікрагісторыю / А. Воршыч // Наша

Репозиторий ВГУ

ніва. – 2004. – 20 жн. – С. 9.

49. Всемирная история XIX–XX вв.: учебник для 11 кл. общеобразоват. Шк. / В.С. Кошелев. В.И. Синица, И.В. Оржеховский [и др.]. – Минск: Нар. асвета, 2002. – 448 с.

50. Всеукраїнська конференція "Історичне краєзнавство у відродженні духовності, культури, багатовікових національних ...", Луцьк, 28–30 верес. [Электронны рэсурс] // Харкаўскі ун-т. – 2002. – Рэжым доступу: http://slovnyk.org.ua/txt/donvisn/. – Дата доступу: 15.08.2005.

51. Выбранае. Мікалай Улашчык / уклад. А. Каўкі, А. Улашчыка. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 604 с.

52. Высоцкі, А. Іван Драўніцкі: "Родная мова як паветра, як зямля, як маці" [Электронны рэсурс] / А. Высоцкі // Рэгіянальная газета. – Рэжым доступу: http://www.rh.by/by/238/10/7246/. – Дата доступу: 12.09.2015.

53. Вядомы даследчык, краязнавец і літаратар Уладзімір Кісялёў адзначыў свой 80-гадовы юбілей [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://news.21.by/culture/2011/05/26/307547.html. – Дата доступу: 04.05.2015.

54. Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне: бібліягр. паказальнік / уклад. Л.Т. Бяззубік, Н.С. Кітовіч. – Віцебск: ВАБ, 1977. – 40 с.

55. Вялікія і жывыя: Інтэрв'ю з Алесем Белакозам [Электронны рэсурс] // Наша зямля. – Рэжым доступу: http://nashaziamlia.org/2011/04/30/4218/. – Дата доступу: 14.08.2015.

56. Габрусь, Т.В. Помнікі манументальнага дойлідства Міншчыны: гіст.-мастацтвазн. нарыс / Т.В. Габрусь. – Мінск: Полымя, 1991. – 4 с.

57. Галіч, А.Э. Школьныя музеі – захавальнікі і прапагандысты нацыянальнай спадчыны / А.Э. Галіч // Детский туризм и краеведение Беларуси.– Минск: РИФТУР, 2003. – С. 55–66.

58. Гаравы, М. Ад пошукавай работы да краязнаўчага цэнтра / М. Гаравы // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 1. – С. 69–75.

59. Гатоўчыц, І. Спакоранасць перад талентам / І. Гатоўчыц // Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. – Мінск: Маст. літ., 2005. – С. 69–77.

60. Генадзь Каханоўскі // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўнік: у 6 т. – М.: БелЭН, 1994. – Т. 3. – С. 213–215.

61. Герасіменка, М.П. Экспедыцыя "Наш край" у дзеянні / М.П. Герасіменка // Детский туризм и краеведение в Беларуси. / авт.-сост. С.М. Митрахович. – Минск: РИФТУР, 2003. – С. 75–84.

62. Героі Савецкага Саюза – віцябчанкі / склад. Т.В. Ганчарова. – Віцебск: ВАБ, 1975. – 12 с.

63. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: дапаможнік / І.І. Багдановіч [і інш.]; пад рэд. А.А. Карзюка. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 219 с.

64. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: (па матэрыялах

Репозиторий ВГУ

Магілёўшчыны): вучэб.-метад. матэрыялы / А.Р. Агееў. – Магілёў: МгДУ, 2015. – 121 с.
65. Гістарычнае краязнаўства – дзейсны фактар інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу ў школе і ВНУ: тэзісы навукова-метадычнай канферэнцыі, Гродна, 27–28 кастр. 1994 / ГрДУ імя Я. Купалы; кафедра гіст. Беларусі; склад.: Крэнь І.П. (гал. рэд.). [і інш.]. – Гродна: ГОУТ, 1994. – 112 с.
66. Гісторыя камсамола Гродзеншчыны: рэкамен. бібліягр. паказальнік / склад. Л.У. Здрадоўская. – Гродна: ГАНБ, 1990. – 22 с.
67. Гісторыя фабрык і заводаў Віцебскай вобласці / склад. Н.С. Кітовіч. – Віцебск: Віцеб. абл. б-ка, 1962. – 6 с.
68. Гнеўка, М.Р. Студэнтскія маршруты / М.Р. Гнеўка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1977. – № 3. – С. 39.
69. Гомель: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 527 с.
70. Гордеев, П.Б. Могилевщина: Памятники бессмертной славы / П.Б. Гордеев. – Минск: Полымя, 1986. – 143 с.
71. Городецкий, М.Н. Могилев и окрестности: справочник-путеводитель / М.Н. Городецкий, Е.А.Крисковец. – Минск: Полымя, 1982. – 112 с.
72. Госцеў, А.П. Карані і вытокі, або магчымасці школьнага краязнаўства / А.П. Госцеў // Мінулае Гродзеншчыны: навук.-метад. дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Гродна: ГАІПКПКРСА. – 1998. – Вып. 5. – С. 3–31.
73. Госцеў, А. Адзіная выхаваўчая прастора і краязнаўства / А. Госцеў // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2000. – № 3. – С. 47–62.
74. Госцеў, А. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.) / А. Госцеў, В. Швед. – Гродна: Выданне НВК “Пергамент”, 1993. – 320 с.
75. Госцеў, А. Твой стыль [Электроннае выданне] / А. Госцеў. – Рэжым доступу: http://www.t-styl.info/by/114/society/9502/. – Дата доступу: 12.09.2015.
76. Грамович, В.В. Памятники колхозного строительства в Белоруссии / В.В. Грамович, М.П. Костюк. – Минск: Беларусь, 1976. – 31 с.
77. Грахоўскі, С.І. Мінск. Спадарожнік турыста / С.І. Грахоўскі. – Мінск: Беларусь, 1975. – 224 с.
78. Грицкевич, А.П. Слуцк: ист.-эконом. очерк / А.П. Грицкевич. – 2-е изд. – Минск: Беларусь, 1970. – 112 с.
79. Грицкевич, А.П. Древний город на Случи / А.П. Грицкевич. – Минск: Полымя, 1985. – 158 с.
80. Гричихина, Е.Е. Опыт проведения производственно-исторических экскурсии / Е.Е. Гричихина – М.: Просвещение, 1959. – 23 с.
81. Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага 1830–2000 гг.: бібліягр. паказальнік / уклад. Л.І. Трумасава. – Гродна: ГАНБ імя Я.Ф. Карскага, 2004. – 30 с.
82. Гродно: энцикл. справочник / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.)

Репозиторий ВГУ

[и др.]. – Минск: БелСЭ, 1989. – 483 с.

83. Грыцкевіч, А. Краязнаўства / А. Грыцкевіч // Краязн. газ. – 2003. – № 1, крас. – С. 2.

84. Грыцкевіч, В. Шляхі вялі праз Беларусь / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс. – Мінск: Выдав. літаратура, 1980. – 272 с.

85. Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі [Электронны рэсурс] / А. Гужалоўскі // Камунікат. орг. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=10378. – Дата доступу: 13.03. 2015.

86. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2004. – 218 с.

87. Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок / Ф.Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 123 с.

88. Гучок, Я. Ах, Родчанка. Колькі слоў наўздагон юбілею [Электронны рэсурс] / Я. Гучок // Інфа-кур'ер. – Рэжым доступу: http://kurjer.info/2011/04/27/ax-rodchanka-kolki-slo-nazdagon-yubileyu/. – Дата доступу: 12.05.2015.

89. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 119. – Воп. 34. – Спр. 13. – Арк. 15. Справки по работе первичных, районных, городских областной комсамольских организаций 1965 г.

90. ДАВВ. – Фонд 289. – Воп. 1-к. – Спр. 90. Личное дело К.М. Колосова.

91. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 1. Протоколы учредительных конференций Витебской областной, городских и районных отделений общества охраны памятников.

92. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 2. Протоколы заседаний Центрального Совета Белорусского добровольного охраны памятников истории и культуры.

93. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 3. Протоколы заседаний Совета областного отделения БДООПИиК.

94. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 4. Протоколы заседаний президиума областного отделения БДООПИиК за 1966 г.

95. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 7. Отчет областного отделения за 1967–1968.

96. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 13. Отчеты, справки о работе областного, городских, районных отделений за 1968.

97. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 17. Постановления президиума ЦС БДООПиК за 1969 г.

98. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 18. Постановления совета облоно, президиума областного совета БДООПиК за 1969 г.

99. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 31. Постановления и распоряжения президиума ЦС БДООПиК за 1970 г.

100. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 33. Планы работы президиума

Репозиторий ВГУ

областного Совета на 1970 г.
101. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 39. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972 гг.
102. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 40. Постановления заседаний президиума ЦС БДООПиК за 1971–1972 гг.
103. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 81. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1974 г.
104. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 115. Постановления пленума и президиума ЦС БДООПиК за 1976 г.
105. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 128. Списки исторических памятников, расположенных на территории области (1976).
106. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 130. Постановления пленумов, заседаний президиума Республиканского Совета БДООПиК.
107. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 177. Протоколы 2-го Пленума Витебского обласного Совета от 28.04.1982 г. об итогах работы (1981).
108. ДАВВ. – Фонд 487. – Воп. 1. – Спр. 184. Постановления президиума Республиканского Совета БДООПиК (1983).
109. ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 285–298. Тэкст кнігі "Героі Савецкага Саюза ўраджэнцы Віцебшчыны".
110. ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 304–307. Дела относящиеся к конфенренции "Некоторые вопросы истории Витебской областной организации".
111. ДАВВ. – Фонд 520. – Воп. 1. – Спр. 356. Тэкст кнігі "Заветам Ленина верны (страницы истории комсомола Витебщины)".
112. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 6. Сводный отчет о работе школ области за 1965/1966 гг.
113. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 72. Сводный отчет ОблОНО о работе школ области за 1968/1969 гг.
114. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 248. Протоколы совета ОблОНО и материалы к ним.
115. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 321. Справки и информации о работе органов просвещения за 1976 г.
116. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 366. Приказы заведующего по основной деятельности (1977).
117. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 893. Приказы заведующего по основной деятельности (1985).
118. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 895. Справки и информации о работе учреждений просвещения области за 1985 г.
119. ДАВВ. – Фонд 2797. – Воп. 14. – Спр. 1004. Приказы заведующего ОблОНО по основной деятельности за 1987 г.
120. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 37. Отчеты о работе областного совета общества с приложениями к нему за 1971 г.
121. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 61. Отчеты, справки,

Репозиторий ВГУ

информации о работе областного совета общества за 1974 г.

122. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 101. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1981 г.

123. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 120. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1983 г.

124. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 132. Отчеты, справки, информации о работе областного и районных советов общества за 1983 г.

125. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 141. Документы о работе народных университетов знаний о памятниках истории и культуры (сведения, информация) за 1984–1987 гг.

126. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 148. Постановления президиума республиканского Совета общества за 1985 г.

127. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 175. Протоколы собеседований с ответственными секретарями районных отделений о перестройке работы (1987).

128. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 61. – Арк. 73–74. Отчеты, справки, информации о работе областного совета общества за 1974 г.

129. ДАГВ. – Фонд 224. – Воп. 1. – Спр. 101. – Арк. 20. Постановления президиума республиканского Совета общества и переписка с государственными и общественными организациями по основной деятельности за 1981 г.

130. ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 51. Протоколы заседаний историко-краеведческого кружка 1971–1975 гг.

131. ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 53. – Арк. 13. Документы о работе историко-краеведческого кружка (планы, отчеты, статьи) 1975–1981 гг.

132. ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 56. Проект устава историко-краеведческого кружка и список бывших членов.

133. ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. – Спр. 98. – Арк. 2. План работы секции исторического краеведения на 1983 г.

134. ДАГВ. – Фонд 245. – Воп. 1. Спр. – 119. Личное дело профессора ГрГУ им. Я. Купалы Я.Н. Мараша (1947–1990).

135. Дадатковыя рэкамендацыі па зборы матэрыялаў і напісанні гісторыка-дакументальных кніг “Памяць”. – Мінск: МП “Белтэст”, 1992. – 69 с.

136. Далідовіч, Г. Якім быць нашым дзецям? / Г. Далідовіч // Краязн. газ. – 2003. – № 5, чэрв. – С. 4.

137. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці: – Фонд 1244. – Воп. 2. – Спр. 1–16. Краязнаўцы Магілёўшчыны: Філіповіч І.І.

138. ДАМВ. – Фонд 1244. – Воп. 3. – Спр. 1–25. Краязнаўцы

Репозиторий ВГУ

Магілёўшчыны: Абрамовіч Д.М.

139. ДАМВ. – Фонд 1244. – Воп. 19. – Спр. 1–15. Краязнаўцы Магілёўшчыны: Гузаў В.Д.

140. ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 15. Задания пионерским отрядам "Следопыты Октября", посвященных 50-летию Октябрьской революции за 1967 год.

141. ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 95. Документы о проведении конкурса на лучший общественный музей.

142. ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 253. Исторические справки на города Чаусы, Чериков, Шклов, Хотимск (1983).

143. ДАМВ. – Фонд 2930. – Воп. 1. – Спр. 310. Перспективны план сооружения, реконструкции и реставрации памятников истории и культуры Могилевской области на 1986–1990 гг.

